Ба 11005

ПЯТРО ГЛЕБКА

# ПАД НЕБАМ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

## ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1947

Дзяржаўнае
Выдавецтва
БССР

ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ

# БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

★ ★
★

042009

1917 – 1947

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК

Инв. 1953 г.

Ба 11005

ПЯТРО ГЛЕБКА

# ПАД НЕБАМ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

## ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ

Інв. 1953 г.
БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1947

## *ПЯТРО ГЛЕБКА*

### I

*Як маладзік, навокал гляну вокам —*
*Я разгадаць наступны дзень прышоў:*
*Гадае той аб прышласці далёкай,*
*Хто верыць у сучаснае душой.*

Калі пройдзен звыш дваццацігадовы шлях паэтычнай творчасці і перад самім пісьменнікам і перад яго чытачом ляжаць шматлікія і markup розностайныя плады гэтай творчасці, ад мімалётных замалёвак да глыбока-прадуманых і эпічна-выкладзеных абагульненняў жыццёвага вопыту і назіранняў, першай думкай таго, хто бярэцца за кнігу, бывае думка знайсці зерне, якое ўласціва данаму паэту, якое ён прынёс у літаратуру, пасеяў у ёй, рупна і дбайна даглядаў яго ўсходы, выпалваў кволае і нядобраякаснае і нарэшце прышоў, як гаспадар, каб паглядзець на тое, што падрыхтавана да жніва. Для пісьменніка падобны агляд карысны як праверка выканання тых надзей і абяцанняў, якія жылі ў ім, калі ён уступаў у літаратуру, як крытычная падрыхтоўка да новых пасеваў, а для чытача ён цікавы, як сістэматызаваны і прапушчаны праз паэтычнае «я» паказ жыцця народа, у даным выпадку жыцця савецкага народа на працягу апошняга дваццацігоддзя. Праўда, лепш такой задачы служыў-бы поўны збор твораў, а не выбраныя творы паэта, але і выбраныя творы—іменна таму, што ў іх адсеялася тое, што паэт сам лічыць негрунтоўным, мімалётным ці памылковым нават,—могуць у значнай, нават у пераважнай ступені служыць абодвум гэтым мэтам. Паэзія, як і сам паэт,—прадукт свайго часу, свайго грамадства. Яны абапіраюцца на здабытае да іх у галіне мастацкай творчасці, убіраюць у сябе ідэі, вынаходніцтвы, жаданні і мары таго ці іншага класа. Але ўсё гэта—у меру свайго таленту і майстэрства—паэт прапускае праз прызму

свайго ўласнага светаадчування, творча асэнсоўвае і пераўтварае ў яму аднаму ўласцівыя вобразы, думкі, высновы. І чым бліжэй паэт да народа, чым вышэй яго талент, чым палітычна больш спелы яго светапогляд, тым большы водгук знаходзіць у народзе кожны вобраз яго паэзіі, кожнае яго ўласнае пачуццё, нават мімалётны настрой, нават сугуба асабістая лірыка. Не заўсёды ўсе гэтыя якасці даюцца адразу, пры ўступленні паэта ў літаратуру, найчасцей яны паступова прыходзяць у творчасць у працэсе росту самога паэта і яго паэзіі, і добра, калі мы можам бачыць свядомыя намаганні паэта набыць, выхаваць у сабе гэтыя станоўчыя і асабліва неабходныя для сучаснага паэта якасці. Іменна такім нам прадстаўляецца творчы шлях Пятра Глебкі. Нават першыя творы, змешчаныя ў гэтым зборніку, даюць нам уяўленне аб тым, што перад намі не паэт толькі, як казалі раней «божай ласкаю», а паэт— майстра мастацкага слова, які «робіць паэзію» па прыкладу В. В. Маякоўскага, пераварачваючы «тонны словесной руды, единого слова ради». Наша крытыка часта спасылаецца на вучобу ў Маякоўскага пры разглядзе творчасці сучасных паэтаў, і гэта зусім слушна: уплыў Маякоўскага на савецкую паэзію (і не толькі на савецкую, а на дэмакратычную паэзію ва ўсім свеце) агульнавядомы і бясспрэчны. У Глебкі сляды гэтай вучобы мы перш за ўсё знойдзем у грамадскім накіраванні яго паэзіі, шырыні ахопу грамадскіх падзей і ў той спецыфічна аратарскай устаноўцы, у паэтычнай форме, якая падначальвае сабе і падбор слоў, найбольш яркіх, новых і выразных, і адносіны да рыфмы, і адносіны да музыкі паэтычнага радка. Сапраўды, вазьміце любы верш П. Глебкі нават першага перыяда і нават самы інтымна-лірычны, і вам перш-наперш кінуцца ў вочы актыўныя адносіны паэта да рэчаіснасці.

Бульняговыя межы агорклі, —
Іншай радасці прагну цяпер:
Расцвітай, Беларусь мая, зоркай
На сузорных шляхах СССР.

Не проста жаданне, а прага зрабіць усё для росквіту сваёй вялікай Радзімы, свайго народа, аддаць усяго сябе на служэнне яму—гэта вялікае жаданне кіруе паэтам у яго паэтычнай творчасці. Паэт верыць у сілу народа і вучыць гэтай веры свайго чытача.

Наскія дарогі, наскія пуціны
У пясках не знікнуць, у пясках
не згінуць.

Ён уважліва прыглядаецца да акаляючага: да грамадскага ладу, да прыроды, да людзей, ён асэнсоўвае падзеі, як асэнсоўвае і з'явы прыроды. Адсюль струмень філасофскай прыродаапісальнай лірыкі з самага пачатку яго дзейнасці (вершы «Клён завяў», «І сонца і месяц») з адзіным вынікам: жыццё перамагае, і паэт павінен пракланяцца «Перад новай красой і жыццём». Адсюль уяўленне аб паэзіі, як аб «вялікай песні жыцця», як аб змаганні за гэта жыццё—вольнае, бурнае і шчаслівае для ўсіх працоўных. Адсюль маршападобны верш «Чырвонай Арміі парад»—1929 года, з такімі беспадобнымі радкамі, як:

Да самай ночы ад світанку,
Ад самых ранішніх зарніц,
Паўзуць жалезным брухам танкі,
Аж стогнуць сцены камяніц.
... І гэта стройная лавіна
Мне навявае успамін
Пра барацьбу маёй краіны.
Пра слаўныя былыя дні.
Пра тыя дні, калі на полі
У віхры смерці і адваг
Палкі чырвоныя за волю
Галовы слалі далавах.

У гэтым сказваецца творчая вучоба, а не голае наследаванне Маякоўскаму. Сляды гэтай вучобы мы знойдзем і ў пошуках новай, спыняючай увагу чытача, асанансавай рыфмы (глядзі верш «Слова перамогі»), калі сапраўды рыфмы, як астрыі пік, дзейсна накіраваны для бітвы з ворагам, а не з'яўляюцца проста прыгожымі бразгулькамі, аздабляючымі канцы віршаваных радкоў. Гэтую вучобу мы бачым у поўнагалосных, разлічаных на аратарскае вымаўленне, ударна паўтараючыхся складах і словах у кожным вершы.

За крокам — крок,
За ротай — рота,
За батальёнам — батальён.
Ідзе суровая пяхота,
Разведкі лёгкі эскадрон.

Ударная сіла мастацкага слова, я сказаў-бы прабойная яго сіла, калі яно накіравана супроць ворага, адна з тых якасцей, якую культывуе Глебка ў сваёй паэзіі амаль з самага пачатку. Але Глебка ніколі не спускаецца да голага наследавання Маякоўскаму (што, як вядома, загубіла шмат маладых і нядрэнных паэтаў). Яго вучоба, калі так можна сказаць, ідзе поруч са змаганнем з тым, што ён не прымае ў

паэтычнай тэхніцы Маякоўскага. Не гледзячы на тое, што ён часамі паддаецца ўлюбёнай рытміцы Маякоўскага, Глебка ў асноўным прыхільнік так званага класічнага памеру верша, правільнай сілаба-танічнай рытмікі. Праводзячы па рэцэпту Маякоўскага адбор свежых, не зацяганых і найбольш вобразна насычаных слоў для выражэння сваіх дум і пачуццяў,— Глебка аддае перавагу паўторам аднолькавых гуказбегаў, унутраным рыфмам, алітэрацыям у гэтых словах і гэтым павялічвае музыкальнасць верша, нібы кампенсуючы яго за нязвонкія канчальныя рыфмы. Можна заўсёды паручыцца, спаткаўшы той ці іншы склад, ці гуказбег у адным радку, што паэт яшчэ некалькі разоў ужыве ў наступных радках, пакуль ён не зменіцца на такі-ж паўтараючыйся іншы склад, або склад з перастаўленнем гукаў.

Над горадам сігнальны пошчак
І сцяг вогненна гараць —
Сягоння ў нас на люднай плошчы
Чырвонай Арміі парад.

У гэтым невялікім урыўку склад «на»—паўторан 6 разоў, склад «ра-ар» 5 разоў, спалучэнне з гукам «д»—5 разоў. Калі прыдаць да гэтага схільнасць Глебкі да анафар, да паўтораў строф, якія абрамляюць лірычны верш, да паўтараючыхся адмаўленняў «ні», «не», або злучніка «і», калі вылучыць, як асаблівасць яго верша, тое, што ён любіць спалучаць процілеглыя вобразы (холад і цеплыню, гора і радасць, святло і цень, рык і цішыню), дык мы ўбачым, як Глебка перадаваў у сваіх вершах магутную рытміку жыцця. Тое самае трэба сказаць адносна наяўнасці ў вершах Глебкі лірычных мініятур-малюнкаў прыроды, якія прысутнічаюць ва ўсіх яго трыбунных вершах. У вершы аб Беларусі паэт збірае «залатую над клёнамі россып», каб упрыгожыць вобраз сваёй радзімы, у філасофскім вершы «На што гадаць і марыць аб далёкім», як маляўнічыя мініятуры прыродаапісальных з'яў, мы бачым і яблыні, налітыя крамяным сокам і апранутыя ў «першы шоўк» веснавога лісця, і «неба сінь з дымкамі аблакоў». Гэта робіць вершы Глебкі яшчэ больш лірычнымі і мяккімі, а ўключэнне прыродаапісальных радкоў і вобразаў аціпляе трыбунную лірыку паэта, не зніжаючы яе суровасці.

Такім чынам, самае беглае азнаямленне нават з пачаткам паэтычнай творчасці П. Глебкі паказвае нам, што ў яго асобе ў беларускую літаратуру прышоў майстра слова, які глядзеў

на паэтычную працу, як на скрупулёзную, сістэматычную працу над словам, над наданнем радку высокага мастацкага гучання, пры ўсёй паўнаце выражэння пачуццяў і дум совецкага чалавека, пры глыбокай ідэйнасці паэзіі. Гэтыя станоўчыя якасці паэзіі Глебкі, якія заўважаюцца ў першыя гады яго творчасці, у далейшым знаходзяць сваё ўсё большае і большае выражэнне. І калі ў першых вершах чытач знойдзе некаторыя невыразнасці або хістанні ў азначэнні ролі паэта і ролі паэзіі, з некаторай акцэнтыроўкай на захапленне абстрактнай прыгажосцю, некаторую дань недастаткова акрэсленым лятуценням, з «цвеценню», «сінню» і «кволасцю», дань праклaненню перад гучаннем самога слова, часамі ва ўшчэрб чоткасці думкі, пробу здольнасці пабудаваць верш на нейкай асаблівай рытміцы ці незвычайным чаргаванні рыфм («Рытмы», «Перад навальніцай»), то з цягам часу гэтых слабасцей будзе ўсё меней і меней і поступ паэта наперад становіцца ўсё больш упэўненым.

Некаторую павольнасць і зацяжку ў ідэйным і мастацкім росце сваёй паэзіі, абумоўленую патрэбай перамагання вышэй пералічаных акцэнтыровак і этнаграфічнай вузкасці тэматыкі, сам паэт тлумачыць потым «крывым раздарожжам» «Узвышша», якое перашкаджала «змяніць свой вузенькі настрой на шырыню людскіх настрояў» (паэма «Карменсіта»—1933 г.), Нацыяналісты ўпарта чапляліся за кожную праяву гэтага «вузенькага настрою», узносячы яе на вышыню «сапраўднай і адзіна-правільнай» паэзіі. Але П. Глебка здолеў з дапамогай совецкай грамадскасці «адкінуць навотлю» няпрошаных «прыяцеляў», замацаваць тое станоўчае, з чым ён прышоў у літаратуру, развіць яго ў патрэбным кірунку. Паэт ведаў, што жыццё—адзіная аснова паэзіі.

Няхай жыццё мой сціплы верш
Густымі сокамі напоіць,
Няхай у стройным тканні жыл
Жывая кроў людзей заб'ецца, —
Тады ён толькі будзе жыць
І хваляваць людскія сэрцы.

І ў адпаведнасці з гэтым паэт, кажучы некалькі высокім стылем, кіраваў човен сваёй паэзіі.

Першыя-ж творы паэта звернуць увагу чытача і на яшчэ адну асаблівасць творчасці Глебкі: любоўнае і ўмелае выкарыстанне народнай паэзіі. Вобраз жняі, якая «у глухой даліне жыта дажынала» і пела сыну, вобразы дзяўчат, якія ідуць на зазелянеўшыя ўзгоркі заклікаць вясну, вербы, якія «гнуцца

нізка, гнуцца аж да долу» і асацыіруюцца з дзявоцкай доляй,—выкарыстоўваюцца паэтам, але зусім у новым абрамленні і ў новай якасці: маці-жняя ў сваёй песні прарочыць сыну зусім іншую долю, чым тая, якая правідзелася традыцыйнай гераіні падобных народных песняў:

Прабягуць гадочкі,
І ў глухой даліне
Найбуйнейшым жытам заквітнее ніва,
Дружна з калектывам
Загудзе машына.

Ужо не проста вясковыя дзяўчаты будуць сустракаць вясну, а «дзяўчаткі мае, комсамолкі», і самому паэту разам з імі хочацца клікаць не традыцыйную, а новую творчую вясну народа:

Будзі, вясна, магутныя акорды,
Да творчай працы заклікай,
Гартуй нам дужасць у руках,
А на абліччах нашых — гордасць,
... Бо нам-жа трэба будаваць.

І гнуткія вербы ў яго вершах прарочаць дзяўчыне не пакорлівасць долі, а ўпартасць у адшуканні сваёй новай і незалежнай долі.

Да гэтага трэба дадаць уменне паэта шчодра карыстацца багаццямі народных эпітэтаў, параўнанняў і вобразаў («На вір, на лес сухі адкінь», «Радзіла нас нядоля чорная і гадавала нас, як мачыха»), спалучанае з уменнем ажыўляць гэтыя вобразы трапнымі новымі супастаўленнямі, напрыклад такімі, як «Мы выраслі непакорныя» чорнай долі і здольныя «жыццё ліхое перайначываць». Гэтая сувязь з народнай творчасцю ў Глебкі таксама праходзіць цэлую гаму развіцця і творчага апасродкавання, узбагачаючы яго мову і мастацкія прыёмы на працягу ўсяе творчасці. Яна ішла ад тых матчыных казак і спеваў, якія так прыгожа апеў сам паэт у сваёй першай ліра-эпічнай паэме «Матчыны казкі» (1928 г.), у якой ёсць шмат аўтабіяграфічнага. Гэтая паэма поруч з паэмамі «У дарогу», «Хада падзей», «Трывожны сігнал», «Арлянка» і «Арка над акіянам», напісанымі ў першыя пяць год творчай дзейнасці П. Глебкі, раскрылі перад чытачом яшчэ адну характэрную рысу паэтычнага даравання Глебкі: паэт-лірык аказаўся не менш здольным у стварэнні значных эпічных палотнаў. Эпіграфам да большасці з гэтых паэм можна было-б паставіць наступныя радкі з «Арлянкі»:

Мы прысвецім найлепшую песню сваю
Тым, што йшлі праз балоты палескія,
Што загінулі мужна ў вялікім баю
За Беларусь,
За Савецкую.

Паэма «Трывожны сігнал» перадае адзін з баявых эпізодаў барацьбы супроць белапалякаў на Дзвіне, калі часткі Чырвонай Арміі былі вымушаны адступіць за раку. На гэты бок ракі застаўся невялікі атрад конніцы і цягнік з боепрыпасамі. Банда белапалякаў і нацдэмаўскай навалачы захапіла чыгуначны мост, каб адрэзаць савецкім байцам і цягнікам з мірным насельніцтвам шлях да адступлення. Камісар ВЧК узяў на сябе кіраванне атрадам для таго, каб прарваць акружэнне. Бандыты, не чакаўшы такой смеласці і ўпэўненыя ў тым, што акружаныя байцы здадуцца і будуць лёгка павешаны ў бары, пусціліся на хітрасць: яны вывесілі чырвоны ліхтар перад мастом, каб спыніць цягнік. Але ў камісара ВЧК хапіла мужнасці рызыкнуць не толькі сваім жыццём, але і жыццём тых маладушных, якія гатовы былі абвінаваціць яго ў здрадзе, і прарвацца праз захоплены ворагам мост. У паэме «Арлянка» апавядаецца пра тое, як камандзір Чырвонай Арміі, расстраляўшы ўсе патроны, папаў у палон да белапалякаў і як яго спрабавала выратаваць яго каханая дзяўчына-сялянка, празваная сваімі сябрамі-партызанамі «Арлянкай». Яе гісторыя пасля больш поўна і пераканаўча развіта П. Глебкам у драматычнай паэме «Над Бярозай-ракой». У паэме «У дарогу»—падаецца працяг барацьбы беларускага народа супроць белапольскіх паноў на той частцы Беларусі, якую ім удалося ўтрымаць у сваіх руках і пасля заключэння міру. Нас не цікавіць зараз разгляд сюжэта гэтых паэм (з ім чытач можа непасрэдна пазнаёміцца ў зборніку). Нас цікавіць, як справіўся малады тады пісьменнік з паказам чалавечых характараў і тыповых абставін таго часу, да якога належаць напісаныя творы, і тое, як адлюстраваліся ўказаныя вышэй асаблівасці яго таленту, якія ўжо ў значнай меры выявіліся ў яго лірычнай творчасці. Адказам на апошняе пытанне будзе тая акалічнасць, што паэт і свае паэмы (не толькі гэтыя, але і «Хаду падзей»—у значнай меры «лабараторную» работу аўтара) перш-на-перш прызначае для трыбуннага вымаўлення, для аратарскай чыткі. Таму П. Глебка свае паэмы перасыпае адступленнямі лірычнага і публіцыстычнага парадку. Так, намаляваўшы, па свайму звычаю, скупымі, але яркімі фарбамі, пейзаж Усходняй і Заходняй Беларусі, якія зліваецца ў адзіны

пейзаж: «азёры, лясы, палеткі, балоты, аблогі», і насыціўшы гэты пейзаж адпаведным настроем у паэме «У дарогу»— П. Глебка робіць публіцыстычнае адступленне: «Заходняя частка, мая Беларусь, ці здзейсніш калі парыванні», парыванні да волі, да вызвалення? І разам з усёй краінай паэт адказвае:

— Набліжаецца дзень,
Паўстанем, адважна паўстанем!
Нядарам у пушчах калышацца звон
Навостранай помстаю сталі!
... Ніякая сіла не спыніць размах,—
Агні разгарацца, засвецяць,
І стане пад сцягам краіна мая
Адной Беларуссю Совецкай!

У другім месцы гэтай паэмы, узняўшы вобраз мацеры адважных пяці сыноў Асташэняў да вобраза-сімвала, які ўвасабляе ў сабе самую Заходнюю Беларусь і яе сыноў-барацьбітоў за вызваленне, П. Глебка зварочваецца да маці непасрэдна ад сваёй асобы:

Матуля, адвечная скруха твая
Загіне калі, ці ніколі?

Паэт пачынае паэму «Трывожны сігнал» аратарскім уступам «Замест лірычнае прадмовы», прысвячаючы яго вострай палеміцы з «нялюбым паэтам» нацыяналістычнай школы, якіх шмат «падвізалася» ў беларускай літаратуры тых часоў, калі пісалася гэтая паэма. П. Глебка выкрывае маскіроўку гэтага роду «паэтаў» і тады, калі яны ныюць аб адсутнасці нейкай кволай, есенінскай рамантыкі «не ў пару апаўшых лісцяў», за якой яны-б хацелі схаваць сум ворагаў, гінуўшых пад ударамі пралетарскай рэволюцыі і надыходзячай калектывізацыі, і тады, калі гэтыя «паэмы» хавалі за ўяўна-бадзёрай, крыклівай прозай сваіх вершаў-адпісак сваё «распрадане сэрца» і змяіныя думы. Іх рамантыцы, якую П. Глебка высмейвае ў паэме «Хада падзей», паэт супроцьстаўляе сапраўды гераічную рамантыку рэволюцыі, грамадзянскай вайны і масавага нацыянальна і соцыяльна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. І, заканчваючы паэму, паэт зноў варочаецца да аратарскага адступлення, каб яшчэ раз закляйміць нацыяналістычных «штукмайстраў», лакеяў замежнага капітала, які з асалодай вітае іх літаратурныя дыверсіі:

Рукой халоднай безупынку
Ён ставіць творчасці пячаць:

За радасць нашую—
адзінку,
За сум варожы —
цэлых пяць.

Увесь раздзел «Замест эпілога»—прасякнут радасцю чалавека, які разам з народам перамог «у дні вялікага змагання», абышоў варожыя пасткі, разгадаў намеры ворага і вышаў, зноў-жа разам з народам, на «новыя прасторы» жыцця і творчасці.

На небе расцвітае яснасць,
Як пацалунак маладой.
Мае сябры, якое шчасце
Прайсці жывому над вадой!

Мінуць трывожныя сігналы,
Павахтаваныя масты,
Дзе ў старасвецкіх прычындалах
Стаяць варожыя пасты.

Такім чынам ў паэмах П. Глебка прадаўжае той-ж напрамак на развіццё і разгортванне ў беларускай паэзіі яе лініі актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, «актыўнага ўтаржэння» ў найбольш актуальныя праблемы сучаснасці, з захаваннем адтрыбунна-аратарскага прызначэння самой паэзіі. Самыя адступленні ад паэм носяць сляды тых умоў і абставін класавай барацьбы, якая разгарнулася ў часе і пасля аднаўленчага перыяда, і якія знаходзяць правільнае адлюстраванне ў творчасці паэта. Таксама правільнае адлюстраванне знаходзяць і тыповыя абставіны, якія служаць фонам для сюжэта паэм, як, напрыклад, бытавыя абставіны жыцця працоўных у Заходняй Беларусі («У дарогу»), выпісаныя з уласцівай Глебку страсцю і маляўнічай выразнасцю (варта ўспомніць хоць-бы малюнак мястэчка Вязынь ноччу з старэнькімі хатамі, гнілымі хлявамі, «крамамі з дошчак», і «не гмахі, а ўсё-ж камяніцы», уздоўж галоўнай вуліцы, якая таксама баіцца парушыць прымусовы парадак акупантаў), і палітычныя абставіны, якія так трапна характарызуе сын Рыгора Асташэні:

Калі будзе няволя у нас панаваць,
Дык разваліцца й гэтая хата.
Ты сягоння карову, каня нажывеш,
Заўтра ўсё прададуць за падаткі.

Большыя хібы мы знойдзем у маладога Глебкі ў перадачы вобразаў людзей у першых яго паэмах. У большасці яны надзелены адной якой-небудзь рысай, якая часам гіпербалізуецца да таго, што вобраз становіцца сімвалам (маці

Асташэні, калі яна ўночы ў полі кліча сваіх сыноў-сакалоў, паклаўшых галовы за волю роднага народа). У процівагу ім і ў рэзкім кантрасце з іх абмалёўкай падаюцца асобныя вобразы ў бытавым рэалістычным плане (сам Рыгор Асташэня і часткова сын яго Уладзік), і гэтая рознапланавасць вобразаў аднаго і таго-ж твора шкодзіць іх паэтычнай цэльнасці. Шкодзіць цэльнасці гэтых паэм і тое, што паэт нарачыта падкрэслівае сваю асаблівую схільнасць да псіхалагічна-драматычных сітуацый (паэмы «Арлянка» і «Трывожны сігнал»), і тады шырокая тэма гвалтоўна звужаецца, абстрагіруецца ад тыповых абставін і становіцца нецікавай шырокаму чытачу, а само абгрунтаванне адарваных ад жыццёвай праўды ўчынкаў герояў цягне за сабой і скажэнне гэтых абставін. Як прыклад можна ўказаць на гісторыю з прарывам з акружэння ў паэме «Трывожны сігнал», дзе, пагнаўшыся за псіхалагічнымі перажываннямі камісара ЧК, якога абвінавацілі без падставы ў здрадзе, паэт згубіў магчымасць паказаць сапраўдныя баявыя дзеянні атрада камісара, пра які ён сам кажа:

Мае таварышы!
Ніколі
Не ведаў страху наш атрад:
З любой засады—вымчаць коні...

Захапіўшыся развязаннем псіхалагічнай праблемы, паэт і не заўважыў, як гэтыя людзі ператвораны ім з адважных чэкістаў у панікёраў:

Нехта біўся аб сцены сваёй галавой,
Нечы сударжны твар скамянеў
і пажоўк.

Ды і вобраз самога камісара значна страціў ад таго, што паэт, давёўшы яго прадбачлівасць фразай у пачатку: «А зараз клічце машыніста, няхай ён будзе лепш пры мне», пасля, для ўзмацнення драматычнасці сітуацыі, прымушае машыніста здрадніцкі збегчы з паравоза. Відавочна ў жыцці камісар працягнуў-бы сваю прадбачлівасць і тады, калі цягнік быў у пуці, а таксама падрыхтаваў-бы свой атрад да прарыву боем, не спадзяючыся толькі на тое, што яму ўдасца неўзаметку прайсці міма банды, якая асядлала дарогу.

Але ўсё гэта хваробы росту і дань прыўзнятай рамантычнасці ў паказе чалавека, якой прытрымліваўся малады П. Глебка ў сваіх першых паэмах. Чытач сам здолее пераканацца, што ў наступных паэмах паэт знойдзе патрэбную прапорцыю паміж рэалістычным і рамантычным, удасканаліць

сваё майстэрства ў абмалёўцы людскіх характараў і ў пабудове сюжэта.

Што зацікавіць і парадуе чытача ў гэтых паэмах, дык гэта тое, што Глебка робіць буйны крок наперад да тэм індустрыялізацыі краіны, да гарадской лірыкі, да паказу чалавека працы. Варта нагадаць малюнак горада зімой у паэме «Хада падзей», ці сцэнку з пагрузкай у цягнік атрада чэкістаў і выхад цягніка са станцыі, або асобныя сцэны з «Аркі над акіянам».

Для маладой, у аснове сваёй сялянскай паэзіі Беларусі — і тэмы і вобразы П. Глебкі ў гэты час былі безумоўным крокам наперад, а для самога паэта буйным творчым поспехам.

З усяго вышэй сказанага лагічна выцякае, што, прышоўшы ў беларускую паэзію, каб разгадаць «наступны дзень сваёй краіны», паэт здолеў стаць на правільны шлях, звязаць сваю паэзію з шырокімі працоўнымі масамі, і дзякуючы ўпартай працы над словам, над вобразам, дзякуючы ўпартай вучобе на лепшых узорах тагочаснай совецкай паэзіі, у прыватнасці на ўзорах Маякоўскага, — П. Глебка здолеў стварыць ужо на першым этапе сваёй творчасці рад вельмі каштоўных і вельмі цікавых паэтычных твораў.

## II

*Мы помнім,*
*Што крывёю здабыта*
*На працу вялікае права,*
*І множым упарта здабыткі,*
*Як гонар,*
*Геройства*
*І славу.*
(«Урачыстасць», 1931 г.)

Гады вялікай перабудовы і надышоўшыя за гэтым гады бурнага развіцця социялістычнай эканомікі і культуры сталі гадамі далейшага развіцця ўзросшага і акрэпшага таленту паэта. Перш-на-перш расшырыўся яго кругагляд. Ужо не толькі тое, з чым ён непасрэдна сутыкаецца ў асабістым жыцці, або тое, што так ці інакш звязана з беларускай тэматыкай, уздымае пафас яго паэзіі. Не, ён адчувае сябе гаспадаром вялікай, агульнай для працоўных усяго свету Радзімы, вялікага Совецкага Саюза, у які, як неад'емная частка, як поўнапраўны член сям'і, з'еднанай навекі ленінска-сталінскай дружбай совецкіх народаў, увайшла Совецкая Беларусь.

Паэт з поўным правам мог вызначыць гэта сваё месца ў адным з вершаў 1936 года «Песня славы»:

Я сам гаспадар неабсяжнай краіны
І верны слуга дарагое айчыны,
Народа майго гераічнага сын —
Совецкай рэспублікі грамадзянін.

Асноўнай тэмай яго творчасці становіцца вольная творчая праца совецкага чалавека, ва ўсім яе шматгранным праяўленні. Яго творчасць зліваецца з творчасцю вялікага калектыва. У яго паэзіі гучыць і радасць за шчаслівае заможнае шчасце калгаснай вёскі, і клопаты за ўмацаванне калгасаў, захапленне соцыялістычнай індустрыялізацыяй краіны, гонар за яе поспехі і перамогі і няспынныя клопаты аб умацаванні абароны мірнай працы совецкіх народаў. Правядзенне падпіскі на пазыку, большэвіцкая вясна, арганізацыя соцыялістычнага спаборніцтва ў горадзе і ў вёсцы, выбары ў Вярхоўны Совет, прыняцце Сталінскай Канстытуцыі, радасныя водгукі на кожнае выступленне правадыра народаў—галоўнага зодчага нашага будаўніцтва, міжнароднае становішча нашай радзімы, радасць з поваду поспехаў і гора з прычыны паражэння братоў па класу ў іншых краінах—словам усё шматграннае палітычнае жыццё, усе народныя пачуцці совецкага чалавека знаходзяць свой водгук у паэзіі Глебкі. Тон гэтай паэзіі радасны і ўпэўнены, фарбы сонечныя і цёплыя. Павысілася і мастацкая дасканаласць майстэрства: менш адчуваецца рытарычнасці нават у тых вершах, якія прысвечаны агульнапалітычным праблемам, яны падаюцца праз большае апасродкаванне ў вобразах, у пачуццях жывога чалавека, скрупулёзная работа над словам, якое часамі на першым этапе «засушвала» верш, цяпер не перашкаджае, а дапамагае выяўленню таго вялікага пачуцця, якім перапоўнен паэт. Вершы ў значнай меры набываюць сюжэтнасць, і гэта ў сваю чаргу дапамагае стварэнню шматгранных вобразаў совецкіх людзей. Сюжэты паэм становяцца менш друзлымі, набываюць стройнасць і мэтаімкнёнасць. А самае галоўнае—ідэйная накіраванасць паэзіі Глебкі становіцца больш яснай, празрыстай, і таму больш дзейснымі становяцца тыя мастацкія сродкі, якімі валодае паэт.

Пакідаючы за чытачом «Выбраных твораў» права і магчымасць, чытаючы творы паэта1931—1940 года, самому ўпэўніцца ў правільнасці зробленых вывадаў, мы хацелі-б звярнуць яго ўвагу толькі на наступныя характэрныя для гэтага перыяда рысы паэзіі П. Глебкі: пры ўсёй шматграннасці вобраза



Инв. 1983 г. 84//88

савецкага чалавека, пры ўдалым вылучэнні тых рыс, якія сталі ўласцівы яму, як носьбіту самой перадавой ідэі, відавочны асаблівыя намаганні паэта стварыць тры групы вобразаў, у якіх найбольш ярка выяўляюцца гэтыя рысы: вобраз савецкай моладзі, у прыватнасці савецкай дзяўчыны і жанчыны, вобраз байца і камандзіра Чырвонай Арміі і вобраз правадыра рэвалюцыі. У стварэнне гэтых вобразаў паэт уносіць асаблівую цеплыню, асаблівую сілу паэтычнай страсці і асаблівую ўпартасць у дасягненні найбольшай мастацкай адшліфоўкі. Відавочна, работа над стварэннем гэтых вобразаў давала асаблівую асалоду самому паэту і стварэнне іх ён лічыў «справай славы, гонару і геройства» для савецкай паэзіі. Нездарма ў заканчэнні «Карменсіты» ён з любоўю ўспамінае:

Якімі горнамі цяпла
Мой голас
І мае настроі
На мужны гартавалі лад
Уласныя мае героі,
Героі фабрык і садоў,
Высокіх гор,
Марэй вялізных,
Героі сёл і гарадоў —
Будаўнікі соцыялізма.

Ва ўзаемасувязі з імі ён бачыў сілу паэзіі, сілу паэта. Іменна таму з-пад яго пяра выліваліся гімны людзям працы.

Слава людзям дружнай працы,
Слава ім!
Мінуць вякі, —
Будзе так-жа выгінацца
Шкло празрыстае ракі,
Будзе мак цвісці на градах,
Будзе ў сэрцы з веку ў век
Несці творчай працы радасць
Непакорны чалавек.

І ў любоўна выпісаных вобразах савецкай моладзі паэт перш за ўсё падкрэслівае гэтую радасць творчай працы і расказанае паэтычнымі сродкамі сталінскае палажэнне, што савецкаму чалавеку не трэба ўжо клапаціцца: а што-ж будзе з ім і сям'ёй на заўтрашні дзень. У невялічкім «Зімовым малюнку» паэт вуснамі маці суцяшае малую дзяўчынку, якая заплакала, вывернуўшыся ў снег з санкамі:

Ты не будзеш адна ніколі
Ні ў трывогах сваіх, ні ў бядзе:
Нас усіх непадзельная доля
Не пакіне самотных нідзе.

2. П. Глебка.



Інв. 1953 г. БА 11005
БССР Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна

Гэта пачуццё таварыскага локця, як і пачуццё светлай перспектывы, шырокай дарогі ў жыцці заўсёды прысутнічае ў ствараемых паэтам вобразах моладзі. Гэта пачуццё прывіта совецкай моладзі таварышам Сталіным і зусім слушна ў вершы «Прысяга»—яго вобраз з'яўляецца на падтрымку маладой калгасніцы-ўдарніцы, якая прышла ў сельсовет патрабаваць выканання ўмоў, пры якіх яна магла-б даць «дзве тысячы на трактар», і не спаткала патрэбнага разумення.

І заўвагай недарэчнай
Хтосьці крыўдна сэрца коле,
Што і Сталіна, бясспрэчна,
Ты не бачыла ніколі.
І тваіх вачэй крышталі
Пацямнелі пад навалай:
— У мяне—у сэрцы Сталін,
Я душою прысягала!
... Хто душою, чыстай светлай
Перад Сталіным клянецца —
Знойдзе сілы здзейсніць мэту
І прысягі не зрачэцца.

Звярніце ўвагу, з якім замілаваннем і з якой паэтычнай празрыстасцю і дасканаласцю пададзен П. Глебкам вобраз маладой трактарысткі:

У бярозавых прысадах
Ападае голле нізка.
Ты ідзеш вясновым садам
Маладая трактарыстка.
З лапушнога лісця росы
Асыпаеш поўнай жменяй.
Ручаём спадаюць косы,
Разліваюцца струменем.
Лёгкім крокам трактарысткі
Узыходзіш ты на ганак,
І адразу-ж прамяністы
Без цябе смутнее ранак.
У вачах, як вір глыбокіх,
Ты нясеш усю уцеху,
Нават ямачкі на шчоках
Поўны радаснага смеху.
Гэта радасць льецца лавай
У пакоі сельсовета.
І ўсміхаюцца ласкава
Вочы Сталіна з партрэта.

У гэтым малюнку, зробленым рукою сапраўднага майстра, такая прастата і ў той-жа час такая дасканаласць, што ён просіцца і на жывапіс, і на музыку, таксама як другі малюнак

багатай калгаснай восені—з адлётам журавоў над зжатай нівай і парай закаханых маладых людзей:

Ад ярыны трашчалі гумны,
Раслі высокія стагі,
І малатарні хорам шумным
Будзілі рэчак берагі.
Там на калгасных агародах
Багаты бралі ураджай,
Там за турботы нагарода
Лілася мёдам цераз край.
Там ціхія рачныя тоні
Гулі ад рыб, як вір круты,
Там спелі позьнія антоны,
Гарэлі сонцам залатым.
І, моўчкі, мы гарэлі самі
Вялікай радасцю зямлі,
І над шчаслівымі над намі
Аблокі вечнасці ішлі.

Параўнайце з гэтым малюнкам калгаснай заможнасці, выпісаным з сапраўды рэмбрандтаўскай рэчавасцю і майстэрствам, малюнак дарэвалюцыйнай вёскі ў вершы «Пачатак вясны», напісаны з такой-жа дасканаласцю:

Галодныя каровы гвалтам
Будзілі вусціш веснавы,
Ламалі дзверы на кавалкі
І ў поле йшлі шукаць травы.

Чародамі хадзілі дзеці
Бацькоў сваіх заўважыць след,
Што дзесьці там, на белым свеце,
Рупліва здабывалі хлеб.

Нарэшце скрозь дарогі сохлі,
Вярталіся бацькі дамоў,
Аглядвалі старыя сохі
Пад шэпты дзедаўскіх замоў.

І клянучы і так праклятый
Свой лес і чорны смутак дум,
На вузкія палосы з хаты
Вывозілі сваю бяду.

Параўнайце гэтыя два малюнкі, і вам зразумелым стане і ўзросшае майстэрства паэта ў адлюстраванні рэчаіснасці, і тыя вялікія змены, якія прынесла «дружная праца» «непакорнаму» совецкаму чалавеку пры новым калгасным жыцці, і тое, чаму паэт амаль заўсёды бярэ для партрэтнага вобраза моладзі такі светлы і багаты фон. Нагадаю вам верш «Экзотыка», дзе для разняволенай усходняй жанчыны ўзята фонам Чорнае

мора і Крымскія горы, або верш «Вясёлыя песні»—авеяныя лёгкім гумарам, дзе падаецца пасаг совецкай дзяўчыны: «заводы, шахты, домны і русая каса», а фонам вячэрняй прагулкі матроса і работніцы цагельні падаецца такі малюнак:

У гэты час, пад поўнач,
З усіх канцоў зямлі
Нагружаныя поўна
Прыходзяць караблі.

Чалавек—творца ўсіх багацця ў на зямлі, і жыццё яго стала светлым, шчаслівым і поўнакроўным, калі разняволеная праца зрабіла яго і гаспадаром гэтых багаццяў,—такі вывад робіць чытач паэзіі Пятра Глебкі, бачачы майстэрскае мастацкае адлюстраванне совецкай рэчаіснасці. Сабраныя ў адно месца вершы і паэмы П. Глебкі, прысвечаныя совецкай жанчыне і дзяўчыне (у тым ліку «Провады», «Ад шчырага сэрца», «Зімовы малюнак», «Вернасць», «Дзеўчына совецкае краіны», паэмы «Карменсіта» і «Эма»), маглі-б прынесці іх аўтару славу найбольш чыстага і лірычнага песняра новай долі совецкай жанчыны і светлага незаплямленага кахання.

Я цябе прымаю, быццам песню,
Што праходзіць праз маё жыццё:
Бурную, як ранняе прадвесне,
Ясную, як поначы касцёр.

У гэтыя словы ўклаў свае адносіны да совецкай жанчыны паэт-лірык. Паэт-эпік даў незабываемы партрэт сялянскай дзяўчыны Эмы, совецкае выхаванне якой зрабіла яе перадавой калгасніцай, для якой вырошчванне калгаснага багацця стала такім-жа блізкім і апаэтызаваным, як было для яе папярэдніц гатаванне пасагу. Спалучэнне асабістага шчасця і шчасця ўсяго грамадства—асноўная думка і асноўны тэзіс, які праходзіць праз усе творы аб совецкай дзяўчыне і жанчыне ў творчасці Глебкі.

Нельга абмінуць, кажучы аб вобразе жанчын у творчасці П. Глебкі, невялікі, але высокамастацкі верш пра жанчынурэволюцыянерку — «Умоўны знак». З якой гордасцю за права служыць свайму народу, за права быць у пярэдніх радах барацьбітоў за лепшую долю сваіх братоў і дзяцей яна адказвае паэту:

Між тысяч жывых і мёртвых —
Пытаеш,—пазнаць мяне як?
Запомні-ж, мой дружа, цвёрда
Наступны умоўны знак:

Калі перамогу зайграюць
Шырокія маршы жыцця—
Я першай стаяцьму ад краю,
Высока ўзнімаючы сцяг;
Калі-ж не ўтрымаюць рукі
І вырве яго ў мяне смерць —
Агнём на халодным бруку,
Як сцяг, будзе сэрца гарэць.

Вечна помніць пра святую кроў, пралітую за агульнанародную справу, і быць дастойным подзвігаў мучанікаў рэвалюцыі ў штодзённым жыцці і працы вучыць нас паэма «Кара» аб забітым польскай дэфензівай члене ЦК падпольнай комуністычнай партыі т. Рэдыка. Нават беглае параўнанне яе з паэмай папярэдніх год «У дарогу», якая магла-б па сутнасці служыць пралогам да «Кары»,—упэўніць чытача ў значна ўзрослым майстэрстве пісьменніка. У гэтай паэме даецца разгорнутая біяграфія рабочага, комуніста-падпольшчыка, да апошняй кроплі крыві адданага служэнню высокароднай мэце вызвалення працоўных ад гнёту капіталістаў. Вобраз Рэдыкі выпісан чотка, буйным планам. Высокі паэтычны накал і палітычная завостранасць паэмы ставяць яе ў рад лепшых паэм П. Глебкі. Варта напомніць тыя глыбока па-народнаму зробленыя папярэджанні і пажаданні, якімі праводзіць паэт Рэдыку ў яго адказную і цяжкую дарогу:

Прайдзі-ж над глыбокай магілай,
Як вецер—над строем прысад,
Як віхар праходзіць над морам,
Як птушкі ідуць над вадой,
Як рэкі абходзяць горы —
Міні свой смяротны дол!

Смерць бясстрашнага комуніста ёсць адначасна і яго бяссмерце: яго подзвіг рушыць у бой новыя тысячы байцоў, сілы якіх удзесяцярацца жаданнем пакараць катаў, што абарвалі гераічны шлях рэволюцыянера. Смерць, якая параджае новае жыццё, смерць, калі яна набліжае волю і шчасце мільёнаў,—не смерць, а бяссмертнасць. К гэтаму вываду прыводзіць паэт свайго чытача ў радзе сваіх паэм, у тым ліку ў «Кары», «Пра вясну і рэволюцыю», у драматычнай паэме «Над Бярозайракой». Мы не будзем разглядаць агульнавядомай паэмы П. Глебкі —«Ноч у вайсковых лагерах», хаця на аналізе яе можна было-б паказаць узрослае ўмельства паэта дасягнуць гармоніі ў сюжэце, найбольш правільна скарыстаць пейзаж для адлюстравання настрою дзейных асоб, узмацніць эмацыянальнасць напружанай драматычнасці таго ці іншага месца

знешне стрыманай формай апавядання, умельства надаць параўнанням рэчавую важкасць (праходзяць «чатыры палкі, як адна галава», або—цемра лягла «густая, як стоптаны жвір пад нагамі», або «гудуць капыты—далёка, як зоры, трывожна, як нервы»). Можна было-б давесці на вопыце гэтай паэмы, як і другіх вершаў П. Глебкі гэтага перыяда, далейшую дасканаласць рыфмы («вырас—выраз—вырыс») і скарыстанне радка як лозунга ў адпаведнасці з запаветам Маякоўскага: «Строку лозунгом взвей». Але ўсё гэта чытач сам знойдзе ў паэме. Хочацца звярнуць увагу чытача на ўменне Глебкі гаварыць сурова аб суровых рэчах. Прыкладам гэтага можа служыць паэма «Апошняя стрэча». Сюжэт гэтай паэмы, навеяны матэрыяламі партыйнай чысткі 1933 года, неаднаразова распрацоўваўся паэтамі, празаікамі і драматургамі Беларусі (у прыватнасці на ім пабудавана п'еса «Канец дружбы» К. Крапівы, апавяданне М. Лынькова «Шрам» і інш.). Але з усіх распрацовак гэтага сюжэта, тое, што зроблена Глебкам, вылучаецца іменна суровасцю мовы, гранічнай скупасцю фарбаў пры такім-жа гранічным па сіле эмацыянальнасці ўздзейнічанні на чытача. Напомню карціну начнога бою:

Нам быў загад наступаць на Казань,
А мы наступалі на цёмную ноч,
Бо мы не маглі ўжо вярнуцца назад,
Хоць нашы палкі адступілі даўно.
Над намі ірваліся горы гранат,
Пад намі зямля ракатала, як гром,
Накрыж агнём частаваў супарат,
Самым пякучым на свеце агнём.
Кругамі маланкі ішлі уваччу,
Кроўю пясок жвіраваты прамок,
І нехта зняверлівы першы пачуў,
Як наш кулямёт захліпнуўся і змоўк.
... Цемра на момант сплыла ў далячынь,
Бязмежнасць прасторы мяне абняла.
Я стаў з цэлым светам адзін-на-адзін,
Без кроплі жывога людскога цяпла.
... Я рукі тады палажыў на пясок —
І сілай зямною наліўся мой пульс,
І жвір вокамгненна навылет прасох,
Заціхлі пявучыя посвісты куль.

Як гэта нагадвае па сіле сваёй словы Маякоўскага:

«Но землю, с которой вместе мёрз,
Вовек забыть нельзя!»

Якім згусткам эмоцый напоена тут кожнае слова, і як далёка адышла карціна начнога бою ў «Трывожным сігнале».

І зусім па-інакшаму ўспрымуцца, здавалася-б, сухія і скупыя словы аб выніках бою:

Навобмацак ладзілі зрушаны шчыт,
На слых насцярожана бралі прыцэл.
Ён стужкі падносіў, я градам крышыў,
Аж пальцы папухлі на правай руцэ.

Нарэшце адолю зайграў кулямёт,
Залпам яе падхапілі стралкі,
І вораг, прабіты агнём навылёт,
Падаўся назад цераз ноч і пяскі.

Само сабой зразумела, што людзей, якія правялі разам гэтую баявую ноч, сяброўства «звязала на тысячы год». І ўсё-ж класавае змаганне паставіла іх у часы сапраўднага выпрабавання ўсіх якасцей чалавека на розных полюсах: аднаго пацягнула ўласніцкая стыхія, другі застаўся на тых-жа пазіцыях, якія ён абараняў кулямётам ад контррэвалюцыі. І аб асуджэнні апошнім свайго былога друга сурова расказвае паэт. Ён адчувае, што былы друг стаў носьбітам ідэй і спадзяванняў былых інтэрвентаў:

І я—непрыкметны работнік пяра,—
... Вышэй уздымаю мой меч —
Нянавісць і гнеў маіх слоў.
(Скажы мне, краіна...)

Затое якой цеплынёй прасякнуты шматлікія звароты паэта да байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі («Калыханка», «На варце», «Дазорны», «Песні аб граніцы», «Провады», «Палёт», «Пілоты», «Пісьмо брату» і інш.). У гэтых вершах паэт часта звярачваецца да скарыстання форм і вобразаў народнай творчасці.

Ходзяць зоры над краінай
А дарожанька бяжыць...
Выпраўляе маці сына
У чырвоны полк служыць:
— Будзь адважны і харобры,
Рэволюцыі салдат,
І з няславаю нядобрай
Не варочайся назад.—

І «запеў» верша, які становіцца рэфрэнам для зваротаў да чырвонаармейца яго маці, сясцёр і жонкі і для яго адказаў ім, і паралелі (ходзяць зоры над ярам, над полем, над залужжам, над нівай—у адпаведнасці са зместам адказаў), і ўласцівае народнай творчасці багацце параўнанняў і паўтораў, калі перадаецца дыялаг героя народнага эпаса з радам другіх людзей,—усё гэта выкарыстоўваецца паэтам,

падкрэслівае яшчэ раз тую ўсенародную ўвагу, пашану і любоў, якімі карыстаецца наша Чырвоная Армія—плоць ад плоці і кроў ад крыві совецкага народа.

У «Лісце брату» паэт, зрабіўшы экскурс у гісторыю сваёй краіны, аднавіўшы ў памяці свае і брата дзяцінства, разгортвае паказ таго, што дала працоўным совецкая ўлада і партыя, і заклікае цвёрда стаяць на варце нашых граніц, стаяць

За права змучаных аратых
На каласісты ураджай;
За наша права на багаты,
На сонечны, квяцісты край;

За права жыць і гаспадарыць,
Людзьмі назвацца між людзей,
За права на спакой пад старасць
І на вясёлы смех дзяцей.

А калі прыдзецца «у час вялікай абароны» і памерці ў баі, дык памерці,

Але жыццё аддай не дарам:
Памры, на прыступ ідучы,
Як паміраюць комунары,
Каб смерцю смерць перамагчы.

Можна было-б яшчэ шмат прывесці прыкладаў і лірычнага і эпічнага адлюстравання былых і будучых герояў абароны Совецкай Радзімы ў творчасці паэта: ад камандзіра дывізіі («Ноч у вайсковых лагерах») да пагранічніка, які, каб дагнаць дыверсанта, скідае кажух і боты і па гурбах і марозу ўсё-ж насцігае яго; ад маршала, пра якога спявае маці сыну ў «Калыханцы», да дапрызыўніка, які марыць аб тым, як ён будзе прадоўжваць баявыя традыцыі Чырвонай Арміі, служачы свайму народу. Можна было-б у пацверджанне думкі аб шырокім дыяпазоне паэта напомніць аб стварэнні ім самых рознастайных вобразаў совецкіх людзей—ад артысткі, якая пела «Кармэн», да вясковай дзяўчынкі Эмы, ад знатнай трактарысткі да гераіні партызанскай барацьбы 1918—1920 гадоў, ад калгаснага брыгадзіра да інжынера па асушцы балота. Але і сказанага досыць, каб прызнаць, што ў асобе П. Глебкі беларуская паэзія атрымала вельмі здольнага (і, дарэчы, вельмі працаздольнага) мастака, які ўзбагаціў яе жывымі і поўнакроўнымі вобразамі герояў нашага часу.

І ўсё-ж найбольшых поспехаў дабіўся П. Глебка ў стварэнні вобразаў вялікіх людзей нашай краіны, у тым ліку і ў першую чаргу вобразаў Леніна і Сталіна і іх бліжэйшых саратнікаў.

## III

*Хоць сцежка цяжкая надзіва —*
*Кірунку да мэты не зменім:*
*Гісторыя шлях прысудзіла,*
*А думкамі вызначыў Ленін.*
*Няхай перашкоды віюцца,*
*Ніколі ў шляхах не прыстанем:*
*Вядзе нас у глыб Рэвалюцыі*
*Дарогаю вернаю Сталін.*
(„Урачыстасць", 1931).

Правільна адлюстроўваючы настроі і думкі совецкага народа, П. Глебка поўна і сардэчна выражае вялікую любоў нашага народа к правадырам рэволюцыі, к тым, чыё імя было заўсёды звязана з барацьбой народа за лепшую будучыню, хто кіраваў вызваленнем, забяспечыў яго поспех, забяспечыў разгром варожых рэволюцыі сіл і павёў совецкія народы па шляху соцыялістычнай перабудовы жыцця.

Заўсёды прынцыповыя, нязломныя і непахісныя ў барацьбе з ворагамі народа і рэволюцыі, мудрыя правідцы будучага, найвялікшыя стратэгі і мудрэйшыя кіраўнікі адной з найвялікшых дзяржаў свету, першай пролетарскай дзяржавы — Ленін і Сталін былі заўсёды блізкімі і роднымі кожнаму звычайнаму простаму чалавеку, так як блізак самы лепшы друг, настаўнік і бацька. Асноўныя рысы, якія ўлоўлівае паэт пры стварэнні іх вобразаў,—гэта іх глыбокая чалавечнасць і ніколі не парываючаяся сувязь з народам, з масамі. Абедзве гэтыя якасці, глыбока ўласцівыя Леніну і Сталіну, зарадзіліся ў характары правадыроў рэволюцыі яшчэ ў тыя часы, калі яны толькі вышлі на поле рэволюцыйнай дзейнасці ў глухія часы царызма. Пра гэта расказвае чытачу П. Глебка ў двух частках трылогіі: у паэмах «У тыя дні» і «Мужнасць» і ў дзесятках вершаў.

Паэма «У тыя дні» расказвае ў храналагічным парадку аб падрыхтоўцы і правядзенні Вялікай Кастрычніцкай Рэволюцыі. Яна пачынаецца малюнкамі першай сусветнай вайны, калі бяздарны царскі ўрад відавочна праігрываў яе. Распачатая ў абарону інтарэсаў імперыялістычных драпежнікаў, яна несла працоўным масам знішчэнне, пакуты і поўнае разарэнне. Прадажніцтва царскага двара дапамагала ворагу заняць досыць значную тэрыторыю на захадзе Рускай імперыі, для Беларусі быў характэрным малюнак, які падае паэт у пачатку паэмы:

Па старых,
Зруйнаваных вайною гасцінцах
Цягнуць бежанцы бедны,
Убогі пажытак.
У падраных шынелях
Ідуць пехацінцы,
Кавалерыя топча
Высокае жыта.
Цішыня, цішыня!..
Нават гром кананады
Не развее тугі
З змярцвелага сэрца...

Для усіх было зразумелым, што царскі ўрад не здолен вывесці краіну з вайны, што ён падводзіць яе да краю бяздоннай прорвы. І думкі людзей зварачваюцца да тых, хто на працягу ўсяго свайго жыцця быў няўхільным ворагам самадзяржаўя:

Эх, каб сілы былі,
Ды каб дружна паўсталі!..
Толькі, мусіць, ніколі
Такога не будзе:
У Швейцарыі Ленін,
На катарзе Сталін,
У выгнанні, у турмах
Найлепшыя людзі.

Але і ў выгнанні і ў турмах сэрцы гэтых лепшых людзей з народам. Імі даецца лозунг—ператварыць імперыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую, павярнуць штыкі супроць тых, хто распачаў вайну, «Мір хацінам, вайна палацам». І пад націскам піцерскіх рабочых і паўстаўшых салдат—аковы царскай няволі збіты з рук народа.

Але новыя ладзяць
Народу кайданы:
У часовым урадзе —
Паны Мілюковы,
У Советах рабочых —
Прадажныя Даны.

Думка народа зноў зварачваецца да Леніна і Сталіна, да тых, якія на працягу ўсяго свайго жыцця змагаліся не толькі супроць цара, але і капіталістаў Мілюковых і іх агентуры ў рабочым класе—прадажных Данаў:

І Сталін з далёкай тайгі
Спяшае прыйсці ў Петраград.

І Ленін, якога «паланілі глухімі кратамі граніц», вырываецца з гэтых крат

Туды, туды...
Дзе супраць здрады

Мільёны рушаць у паход,
Дзе на крывавых барыкадах
Змагаецца яго народ.

З прыездам Леніна і Сталіна руская рэвалюцыя знайшла сваіх праваднроў, і паэт паказвае у незабываемых малюнках спатканне Леніна з народам і ў вагоне і на Фінляндскім вакзале. Пасля пачалася напружаная работа па мабілізацыі мас для атакі на цвярдыню капіталізма, калі

Леніна слова —
Мільёны збірала,
Сталіна слова —
На бітвы вяло.

Паэт стараецца паказаць гэты працэс усебакова,—і праз дэлегатаў, якіх выбіраў кожны павет і пасылаў у Піцер з цвёрдым наказам:

Выслухаць Леніна
Думкі-парады,
Вырашыць з Сталіным
Тысячы спраў.

і праз паказ уздзейнічання палымяных слоў Леніна на масы, і праз актывізацыю саміх мас. Асабліва дасканала апрацаваны сёмы і восьмы раздзелы паэмы, у якіх прыведзен вядомы ўсім эпізод, калі Ленін ад імя большэвіцкай партыі заявіў, што «Ёсць такая партыя», якая можа адна ўзяць уладу ў свае рукі і выратаваць Расію. У гэтых раздзелах у мастацкі дасканалай форме паказаны тыя палітычныя сілы, якія змагаліся за ўладу паміж лютаўскай і Кастрычніцкай рэволюцыяй: і прадстаўнікі буржуазіі, якія «саймуюцца, як уладу выкрасці», і меншавікі з эсэрамі, якія «тэатральнымі трагікамі» курчыліся на трыбунах, захліпаліся «тонкімі руладамі» словаблудства, каб угаварыць народ пакорна ісці ў запражцы капітала:

Над крыклівай помпаю
Трагікаў і эпікаў
Выбухае бомбаю
Ленінская рэпліка:
— Ёсць такая партыя!.. —
... А ён, вялікі і магутны,
І радасны, як светлы дзень,
Паходкай лёгкай і нячутнай
Ужо ў прэзідыум ідзе,

каб канчаткова выкрыць «чорныя справы» і махінацыі «міністраў-капіталістаў» і патрабаваць улады для працоўных мас, патрабаваць перадачы ўлады Советам.

Далей паэт паказвае згуртаванне мас пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна і адчайную барацьбу буржуазіі за тое, каб утрымацца ва ўладзе: і чэрвеньскі наступ на фронце, каб цаною тысяч салдацкіх жыццяў «паменшыць лік большэвікоў», і расстрэл дэманстрацый, і разгром рэдакцый большэвіцкіх газет, і самую раз'юшаную ману і паклёп на Леніна.

Разбіты рэдакцыі
Нашых газет,
Палацы Кшасінскай
Займаюць казакі.
— На катаргу Леніна!—
Хрыпне кадзет,
І кожную сцежку
Віжуюць сабакі.
У ноч, у падполле
Ідзе правадыр,
У бедных хацінах
Шукае прыстанку.
І нюхаюць доўга
На бруку сляды
Халодныя ноздры
Сабак і ахранкі.

Але ўсе гэтыя мерапрыемствы спрыялі толькі паскарэнню палярызацыі сіл. І паэт зусім слушна ў наступным раздзеле паказвае як—

Сваёй камедыі сыграўшы ролі,
Міністры сталі ў строй гарадавых.

А з другога боку —

І сёлы разгінаюць стан пахілы,
Становяцца ў шарэнгу гарады,
І кожны дзень дужэюць нашы сілы,
Шырэюць большэвіцкія рады.

Паэт кляйміць чорную здраду рыкавых, якія паспрабавалі выдаць Леніна на суд азвярэлай банды капіталістаў.

Не, здраднікі і гандляры! Не выйдзе:
Ад вашых рук і ненавісці злой —
Дзержынскі і Серго Орджанікідзе
Яго заслоняць радасна сабой.
На варце Леніна мільёны сталі,
Запаленыя гнеўным пачуццём,
І першы ленінец—таварыш Сталін
Аддасць за Леніна сваё жыццё.
Яго дарогамі, яго шляхамі
Ён павядзе на бой рабочы клас,
Ён — ленінская мудрасць паміж намі,
Ён—ленінская воля сярод нас.

І паэт разгортвае паказ дзейнасці Леніна і Сталіна па непасрэднай падрыхтоўцы ўзброенага паўстання і па кіраўніцтву самім паўстаннем. Ён падае малюнак штаба паўстання ў Смольным з Леніным і Сталіным на чале. Ён адлюстроўвае і напружаную цішыню, калі «хвіліны ідуць, быццам тысячы дзён», і ўпэўненыя загады Сталіна, і хвалюючае аблягчэнне пры развязцы.

Зноў ударыў з гармат
Браніраваны крэйсер,
Дробным шротам пасыпаўся
Белы карніз.
І міністры з высокіх
Наседжаных крэсел —
Недаступных вышынь —
Апаўзаюць наніз.

Паэма канчаецца паказам радасці перамогі і ўслаўленнем «байцоў суровай бітвы», якія паклалі падмурак новага жыцця, новага грамадскага ладу.

У гэтай паэме, больш як у якім-небудзь іншым творы П. Глебкі, сказалася творчая вучоба паэта ў В. В. Маякоўскага. Яна выяўляецца ў акрэсленасці палітычнай лініі і палітычнай завостранасці кожнай часткі, кожнага кампанента паэмы. Досыць успомніць тыя мясціны, дзе падаюцца ворагі рэвалюцыі: бытавым зніжэннем матэрыялу, трапнай іроніяй, якая часамі даходзіць да сарказма, часамі зніжаецца да шаржа, да палітычнай карыкатуры, паэт паказвае нікчэмнае хаця і звярынае нутро абаронцаў капіталістычнага ладу. Гэта зніжэнне вобразаў ворагаў яшчэ больш падкрэслівае гіганцкую веліч вобразаў правадыроў рэвалюцыі, маштабы іх ідэй, іх розуму, іх учынкаў, бо, зніжаючы вобраз ворага, паэт ніколі не зніжае тых цяжкасцей, якія прыходзіцца пераадолець. І ў тым і ў другім выпадку паэт шукае і знаходзіць найбольш яркія, свежыя і найбольш нечаканыя рытмы, словы, рыфмы, вобразы, якія з найбольшай паўнатой, пры найбольшай сціслasці, выяўлялі-б сутнасць характарыстык людзей і падзей. «Мірненькі марш ад прастола цара да міністэрскага крэсла», як выяўленне жаданняў Керэнскага і кампаніі ўкласці народную рэвалюцыю ў рамкі змены кабінета, «недасяжныя вышыні» міністэрскіх крэслаў, як выяўленне высокай думкі аб сабе эсэраўскіх і меншавіцкіх міністраў, якія аднак «апаўзаюць наніз» пры першых стрэлах «Аўроры», «халодныя ноздры сабак і ахранкі», якія віжуюць за Леніным, асыпанне штукатуркі карніза, як паралель «апаўзаючым наніз» міністрам, міністры, якія «сыграўшы сваю ролю» ў камедыі, становяцца ў строй

царскіх гарадавых, і шмат іншых трапных дэталей бясспрэчна кажуць пра тое, што вучоба ў Маякоўскага прынесла свой багаты плён для Глебкі. Пра гэта-ж кажуць прыпаднятыя аратарскія адступленні, якія дыктуюцца перапоўнішым сэрца настроем—у адным месцы захаплення, у другім месцы абурэння і пагарды—і якія арганічна выцякаюць з гістарычна правільнага, але далёка не бесстаронняга паказу ходу падзей, надаюць гэтаму паказу накал страсці, паскорваюць іх тэмпы і напружанасць. Вера ў сілы народа, уменне знайсці асноўнае звяно, якое дае магчымасць выцягнуць увесь ланцуг пры даных гістарычных умовах, уменне пераадолець перашкоды і атакаваць іх з яшчэ большай сілай, уменне злучаць вакол сябе сілы народа — гэтыя якасці Леніна і Сталіна знайшлі ў паэме патрэбнае адлюстраванне. Ленін і Сталін, як два генія пралетарскай рэвалюцыі, як найбольш блізкія сябры ў агульным змаганні — праходзяць праз усю паэму.

Усе гэтыя думкі і пачуцці, толькі пададзеныя з яшчэ большай сілай і паэтычным узлётам, з яшчэ большай эмацыянальнасцю пранізваюць і другую паэму П. Глебкі—«Мужнасць». Напісана яна к дзесяцігоддзю з дня смерці В. І. Леніна і прысвечана агульнавядомай клятве т. Сталіна выканаць заветы Владзіміра Ільіча.

Самы пачатак паэмы,—зварот паэта да мужнасці класа,—надае ўсяму твору высокае гучанне, уздымаецца да класічных па сваёй велічы народных абагульненняў:

Падымі мяне,
Мужнасць класа,
Над галовамі паўшых ніц,
Праўдзі над імклівым часам,
Над палётам планет і зарніц!
Дай звычайнаму слову дужасць,
Каб шумела яно,
Як пажар!

І паэт вытрымлівае гэты велічны тон на працягу ўсяго твора, бо ён падказан паэту сапраўды ўсемагутным усенародным пачуццём. Спачатку гэта пачуццё найвялікшай страты «чалавека, што прайшоў непаўторны шлях», які «паўстаў над светам, як жывы і грозны агнявы штандар». І паэт знаходзіць словы і вобразы, каб перадаць гэта ўсенароднае гора, ад якога ў жылах «ледзянее кроў».

Гэта ногі ад гора прысталі,
Гэта рукі спавіты тугой,
Гэта плача таварыш Сталін,
Нахіліўшыся над труной.

Мільённыя масы прышлі развітацца з самым любімым чалавекам на свеце.

І ніколі не знойдзеш ні ў якіх
Летапісных аналах пяра,
Каб народ гэтак горка плакаў
Над магілаю правадыра.
Нашы сэрцы наўзрыд галасілі,
Нашы вочы заслала імгла...
Чалавечага плачу сіла
Горы змыць векавыя магла.

Нарэшце гэта гора дасягае свайго апагея ў часе пахавання Владзіміра Ільіча. І голас паэта сапраўды ўздымаецца над часам і палётам планет, каб стварыць незабываемы літаратурны помнік гэтай трагічнай, жалобнай хвіліне расставання з правадыром.

І вось наступіла часіна,
Адна з найцяжэйшых часін,
І сэрца бязмежнай краіны
Замерла на пяць хвілін.
У роспачы сціснуўшы зубы,
Мы чулі
Як стогнуць гудкі,
Як горна рыдаюць трубы,
Як ціха стаяць палкі,
Як страшна равуць сірэны,
Як віхрам імчыцца зямля,
Як стынуць нямыя сцены,
Высокія сцены Крэмля,
Як гулка цяжкія гарматы
Апошні салют аддаюць,
Як плача над страшнай утратай
Совецкіх Рэспублік Саюз.

Але большэвікі таму і з'яўляюцца вучнямі і выхаванцамі Леніна, паслядоўнікамі яго вялікіх спраў, што няма на свеце такіх падзей, такога гора, якое прымусіла-б іх апусціць рукі. Таму:

Над снягамі, над горам, над жалем,
Над законамі смерці й жыцця
Паднімаецца ленінец Сталін,
Узнімаючы Ленінскі сцяг.

Паэту не толькі ўдалося найбольш блізка к тэксту ўкласці ў верш вялікія словы сталінскай прысягі, але і на высокім паэтычным узроўні ў другой частцы паэмы паказаць, як здзейснілася клятва правадыра. Пафас творчай працы, гордасць за магутнасць совецкага народа напаўняе гэтыя радкі паэмы і асобныя мясціны яе зроблены з гранічнай дасканаласцю. Напомнім хаця-б такія радкі:

Ад нацдэмаўскіх збродных шаек,
Ад прадажных служак Рамзіна
Выпаўзала, ішла глухая,
Наступала на нас вайна.
Кожны хутар, абнесены садам,
Па дарозе да нашых мэт —
Гэта дваццаць чатыры засады
На адзін усяго кілометр.

Або:

Па калгасных палях
(Аж рэха
Векавыя калыша бары)
Ходзяць нашы найлепшыя шэфы —
Сталінградскія трактары.
За іх следам шуміць пшаніца,
Канюшына шалее, аўсы,
Аж на дол прыпадаюць ніцма
Пад цяжарам зярна каласы.

Паэту ўдалося ў мастацкіх вобразах паказаць, якой магутнай сілай сталі перадавыя ідэі Леніна—Сталіна, ідэі комунізма, калі яны зрабіліся здабыткам мільённых мас. Паэт рузумее, што асноўнай умовай гэтых дасягненняў стала для совецкага народа — ленінскае кіраўніцтва нашай краінай таварышам Сталіным:

І мы ніколі не прыстанем
Ні ў цяжкай працы,
Ні ў хадзе,
Бо з намі наш любімы Сталін,
Бо з намі партыя ідзе.
Бо чуем кожнае імгненне
І кожнай кропляю крыві —
Вялікі і магутны Ленін
Сярод жывых
Ідзе жывы.

У сваіх шматлікіх вершах П. Глебка неаднаразова зварачваецца да вобраза Леніна і Сталіна. Так у вершы «Помнік», 1938 года, паэт, аглядаючы дасягненні Совецкага Саюза, піша:

Ажываюць заводы і домны,
Гоман поўніць прасторы дарог...
І выраствае Леніну помнік
У легенду людскіх перамог.
...Дружнай сілай сялян і рабочых
Будаваў гэты помнік жывы
Самы смелы ў гісторыі зодчы,
Самы мудры ў вяках большэвік.

Мы ўпаміналі ўжо верш «Прысяга», калі ўдарніца-трактарыстка прысягае ў сэрцы Сталіну, што яна дабецца рэкорднай

выпрацоўкі на трактар. П. Глебка ўкладае ў цудоўныя радкі вось гэтую блізасць правадыра да кожнага працоўнага:

І ўсміхаюцца ласкава
Вочы Сталіна з партрэта.
Зараз ён устане, здэцца,
Дапаможа і навучыць.

І «Песня фізкультурнікаў», і «Песні пагранічніка», і «Навагодні тост», і «Ліст брату» адлюстроўваюць у сабе любоў народа да правадыра. Верш «Родным братам», вызваленым ад панска-польскага палону, заходнім беларусам, канчаецца заклікам:

Кроч у новыя, светлыя далі,
Разарваўшы прымусу ланцуг!
За цябе непакоіцца Сталін —
Усіх прыгнечаных бацька і друг.

Бацькоўскія клопаты тав. Сталіна аб беларускім народзе і бязмежная ўдзячнасць і любоў беларускага народа да т. Сталіна неаднаразова натхнялі паэта на высокамастацкія творы, сярод якіх адзін з лепшых—«Песня славы», дзе ёсць такія цудоўныя радкі:

Гэта ты упартай воляй
На прастор і шыр
Вывеў нас з былой няволі,
Мудры правадыр.
... Гэта ты рукою дужай
Даў народам мір,
Нас навек з'еднаўшы дружбай,
Мудры правадыр.

Іменна глыбокія пачуцці беларускага народа выражае паэт, калі ў вершы «Снежаньскі вечар», паказваючы, як рыхтуюцца працоўныя слухаць выступленне тав. Сталіна, усклікае:

Сэрца-ж маё! будзь вялікім, як мора,
Радасць і шчасце людское змясці.
Чуеш, ідзе над шырокім прасторам
Самая светлая хваля ў жыцці.
Дрэвы маўкліва на варце пасталі,
Сціх нават гоман і шум баравы...
З намі гаворыць любімы наш Сталін —
Ленінскі голас мы чуем з Масквы.

Беларускі народ будзе вечна ўдзячны таварышу Сталіну, як свайму лепшаму другу і клапатліваму бацьку, бо ўсё тое, што ён бачыў добрае ў жыцці, звязана з імем таварыша Сталіна. Ён стаяў ля калыскі яго дзяржаўнасці, ён кіраваў яго абаронай ад ворагаў. Ён пасылаў сюды сваіх саратнікаў у небяспеч-

ныя для нашага народа часы. Аб адным з гэтых саратнікаў—Серго Орджанікідзе і яго баявой рабоце ў часы абароны нашай радзімы ад белапольскай навалы расказвае П. Глебка ў сваёй драматычнай паэме «Над Бярозай-ракой». Разгляд гэтай паэмы значна павялічыў-бы памер уступнага артыкула, таму мы абмяжуемся толькі ўпамінаннем таго, што адным з дасягненняў паэта ў ёй з'яўляецца любоўна напісаны вобраз Серго Орджанікідзе. Мяккі і глыбока чалавечны ў дачыненні сялян і чырвонаармейцаў, здольны ў хвіліну адпачынку ад бою пазабаўляць дзіця, а ў цяжкую хвіліну гора сялянкі, як сын, падтрымаць яе сілы, ён у той-жа час валявы камандзір у баі, смелы разведчык, які не пабаяўся сам пайсці ў тыл ворага, мудры стратэг і большэвік сталінскай вывучкі. Стварэнне гэтага вобраза—буйнае дасягненне совецкай паэзіі.

Так выглядае творчасць Пятра Глебкі на другім яе этапе, г. зн. да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

## IV

*А што-ж, калі-б цяпер, як кнігу,*
*Раскрыла ты маю душу?*
*У ёй запісана ў паходах*
*Крывёй дасведчання майго*
*І гора нашага народа,*
*І веліч мужнасці яго.*

(Пра кнігі.).

У час Вялікай Айчыннай вайны П. Глебка са зброяй у руках абараняў сваю радзіму ў радах Чырвонай Арміі ад нямецка-фашысцкай навалы. І гэтай-жа мэце ён падначаліў сваё мастацкае слова. У вершах яго адбіліся ўсе тры долі, якія спаткалі тых, з якімі ён правёў сваё свядомае жыццё, для якіх ён пісаў, гераічнай працай якіх захапляўся: і доля тых, што, як і сам паэт, паспелі ўзяцца за зброю і, сцякаючы крывёй у шматлікіх баях, вымушаны былі з вялікай тугой і гарачу адыходзіць на ўсход, каб потым зноў рынуцца на ворага і разбіць яго; і доля тых, якія былі знянацку захоплены вайной і, не паспеўшы адыйсці, трапілі ў жудасную нямецкую няволю; і доля тых, якія ў тылу ворага ўзнялі ўсенародную партызанскую барацьбу супроць крывавых захопнікаў. Але і ў самую жудасную пару адступлення і ў самыя цяжкія часы акупацыі ўсіх іх аб'ядноўвала і падтрымлівала іх сілы адна думка, якую выказаў паэт у вершы «Мы вернемся» ў 1941 годзе.

Услаўшы да розных аселішчаў шлях
Касцямі варожых салдат,
Па трупах, па жылах, па гэтых касцях
— Мы вернемся скора,
Мы прыдзем назад!

Усю страсную любоў да радзімы пераплаўляў паэт у нянавісць да яе ворагаў і гэткую-ж нянавісць будзіў ён у сэрцы сваіх чытачоў. Ён падае ніколі не забываемыя малюнкі дарог адыходу бежанцаў, тых дарог, з якіх кулямёты фашысцкіх сцярвятнікаў «змяталі людзей і пыл», бомбамі трушчылі дзіцячыя каляскі і забівалі мірнае насельніцтва, ён падае жудасныя малюнкі разбурэння і знішчэння дваццацігадовай упартай працы совецкіх людзей і заклікае да помсты («Галасы дарог», 1941 г.). Паэт разумее, што гэта вайна такая, якой яшчэ не было дагэтуль у гісторыі войн, і заклікае «захоўваць свой цвёрды дух» у любых выпрабаваннях вайны і на нагласць аматараў «маланкава хуткай» вайны адказваць такой упартасцю, якую праявілі байцы адной часці Чырвонай Арміі, якія чацверты дзень адбівалі «па сем атак на дню»:

Два разы танкі іх прайшлі,
Засыпалі зямлёй.
Яны ўзняліся з-пад зямлі
І рушаць зноў у бой.
Жалезам волі не зламаць!
Яны адступяць з агнявых,
Калі не будзе больш відаць
За трупамі жывых.

У тым-жа 1941 годзе ён піша некалькі вершаў, якія заклікаюць разгарнуць—у выкананне зварота тав. Сталіна да насельніцтва часова акупіраваных ворагам совецкіх раёнаў—усенародную партызанскую вайну («Песня партызан», «Калгасны вартаўнік», «Жніво», «Героі», «Да моладзі»). Ён зварочваецца да моладзі:

Няўжо-ж вы схіліце калені,
Сябры геройскіх, мужных спраў,
Каторым даў свабоду Ленін,
Каторым Сталін шчасце даў?
О, не! На ўзгорках і між долаў
Магутны чую ваш адказ:
— Не схіліць той пакорна голаў,
Хто волю зведаў хоць-бы раз!
Паўстань-жа, моладзь Беларусі,
Сыны рабочых і сялян,
Супроць няволі і прымусу
Гуртуй атрады партызан!

Выяўляючы цвёрдую ўпэўненасць у перамозе, якая ні на адну хвіліну не пакідала совецкіх людзей, паэт піша адзін с сваіх лепшых вершаў пачатку вайны—«Правадыр», у якім яшчэ раз падкрэслівае адзінства совецкага народа з сваім правадыром і палкаводцам таварышом Сталіным.

Мы духам—нязломныя, воляй—упартыя,
Бо ведае кожны баец, камандзір,
Што з намі вялікая мудрая партыя,
Што з намі, наперадзе нас—правадыр.

Тэма радзімы заўсёды была арганічнай для паэзіі П. Глебкі. У часе вайны, абвостраная прымусовым адрывам паэта ад родных месц і небывалымі ў гісторыі пакутамі народа, яна стала дамініруючай, а па сіле пачуцця і па дасканаласці майстэрства—рэалізаванай у самых лепшых вершах гэтага перыяда. І хмарка, якая пазбірала расу з роднай зямлі і дагнала байцоў за Валдаем:

Грукнула мне ў сэрца,
Як у тыя шыбы
Ціхае хаціны
З вокнамі у сад:
— Дзе-ж тваё прыстанішча?
Дзе твая сяліба?
Што-ж ты не вяртаешся
Цэлы год назад?

І ліст, які, «ападаючы, шасне над вухам»,—нагадвае паэту глухі, разгойданы вайной шум Белавежскай пушчы, і арабіна на пажарышчы «перад расхістаным ветрам акном»—напамінае аб чырвоных сцягах і прысязе «жыць і памерці за родны свой край». Паэт мысленным вокам акідае прасторы радзімы, калі застаецца на адзіноце, і перад яго вачыма ўстаюць жудасныя малюнкі:

На полі—ноч. На сэрцы—ноч.
Ноч над усім забраным краем.
І людзі падаюць насторч,
І дрэвы стогнуць:—Паміраем

Прывіды шыбеніц, начныя аблавы гестапа, угон совецкіх дзяўчат на нямецкую катаргу, тое, што на месцы былых шумных гарадоў—

Ды пуста скрозь. І вецер свішча,
І ў небе стынуць каміны,
І на шырокіх папялішчах
Начуюць совы й груганы.
Пустыя, выбітыя вокны
Палошчуць спорныя дажджы,

ўсё гэта стаіць перад яго вачамі, і паэт ўскліквае: «Ты ці не ты гэта, наша краіна?» Тады яго, як і мільёны выгнаных з сваіх родных сёл і гарадоў,—

Тым болей прагна кліча кроў:
Упэўненым, шырокім крокам
Прайсціся каля тых муроў;
Прыпасці вуснамі і піць-бы,
Пакуль дазволяць берагі,
Блакітныя струмені Віцьбы
З адценнем чорным ад тугі.

Прывід радзімы-паланянкі яшчэ больш падкрэсліваецца ўспамінамі аб светлых днях жыцця на радзіме, малюнкамі бацькаўскай зямлі, якія «нічым вас з памяці не сцерці». І тады абуджаецца найвялікшая прага бою, найвялікшае жаданне хутчэй вызваліць працоўных Беларусі з лап фашысцкага звера, адпомсціць ворагу за здзекі. З вуснаў паэта вырываюцца заклікі да гэтага астатняга бою.

Загартоўвай цвёрда зброю,
А не мірныя дарогі,
Выйдзі з першаю зарою
На зарослыя аблогі.
Уздымай іх не сахою,
А гарматнымі плугамі,
Заспявай не збажыною,
А нямецкімі касцямі.

Паэт любоўна адлюстроўвае вобразы тых, хто ўзняўся на гэтае ўсенароднае змаганне: і старога вартаўніка калгаснай заможнасці, якога адзін від папялішча таго, што ён так дбайна ахоўваў, прыводзіць у партызанскі атрад, і пасланца ад ЦК, які праз мяцелі і віхуры даносіць у безлічныя партызанскія атрады Беларусі загад баявы, і саміх партызан:

Гэта нашы суседзі:
З тым сумесна жылі,
З гэтым, помніцца, недзе
Нават чарку пілі...
Дзед — таксама знаёмы,
Можа, нават, радня —
Клапатліва, як дома,
Запрагае каня.
Хлопцы з першае роты,
З кім дружыў я і рос,
Два ручных кулямёты
Ставяць дзеду на воз.
Пажылыя мужчыны,
Угінаючы дол,
Носяць палкія міны,

Грузяць ярасны тол.
Маладая кабета
Правярае курок.
А наводдаль падлетак,
Селавы пастушок,
Пагарджаючы боязь,
Як бывалы салдат,
Затыкае за пояс
Пяць гарачых гранат.

Паэт паказвае ўсенароднае падтрыманне партызан. Асабліва цёпла напісаны верш «Райком», аб падпольным райкоме партыі, які кіруе партызанскай барацьбой у сваім раёне.

Ён там—у пушчах і лясах,
Паблізу ад палянкі,
І людзі добра знаюць шлях
Да патайной зямлянкі.

З вялікім замілаваннем расказвае паэт аб тых партызанах, якія, ажыццяўляючы жывую сувязь з Масквой, прыязджалі туды і з якімі паэту даводзілася бачыцца («Дзяўчыне з Клімавіч», «Родны хлеб»). У гэтых вершах тэма радзімы знаходзіць сваё глыбока-паэтычнае ўвасабленне. Напомнім заключныя строфы з верша «Родны хлеб», у якіх перадаюцца пачуцці байцоў-беларусаў, якім прынеслі партызанскія пасланцы скарынку хлеба з партызанскага лесу.

І — божа мой!—якім духмяным
Павее водарам яна!
Адразу кожны стане п'яны,
Але не з горкага віна.
Ён будзе п'яны з успамінаў
Аб нашай роднай старане,
Аб той калысцы і краіне,
Дзе маці песціла мяне,
Дзе кожны вечар ля зямлянкі
Сумуюць нашы землякі,
Дзе маладыя партызанкі
Пякуць і сушаць праснакі.

Спатканне з прадстаўнікамі гераічных партызанскіх атрадаў, з гэтымі жывымі сведкамі велізарнейшага, класічнага партызанскага руху на Беларусі, усяляла ў сэрца паэта яшчэ большую ўпэўненасць у перамозе:

І я ведаю і цвёрда верую,
Што народ мой выйдзе з нематы.
Апранутая ў ватоўку шэрую,
Гэту веру мне прынесла ты.

Так кажа паэт дзяўчыне з Клімавіч. У другім вершы «Наша слава», прысвечаным героям Савецкага Саюза, сынам беларускага народа, паэт у іх гераічных учынках бачыць новую крыніцу веры ў сілу народа. Смалячкоў, Палаўчэня, Даватар, Сільніцкі, Заслонаў і тысячы герояў усіх нацыянальнасцей Савецкага Саюза не шкадавалі свайго жыцця, каб забяспечыць перамогу Савецкага Саюза, каб нанесці як мага большы ўрон драпежнаму ворагу. У гэтым адзінстве гераічных намаганняў вялікай сталінскай сям'і народаў СССР бачыў паэт вытокі надыходзячай перамогі, вытокі нашай сілы, і гэта знаходзіла свой адбітак і ў такім лірычным вершы, як «Пасылка»—аб падарунку «беларускаму герою ад сяброўкі і сястры» невядомай яму грузінкі («Каб ты ведаў, што і ў горы ты на свеце не адзін»)—і ў адным з лепшых вершаў «Смерць салдата», які без жальбы аддае сваё жыццё за тое, каб красаваўся шчасна і вечна савецкі край, і ў вершы «Беларусі», у якім паэт, вітаючы байцоў Чырвонай Арміі, якія ўступілі ў 1943 годзе на беларускую зямлю, просіць Беларусь:

За нас усіх падзякі словы
Скажы заступнікам тваім,
Асеннім золатам дубровы
Азалаці дарогі ім.
Прытулак дай пад родным небам,
Ад зла лясамі ахіні,
І пачастуй іх нашым хлебам,
І ласкай сэрца іх крані.

Гэта тэма завяршаецца вершам «Пад небам бацькаўшчыны», які даў назву усяму зборніку выбраных твораў і ў якім ёсць такія ключавыя радкі:

Але і ў горкі час выгнання,
Дзе ні ступалі па зямлі,
Мы не былі без спачування
І на чужыне не жылі.
Бо хоць брылі з цяжкой паклажай,
Усё-ж ішлі мы дзень пры дні
Пад небам бацькаўшчыны нашай,
Між таварыствам і радні.

Іменна наша агульная бацькаўшчына, вялікі Савецкі Саюз, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна вывела беларускі народ з царскай няволі, узняла яго на высокую ступень дабрабыту і культуры, змагалася за яго з нямецка-фашысцкімі бандамі, падтрымлівала ў часе часовай акупацыі—і маральна і матэрыяльна—і нарэшце разбіла самага злейшага ворага беларускага народа, яго спрадвечнага ворага—немцаў, і да-

памагла ачысціць беларускую зямлю ад тых, хто збіраўся знішчыць беларускі народ і забраць яго зямлю сабе. Імення пад небам гэтай нашай агульнай бацькаўшчыны, пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі толькі і магла расцвісці беларуская культура, нацыянальная па форме і социялістычная па зместу, з'яўляючыся ўкладам у развіццё ўсесаюзнай культуры. Імення пад небам нашай агульнай бацькаўшчыны магчыма стала і такое хуткае залечванне ран, нанесеных вайной, пра якое кажуць першыя «мірныя» вершы гэтага зборніка: «Зварот», «Новы дом» і інш. Гэтую магчымасць дала нам агульная перамога над ворагам.

У мужнай веры Ленінграда,
У грозных бітвах за Маскву,
У першых залпах Сталінграда
Яна паўстала наяву.
Яе мы працаю кавалі
На прадпрыемствах і палях,
Яе мы кроўю здабывалі
У самых жудасных баях.

Услаўленне гэтай перамогі і ёсць асноўная тэма апошняга раздзела зборніка выбраных твораў П. Глебкі.

Такім чынам перад чытачом ляжыць зборнік лепшых твораў аднаго з таленавітых беларускіх паэтаў, паэта шчырага і арыгінальнага, які вельмі ўдумліва адносіцца да сваёй творчай працы і патрабавальны да яе. Сваімі ідэямі, думкамі, настроямі яго паэзія сугучна думкам і настроям шырокіх працоўных мас нашай радзімы і ў гэтым яе асноўная каштоўнасць. Ленін вучыў: «Мастацтва належыць народу, яно павінна ўходзіць сваімі найглыбейшымі карэннямі ў самую тоўшчу шырокіх працоўных мас. Яно павінна быць зразумела гэтым масам і любіма. Яно павінна аб'ядноўваць пачуцці, думку і волю гэтых мас, паднімаць іх. Яно павінна прабуджаць у іх мастакоў і развіваць». У нейкай меры, як частка мастацтва Совецкай Беларусі, гэтаму адпавядае і паэтычная творчасць Пятра Глебкі, і мы думаем, што прапануемы ўвазе чытача зборнік выбраных твораў будзе карысным шырокаму колу чытачоў і з'явіцца для іх добрым падарункам да 30-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі.

*М. Клімковіч*

# ПАД НЕБАМ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

## АД АЎТАРА

У гэтай кнізе сабраны найбольш характэрныя творы, напісаныя мною на працягу дваццаці гадоў. Не ўсе яны роўныя па сваёй актуальнасці і мастацкай каштоўнасці. Я палічыў патрэбным змясціць тут і менш вартыя з іх дзеля таго, каб даць чытачу поўнае ўяўленне аб маёй творчасці. З гэтых меркаванняў я не мяняў у творах нічога, што магло-б перайначыць іх змест ці думку. Я ўнёс толькі сям-там стылістычныя папраўкі і ў першую чаргу тады, калі гэтага вымагаў сучасны правапіс.

Кніга разбіта на некалькі раздзелаў, адпаведна тым перыядам, якія, мне здаецца, можна вызначыць у маёй літаратурнай біяграфіі.

Першы раздзел абдымае 1925—1930 гады. Ён пачынаецца першымі маімі літаратурнымі спробамі і завяршаецца творамі, напісанымі пад час «вялікага пералому».

У другім раздзеле (1931—1935 гг.) змешчаны вершы і паэмы, створаныя ў бурныя гады разгорнутага соцыялістычнага будаўніцтва і ўсталявання калгаснага ладу.

У трэцім раздзеле (1936—1940 гг.) — вершы аб заможным і шчаслівым жыцці нашай краіны пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

У чацвертым раздзеле (1941—1945 гг.) змешчаны амаль усе мае вершы, напісаныя ў час Вялікай Айчыннай вайны.

У рамках кожнага з гэтых чатырох раздзелаў вершы падаюцца ў храналагічным парадку; больш разгорнутыя рэчы, як цыклы вершаў і паэмы, выносяцца ў канец адпаведнага раздзела.

Паэмы «У тыя дні» (1937 г.) і «Мужнасць» (1934 г.), якія з'яўляюцца першай і трэцяй часткай задуманай мною трылогіі «Сцяг перамогі» і напісаны ў розныя перыяды маёй творчасці, складаюць пяты раздзел кнігі.

Нарэшце, шостым асобным раздзелам кнігі ідзе драматычная паэма «Над Бярозай-ракой», як рэч зусім адменная ад іншых паводле свайго жанра.

*ПЯТРО ГЛЕБКА.*

15 лістапада 1945 г.

## *1925—1930*

## ЖАДАННЕ

Быльняговыя межы агорклі, —
Радасць новая ў сэрцы цяпер:
Я хачу, каб пяскі і узгоркі
Не сціскалі, краіна, цябе.

Я хачу, каб балоты і багны,
Быццам радасць у цвецені ліп,
Снегавою раўнінаю прагна
Без загонаў і межаў ляглі.

Быльняговыя межы агорклі, —
Іншай радасці прагну цяпер:
Расцвітай, Беларусь мая, зоркай
На сузорных шляхах СССР!

*1926 г.*

## ПЕСНЯ ЖНЯІ

Жняя маладая — стройная каліна —
У глухой даліне
Жыта дажынала.
Пад мурог-мяжою, над калыскай сына
Спевам салаўіным
Песню напявала:

— Спі маленькі Янка, любы мой сыночак!
Прабягуць гадочкі —
Будзем жыць іначай:
Там, дзе ўчора дзед твой плакаў на загонах,
Твая маці сёння
Больш ужо не плача.

Хоць цяжкая праца з просценькім сярпочкам, —
Прабягуць гадочкі,
І ў глухой даліне
Найбуйнейшым жытам заквітнее ніва,
Дружна з калектывам
Загудзе машына.

*1925 г.*

* * *

Нашто гадаць і марыць аб далёкім,
Каму ў жыццё не верыцца душой? —
Нальецца яблыня крамяным сокам
І заўтра апране раскошны шоўк.

А не збярэ яна апалых лісцяў,
Не зацвіце ў старых пялёстках зноў,
Бо толькі зоры — тыя, што й калісьці,
Ды неба сінь, з дымкамі аблакоў.

Як маладзік, навокал гляну вокам —
Я разгадаць наступны дзень прыйшоў:
Гадае той аб прышласці далёкай,
Хто верыць у сучаснае душой.

*1925 г.*

## ЯК РАНЕЙ

Як раней, я маўклівы і просты,
Толькі іншае сэрцам пасяг:
Залатую над клёнамі россып
Беларусі збіраю ў пасаг.

Прыбярэцца тады яна ў строі,
Упляце шаўкавіцу ў касу,
Выйдзе, стане на ўзгорачку стройна, —
Залюбуюцца ўсе на красу.

Залюбуюцца людзі на поступ —
Гэта сёння я сэрцам пасяг, —
І таму залацістую россып
Беларусі збіраю ў пасаг.

*1926 г.*

## ВЯСНА

Ты вясна — маладая красуня,
А ці-ж я не такі малады?
Сэрца радасцю ціхай красуе,
І красуюць у цвеце сады.

Зелянеюць на сонцы узгоркі,
І сіней за нябёсы рака...
Ой, дзяўчаткі мае, комсамолкі,
Выйдзем разам вясну сустракаць!

Заспявайце вясновую песню,
Я вам буду і сам падпяваць.
Сонца косы шаўковыя песціць,
На узмежку ўзыходзіць трава.

Ты вясна — маладая красуня,
Прыгажэй за прыгожых дзяўчат:
Галава буйным цветам красуе,
Зацвілі васількі у вачах.

*1926 г.*

## КЛЁН ЗАВЯЎ

Клён завяў ды стаіць у раздум'і,
Галаву апусціўшы на дол:
Паляцелі лісты, быццам думы,
Паляцелі зямлі на прыпол.

Я і сам прыціхаю пад клёнам:
Паляцець залатым-бы лісцём
Ды упасці далёка... з паклонам
Перад новай красой і жыццём.

Я іду, а лісты адлятаюць;
І чамусьці хмурнее мой твар:
Здэцца-б сэрца аддаў развітанню —
У няведамым шмат хараства.

*1926 г.*

## ГНУЦЦА ВЕРБЫ

Гнуцца вербы,
Гнуцца нізка,
Гнуцца аж да долу...
Дарагая, сядзь-жа блізка,
Раскажы пра долю.

Я вачэй тваіх праменні
Пад нябесны колер
Расцалую,
Можа меней
Будзе ў сэрцы болю.

Гнуцца вербы,
Гнуцца ніжай,
Гнуцца аж да долу...
Дарагая, сядзь-жа бліжай,
Раскажы пра долю.

*1926 г.*

## ЗАЦВІЛІ ЗАРНІЦЫ

Зацвілі зарніцы, зацвілі над гаем...
Думае дзяўчына, думае-гадае:

«У палях дарогі, у палях сцяжынкі...
Падаюць на скроні, падаюць сняжынкі.

Дзе-ж ты, мая радасць, дзе ты, мая наквець?
Заламала рукі, заламала накрыж.

А навошта слёзы і навошта роспач?
Заспявай, дзяўчына, заспявай папросту.

Наскія дарогі, наскія пуціны
У пясках не знікнуць, у пясках не згінуць.

Зацвілі зарніцы, зацвілі сузор'ем,
Звоняць над нізінай, звоняць над узгор'ем.

Паглядзі на зоры, паглядзі над краем, —
Знойдзеш сваю сцежку, знойдзеш, дарагая.

*1926 г.*

## М. БАГДАНОВІЧУ

Ці то восень была, ці зіма, ці вясна,
А ці сонца свяціла, ці зоры?
Пахіліўся на дол і пагорбіўся стан...
Кіпарысы наўкола і мора.

Хвалі на моры
Сумуюць, гавораць:
Хто і дзе?
Вецер галосіць,
Чорная просінь
На вадзе.

Не цвілі васількі, а кізілы цвілі,
Калі жвір на труну уссыпалі.
Скаргі скрозь праляглі на пясчанай зямлі,
Толькі бурна імкнуліся хвалі.

Хвалі на моры
Сумуюць гавораць:
Хтосьці знік.
Людзі прыпалі,
На стромкія скалы
Палі ніц.

Ці стаяў, а ці не над магілаю крыж,
Толькі помнік стаіць на узвышшы.
Не зязюля, а чайкі узвеялі крык,
Узняліся над морам і вышай...

Хвалі на моры
Сумуюць, гавораць:
Скрозь — туман.
Хтось на чужыне
З песняй загінуў
І... няма.

Спавіла яго смерць, але песня жыве —
Хіба песня калі бо загіне?!
Да магілы сляды на зялёнай траве,
Быццам шлях на азёрах на сініх...

Хвалі на моры
Сумуюць, гавораць,
Коцяць жвір.
Вэлюм на вочы...
Хвалі прарочаць:
Ён — жывы!

*1927 г.*

## НАШТО ЗАХАВАЛА

Нашто захавала на сэрцы тугу?
Ці-ж радасць прыходзіць без гора?
Глядзі, як гамоніць трава на лугу,
Туманам спавітая ўчора —
спавітая ўчора.

Бывае маркота, жалоба і сум, —
Я ведаў такія навалы,
А ўсё-ж маладосці шчаслівай вясну
Навотлю не кінуў на хвалі —
не кінуў на хвалі.

Без суму і радасць ярчэй не гарыць,
А роспачы, плачу — не трэба.
Маўклівая хвоя стаіць на гары,
Стаіць і глядзіцца у неба —
глядзіцца у неба.

У будучнасць глянь, у мінулае глянь —
Імкнуцца, імкнуліся людзі,
Тады ты не станеш, як белая здань,
І плачу ніколі не будзе —
ніколі не будзе!

*1927 г.*

## І ЗОРЫ, І МЕСЯЦ...

І зоры, і месяц, і сінь над палямі
Вячыста не моўкнуць — шасцяць.
А думкі віюць, развіваюць памалу

Вялікую Песню Жыцця.
Над морам, над лесам, над дзікаю стромай
Узвеяла сонца свой Сцяг.

Яго шаўкавістыя, дзіўныя строі
У ветрах вякоў шалясцяць.
Загэтым сугучнасць навокал і стройнасць,

Загэтым у цвеце Зямля.
І мы сваю радасць на йстужкі пакроім,
Каб выслаць кілімамі шлях.

*1927 г.*

## ВІТАННЕ

Шляхі віюцца між палямі,
А над шляхамі — віхрам пыл.
Імчымся мы, і перад намі
Бягуць дарожныя слупы.

За слупам слуп — вярстою меней,
Вярстою бліжай да сяла.
Насустрач госцю — на гуменні
Сасна абдымкі разняла.

А навакол красуе жыта,
Аўсы чупрынай шалясцяць.
Усланы шлях наш аксамітам,
Кані, як шалыя, імчаць.

Шалёны міг і міг шчаслівы!
У пазалоце тоне луг...
Вітанне вам, палеткі, нівы,
Вітанне роднаму сялу!

*1928 г.*

## ДЗЕЎЧЫНЕ З ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Раскажы,
Каханая мая,
Адчаго маркота на аблiччы?

Ці таму,
Што патрывожыў я
Супакой тваёй святліцы?

А ці думы вечныя прыйшлі
Аб краіне,
Ворагам забранай?
Ведаю,
Што сніцца росквіт ліп
У ружовы летні ранак.

І здаецца:
Маці будзіць жаць,
Але сон зацяў твае павекі...
Асыпаецца празрыстая імжа
На твае абветраныя вейкі.

Ты ідзеш дарогаю адна,
Углядаешся ў аддалі пільна,
Галасы імкнуцца пераняць —
Гэта водзыўкі з далёкай Вільні.

Каляровасць позняе вясны
Упрыгожыла праменнем ранак...
Ведаю,
Што сняцца сны
Аб краіне,
Ворагам забранай.

Аднаго не ўмею разгадаць —
Адчаго ты сумная такая?
Можа, вецер дальні нагадаў,
Што і ты далёкая,
Чужая?

Дык на вір,
На лес сухі адкінь
Гэту немарасць,
Мая дзяўчына:
Для цябе,
Мяне
І для такіх —
Есць у нас адзіная айчына.

Калі-ж зірк мой,
Любая мая,
Абудзіў трывогу на абліччы, —
Ты скажы —
Не патрывожу я
Супакой тваёй святліцы.

*1929 г.*

## ЗАКЛІК ДА ВЯСНЫ

Вясна мая! Развей утому!
Няхай вятры на лес нясуць
Трывогу горкую і сум,
Няхай нясуць каму другому.

На нашу сціплую бадзёрасць
Глядзяць наступныя вякі.
Вясна! Ты чуеш? — скрозь гудкі.
Ты чуеш? — гоман на азёрах.

Будзі, вясна, магутныя акорды,
Да творчай працы заклікай,
Гартуй нам дужасць у руках,
А на абліччах нашых — гордасць.

Бо як ахопіць скруха смуткам
Па чорнай глыбіні вачэй —
На цягу дзён і ўсіх начэй
Шукацьмеш і не знойдзеш скутку.

Жыццё-ж такіх не вельмі песціць,
А нам-жа трэба будаваць...
Ты чуеш, як шуміць трава, —
Дзявочым наслядуе песням?

Развей-жа ты, вясна, утому,
Няхай вятры на лес нясуць
Трывогу горкую і сум,
Няхай нясуць каму другому.

*1929 г.*

## ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ПАРАД

Над горадам сігнальны пошчак
І сцягі вогненна гараць —
Сягоння ў нас на люднай плошчы
Чырвонай Арміі парад.

За крокам —
        крок,
За ротай —
        рота,
За батальёнам —
        батальён.
Ідзе суровая пяхота,
Разведкі лёгкі эскадрон.

Да самай ночы ад світанку,
Ад самых ранішніх зарніц,
Паўзуць жалезным брухам танкі,
Аж стогнуць сцены камяніц.

Імчацца конніцы калоны,
Рыпяць марозна капыты,
Храпуць успуджаныя коні
І падымаюць снежны пыл.

І гэта стройная лавіна
Мне навявае успамін
Пра барацьбу маёй краіны,
Пра слаўныя былыя дні.

Пра тыя дні,
Калі на полі
У віхры смерці і адваг
Палкі чырвоныя за волю
Галовы слалі далавах.

Не для геройства,
Не для славы:
Каб скінуць з плеч навек ярмо —
Ішлі на Крым
І на Варшаву
І дасягнулі перамог.

Настане дзень,
Калі ізноўку
Над светам пройдзе вал вайны.
Мацней сціскаючы вінтоўкі,
Советы выйдзем бараніць.

Не зможа нас ніхто ў паходах,
І закрасуе воля скрозь:
Ты паглядзі,
Які ў пяхоты
Упэўнены
І цвёрды крок!

Ты паглядзі,
Як ад світанку,
Ад самых ранішніх зарніц
Паўзуць жалезным брухам танкі,
Аж стогнуць сцены камяніц.

Імчацца конніцы калоны,
Рыпяць марозна капыты,
Храпуць успуджаныя коні
І падымаюць снежны пыл.

А вецер сцягі развявае,
Яны агністасцю гараць.
Урад рэспублікі прымае
Чырвонай Арміі парад.

*1929 г.*

## СЛОВА ПЕРАМОГІ

Радзіла нас
нядоля чорная
І гадавала нас,
як мачыха;
Мы выраслі
непакорныя
Жыццё ліхое
перайначваць.

Нам развіццём грамадства
суджана
Павесці перад
у гісторыі...
Дармо, што лектары
дасужыя
Нас не вучылі
ў аўдыторыях.

Вучыла нас
змагацца партыя,
Вяла прайсці
шляхі калючыя.
І выйшлі мы,
як сталь, упартыя
На бой
пад сцягам рэвалюцыі.

Ланцуг няволі
цяжкім молатам
Разбілі мы
навекі-вечныя
І здабылі правы
на моладасць
Краіны новае —
савецкае.

*1930 г.*

## РЫТМЫ

### ЗІМОВЫ РОЗДУМ

Сняжынкі белыя
Над полем бегалі,
Лятáлі, лёгкія,
І мітусіліся.
Дарога ветліва
Ківала ветламі,
Як сон, далёкімі,
Як неба, сінімі.

А зоры клікалі
У даль вялікую,

У даль прасторную,
Ў прасцягі снежныя.
І людзі ў роздуме
Стаялі грозныя
Над тымі чорнымі
Сваімі сцежкамі.

З вятрамі лёгкімі
У высь далёкую,
У даль пагодную
Ляцелі сэрцы іх: —
За тымі морамі,
За тымі горамі
Была свабодная
Зямля совецкая.

## ПЕРАД НАВАЛЬНІЦАЙ

Вятры усходнія —
    такія ветлыя,
Вятры заходнія —
    такія дзікія,
Вятры асеннія
    навокал бегаюць,
Вятры халодныя
    махаюць крыллямі.

З усходу веючы,
    галлё пялегуюць,
А пойдуць з захаду —
    прысады крышацца.
Вятры асеннія
    навокал бегаюць,
Вятры халодныя
    махаюць крыллямі.

А неба сіняе
    штодзённа хмарыцца,
А хмары белыя,
    а хмары чорныя
То ласкай бліскаюць,
    то сілай хваляцца, —
Туга бяскрайняя
    да сэрца горнецца.

Як хмары ўсходнія —
тады бялявыя,
Як хмары з захаду —
бядою чорныя...
Штодзённа хмарыцца,
і хмары плаваюць,—
Навала блізка ўжо,
яна разгорнецца.

АГНІ ПАЎСТАННЯ

Скалыхнуліся грозна лясы,
Перуны засвісталі наўсцяж;
Пашчапалася мёртвая сінь,
І маланкі агнём шалясцяць.

А ці гэта навала ідзе,
А ці помста людская гарыць —
Не чакайце на заўтрашні дзень,
Натачыце вастрэй тапары!

Ёсць за морам краіна красы,
Апавітая ў сонечны бляск.
Гэта ваша айчына, браты,
Да яе пракладайце свой шлях.

На яе станавіцеся след,
Каб краіну чужую, сваю,
Каб увесь паднявольны сусвет
Аб'еднаць у Савецкі Саюз.

*1930 г.*

## МАТЧЫНЫ КАЗКІ

1

А на полі жніво...
Паглядзі на жняю —
І паспешнасць і рупнасць у працы.
Так даўней і цяпер. А ці звяжам калі
У снапы чалавечую працу?

А на полі жніво...
Залатыя снапы
Людзі роўненька ставяць у мэндлі.
Толькі нам, жывучы, не пара спачываць
У цішы гэтых водарных мэндляў.

А на полі жніво...
І пад ценем снапоў,
Над калыскаю сына матуля
Будзе казкі казаць, будзе песні спяваць,
І тады адпачыне матуля.

А на полі жніво...
Колькі працы і дум,—
Можа, болей, як гэтых калоссяў.
А вятры ўсё плывуць, а вятры ўсё ідуць,
А вятры — шалясцяць у калоссі...

2

Над палеткамі сон, над палеткамі ціш,
Нават сонца на поўдні замерла.
Летні дзень залатой павалокай трымціць,
Быццам сцеле празрыстую мэрлю.

Цёмны лес апусціў у знямозе галлё,
Над жытамі не плавае вецер.
Распусціла утома крыло над зямлёй
І шапоча ласкава: заснеце!

І заснулі палі, і заснулі лясы,
Толькі маці не спіць над калыскай:
Неспакойны такі дарагі яе сын,
Дык спявае яму і калыша.

— Спі, сыночку,
Спі, каточку,
Спі.
Вецер ходзіць,
Вецер носіць
Пыл.

Зацярушыць,
Запарушыць

Злы
Твае вочкі.
Спі, каточку,
Спі.

Тады ўстанеш
Ды узглянеш
Ты —
Скрозь як ночка...
Спі, каточку,
Спі.

Не дазволю
Злому ветру
З дзікіх нетраў
Бушаваць.
Мой сыночак,
Мой каточак
Будзе спаць.

А паспаўшы,
Як устане
Позна, рана
Ды узгляне —
Скрозь:
Залацістасць
У маністах
І барвовасць
Скрозь.

Тады ўбачаць
Яго вочкі
Дня і ночкі
Хараство.
Спі, сыночак,
Спі, каточак,
Ходзіць сон. —

Замоўкла матуля, суцішыўся сын,
Не знае ён светавых фонаў:
Ён слухаў не словы, не словы і сніць,
А музыку дзіўных сімфоній.

3

— Мама, чуеш, восень
Бразгае ў акно.
Колькі год мне?
Восем?
— Ты усё адно...

— Раскажы пра долю,
Адчыні душу:
Слухаў-жа я ў полі
Стогалосы шум.

Можа я згадаю
Твой адвечны сум
Ды з чужога краю
Радасць прынясу.

Маці прытуляе
Да грудзей дзіця:
— Сынку, не згадаеш
Свету і жыцця.

Падрасцеш вялікі —
Раскажу тады. —
На худым абліччы
Цьмяныя сляды.

— Мама, чуеш, ветры
Нашы клёны гнуць, —
Раскажы цяпер ты,
Не магу заснуць.

— Пачакай, настане
Белая зіма,—
Будзе твая мама
Сумаваць адна.

Буду гаварыць я
Ў тыя вечары
Казкі залатыя
Позна да зары.—

Ціха ў хаце.
Восень
Бразгае ў акно.

Сняцца сыну восем
Пражытых год.

Сніцца гай-сасоннік,
Невыразны цень;
Шэпча сын спрасонку:
— Мама, шчасце йдзе!

4

Белы снег мне нагадвае белыя, белыя хмары,
Што плывуць з беларускіх далёкіх азёр.
З адамашкай ружовай навокал дзіцячыя мары
Адплываюць таксама далёка да зор.

Маці кужаль прадзе і расказвае дзіўныя казкі:
— У такой-то, такой-то чужой старане
Жыў асілак ліхі, чалавек, як вядома, не наскі;
Узлятаў ён да зор і па морскім разгульваў дне...

Чую голас срабрысты, ласкавы, пяшчотны матулі,
І у казках няясныя словы і сэнс,
А ўжо думы ўзвіліся і клічуць, і вабяць, і туляць,
І фантазіі крыллі памчалі мяне.

Я лятаў праз азёры і моры у сінім тумане;
Пада мною плывуць і тануць караблі;
Я адзін, я адзін у празрыстасці хваль акіяну,
І навокал нідзе ні кавалка зямлі.

Сярод дзікіх пустынь, па дарогах, нікім не
таптаных,
Я ў бяскрайнасць імчуся на лёгкім кані.
Конь стаміўся зусім, прыпыніўся, зарзаў на
расстанне
І упаў на калені...

5

У хаце самотна звініць цішыня,
Маркотай абвеяна лямпа.
На сценах, здаецца, хтосьці крыллі разняў
І доўгія, тонкія лапы.

І раптам: не лапы — плыве карабель,
Не крыллі хістаюцца — ветразь;

Матросы падходзяць, адходзяць далей;
Мяне дакранаюцца ветры.

Павеяла з мора азёрным цяплом,
І водар паўднёвы праліўся...
. . . . . . . . . . . .

То сон ахінуў мяне цёмным крылом,
А поўдзень далёкі — прысніўся.

6

Ішлі кудысьці мы дарогай,
Была шчэ ў наквеці вясна,
І гэта ранняя убогасць
Наваражыла шчасце нам.

Буслы вярталіся на дзіва
Ў такую раннюю пару.
— Куды, шчаслівыя, куды вы, —
Яшчэ заснежаны ваш рум! —

Яны над возерам замерлі
(Нас ахапіла цішыня),
І крылляў іх жывую мэрлю
Туманам белым хтось разняў.

А гукі дзіўныя зліліся
І патанулі ў цішыні,
І месяц у бяскрайняй высі
Расплыўся ў казачную сінь.

Я не умеў сказаць нічога,
Я не хацеў сказаць «люблю».
З дзіцячай радаснай трывогай
Упаў шчаслівы на зямлю.

7

Гарачы дзень. Сяло замерла.
Як неба сіняе, наўкола цішыня.
У халадку стары сабака дрэмле,
Не хочацца яму і мухаў адганяць.

А у садку гудуць чмялі і пчолы,
І струны дзіўныя якіясьці звіняць.
Трава пажоўклая схілілася да долу
І галавы сваёй не можа прыпадняць.

Такая ціш!... І мне здаецца,
Што вечна будзе гэты летні дзень.
А сонца ласкава у вышыні смяецца,
І час ідзе, ідзе, ідзе...

8

Ясны вечар над лесам ідзе,
А над полем яшчэ адвячорак.
Дагарае на захадзе дзень,
На усходзе трывожачы зоры.

Над ракой усплывае туман,
Набліжаецца стомлена ціша,
І ні слёз, ні тугі, ні жаданняў няма —
Ноч у казках сваіх закалыша.

9

Песні адспяваны,
Казкі пераказаны —
Што-ж цяпер?
А на сэрцы раны
Скрухаю павязаны
Без цябе,
Залатая восень!

Ай, душа галосіць —
Плача, аж заходзіцца.
А чаго?
Па чужых палосах
Матчын сын находзіцца...
«Колькі год
Вандраваць ён будзе?»

Цісне кашаль грудзі —
Маці занядужыла:
«Ой, бяда!

Скрозь чужыя людзі —
Мусіць, гэтак суджана
Прападаць...
Дайце... шчасце... сыну!..»

Шалясцяць асіны,
Сэрца заварожана
Харагтвом.
І малому сыну
Казкамі ўпрыгожаны
Сніцца сон —
Залатая восень...

10

Холадна.
Хочацца есці:
«Мама, устань!..»
Спіць.
Дзесьці,
Далёка дзесьці
Вецер шуміць.

Рукі памерзлі, азгрубелі.
«Мама, ты чуеш?»
Спіць.
Твар мармурова-белы...
Вецер шуміць.

Рукі сухія, худыя
Сын палажыў на чало —
Іскра халодная дзіка
Раптам кальнула у лоб:
— Ай!

Вось і разгадана тайна,
Мары, і казкі, і песні
Кінуты засаб нядбайна —
Годзе малога ім песціць!

Восень стаіць каля весніц —
Чыстая праўда жыцця:
Холадна,
Хочацца есці...
Ветры шумяць...

11

Мне пятнаццаты год...
Я выходжу ў прасцяг, —
Снегавая наўкола раўніна,
А сняжынкі лятуць,
Летучы шалясцяць,
Ападаюць сняжынкі
І гінуць.

Дні маленства мае,
Бестурботныя дні,
Залатыя, далёкія казкі...
Ах, як лёгка гадаць,
Забывацца і сніць,
Але жыць, але жыць —
Гэтак цяжка!

Дзе-ж ты, казак маіх
Асалода жыцця? —
Бачу толькі змаганне і працу.
А сняжынкі лятуць,
Летучы, шалясцяць,
На зямлю ападаюць,
Лажацца...

12

Расцвітае над лесам вясна,
Усміхаецца яснасцю дзень.
Вецер белыя хмары узняў,
І на крыллях за мора нясе.

Пачакай, лёгкакрылы вястун,
Можа ў хмарах — маленства маё,
Дык прымчы залатое адтуль.
Але вецер — упаў у галлё...

Устаюць успаміны ў душы,
Ды не вернуцца радасці дні,
Толькі дальняю песняй цішы
Дзень маленства майго празвініць.

Вецер белыя хмары узняў, —
Праліецца срабрыстасцю дождж.
Добры дзень, маладая вясна,
Прывітанне табе, маладосць!

*1928 г.*

## У ДАРОГУ

### I

З усходу на захад —
азёры,
лясы,
Палеткі,
балоты,
аблогі.
І ворагі топчуць
каралі красы,
Як людзі пясок на дарогах.
З палеткаў зрабілі
для гульбішчаў пляц
(Не чуюць
ні скарг,
ні дакораў),
І носіцца ціхі
надломаны плач,
І хвалі шумяць на азёрах.
Пракоцяцца хвалі
і слёзы збяруць,
Нясуць
аж у мора
рыданні.
Заходняя частка,
мая Беларусь,
Ці здзейсніш калі парыванні?
Ці збудуцца мары,
жаданні людзей,
Твае,
дарагая,
таксама?

І чую ў адказ:
— Набліжаецца дзень,
Паўстанем,
адважна паўстанем!
Нядарам у пушчах
калышацца звон
Навостранай помстаю сталі:
На гранях мінулых
і будучых дзён
Паўстанем змагацца,
паўстанем!
Навала узрушыць
блакітную гладзь,
Прамчыцца са скогатам каня,
І стане той скогат
— адчаянны плач —
Апошнім народным рыданнем.
Ніякая сіла
не спыніць размах, —
Агні разгарацца,
засвецяць,
І стане пад сцягам
краіна мая
Адной Беларуссю Совецкай.
Не ўчуеш
ні скаргі,
ні плачу тады,
Крыламі атуліць вясёласць.
А зараз —
трывожна шумяць гарады,
гамоняць узрушана сёлы.

Праз гэту
трывожнасць,
надзею,
адчай
Я чую над краем рыданні:
Выходзіць сын долю
ці смерць сустрачаць,
І маці чытае літанні.

А месяц пахмуры
ў далёкай цішы

Праходзіць памалу над лесам,
З халодным спакоем
халоднай душы
Глядзіць на «Усходнія крэсы».

II

Старэнькія хаты,
гнілыя хлявы
Пасталі абапал дарогі.
На вуліцах
дробны пясочак і жвір —
Убор небагаты і строгі.

Галоўная вуліца роўна ідзе —
Парадак парушыць баіцца.
У цэнтры пышліва раскінулі цень
Не гмахі,
А ўсё-ж камяніцы.

Яны,
як вянком,
абкружылі бульвар,
Прazваны Вялікаю плошчай;
А поруч з дамамі —
старая царква
І крамы навокала з дошчак.

Над вуліцай звесілі голле дубы,
Купчастыя клёны і вязы,
А елкі да неба паднялі чубы...
Мястэчка завуць гэта Вязынь.

За некалькі крокаў ад места ўаддаль
Віецца істужкаю рэчка;
Свіціцца вада,
як зялёны паркаль;
На беразе —
лозы,
парэчкі.

Пад ценем свайго
лапушнога галля

Каліны сцюдзёнасць схавалі.
Разносяць па свеце назову «Вілля»
Рачныя
шумлівыя хвалі.
Жыве рознастайны ў мястэчку народ:
Рамеснікі,
цеслі,
сяляне;
Ёсць тут і не просты,
а «выбраны» род —
Суддзя,
паліцэйскія,
пані.

Да гэтага
старасту трэба дадаць,
Начальніка Вязыньскай гміны,
Ён — самая важная тут галава
На шыі спрацаванай
сіняй.

Сялян так
не злічыш на пальцах усіх —
Іх тысячы тут занядбаных:
Старэнькія хаты
ў завулках крывых —
Не месца для «яснага пана».

Вунь вецер на стрэхах салому разнёс,
Збіраюць па каліву ў жменю.
Дзе дуб малады вяршаліну узнёс —
Жыве селянін Асташэня.

III

На ўсю акалічнасць вядомы Рыгор,
Блукаў ён па свеце багата,
Разбураны ўшчэнт Асташэневых двор,
Каламі падпёртая хата.

Палоска зямелькі —
два крокі ўшыркі,
Сажон каля тысячы лугу.

У Вязыне ўсе так жывуць беднякі,
Святым,
як гаворыцца,
духам.

А горай за ўсіх —
Асташэня Рыгор:
Няма ад сям'і дапамогі, —
Ад рання да ночы,
ад сонца да зор
Спачынку не ведаюць ногі.

І толькі на сына надзея адна:
«Вучыў нездарма,
дапаможа...».
І маці старая ў малітвах штодня
Аб сынавай долі варожыць.
Яна на працягу
шматлікіх начэй
Выходзіць за вёску паволі,
І, слёзы раняючы
з хворых вачэй,
Сыноў сваіх кліча у полі:

— Сыночкі-саколы,
лятаеце дзе? —
І вецер нясе ёй адказы:
— Загінуў старэйшы даўно ў барацьбе,
Даўно,
што не помніць і Вязынь.

Другога...
Забілі
нядаўна зусім,
Шчэ крыж не дагніў на магіле;
Ніхто,
толькі я
над труной галасіў...
Адважна паўстанцам загінуў.

А трэці,
пранізаны куляй наскрозь,
Дагас у турме на Лукішках.

Я гэтаму такжа
	узвеяў на скронь
Пяску жвіраватага крышку.

Чацверты і пяты —
	жывыя сыны...
Іх лепшая доля чакае:
Хоць можа і згінуць —
	запаляць агні
Над гэтым зняволеным краем. —

І маці вачыма
	шукае маяк,
Што будзе праменіць над полем.
Матуля,
	адвечная скруха твая
Загіне калі,
	ці ніколі?

IV

Восень.
	Ноч.
		Завываюць вятры.
Пагасіла агні свае Вязынь.
Акяніцамі вецер
	трывожна рыпіць.
«Нехта стукнуў,
	здаецца,
		два разы»..

Устрывожана маці,
	бяжыць да дзвярэй...
Цішыня...
	Толькі вецер скаголіць.
«Дзе-ж
	Уладзік?
		Сыночак мой дзе?
На двары гэтак цёмна сягоння».
І маркотна,
	і дымна
		лучына гарыць,
Шалясцяць палахлівыя цені.

На палатках не спіць
Асташэня стары,
Аглядае задумліва сцены.

Мары ткуць залаты
і дзівосны дасэнь,
Развіваючы пасмы з навою:
«Новы дом,
а над ім
каміны на страсе
Дуб зялёнай накрыў галавою».

Маці возьме
паправіць
самотны агонь,
Зложыць рукі ізноў на каленях
І нахіліцца нізка,
заплача чагось
І застыне ізноў задуменна.

Думы такжа снуюцца,
складаюць дасэнь,
Толькі іншыя фарбы узораў:
Паўстае маладосць
у атрутнай красе,
Паўстае невыказнае гора.

І сціскаецца болем надрыўным душа,
Узрастае за сына трывога,
А на ганку знаёмая чутна хада,
Маці бегма бяжыць да парогу.
— Ты?..
Уладзік?
Сыночак!..
Прыйшоў...
І павісла на шыі у сына.
— Есці даць?
Ды не ведаю што —
Толькі хлеб на вячэру з мякінай.

Сын ласкава цалуе
маршчыністы лоб
І садзіцца ў знямозе на лаву.

Уздыхае стары:
— Эх!
Усё адышло,
Не паможа ніхто,
не паправіць!

— Слухай, тата,
пакінь бедаваць,
Не папраўлю табе я на многа.
Трэба волю здабыць —
і тады будаваць...
Заўтра я адыходжу ў дарогу...

V

— Эх,
сынок мой,
сынок!
гадаваў я цябе,
Ускладаў гэтак многа надзеі!
І стараўся вучыць...
А цяпер...
Што цяпер?
Паміраюць і гаснуць надзеі.

Хіба згінула мала
такіх вось,
як ты,
А ці далі якую палёгку?
Вось і ты,
дарагі,
прападзеш маладым,
А бацькам гэта —
цяжка,
не лёгка...

Навучыўся —
і добра,
пасаду бяры,
Можа й нам дапаможаш капейкай:
Хата ледзьве ліпіць,
хлеў таксама стары,
А ты ўбіўся у гэту ячэйку!..

— Слухай, родны,
вінуй,
калі я вінават,
Ці-ж не бачу, жывем як багата?
Калі будзе няволя
у нас панаваць,
Дык разваліцца й гэтая хата.

Ты сягоння карову,
каня нажывеш,
Заўтра ўсё прададуць за падаткі.
Любы,
родны мой,
сыну павер —
Не бывае канца без пачатку.

Не на смерць-жа іду я,
а толькі на сход —
Падлічыць нашы сілы і страты.
Дык чаго сумаваць,
дык журыцца чаго?
Неўзабаве вярнуся дахаты. —

Бацька галаў пакорна схіліў
і заціх,
Маці цішкам слязу выцірала,
Брат маленькі Алесь
пагдядаў на усіх,
Урачыстасць цішы панавала.

— Ну,
бывайце здаровы,
пара мне,
пайду... —
Маці сына за шыю ўхапіла...
Бразгатаў у акно
сваім голейкам дуб,
Маладыя прабуючы сілы.

Хлопец торбачку ўзяў
і ступіў за парог,
Маці крыж тры разы палажыла,
Прашаптала ўздагон:
— Будзь, сыночак, здароў! —
І прыпала вачыма да шыбы...

Сын ідзе па двары,
        вось ён выйшаў з двара,
Бацька ўжо зачыняе вароты.
Маці доўга глядзіць,
        заклапочаны твар
Агартае
        і сум
                і самота.

*1928 г.*

## ХАДА ПАДЗЕЙ

### ЛІРЫЧНЫ ПРАЛОГ

Вячорная цьмянасць твая,
Красавік,
Мой дух акавітаю поіць,
А вецер імкнецца настрої узвіць
На залатыя навоі.

Спрачаюцца думкі мае з пачуццём,
Снуюць успаміны аснову:
Праходзіць у ясным праменні жыццё,
Восень —
У лісці кляновым.

У белым убранні праходзіць зіма,
Вясна—
У зялёным адзенні.
І лёгкай фантазіі смелы размах
Рупна рысуе падзеі.

У вобразах я вокамгненна падам
Падзеі у духу канструкцый.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Калі цягнікі папрыходзілі з дач —
Пачак прывезлі інструкцый.

### І ВОСЕНЬ ПАЧАЛАСЯ

Ад інструкцый гэтых установы
Скалыхнуліся,
        як хмурыя лясы,

І пайшлі загады й прапановы
Ад вяршынь цэнтральных у нізы.

Прабягалі хуткія кур'еры
За кароткім часам наўздагон,
І ляцелі белыя паперы,
Як лісты асеннія на дол.

Журавы пачалі шалясценне,
Узнялі птушыны неспакой:
Журавам казалі лятуценні
Пашукаць на поўдні супакой.

І яны дарог сваіх глядзелі,
Разгарнуўшы старасвецкі план.
Задзівілі гэтыя падзеі,
І паэт спытаўся у сялян:

— Я вясну адзначу вандраваннем,
Ці прыехала яна ў калгас?
— Хоць складанае пастаўлена пытанне,
Але просты на яго адказ:

Адцвілі даўно вясна і лета,
Час ідзе няспынна,
не суняць... —
І здалося сумнаму паэту,
Што зарана адцвіла вясна.

Напісаў ён верш у захапленні,
Як лісты апалі не ў пару:
Нагадалі крыллі летуценняў
Вобраз дзеўчыны і белых руж.

ДЗЕЎЧЫНА І РУЖЫ

Хмары белыя —
быццам кусты
Беласнежных вялізманых руж.
Адлятаюць дадолу лісты,
Адлятаюць лісты не ў пару.

Яшчэ жнівень на полі цвіце
Пазалотаю позніх аўсоў.
Раніцою дзяўчына ідзе
Пазбіраць каласы у крысо.

І на босыя ногі раса
Ападае з халоднай травы,
І на плечы спадае каса
Ручаём залатым з галавы.

Вейкі спуджана нейк шалясцяць,
Адвінаецца зірк уаддаль.
(Прабягаюць дарогі наўсцяж
І знікаюць —
канца не відаць).

І асмуглыя рукі яе
Захінаюць кажушак стары,
Каб грудзей не крануўся падвей,
Не туліліся моцна вятры.

А на вуснах ружовых,
як цень,
Задуменная ўсмешка лягла.
Золкі смутак з-за лесу ідзе,
Асядае над полем імга.

Адцвіла залатая вясна,
Адшумелі лугі і лясы.
Павалокаю белай туман
Не заценіць дзявочай красы.

Хмары белыя —
быццам кусты
Беласнежных вялізманых руж.
Адлятаюць дадолу лісты,
Адлятаюць лісты не ў пару.

### ПЕРАВЫБАРЫ Ў ПРЫРОДЗЕ

Красавала восень ярка
У кастрычнікавых днях.
Гаварлівая жняярка
Не змаўкала на палях.

Шалясценне жоўтых лісцяў
  Ад відна і да відна...
Ні пашаны,
        ні карысці
Ані каліва няма.

Толькі могуць мне пашкодзіць, —
Узнялі нядарам крык:
Самакрытыка у модзе —
Недахопы стануць крыць.

Шмат мне бачыць давялося,
Што чужы табе —
        не брат... —
Разважала часта восень,
Як сапраўдны бюракрат.

Скараціць рашыла штаты,
На падмогу кліча дождж:
— Атрасі на клёнах шаты
І развей на полі ўдоўж.

Толькі з птушкамі вось гора —
Хіба выслаць за мяжу?
Хай ляцяць сабе за мора,
Я ім добранька скажу:

«Можа хто ў камандыроўку
Хоча, птушкі, паляцець —
Напішу я вам пуцёўку
Дасягненні агледзець».

Дык на працу,
        дождж,
                на працу:
Справы многа на зямлі! —
Адказаў дождж:
        — Рад старацца! —
І зашастаў у галлі.

Супынілася жняярка
На сцўгасавых палях,
І лісты з каштанаў парку
Адлятаюць далавах.

Птушкі выбраліся скора,
Чарадою і ў разброд,
Хто за межы,
аж за мора,
Хто лячыцца на курорт.

Узнялі вятры трывогу
(Чуцен грозны гоман хваль),
На азёрах,
на дарогах
Сталі скаргі друкаваць.

Прачыталі тыя скаргі
І лясы
і жоўты сад
І рашылі не на жарты
Перадаць зіме пасад.

Узнялі аднагалосна
Вершаліны на узмах:
— Хай гуляе на палосах
Замест восені зіма.

ЗІМОВЫ АДПАЧЫНАК

Пасаду старшыні
халодны лістапад
Наступніку
увечар перадаў.
І снежань малады
аснежыў голы сад,
За дзень канькі
і лыжы распрадаў.

Марозным вечарам
на фабрыках гудкі
Пераклікаліся
акордамі сірэн,
І першаю
спартыўная каманда «КІМ»
На новых лыжах
выехала ў трэк.

У золкай змрочнасці
        схіснуліся агні,
І ціну тонкую
        наземіць цень...
Калонай роўнаю
        ідуць за днямі дні.
Якая стройная
        хада падзей!

Вятры сцюдзёныя
        гайсаюць каля стаў,
У задуменнасці
        марозны лес.
Як пальцы — тонкія,
        і хрупкія, як сталь,
Лілеі белыя
        цвітуць на шкле.
Лісты шырокія
        прыгожа вышываў
На сінім шкле
        халодны маладзік,
Адлюстравалася
        узлётаў вышыня
І глыбіня
        пачуццяў маладых.

І звонку казачным
        здаецца ў змроку клуб
сваёй суровасцю
        халодных рыс:
Спадаюць цені мёртвыя
        са стрэх на зруб.
Ды сэрца клубнае,
        як жар, гарыць.

А дні ідуць,
        кароткія, як радасць, дні.
Сляды кладуцца
        роўныя на снег.
Зіма,
апошнімі снягамі зварухні
І саступі шляхі свае
        вясне!

Яна, склапочаная,
        ходзіць ля акон,
Яна над рэкамі
        варушыць ціш,
Яна шчапае лёд
        (ты чуеш гром і звон!),
Яна вятрамі ў полі шалясціць.

Яна паводкаю ідзе,
        прыгожая вясна,
Узварухнуліся,
        шумяць лясы,
Яна ідзе
        і заклікае нас
Да творчасці
        вялікае красы.

## ВЯСНА НАВОДЗІЦЬ ЧЫСТКУ

Прыляцелі ластаўкі
З трапяткімі крылламі.
Паламаны застаўкі
Ледзянымі крыгамі.

І паводка бурная
Умывае вуліцы,
А масты чыгунныя
Над ракой сутуляцца.

І вясна
        і людзі ўсе
Раніцою ранняю
Пачалі па вуліцах
Чыстку генеральную.

Бюракраты пырскаюць,
Быццам хвалі пенаю,
Напужаны чысткаю,
Значыць —
        гігіенаю.

А тым часам сапраўды
        рабочы кантроль

Парашыў адчыніць
дубальтовыя дзверы
Габінетаў усіх,
канцыляр
і кантор —
Пісаніну і працу
праверыць.

І цяпер аб'явілася
шмат «валацуг»,
Што «не помняць»
ні бацькі,
ні маткі,
ні брата,
Каб давесці-ж аднак
«пролетарскасць» сваю —
Зазначаюць,
што іх...
«нарадзіў інкубатар».

А каб верылі больш,
пацiскаюць руку
Меней «заву»,
а болей кур'еру.
Габінеты цяпер
не стаяць на замку —
Адчыняюцца ветла
дубовыя дзверы.

Ай, як хутка
падзеі мяняюць людзей,
І душу іх,
і твар,
і усмешку!
Толькі, мусіць, вясна
у няспыннай хадзе
Не мяняе аблічча
і сцежак.

Не мяняе ніколі
зялёных дарог,
Не спыняюць напружнасці
людзі ў рабоце:

Ўсё нязменна у сем
        раніцою гудок,
І красуе вясна
        ў пазалоце.

Яснымі праменнямі
На прыпол красы
Раскідае жменяю
Сонца паясы.

І тады вясёлкаю
Зацвітае сад,
Раніцою волкаю
Зіхаціць раса.

Вочы белазорыя
Упіваюць сінь.
Вецер над азёрамі
Ціха шалясціць:

— Можа троха зімна вам? —
Шчэ чуваць зіма,
А паэты гімнамі
Услаўляюць май.

## МАЕВЫ ГІМН

Думкі і вобразы
        лучацца шчыльна,
Сэрца нітуюць
        настроі вясны.
Дзеі праходзяць
        заўсёды нясхільна,
Дзеі... а такжа
        праўдзівыя сны.
Толькі нядаўна
        на санях кляновых
Вывезлі з Мінска
        за горад зіму, —
Тэмпам ускораным
        рытмаў вясновых
Сёння складаецца
        сонечны мур.

Толькі надоечы
вусны прасілі,
Вусны мільённыя
клікалі май —
Сёння-ж у далях,
празрыстасцю сініх,
Дзень гэты
крыллі над светам разняў.
Пошчак прамчаўся
ад Мінска да Вільні,
Як навальніцаю
шэлест лясны...
Дзеі праходзяць
заўсёды нясхільна,
Дзеі — як нашы
праўдзівыя сны.
Вось і здаецца
нязвыклай,
бязмэтнай
Гэта людская
бяскрайняя плынь.
Маршам аркестры
на плошчы сусветнай
Славяць маёвыя
светлыя дні.
Што-ж гэта сэрца
дрыжыць у трывозе,
Нават і песні
не ўшчунуць бяду?
Дзесьці далёка
па чорнай дарозе
Нашых братоў
на пакуты вядуць.
Што-ж ты татахкаеш,
сэрца, бяссільна,
Хіба не верыш
у подых вясны?
Дзеі праходзяць
заўсёды нясхільна,
Збудуцца нашы
праўдзівыя сны.
Будзе часіна,
як тыдзень русальны.

Людзі пакрышаць
        няволі крыжы,
Прыдуць з выгнанняў,
        адвечных і дальніх,
Прыдуць — паўстануць
        змагацца і жыць.
Дзень гэты будзе
        таксама маёвы,
Злучнасць працоўных
        уславіць вякі,
Праца вянкамі
        красы каляровай
Высцеле сціпла
        комуне шляхі.

Толькі сачыце
        упарта і пільна
Подыхі кожнае
        новай вясны —
Дзеі праходзяць
        заўсёды нясхільна:
Дзейнасцю стануць
        праўдзівыя сны.

## ВЫСНОВЫ

Залатымі косамі вяснянкі
Адшумелі ўчора над лясамі.
Занядбала любая сялянка,
Занядбала сёння паясамі.

Кажуць, ходзіць лета каля лядаў, —
Датыкай, дзяўчына, свае кросны,
Малады вунь едзе у прысадах...
Зашумелі вершалінай сосны.

. . . . . . . . . . . . . . . . . .

Веснавой мелодыі акорды
Прашумелі бураю над брукам,
А паэтаў,
        некалішнім гордых,
Не кранае аніякі грукат.

А пара-б ім новую аснову
Разматаць для творчасці з навояў,

Каб суседзі,
робячы высновы,
Не смяяліся з старых настрояў.

*1929 г.*

## ТРЫВОЖНЫ СІГНАЛ

### ЗАМЕСТ ЛІРЫЧНАЙ ПРАДМОВЫ

Заместа лірычнай прадмовы,
Спавітай у ясны паяс,
Я выкажу простыя словы
Пра смутак у песнях у нас.

Размах будаўніцтва нязвыклы,
Напружная праца штодзень...
І трэба —
упарта і сціпла
Прымаць найвялікшы удзел!

І трэба —
аддана і смела
Тварыць рэвалюцый пасаг,
Каб сонца на ветразях белых
Данесці ў цвятлівісты сад.

А ты мой,
Нялюбы паэта,
Маўклівы ідзеш на папас;
Каханне дарэшты запета,
Зняслаўлена жальба і гас.

Ты прозай штодзённаю клічаш
Свае абавязкі,
І сум
Адценнем сухім на абліччы
Ад воч засланяе красу.

Туман прычыняе павекі,
Утомай збіваючы з ног,
Шукаеш рамантыкі нейкай,
Навеяная вёсламі сноў.

А ў кожнай пульсацыі сэрца,
У кожным размаху рукі —
Ты бачыў, паэт,
Як імкнецца
Жыццё разламаць берагі?!

Ты бачыў задумныя вочы,
Калі нечаканая гаць
Хаду прыпыняе рабочых, —
Ці выйшаў ты ім памагаць?!

Ты дзесьці, складаючы вершы
Пра радасць натруджаных рук,
Ні кроплі у радасць не верыш,
Не верыш у нашу зару.

І ведаеш,
Колькі жалобы
Радкі затаілі твае!
Ты песні і маршы угробіў
Пад холадам снежных завей.

А ў час,
Калі чорная скруха
Стаіць ля тваіх ля акон, —
Ты, ломячы белыя рукі,
Шукаеш рамантыкі дзён.

Спяваеш тады пра каханне
І цемру асенніх начэй,
І песні ў старым чамадане
Хаваеш ад нашых вачэй.

Тваё распраданае сэрца
Рамантыкай тэй не гарыць,
Як мускул ад працы ірвецца —
Імкнецца комуну стварыць.

Не знае рамантыкі й іншай,
Калі забіваў брата брат,
Каб сонца з далёкіх узвышшаў
Данесці ў цвятлівісты сад.

Няшчасны!
Якая жалоба
У радасці прозы твае!
. . . . . . . . . . .

Зямны паварочваю глобус —
Жыццё маладое ўстае.

І будуць у смутку наяўна
Рамантыкі нашае сны:
Было,
як гавораць,
нядаўна —
У час грамадзянскай вайны.

## ЛЯСЫ ШУМЕЛІ НА ТРЫВОГУ

Лясы шумелі на трывогу,
І голас іх надрыўны быў.
У цёмнай засціле дарога
Штафіравала чорны пыл.

Ішлі на ўсход калоны войска,
Забраўшы радасці надзей:
Чуць золак —
Вораг прыдзе ў вёску,
Бяду кріне прывядзе.

І нехта ў полі клікаў сына:
— Вярніся, сынку!..
Хто-ж цяпер
Хаціны нашае краіны,
Хто-ж абароніць без цябе?! —

Але прайшло
І знікла войска,
І стала ціха навакол.
Ад сонца вузкая палоска,
Як стужка, ўпала над ракой.

Рака схіснулася ў даліне,
Зашалясцеў сухі аір.
Жалезны мост,
Як павуціна,
Павіс на ліштвах цераз вір.

Па мастаўі,
Як рысы-жылы,
Чыгунных рэек паясы
Пабеглі параю няўхільнай
Аж за азёры,
За лясы.

Лясы шумелі на трывогу:
— Куды ты, грозная ЧК?
Не едзь утоптанай дарогай —
На долю будзеш наракаць.

Тваіх галоў чакае вораг,
Падмогі марна ты не шлі:
Палкі чырвоныя за горы
Яшчэ у ранку адышлі.

І Ў ЧК ПАЧАЛАСЯ НАРАДА

Пазалотаю тонкай вакзал
Убірала вячорнае сонца.
Цягнікі адышлі
        і назад
Праз гадзіну вярнуліся зноўку.

Параходы прайшлі па Дзвіне
І прынеслі трывожныя чуткі:
За вярсту ад вакзалу ці дзве
Аўладалі бандыты чыгункай.

Аўладалі мастом,
        ля ракі
Перарэзалі ўсе пераходы:
На вакзале стаяць цягнікі,
На пристанку стаяць параходы.

Нерваваліся людзі ў ЧК,
Гаварылі —
        пакінуць трэ' ветку.
Камісар загадаў пачакаць,
Покуль вернецца наша разведка.

Вартавалі дарог палатно
Ахінёныя зморай атрады.

Летні вечар прыйшоў пад акно,
І ў ЧК пачалася нарада.

Ценявой павалокаю сад
Шалясцеў над пустыняй палеткаў.
Задуменны сядзеў камісар,
Слухаў рапарт уважна разведкі.

Мігацелі у зацьме агні.
Рзалі коні трывожна і глуха.
Камісар данясенне спыніў,
Загадаў прапанову паслухаць.

— Мае таварышы!
Ніколі
Не ведаў страху наш атрад:
З любой засады —
вымчаць коні,
А ці наперад,
ці назад.

Не ў гэтым рэч.
За нашым войскам
Цягнік нядаўна вёз прыпас.
Пакуль апал насілі з вёскі —
Ён запыніўся тут на час.

І раптам банда захапіла
Чыгунку скрозь каля ракі,
Два параходы затапіла,
Назад вярнула цягнікі.

Няма калі нам траціць часу:
За намі вораг наш ідзе,
І трэба вывезці прыпасы
Ці па зямлі, ці па вадзе.

Вы,
камандзіры эскадронаў,
Як толькі сцішыцца агонь, —
Пагрузіце
прыпас
і коні
І самі сядзеце ў вагон.

А зараз клічце машыніста,
Няхай ён будзе лепш пры мне.
Калі зрыхтуеце ўсё чыста —
Прашу паведаміць мяне. —

Адказ кароткі:
— Ёсць!
— Ідзеце!
Махаў вялізманым пяром,
Качаўся,
        слаўся
                лёгкі вецер,
Каб чыста вымесці перон.

## У ДАРОГУ

Калі сонца за мора пайшло —
Вечар зоры сабраў на мітынг,
Месяц жоўты стаяў над сялом,
Быццам з золата тонкага літы.

Вартаваў ён людскі супакой,
Толькі дзе там яго увартуеш:
Гаманіў кулямёт за ракой,
Ахінёны туманнаю туляй.

І трывога павольна расла,
Як раслі чалавечыя цені, —
Гэта сум на палетках паслаў
Палахлівых начэй шалясценне.

Бо спакойна мігалі агні,
Нагружалі вагоны чэкісты,
Уздыхаў на пероне цягнік,
Залатыя губляючы іскры.

А калі,
        насупор ціхіх дум,
Падалася каманда:
        «Гатова!»,
Так,
        як коні храпуць на бяду,

разбіваюць
        цяжкія падковы, —
Заірзаў,
        пашчапаў супакой,
Аж звяры у лясах пашалелі,
І пайшоў ён павольнай ступой,
Выгінаючы гнуткае цела.

А пасля —
        ўсё хутчэй
                і хутчэй,
Аж звінелі вагонныя шыбы,
Быццам чуў,
        што вось гэтых людзей
Ён апошніх вязе на пагібель.

## У СТАНЕ ВОРАГА

Адчарадаваўся месяц ясны,
На змену выйшла мілавіца;
Упалі кос ружовых пасмы,
Як згібы тонкай бліскавіцы.

Яна звязала косы бантам
І стала, зорная, над лесам:
Дзівілася на тую банду,
Што ў Беларусь прыйшла з Одэсы.

На мосце моцна спала варта,
А коні тупалі на полі;
Каля агню гулялі ў карты
На лёс,
        на шчасце
                і на долю.

Якая смешная наіўнасць
Не знаць,
        што долю сваю самі
Яны расстрэлілі нявіннай
Сваімі лютымі рукамі!

І дзень наступнага,
        бясспрэчна,
Рыхтуе смерці падарунак:

Схіснуўся важка мост над рэчкай
І зазвінелі рэйкі-струны.

— Трывога! —
　　выпрастаўся голас,
Заекатаў далёка ў лесе:
— Калі не свой —
　　поўсотні голаў
На соснах шыбельных павесіць.

Вы чуеце —
　　падземны рокат,
Бяда бяду
　　нясе атраду:
Цягнік ідзе,
　　і недалёка,
Якую льга прыдумаць раду?

Раскідаць рэек мы не ўхопім —
Сігнал трывожны запаліце,
Заляжце поблізу ў акопы —
Цягнік павінен супыніцца. —

І вось
　　у змроку прадсвітальным
На стромкім насыпа адхоне,
Як водблеск месяца аддальны,
Замігацеў агонь чырвоны.

## ТРЫВОЖНЫ СІГНАЛ

Быццам віхар з вятрамі,
　　імчыцца цягнік,
Толькі рэйкі звіняць,
　　толькі рэйкі гудуць:
Праязджае шпарчэй
　　і шпарчэй машыніст
За вярстою —
　　вярсту,
За вярстою —
　　вярсту...

Адшумелі лясы,
    прамінулі палі...
«Як-жа мост прамінуць,
    пераехаць раку?»
І трывога расце—
    гэта скруха зямлі,
І ЧК —
    начыку,
І ЧК —
    начыку.

— Хто там смелы такі,
    каб цягнік тарнаваць?!
Не спыняй цягніка,
    не спыняй, машыніст,
Бо за здраду
    з плячэй паляціць галава! —
А цягнік —
    павальней,
        прыпыніўся цягнік.

І, як шэлест лясны,
    пракаціўся прытоены рокат:
— Гэта ён...
— Гэта ён нас прывёз на пагібель!
— Перарэзаны шлях...
— Семафорам закрыта дарога... —
Хтосьці плакаў,
    і слёзы звінелі па шыбах.

І расла навальніца
    нянавісці дзікай і злосці.
Нехта крыкнуў тады:
    — Расстраляць камісара... —
І з вагона ў вагон,
    як дэпеша па радыё Роста,
Абляцела чэкістаў усіх
    тэлеграма.

Знерваванай хадою
    прыйшоў камісар,
Быццам сэрца пачула
    трывожныя весткі;

Ён халодным дакорам
шкляных акуляр
Паглядзеў на сцяне
на кавалкі абвесткі.

А пасля —
глянуў ветла
на чорных людзей,
Загадаў праз хвіліну
знайсці машыніста.
І пятнаццаць чэкістаў —
пайшло да дзвярэй,
А поўсотні —
маўчала чэкістаў.

— Што-ж, сябры!
Расстраляйце мяне,
Знаю вашы намеры ліхія...
З нас ніводнага смерць не міне—
Дыванам сваім белым накрые.

Перарэзала банда наш шлях —
Семафор у трывожным сігнале.
Покуль змрокам спавіта зямля,
Нас не будзе трывожыць навала.

А калі загарыцца зара,
Калі сонца на пасеку выйдзе —
Прыдзе вораг жыццё забіраць,
Насміхацца над намі ён прыдзе.

Адабраўшы усё:
і душу,
І надзею на шчасце краіны, —
Павядзе пад насмешлівы шум
І павесіць на першай асіне.

Выйдзе маці каторага зваць,
Анямеюць ад крыку палеткі.
Будзе доўга з надзеяй чакаць
Суцяшальнай і радаснай весткі.

А калі вецер весткі прымчыць,
Яны сэрца матуліна вымуць, —

Пойдзе зноў жабраваць,
Клянучы,
Што сыны аддаліся жывымі.

Што-ж, сябры,
Расстраляйце мяне,
Толькі ворагу я не аддамся:
Усёроўна нас смерць не міне —
Без яго лепей згінуць, прынамсі... —

Ані слова адказу
не чуў камісар —
Затаілі глыбока
трывогу чэкісты,
Толькі нехта нясмела
ў цішы адказаў,
Што яны не знайшлі
анідзе машыніста.

Спахмурнела тады
ў камісара чало:
«Без яго можа будзе...
загінуць лягчэй...».
І поўсотні бялявых
і русых галоў
Закрычала маўклівым
шаленствам вачэй.

Бліскавіцай прабегла
халодная дрож,
Камісар затаіў
гэты боль галавы,
Павярнуўся і выйшаў:
— А ну, паравоз! —
І пагладзіў ласкава
рукой паравік.
Уздыхнуў,
застагнаў
і нязроўнай ступой
Зварухнуўся цягнік
і павольна пайшоў.
Нехта біўся аб сцены
сваёй галавой,

Нечы сударжны твар
скамянеў і пажоўк.
Бо здавалася —
зараз,
як толькі на мост,
Зварухнецца зямля,
як пад бураю сад,
Сіметрычнасць сусвету
ахопіць хаос
І загіне навекі
жыццё і краса.

А цягнік ўсё ішоў...
і трывожны сігнал,
І масты,
і засады
мінуў ён даўно.
За вярстою
вярсту
Камісар яго гнаў,
Не шкадуючы цвёрдых,
жалезістых ног.

## НА НОВЫЯ ПРАСТОРЫ

Мінула ноч, і сонца ўстала,
На ясны выйшла небакрай,
Пялёсткаў скрозь нарассыпала —
Няхай пад ветрамі гараць.

А ветры лёгкія здалёку
Насустрач беглі цягніку,
Віталі ветлы яго лёскат
І пошчак неслі за раку.

Яны разносілі трывогу
І скруху сэрцаў маладых,
Віталі нашу перамогу,
У песнях славілі уздым.

Цягнік імчаўся
далей,
далей —
Бліжэй да сонечнай красы,

І рассцілаліся па шпалах
Чыгунных рэек паясы.

Яны вялі да новых боек,
Да новых такжа перамог,
Каб сілы нашыя удвоіць,
Каб пралетарый перамог.

Вялі на новыя прасторы,
Каб такжа іх адваяваць
І запаліць над імі зоры
Комуны светлай хараства.

## ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

Пайшлі ў далёкае выгнанне,
Як на вадзе ідуць кругі,
І дні вялікага змагання,
І ночы цёмныя тугі.

На небе расцвітае яснасць,
Як пацалунак маладой.
Мае сябры,
Якое шчасце
Прайсці жывому над вадой!

Мінуць трывожныя сігналы,
Павахтаваныя масты,
Дзе ў старасвецкіх прычындалах
Стаяць варожыя пасты.

У шатах новага пакрою,
Прыкрыўшы рыцарскі саян,
Пяром вялізманым узброен
Галоўны іхні атаман.

А навакол яго —
штукмайстры,
Як слугі верныя яго,
Вянкамі руж і белых астраў
Прыгожаць меднае чало.

Як дзень, так ноч —
нямыя суткі
(Нямала часу так прайшло),

Адценні радасці і смутку
І не кранаюць медны лоб.

Рукой халоднай
        безупынку
Ён ставіць творчасці пячаць:
За радасць нашую —
        адзінку,
За сум варожы —
        цэлых пяць.

Мае сябры,
Якое шчасце!
Мінаемварту,
        край зямлі...
І хвалі шоўкавыя лашчаць
Пяшчотнай ласкай караблі.

Гараць трывожныя сігналы,
І вораг вабіць на спачын,
А караблі —
        ўсё далей,
                далей
Плывуць па сонца ў далячынь.

Нішто не зверне іх з дарогі:
Ні навальніца,
        ні скавыш,
Ні мора грозны тайны рокат,
Ні смерць адважных стырнавых.

І ні варожыя сігналы,
З агнямі злосці і маны,
Што караблі іх абагналі,
Што ўзадзе кінуты яны.

Мае сябры,
Надзея цвеліць,
Што не рассыплецца краса —
Яна дажджом
        пялёсткаў белых
Аквеціць новы зорны сад.

А не ўтаймуем буры словам,
Не будзем ныць і наракаць,
Мы сонца цвет і пурпуровасць
На цвёрдых вынесем руках.

*1929 г.*

## З ПАЭМЫ «АРЛЯНКА»

... А бывае часіна,
    што ноч навылёт
Прасвідруе цябе успамінамі:
Паўстаюць,
    выдаецца,
        мільёны галоў,
Што ў змаганні за волю загінулі.

Гэта нашае памяці струджаны след
Кліча іх ад балонак гісторыі, —
І прыходзяць яны,
    як жывыя,
        у сне,
І тады урачыста гаворым ім:

— Мы калісьці у шэрагах грозных ваяк
Прысягалі над вашымі трунамі
Збудаваць над сусветам высокі маяк,
Што завецца Вялікай Комунаю.

Перад вамі сягоння запаляць агні
Усе нашы электрыкастанцыі:
Аглядайце краіну даўнейшых руін,
Дзе хадзілі ў дваццатым паўстанцамі! —

Між герояў,
    што славяцца досціпам рук,
Вызначаем пачэснае месца ім:
Яны ўсе баранілі калісь Беларусь
Радавымі чырвонаармейцамі.

Яны ўсе ваявалі за нашу вясну —
Гэта помняць жывыя
    і ведаюць,

І упарта,
    сумленна
        цагліны нясуць
У падмурак Комуны сусветнае.

Маладыя паэты!
    У цёмных лясах
Мы не біліся з ворагам шаблямі вострымі, —
Дык падымем-жа спеў,
    панясем на прасцяг,
Як вянок на магілы геройскія.

Мы прысвецім найлепшую песню сваю
Тым,
    што йшлі праз балоты палескія,
Што загінулі мужна ў вялікім баю
    за Беларусь,
    за Совецкую!

* * *

Б'е зямлю капытамі конь,
Выгінае шырокую шыю:
Чуе —
Мчыцца за ім эскадрон,
Чуе —
Коні храпуць чужыя.

Гэта гоніцца блізкая смерць
Праз нізіны,
    узгоркі
        і гаці.
Узяліся пачуцці гарэць
Неадступным жаданнем змагацца.

Не за славу крывіцкіх славян,
Не за ўласную долю
І лёс свой,
А за шчасце рабочых,
Сялян,
Гарадоў занядбаных
І вёсак.

І ласкава цяжкою рукой
Песціць коннік шырокую шыю:
— Быццам віхар,
Імчыся, мой конь,
Каб цябе не дагналі чужыя!

Нам патрэбна хвіліна адна
На жыццё
І на ростань з палямі.
Калі возьмем яе —
не дагнаць,
Не злавіць нас тады за лясамі...

Дык імчыся жыццю наўздагон,
Недалёка ускраіна гаю... —
Выгінаецца стомлены конь,
Да зямлі жыватом прыпадае.

Толькі сілы слабеюць штораз,
Штохвіліны цяжэй усё дыша.
Гэтак блізка жаданы папас,
Але смерць за папас яшчэ бліжай.

Аглянуўся адважны яздок, —
Даганяе раз'ятраны вораг.
Павярнуў ён каня
і уздоўж
Выцяў з роспачы вострую шпорай.

Ашалеў замардованы конь,
Зачапіўся за камень дарожны,
Спатыкнуўся,
узняўся,
ізноў
Паваліўся,
працяжна захропшы.

Ухапіўся за стрэльбу ваяк,
Безнадзейна навокала глянуў:
Пакаціліся вочы каня
І расталі у белым тумане.

А на змену з імглістасці тэй,
Як вясновыя нашы заранкі,
Загарэліся іскры вачэй
Маладой
    і далёкай
        каханкі.

Навявала яна супакой,
Але вораг разбіў
    і парушыў:
Абступілі хлапца навакол
І скруцілі вяроўкамі рукі.

* * *

Здратаваным лугам,
Збітымі палямі
Праязджалі цугам
Белыя палякі.

Праімчаўся лёскат
Пошчакам драўляным:
На пастой у вёску
Ехалі уланы.

Зазвінелі шыбы,
Затрашчалі клямкі.
Вісне над сялібай
Апантаны лямант.

— Уцякай,
    дзяўчына,
Сплямяць твае грудзі! —
А яна ў кручыне
Заламала рукі.

Правялі уланы
Скручанага вязня:
— Гэта-ж любы Янка,
Дарагі мой,
    ясны...

Выправіла з гора
Да сваіх,
    чырвоных...

Дзе-ж ты быў учора?!
Дзе-ж ты будзеш сёння?!

На якім-жа месцы
Смерць табе учыняць?! --
Плача каля весніц,
Журыцца дзяўчына.

Афіцэр здалёку
Глянуў на аблічча;
Падміргнуўшы вокам,
Пад'язджае бліжай:

— Пекная сялянка,
Кім ты занядбана?
Пацалуй,
смуглянка,
Русага улана!..—
Задрыжэлі бровы,
Глянула наўскоса:
— Пацалуй...
як зловіш,
Болей не папросіш! —

Афіцэр ад злосці
Закусіў аж губу:
— Гэй,
гуляйце
госці,
На чужую згубу!

Покуль хлеба хопіць,
Будзем гаспадарыць...
Пачынайце,
хлопцы,
Покуль гром не ўдарыў! ---

Зарыкалі нема
Пад нажом каровы,
Набухалі гневам
Цёмныя дубровы.

Галасілі маткі,
Ажно лес галёкаў:

Рабаваў манаткі
Афіцэрскі лёкай.

Лютыя жандары
Разрывалі сэрца.
«Трэба іх пажарам
Назаўсёды сцерці!».

Паразносіў чуткі
Вецер скоры,
лёгкі.
Аб'едналі думкі
Блізкіх
і далёкіх.

І як вечар дымны
Постаці заценіў,
Ціха ад будынкаў
Адышліся цені.

* * *

Межамі,
полем,
дарогаю,
проста,
Праз цаліну,
наўкасы,
уцалік
Крадзецца ціха
за постаццю
постаць
Далей ад хаты,
ад роднай зямлі.
Клічуць лясы,
непраходныя пушчы,
Вабяць сваім
недаступным нутром:
Там
ані здзекаў,
ні панскай распусты,
Там толькі
смелы гартуецца крок.

Там
запаляюцца крыўды настроі
Помстай праўдзівай,
        што кліча да дзей.
Лес партызанам —
        надзейная зброя,
Пушча —
        магутная іх цытадэль.
Межамі,
      полем,
            дарогаю,
                  проста,
Праз цаліну,
        уцалік,
              наўкасы
Выходзіць
        змагацца
              загнаная вёска,
Крадуцца цені
        ад хат,
              у лясы.
. . . . . . . . . . . . . . .

*1930 г.*

## З ПАЭМЫ «АРКА НАД АКІЯНАМ»

Шумелі стагоднія пушчы, лясы
Над багнай балот багуністых.
Азёры у пышных абоймах лазы
Вянком выглядалі квяцістым.

Ажына, і лотаць, і дзікі чарот
Разносілі водар навокал.
Звярыныя сцежкі у нетрах балот,
У твані губляліся вохкай.

Ніколі не быў чалавечы там след,
І толькі паданні гавораць:
«Калі дзяцюку станавілася зле,
Ішоў утапіць свае гора...».

Напоены водарам дзікай красы,
Паветрам азёр халаджавых,
Былі тыя пушчы, балоты, лясы
Як-бы самастойнай дзяржавай.

І вось нечакана спрадвечны спакой
Парушаны быў у аснове:
На нетры балотныя ранняй вясной
З рабочымі выйшаў Яновіч.

* * *

Хто не бачыў палескіх паводак вясной,
Той ніколі прыгожай не знаў панарамы:
Чайкі, плаўна махаючы белым вяслом,
Не дасягнуць сыйсціся ніяк з берагамі.

Берагі адыходзяць, паводка расце,
Паляшук у святочным, кужэльным адзенні
Яшчэ ўранку чакае на выспу гасцей,
Але толькі увечар убачыць, сустрэне.

І прабудзе нямала на выспе той госць,
Як-бы дзе ў чужаземным, далёкім палоне,
Покуль хвалі уцешаць няўтольную злосць
І павольна сыходзіць пачнуць з абалоны.

Як спрадвеку, таксама і ў гэту вясну
Паглядалі сяляне ў бязмежнае мора:
Можа друга пазнаюць свайго па вяслу,
Можа з сынам каханым убачацца скора.

Але ціха вакол, і куды ты ні глянь —
Ні каханага сына, ні любага друга:
Балаты і азёры — суздром акіян,
Адзінокая чайка плыве валацугай...

Дваццаць пяць весляроў апусцілі вясло,
Ловяць пальцамі казачны цень багавіння;
Яны змералі шыр непраходных балот,
Адплываюць павольна цяпер на спачынак.

І калі даплылі ўжо да цвёрдай зямлі, —
Люстравалася пушча ў празрыстасці хваляў,
І здалося, стаяць пад вадой караблі,
Што затоплены некалі ў часе навалы.

Гэты вобраз красы, як здабытак вякоў,
Кінуў кліч паўставаць на змаганне ізноўку.
Схвалявалася бурна гарачая кроў,
І Яновіч падаў веслярам дыспаноўку:

— Покуль павадка йдзе, прасціраючы шлях,
Трэба змераць глыбінь гэтых нетраў дзівосных,
Бо пасля недаступнаю стане зямля, —
Налягайце-ж мацней, мараходы, на вёслы! —

Разыходзяцца кругі,
Замыкаюцца кругі,
Пыркі крохкія, як шкло,
Узлятаюць пад вяслом.

Устурбаваныя хвалі
Чайку плаўна залюлялі,
Адыходзіць яна ў даль,
Замыкаецца вада.

А вясна узлёты песціць:
— Заспявайце, хлопцы, песню,
Хай усплёскамі ад слоў
Выгінаецца весло! —

Разыходзяцца кругі,
Замыкаюцца кругі...
Падхапіў вясёлы хор
Стройны песенны акорд:

### Песня

Вышай, таварыш, весло!
Чайка імчыць да ясноты.
Толькі зімой і вясной
Нас не пужае балота:

Павадкі сіняй шляхі
Не сцеражэ перашкода;
Белай раўніны снягі
Також вядуць да ясноты.

Лета і восені дні
Нас падняволяць стыхіі.
Гэй-жа наперад, чаўны,
Коні мае залатыя!

Вышай, таварыш, вясло!
Чайка імчыць да яснотьы.
Толькі зімой і вясной
Мы непакорны балоту!

* * *

Які заблытаны хаос,
А мо' іронія прыроды:
Налева скрозь, азёры скрозь
І непраходныя балоты.

На ўсход-жа сонца ад балот
Пяскі рассыпчата жаўцеюць;
Працята смагай навылёт
Зямлі спустошанае цела.

Узгоркі зганьбілі уздым,
Прасцерлі гладкія далоні,
І чарадою да вады
Збягаюць чорныя адхоны.

Уткнуўшы нізкія ілбы
У камяністы цвёрды бераг,
Спадаюць стромаю, як-бы
Свае раты на воду шчэрадць.

Як толькі-ж хваля набяжыць —
Ваду рачную смокчуць смагла:
Ніяк не могуць атушыць
Сваёй няўтольнай вечна смагі.

У гэты край — пустэльны сад
Вітаць вясновыя заранкі,
Свае праекты расказаць
Хадзіў Яновіч на гулянкі.

На стромкім беразе ракі
Стаяў ён доўга у задуме;

Шумелі крыллем ветракі,
Як неўтаймованыя думы.

Тут і лятункі расцвілі
Мігценнем пышным, каляровым
Пра лёс натруджанай зямлі...
Але раскажа лепш Яновіч.

Яновіч

Краіна вечная туманаў,
Лясоў шумлівых і лазы,
Яшчэ не скончаны паўстанні —
Ты чуеш, клічуць галасы!

У вёску, горад шле сігналы:
Пара ісці ў апошні бой,
Паўстаць узʼюшанай навалай
Супроць звычайнасці старой.

У адказ на шчырае вітанне
Запульсавала бурна кроў;
Ідуць на новае змаганне
Сыны учорашніх рабоў.

Я чую, любая краіна,
Я чую гэтую хаду:
Цяжкія крокі індустрыі
Да перамогі нас вядуць.

Наперакор ліхой стыхіі,
На гэтай згруджанай жарстве,
Узняўшы вежы залатыя,
Прыгожы горад расцвіце.

Узляжа ён красой чыгуннай
На плечы згорбленыя гор,
І прабягуць тунелі вуліц,
Умітусь выснуюць узор.

Уранку высцелецца густа
Ад новых фабрык чорны дым,
І расцвітуць заместа пушчы
Зялёнакосыя сады.

Я веру ў гэтыя лятункі,
Загоцім долі нашай гаць...
Імкнецца вораг злосны тунна *,
Бо мы не станем удыгаць.

Ад накановане заспы
Тварцы ўздымаюцца на кліч,
Я першы высыплю тут наспу —
Хаос у стройнасці злучыць.

Замкнём развой навал у шлюзы,
І ажыве электрастан...
Ён будзе сімвалам саюза
Тварцоў — рабочых і сялян.

* * *

Начавалі зоры на узлессі,
Устурбованых наснілі сноў:
Пад нагамі нечымі у лесе
Чулі ўночы шэлест верасоў.

Даняла трывога галасамі
Задуменнасць вечную зарніц:
«Можа хочуць людзі над лясамі
Запаліць уласныя агні?».

Неспакойна досвітку чакалі,
Каб даведацца якіх прычын,
Але сон закрыў павекі шалем,
І пайшлі зарніцы на спачын.

Прыпыніўся месяц на адкосах
І аблічам нават пацямнеў:
Прыглядаўся доўга на дзівосы,
Ды не мог нічога зразумець.

Выдавалася, што белы мошаст
На пясках пажоўклых пабялеў;
Незлічоныя мільёны мошак
Аж кішаць у скошанай траве.

---

*) марна

«От наладзілі-ж паганы вэрхал,
Знепакоілі высокі мой пасад»,
Пасмяяўся месяц ціхі зверху
І пайшоў паволі у свой сад.

Толькі сонца выведала тайну,
На пустэчу глянуўшы здалёк:
На пляцы электрастану
Будаваўся новы гарадок.

Узраслі будынкі вокамгненна
(Развінуўся утрапёны лёс),
Быццам волат, сціснуўшы у жменю,
Іх сюды аднекуль перанёс.

На пясках, здратованых слядамі,
Як узгоркі, высяцца шатры...
Воблік створанай зямлі вякамі
Рух людскі за ночператварыў.

І мільёны грабароў і цесляў
На работу сталі ад цямна:
«Трэба воту дадзеную здзейсніць,
Трэба край да радасці узняць!».

Загудзелі нетры і алёсы,
Зашумелі пушчы і лясы...
Не патрэбна там прынук і ўпросаў,
Дзе так шмат і шчасця і красы.

Кліча сэрца сэрцы на дагонкі,
Каб хутчэй дапяць за рубікон,
Адклікаецца на іх гамонку
Маладая кроў будаўнікоў.

### Грабары

Цвёрдай, працоўнай рукой
Рэжам глыбока каналы:
Хай адплывае з вадой
Доля ашчадная — скнара.

Будзем мы лепшай глядзець,
Будзем тварыць яе дбайна;
Працу цяжкую людзей
Хутка падменяць камбайны.

### Муляры

Выведзем выш камяніц
Вышай ад самых узлётаў,
Будуць гудкамі званіць
Фабрыкі нашы, заводы...

Як падарунак вясне,
Без макулінкі завады,
Будзе цвятліва яснець
Намі здабытая радасць.

### Рабочыя чыгункі

Праз балаты, лазнякі
Высцелем крохкія рэйкі,
Будуць іграць цягнікі
На галасістых жалейках.

Лёгкай хадою экспрэс
Будзе прыходзіць у госці...
Згіне і выцвіце спрэс
Жальба з вачэй маладосці.

### Усе

Долі прыгожай зару
Мы прывітаема заўтра.
Не навярэджвае рук
Радаснай працы упартасць.

Творцы даюць пачуццё
Новаму стылю ў сучассі.
Мы пераможам усё
Для чалавечага шчасця.

Будзем дняваць, начаваць,
А не пакінем работы:
Строгі зарок — будаваць
Новыя свету ясноты.

* * *

Калі будзеш, мой добры чытач,
Вывучаць Беларусі абшары —
Не забудзься: на карце адзнач
Алаўком каляровым імшару.

Перакрэслі, закрэслі зусім
Ценявую умоўнаю лотаць:
Дзе была запляснелая сінь,
Там няма і адзнакі балота.

Высцілаецца роўны прастор,
Быццам стэп неаглядны навокал.
І гавораць жыты аж да зор,
Наліваюцца ядраным сокам.

І чумее вясной ярына,
І шалеюць мурожныя травы.
Непраходных балот — не пазнаць
І звычайнаю песняй — не ўславіць.

Толькі звон залатых правадоў,
Што напяты, як струны, над краем,
Толькі рокат турбін над вадой
Урачыстыя гімны сыграюць.

І уславяць змаганне людзей
І напружную творчую працу,
Бо умелі у віхры падзей
Адначасна тварыць і змагацца.

І раскажуць, калі ўпершыню
Праз балота, імшару, па шпалах
Цягнікі перайшлі глыбіню
Непраходных азёр і каналаў;

І раскажуць дакладна, калі
На магутным электрыкастане,
Несучы індустрыю ў палі,
Зашумелі маторы, дынамы;

І раскажуць яшчэ, як прасцяг
Спавілі у драцяныя струны...
Усю веліч будоўлі жыцця
Ты пачуеш у песнях чыгунных.

*1929 г.*

## *1931—1935*

## УРАЧЫСТАСЦЬ

Асыпана зорамі вецце,
І снег першазімкавы — чысты.
Таварыш,
Сягоння пачнецца
Вялікая скрозь урачыстасць.

На плошчы марознай увечар
Краіна мая маладая
Выпроствае дужыя плечы,
Работу сваю аглядае.

Хоць рукі натруджаны вельмі,
Хоць нервы напяты аж надта —
Не катуе сэрца пякельнасць,
Бо вынік у працы багаты.

На чорных выжарах-руінах,
Дзе першых каралі паўстанцаў,
Гудуць правады над краінай
Магутных электрыкастанцый.

Гамоняць фабрычныя трубы:
«Каб рукі сахой не вярэдзіць,
Пытанне пастаўлена рубам —
Дагнаць,
Перагнаць,
Апярэдзіць!»

Адолены прорвы і гаці,
Змятаем загоны і межы,
Каб вольна прасцерлася праца
На нашых прасторах бязмежных,

Каб скрозь на палетках калгасных
Работу рабілі камбайны,
Каб ветла смяялася шчасце,
Радзілі палі ураджайна.

Хоць сцежка цяжкая на дзіва —
Кірунку да мэты не зменім:
Гісторыя шлях прысудзіла,
А думкамі вызначыў Ленін.

Няхай перашкоды віюцца,
Ніколі ў шляхах не прыстанем:
Вядзе нас у глыб Рэвалюцыі
Дарогаю вернаю Сталін.

Рэспубліка ў новыя строі
І горад і вёску адзела.
Змаганняў вялікіх героі,
Не выцветуць вашы надзеі!

Недарма вы мужна пранеслі
На дужых плячах рэвалюцыю:
Вясёлыя гімны і песні
Паводкай шумлівай ліюцца.

Мы помнім,
Што кроўю здабыта
На працу вялікае права,
І множым упарта здабыткі,
Як гонар,
Геройства
І славу.

*1931 г.*

## ЧАТЫРЫ ВЯТРЫ

Ёсць чатыры кірункі свету —
Скрозь прасторы краіны мае,
Ёсць чатыры кірункі ветру —
Кожны песню адну пяе.

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсёй,
Па маёй,
Па краіне — вятры.

Я пяскамі прайшоў на ўсход,
Я па моры аб'ехаў Крым,
Я глядзеў, як на поўначы лёд
Разбіваюць нашчэнт вятры —

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсёй,
Па маёй,
Па краіне — вятры.

Дзе ступала мая нага —
На балотах, на скалах гор —
Завіхаюцца як мага,
Падымаюць круты віхор

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсёй,
Па маёй,
Па краіне — вятры.

Гэта нашы лясы шалясцяць,
Гэта нашы заводы гудуць,
Гэта з нашай будоўлі — наўсцяж
Цераз горы і моры ідуць

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсёй,
Па маёй,
Па краіне — вятры.

І я знаю, што спеў турбін,
Наш агонь і гарачую кроў
Цераз межы чужых краін
Пранясуць у навалах скрозь

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсіх,
Ды па тых,
Па краінах — вятры.

Першы вецер скірую на ўсход,
Дзе Бенгалія і Кітай...
Хай ідуць вызваляць народ,
Ланцугі векавыя скідаць

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсіх,
Ды па тых,
Па краінах — вятры.

Пойдзе к захаду вецер другі —
Паднявольную ўзняць Беларусь...
Заспяваюць у Лондане гімн,
У Парыжы запаляць зару

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсіх,
Ды па тых,
Па краінах — вятры.

Трэці вецер на поўнач пашлю...
Перайшоўшы праз горы завей,
На змаганне падымуць люд
За правы і здабыткі свае

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,

З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсіх,
Ды па тых,
Па краінах — вятры.

І чацвертага ветру шлях
Я на поўдзень сухі павяду,
Каб і там красавала зямля
І наўсцяж праставалі хаду

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсіх,
Ды па тых,
Па краінах — вятры.

Так я вызначыў шлях і мэту;
Хай-жа, вотлю адкінуўшы сум,
У чатыры кірункі свету
Песню мужную пранясуць

З усходу — вятры,
І на захад — вятры,
З паўночы — вятры,
І на поўдзень — вятры,
Па ўсіх,
Ды па тых,
Па краінах — вятры.

*1932 г.*

## МОЙ ШЛЯХ

Ты вельмі багатая,
Наша зямля:
І горы
І нетры
Належаць табе.
Ты вузкі занадта
І доўгі быў, шлях:
Ніхто да канца
Не праходзіў цябе.

А я, непакорны,
Наважыў прайсці
І горы,
І нетры,
І далеч дарог,
Бо дужасць маю
У маланках расціў
Найбольшай навалы
Разгневаны гром

Ты вельмі багатая,
Наша зямля;
Я такжа
Багаты
(вялікасцю дум),
І я перайду цябе,
Доўгі мой шлях:
Эпоха маю
Акрыляе хаду.

*1932 г.*

## ПРА СВАЁ ЖЫЦЦЁ

Я мінаю,
Мая краіна,
Ланцугі тваіх дзён і гор,
Я праходжу,
Мая краіна,
Твой шырокі,
Як свет,
Прастор.

І калі ёсць такая радасць,
Не развеюць якой вятры, —
Я нясу гэту добрую радасць,
Як усмешку мае сястры.

Бо на лес успаміны кінуў,
Патапіў у віры маладосць —
Занядбаную сіраціну...
Іх аплакаў танклявы дождж.

Так была
Пакарана памяць
Пра былыя гады і дні,
Каб не засціла
Чорная памяць
Маладога жыцця агні.

Я мінаю,
Мая краіна,
Ланцугі тваіх дзён і гор,
Я праходжу,
Мая краіна,
Твой вялізны,
Як свет,
Прастор.

*1932 г.*

## ДУЖАСЦЬ

Гады міналі.
Крокам сціплым
Краіна йшла да перамог.
Мы будавалі, як паліпы,
Вяршаліны яе дамоў.

І насупор дажджу і ветру
Вялі прасторныя шляхі
Цераз балоты,
Цераз нетры,
Цераз пяскі пустынь сухіх.

Таймуючы тугу і здраду
Чужынскіх дум,
Варожых дзей,
Мы падымалі барыкады,
Каб вораг не прайшоў нідзе.

І скрозь —
На ўсіх пясках пустыні,
На стромах рэк,
На скалах гор —
Паўсталі крэпасці краіны:

Турксіб,
Кузнецк,
Магнітагорск.

І гэтай велічы не зрушыць
Ні вораг злы,
Ні люты час:
Мы палажылі ў сцены дужасць,
Якой валодае наш клас.

*1933 г.*

## НАША ПАСТАНОВА

Дужасць шырокіх тваіх плячэй,
Цвёрдасць маіх спрактыкованых рук,
Яркія сонцы тваіх вачэй,
Сэрца майго непадкуплены стук —
Усё,
Чым багаты шчаслівы наш лёс:
І сілу тваю,
І мужнасць маю,
Узгадаваў і праз буры пранёс
Нашых рэспублік вялікі Саюз.

Рабочы Данбаса капаў руду,
Рабочы Масквы вырабляў прадукт,
Ферганскі калгаснік збіраў пахту,
Чароды авец гадаваў пастух,
Рабочы палеткаў вырошчваў хлеб,
Рабочы чыгункі яго вазіў —
І я перажыў восемнаццаць лет,
І ты перажыў восемнаццаць зім.

Вось так пакрысе ад рэспублік усіх
Работнікі фабрык,
Зямлі
І сяла
Нам перадалі часцінку сіл,
Долю гарачай крыві і цяпла.

І я,
Узгадованы сілаю рук,

Што будавалі краіну маю,
Я падымаю й на плечы бяру
Штодзённай работы часціну сваю.

Ты такжа сумленна нясеш яе —
Вялікае працы маленькую дзель,
І долю работы твае і мае
Мы вымяраем на цвёрды рубель.

Наліты крамянасцю нашых год,
Ён дужасці поўны,
Агню і цяпла,
І мы парашылі аддаць яго,
Каб наша краіна ярчэй цвіла.

І я кладу першы яго на стол,
І ты кладзеш першы яго на стол,
І я падымаю руку за сто,
І ты падымаеш руку за сто,
За сто поўнакроўных
Адсоткаў пазыкі
Другой пяцігодкі вялікай.

Няхай наша дужасць шырокіх плячэй,
Няхай наша цвёрдасць упартых рук,
Няхай нашы сонцы праменных вачэй,
Няхай нашых пульсаў узгоднены стук,
Няхай наша сіла
І наша кроў,
Што ў сэрцах няспынна гудуць і пяюць,
Няхай-жа бароняць і росцяць скрозь
Нашых рэспублік вялікі Саюз.

*1933 г.*

## ПАЧАТАК ВЯСНЫ

Вясна прыходзіла звычайна:
На берагі глухіх нізін
Сачыліся з узгоркаў тайна
Крывыя вены ручаін.

Пасля з грымотамі і звонам
Вада шчапала крохкі лёд;
Складалі кайстры плытагоны
І шыхаваліся ў паход.

Тады ішоў за сонцам сівер
Бызьнёг праветрыць на мяжы;
Са стрэх,
Бядою даўняй сівых,
Плылі да долу капяжы.

Галодныя каровы гвалтам
Будзілі вусціш веснавы,
Ламалі дзверы на кавалкі
І ў поле йшлі шукаць травы.

Чародамі хадзілі дзеці
Бацькоў сваіх заўважыць след,
Што дзесьці там,
На белым свеце,
Рупліва здабывалі хлеб.

Нарэшце скрозь дарогі сохлі,
Вярталіся бацькі дамоў,
Аглядвалі старыя сохі
Пад шэпты дзедаўскіх замоў.

І клянучы і так пракляты
Свой лёс
І чорны смутак дум,
На вузкія палосы з хаты
Вывозілі сваю бяду.

Дзяўчаты клікалі вяснянак,
Але напеў самотны быў...
Так пачынаўся першы ранак
І дзень вясновае сяўбы;

Так пачыналася звычайна
Згрызота думак
І яна —
Мізэрная людская дбайнасць, —
Так пачыналася вясна.

Даўнейшыя адпеты песні,
Вясна бярэ інакшы шлях:
Адменнае зусім прадвесне
Мая рэспубліка прайшла.

Падняўшы струджаныя сілы
На стоптаных абшарах скрозь,
Яна ў змаганні нарадзіла
І ўзгадавала дужы рост.

Яна старанна так і дбайна
Да мэты высцілала шлях,
І на палі прыйшлі камбайны,
І радасць новая прыйшла.

Зруйнованы дашчэнту межы,
Прастораў зрокам не абняць,
Да іх навальна з ветрам свежым
Прыходзіць бурная вясна.

Яшчэ грыміць з лясоў паводка,
А поле смагне скрозь і схне:
Надзвычай вызначан кароткі
І клапатлівы час вясне.

І трэба выйсці дружным строем —
Раней ад ранняе зары, —
Вясны навальныя настроі
Магутнай сіле пакарыць.

Каб адплаціла злая глеба
За наш калішні горкі пот
Арудамі цяжкога хлеба,
Стократ узняўшы умалот.

Каб весялейшы ад вяснянак
Мажор калгаснай песні быў...
Так пачынацца мусіць ранак
І дзень вясновае сяўбы.

Так пачынацца скрозь павінна
Вялікай працы шырыня,
Руплівая людская пільнасць
І бальшэвіцкая вясна.

*1933 г.*

## ПЕРАМОГА

У нас было шмат
для гаворкі прычын:
Над садам вясна
рассыпала пялёсткі,
Чарэмшынай пахкай
цвіла далячынь,
Заходзіла сонца
ў ружовых усплёсках,

Мы дбайнай рукой
дасявалі ганкі,
Наступнага планы
разгортвалі шырай,
Нам ветла ўсміхаліся
нашы жанкі —
І гэтае ўсё
выклікала на шчырасць.

Адменнае слова
сказаў старшыня:
— Мой сын на граніцы
чырвонаармейцам,
Мы з ім парашылі,
што кожнаму з нас
Належыць змагацца
за першае месца.

І я, безумоўна,
шчаслівы і рад,
Што добра зародзіць
густая пшаніца,
Што сын мой —
савецкай краіны салдат —
Пільней вартаваць будзе
нашы граніцы. —

Наступнае слова
трымаў брыгадзір:
— Мы доўга, бывала,
спрачаліся з братам,
Пакуль не сказалі:
адзін на адзін

ідуць у спаборніцтва
нашы брыгады.

І я гэтак сама
сягонячы рад,
Што нашы аўсы
падымаюцца ўгору,
Што слёсару Мішу,
каторы мой брат,
Не будзе за брата
малодшага сорам. —

Апошняе слова
сказаў трактарыст:
— А мы падпісалі
умову з дзяўчынай:
Хто першы закончыць
сяўбу да пары,
Таму не жаніцца
не будзе прычыны.

І я, прызнаюся,
да чорцікаў рад,
Што нашы палі
Зашумяць каласамі,
Што дзеўчына будзе
старацца стократ,
І выйдзе-такі
за мяне яна замуж.

Ад гэтай прамовы
смяяліся ўсе —
Прычын весялосці
у нас было многа:
Вясна развіналася
ў поўнай красе,
Руплівай хадою
ішла перамога;

Мы дбайнай рукой
дасявалі ганкі,
Наступнага планы
разгортвалі шырай,

Нам ветла ўсміхаліся
      нашы жанкі,
А мы іх любілі,
      любілі іх шчыра.

*1933 г.*

## СКАЖЫ МНЕ, КРАІНА

Краіна мая!
Ты прайшла праз агонь,
Праз буры,
Руіны
І росквіт...
Скажы-ж,
Маладая мая,
Адчаго
Завялі на захадзе росы?

Скажы мне,
Якою часінай,
Калі
Ізноў скалыхнецца зямля,
І зоры асыплюцца
Цветам калін
І высцелюць —
Белыя —
Шлях?

Я хочу
Братэрству наступных комун
Да каліва радасць аддаць.
Каму-ж мне нянавісць
Пакінуць?
Каму
Суровы мой гнеў перадаць?

Занадта,
Аж вельмі,
Малая дачка,
І сын не радзіўся яшчэ...
Скажы-ж мне,
Краіна,
Ці доўга чакаць,
Калі у глыбінях вачэй

Народы няволі
Патопяць свой сум,
Адзіны уславяць саюз,
І дзеці мае,
Як вясну, панясуць
Не гнеў мой,
А радасць маю?

У песнях,
У маршах
Рэспублік тваіх,
У бітвах прыгнечаных мас —
Я чую,
Краіна,
Як грозна грыміць
Над светам
Праўдзівы адказ:

«Надходзіць
Вялікіх паўстанняў пара.
Яна не адступіць назад!».
І я —
Непрыкметны работнік пяра —
Выконваю сціпла загад:

Каб радасць
Вясёлым нашчадкам займець,
Над строем варожых галоў
Вышэй узнімаю
Адзіны мой меч —
Нянавісць
І гнеў маіх слоў.

*1933 г.*

## ЭКЗОТЫКА

«Кіпарысы і Крым?..
        Ах, якая экзотыка!
Улюбёны паэтам
        з маленства
                герой —
Маладая смуглянка
        ў саф'янавых боціках

Вас прытуліць пад лёгкай,
як вецер,
чадрой.
На вяршалінах гор
дыярыту і мармуру
Ап'янееце шалам
надземнай красы,
Пра якую вы самі
не снілі,
не марылі,
І якой не пабачыць
ніколі
ваш сын.
Ах, якая экзотыка!»
Гойкала публіка,
Знатакі разбівалі
ад шчырасці лоб.
Так нядаўна яшчэ
выслаўлялі рэспубліку,
Да каторай мы йшлі
праз круты Перакоп.
Дзе-ж ім ведаць —
аматарам лёгкай экзотыкі,
Што інакшую дзеўчыну
вырасціў Крым?!
Яна ходзіць у простых
патоптаных боціках,
Пазірае шырока
на свет
без чадры.
Яна дні заклапочана
працаю спорнаю,
А пасля,
вечарамі,
з малодшай сястрой
Выбягае на пляж —
маладая і стройная,
Мой таварыш,
мой друг,
мой любімы герой.
І я з ёю
сапраўды
навекі заручаны

І пазбаўлен
        законнага права
                на смерць,
Покуль песня мая —
        агнявая і гучная,
Так,
        як вочы дзяўчыны,
                не будзе гарэць.

*1933 г.*

## ДЗЕЎЧЫНА СОВЕЦКАЕ КРАІНЫ

Дзіўныя твае занадта вочы,
Немагчыма нават разгадаць:
Цёмныя,
Як восеньскія ночы,
Светлыя,
Як морская вада.

Не сказаў-бы,
Што і стан твой гнуткі...
Што-ж мяне пароднiла з табой?
Можа тонкія,
Абветраныя рукі,
Што прапахлі сонцам і вясной?

Можа косы русыя,
Дзяўчына,
Што на старце вецер расплятаў?
Я не ведаю нічога аб прычынах
І пра гэта думаць перастаў.

Я цябе прыймаю,
Быццам песню,
Што праходзіць праз маё жыццё:
Бурную,
Як ранняе прадвесне,
Ясную,
Як поначы касцёр.

Несціханая твая гамонка,
Апавітая жывым цяплом,
Адклікаецца ў рытмах звонкіх
У радках маіх ласкавых слоў.

І тваю шумлівую вясёласць,
Поўную напружнага жыцця,
Я прабую выспеваць уголас,
Вынесці у песнях на прасцяг.

Каб твае пачуцці і настроі,
Чым заўсёды маладосць жыве,
Супраць нашых ворагаў,
Як зброю,
Загартоўвалі мой грозны верш.

Толькі, пэўна, з гэтае прычыны
Заручыў нас тэнісавы старт...
Дзеўчына савецкае краіны,
Ты мая найлепшая сястра!

І няхай пакеплівыя вочы
Немагчыма нават разгадаць —
Цёмныя,
Як ліпеньскія ночы,
Светлыя,
Як морская вада, —

Я цябе прыймаю,
Быццам песню,
Што праходзіць праз маё жыццё:
Бурную,
Як ранняе прадвесне,
Ясную,
Як понач касцёр.

*1933 г.*

## ВЕРНАСЦЬ

Малая!
Дай тваю руку.
Ты нечага, здаецца, тужыш?
Дзівачка!
На тваім вяку
Я самым верным буду мужам.

Мне падабаецца
Твой смелы спрыт,

Твая заўзятасць да работы,
Калі на вусны ад зары
Усмешка скрадзецца употай,

А вочы возьмуцца гарэць
Агнямі дрэў,
Травы
І кветак...
Цяплом іх можна абагрэць
Халодныя краіны свету.

За гэта смешнае цяпло,
За спрытныя
Малыя рукі,
За гібкі стан,
За весялосць,
За песні радасці і скрухі —

Я аддаю табе навек,
На поўнае тваё ўладанне
Глыбіні самых стромкіх рэк,
Дарог шырокіх скрыжаванні,

Кірункі чатырох вятроў,
Вышыні гор,
Усплёскі мора,
Усе напевы ўсіх лясоў
І ўсе над светам зоры.

Ніколі толькі не аддам
За слаўнае тваё жыццё
Рэспублікі,
Даранае нам
За смерць братоў,
За смерць сясцёр.

Яна збудавана сям'ёй комун,
Рукамі нашымі,
Тваімі,
Мы палажылі ў яе грунт
І сэрца нашае
І імя.

І хай пакваляць груганы
На край узрошчаны напасці —

Я першы выйду бараніць
Краіну сонечнага шчасця.

Як бачыш,
На тваім вяку
Я верны буду аж да смерці,
Давай-жа мне тваю руку,
Тваю руку і сэрца.

*1933 г.*

## АДЗІНАЯ АЙЧЫНА

Яна ідзе хадою дбайнай,
Напружана і чынна,
Спрацаваных і занядбаных
Адзіная айчына.

І на прасторах земнай кулі
Грымяць мажныя крокі:
Над глыбінёю нашых вуліц
Будынкі высяць кроквы;

Над шырынёй палёў бязмежных
Шумяць гаі пшаніцы;
Над даўжынёй совецкіх межаў
Не дрэмле пагранічнік;

Над вышынёй узлётаў нашых
Заводы ўзносяць плечы;
Аркестры гучна граюць маршы
Над лёсам чалавечым.

І думка-песня аб Комуне —
Наш смутак і вясёласць —
Ідзе ва ўсіх васьмі кірунках
Па гарадах і сёлах.

Яе — праз горы, акіяны,
Пяскі, лясы і нетры —
Да паднявольных, зрабаваных
Нясуць чатыры ветры.

І людзі ведаюць, як дбайна,
Напружана і чынна
Будуем мы для занядбаных
Адзіную айчыну.

*1934 г.*

## «ЗВЯЗДА»

Ходзяць зоры над краінай нізка...
Досвіткам, калі чуць-чуць відно,
Самая вялікая зарніца
Падае ў маё акно.
Рассыпаецца ў мільёнах літар
Роўнымі шарэнгамі радкоў,
Разрываецца магутным дынамітам
Радасных і гнеўных слоў.
І чуваць выразна ў словах трубных,
Як магутнае жыццё пяе —
Я чытаю пройдзены й наступны
Шлях рэспублікі мае.
Малады, напорысты і ўпарты,
Я імкнуся па яе слядах.
На стале разгорнута, як карта,
Яркая вялізная «Звязда».

*1934 г.*

## УМОЎНЫ ЗНАК

Плывуць над палямі аблокі —
Вялізманыя караблі...
Ёсць недзе за морам далёка
Прасторы чужое зямлі.

Там ходзяць дарогамі людзі —
Мае супараты, браты...
Напэўна,
Няшчасная,
Блудзіш
У гэтых натоўпах і ты.

Ад вечнага гора —
Плечы
Скаваў невядомы страх.
Не ведаю,
Як пры сустрэчы
Цябе і пазнаць,
Сястра?

Не ведаю,
Як твой голас
Адрозніць ад крыкаў нямых?
Усіх вас закатаваў голад
На волі і ў турмах глухіх.

Плывуць над палямі аблокі —
Вялізманыя караблі...
Аднекуль з-за мора,
Здалёку,
З прастораў чужое зямлі
Ідзе і шуміць,
Як вецер,
Суровы й ласкавы адказ:
— Ты стрэнеш мяне увечар
Пры цьмяным святле барыкад.

Між тысяч
Жывых і мёртвых —
Пытаеш, —
Пазнаць мяне як?
Запомні-ж,
Мой дружа,
Цвёрда
Наступны умоўны знак:

Калі перамогу зайграюць,
Шырокія маршы жыцця —
Я першай стаяцьму ад краю,
Высока ўзнімаючы сцяг;

Калі-ж не ўтрымаюць рукі
І вырве яго ў мяне смерць —
Агнём на халодным бруку,
Як сцяг,
Будзе сэрца гарэць.

*1934 г.*

## ВЯСЁЛЫЯ ПЕСНІ

### I

Ад першай нашай стрэчы
І па астатні дзень
Мы ходзім кожны вечар
На мора паглядзець.

У гэты час,
Пад поўнач,
З усіх канцоў зямлі
Нагружаныя поўна
Прыходзяць караблі.

Абвеяныя ветрам,
Абмытыя вадой,
Матросы ў шэрых гетрах
Спяшаюць за табой.

Як гонар свой,
Нясу я
Тады тваю руку...
Падумаеш —
красуня,
хусцінка на баку!

Такіх за мною трыста
Хадзіла па слядах,
Як сходзілі на прыстань
Мы ў дальніх гарадах.

Табе мо' невядома,
Што нашых маракоў
Вітаюць,
Як знаёмых,
Ля кожных берагоў.

Мы з вольнае краіны,
Адной на цэлы свет,
І кожная дзяўчына
Глядзіць нам доўга ўслед.

Любую з іх за жонку
Я мог сабе узяць.

А ты смяешся звонка,
Не хочаш і гуляць.

Не задавайся надта:
Праз некалькі гадзін
Мяне чакае вахта —
Давай-жа паглядзім,

Як поначы на прыстань
З усіх канцоў зямлі
Высокія ўрачыста
Прыходзяць караблі.

II

Ад першай нашай стрэчы
І па астатні дзень
Мы ходзім кожны вечар
На мора паглядзець.

У гэты час,
Пад поўнач,
З усіх канцоў зямлі
нагружаныя поўна
Прыходзяць караблі.

Абвеяныя ветрам,
Абмытыя вадой,
Матросы ў шэрых гетрах
Вітаюцца са мной.

Як гонар свой,
Тады ты
Нясеш маю руку,
Раўнівы і сярдзіты,
З наганам на баку.

Падумаеш —
Прыгожы,
Адзін на цэлы свет!
У шырачэзным клёшы,
Значок на рукаве!

Ты паглядзі на прыстань —
Матросамі кішыць,
Адно маргну,
І трыста
За мною пабяжыць.

Табе мо' невядома,
Які ў мяне пасаг? —
Заводы,
Шахты,
Домны
І русая каса.

Нядарам строяць жарты
Чужыя маракі —
Магу любога заўтра
Узяць у прымакі.

Не задавайся-ж вельмі:
Праз некалькі гадзін
Мне трэба на цагельню —
Давай-жа паглядзім,

Як поначы на прыстань
З усіх канцоў зямлі
Высокія ўрачыста
Прыходзяць караблі.

*1934 г.*

## НАШАЙ СЛАВЫ ЗАРА

Яркая прыветлівым і строгім
Мудрым геніем правадыра,
Ты прайшла вялікія дарогі,
Нашай славы ясная зара!

Ты, высокая, заўжды над намі
У паходах баявых ішла,
Цёмнымі асеннімі начамі
Асвятляла незнаёмы шлях.

А ў суровыя, у сіверныя зімы,
Калі сцюжы залятalі ў дом,
Ўсе рэспублікі маёй радзімы
Саграваліся тваім цяплом.

Мы таму нідзе і не прысталі
У дарозе гэтакай цяжкой,
Нас адно жывое імя — Сталін —
Падымае і вядзе на бой.

У легендах услаўляюць людзі
Гэтае жыццё бальшэвіка...
Песня, загрымі-ж салютам,
Музыкаю кожнага радка!

Хай жыве прыветлівы і строгі
Геній мужнага правадыра,
Што паказвае табе дарогі,
Нашай славы ясная зара!

*1935 г.*

## ПЕСНЯ

*Янку Купалу*

Я памятаю ноч:
Маўклівая дарога
Вілася, вузкая,
У цемры, як змяя;
Абапал пышныя дубы
Стаялі строга,
А мы ішлі —
Мае таварышы і я.

У нас тады была
Напружная работа:
Увесь вялікі дзень
Мы пілавалі лес;
Закончылі;
Пайшлі;
І нейкая самота
За намі рушылася
І пайшла услед.

Такімі мы тады
Вярталіся дадому:
Маўклівыя,
Нібы далёкімі былі;
Мы неслі на сваіх плячах
Цяжар утомы,
І ногі нашы
Прыліпалі да зямлі.

Не выстарчала сіл
Цярпець самоту далей,
І нехта першы
Ціха песню заспяваў,
Мы падхапілі ўсе,
Да зор яе паднялі,
І пакацілася яна,
Як морскі вал.

Ускалыхнуўся стромкі лес,
Запелі нетры,
Вяршаліны старых дубоў
Аж загулі;
Шырокія,
Ва ўсіх кірунках ветры
Прайшлі па стомленай
І змучанай зямлі.

Павеяла вясеннім
Подыхам знаёмым,
Агні празрыстыя
З'явіліся ў вачах...
І мы цяпер
Не цяжкую утому,
А песню лёгкую
Панеслі на плячах.

Высокі месяц узышоў
І стаў дазорцам
Над скрыжаваннямі
Глухіх дарог;
Па іх панеслі мы
Жывое сэрца творцы
На свой далёкі,
Стоптаны бядой парог.

І ён зайшоў
І гасцяваў у нашым доме —
Вялікіх песень маг
І сэрцаў валадар.
Няхай імя яго
Было нам невядома —
Мы неслі ўсе яму
Свой лепшы шчыры дар.

Я памятаю тую ноч...
Яна ў навалах
Сплыла ў нябыт вякоў,
У марачную даль;
Мы ведаем цяпер
Тваё імя, Купала,
Вялікіх песень маг
І сэрцаў валадар.

*1935 г.*

## АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

Ты спіш...
За акном асыпаюцца зоры,
Ідуць безупынна вятры.
У садах
Калышуцца дрэвы,
Ажыны гавораць,
У ставах шуміць
Веснавая вада.

Пакой твой
Напоўнілі
Цёмныя цені,
Святло,
Цішыня
І легенды вясны.
Ты спіш...
Да цябе праз высокія сцены
Прыходзяць спакойныя,
Добрыя сны.

Прачнуўшыся заўтра,
Ты іх прыгадаеш,
Работа заспорыцца
Ў спрытных руках,
І моўчкі на вуснах тваіх,
Маладая,
Усмешка вясёлая
Будзе блукаць.

І ты не падумаеш,
Можа, ніколі,
Што гэта каханне маё
Берагло
І сон твой спакойны,
І рук тваіх холад,
І вуснаў тваіх
Палахлівых
Цяпло.

Ты лёгкую шапачку
Моўчкі адзенеш,
Вясёлая выйдзеш
З другімі гуляць.
Авацыяй вас
Мая крыўда не стрэне,
І зайздрасць услед вам
Не будзе крычаць.

Я вас прывітаю,
Як друг і таварыш,
Аднолькава роўна
Ўсміхнуся ўсім,
З другою вясёлаю
Стану у пары
І буду ад шчырага
Сэрца прасіць:

Няхай над галовамі вашымі
Неба
Раскрые крутыя далоні свае;
Няхай урадлівая,
Тлустая глеба
Вам шчодра
Багаты свой плён аддае;

Няхай дыванамі
Лістоў каляровых
Вятры будуць
Вашы шляхі высцілаць;
Няхай вам спяваюць
Лясы і дубровы;
Няхай вам
Дажджы залатыя шумяць;

Няхай для цябе
Асыпаюцца зоры,
Ідуць безупынна вятры,
У садах
Калышуцца дрэвы,
Ажыны гавораць,
У ставах шуміць
Веснавая вада.

*1935 г.*

## НА МОРЫ

Чорнае мора, пярэстыя хвалі,
Вы адзіноту маю ўкалыхалі.

Я падымаю над лодкаю ветразь, —
Сэрца да сэрца імчыцца пад ветрам.

Дзеўчына, ты ў Беларусі далёкай!
Колькі цябе ні гукай, ні галёкай, —

Не адклікаешся: тужыш і мучыш...
Толькі дарэмна: я вельмі жывучы!

Марна вачэй тваіх хлопцы шукалі, —
Мора шумела, каціліся хвалі...

Я не скарыўся, бо ведаю-знаю:
Дзесьці (і скора) цябе напаткаю.

Чую, як сэрца імчыцца да сэрца, —
Ветразь над лодкай пад ветрам ірвецца.

*1935 г.*

## ПЕСНІ ПРЫГОНУ

### 1. ЖНІЎНАЯ

Зайшло сонейка за горы,
На зямлю апалі росы,
Запаліла ночка зоры,
Месяц глянуў на пакосы,
Затужыў над цёмным борам,
І пасыпаліся слёзы...

Гэта плача вінавата
Наша скрыўджаная доля,
Што не маем мы ні хаты,
Ні худобы і ні поля,
Толькі плечы крыюць латы,
Толькі сэрцы ныюць болем.

Мы над панскаю палосай
Цэлы дзень стаялі крукам,
Пагарэлі нашы косы,
Забалелі нашы рукі,
Па дарогах вецер носіць
Нашу песню, нашу скруху...

Мы хвіліны не спачылі,
Усё чысценька пажалі,
Усё ў копы панасілі...
Толькі крыўды, толькі жалю,
Толькі струджанае сілы
У снапы не павязалі...

Хай узнімецца пад зоры,
Хай дажджамі праліецца,
Забушуе чорным морам
І паводкай разліецца, —
Можа змые наша гора,
Можа панства захлынецца.

### 2. ПАЛЮБОЎНАЯ

Высока зоры ружавеюць,
Лятуць буслы пад шляхам млечным,
З лагчыны цёплы вецер вее,

Над пожняй ціхі летні вечар...
Ідуць ад панскай нівы жнеі,
Баляць іх стомленыя плечы.

Гэй, сустрэнь, любы,
Прыгарні, любы,
Мяне, маладую,
Бо ніхто-ж мяне,
Адзінокае,
Не шкадуе.

Мы так стаміліся на полі,
Да ночы жалі ад світання,
Пачуй-жа мой знябыты голас
І выйдзі, любы, на спатканне,
Я раскажу табе пра долю,
Пра наша горкае каханне.

Дык сустрэнь, любы,
Прыгарні, любы,
Мяне, маладую,
Бо ніхто-ж мяне,
Адзінокае,
Не шкадуе.

Няхай-бы цёмная магіла
Паноў праклятых пахавала,
Няхай-бы паню смерць забіла,
Як цяжка нас яна скарала:
Навек з табою разлучыла
І не страчацца наказала.

А ты стрэнь, любы,
Прыгарні, любы,
Мяне, маладую,
Бо ніхто-ж мяне,
Адзінокае,
Не шкадуе.

Усё ад нас з табой забрана:
І сэнс жыцця і радасць смерці,
І толькі думка, мой каханы,
Свабодна да цябе імкнецца:
Няма яшчэ такіх кайданаў,
Каб закаваць людское сэрца.

Дык сустрэнь, любы,
Прыгарні, любы,
Мяне, маладую,
Бо ніхто-ж мяне,
Адзінокае,
Не шкадуе.

### 3. ПЕСНЯ ФРАНЦУЗСКІХ ЖАКАЎ

Не шумі ты, вецер,
У лістах вярбы,
Дай паслухаць сыну
Гэту песню-быль...

Як у замку пышным
Баляваў барон,
Прыязджалі госці
З чатырох старон,
Сенешалы гналі
На прыгон сялян,
Рабавалі хаты,
Неслі госцям дань.

Не шумі-ж ты, вецер,
У лістах вярбы,
Дай паслухаць сыну
Гэту песню-быль...

Як не сцерпеў здзеку
Смелы Жак Прастак,
З плеч кашулі зрэбнай
Не аддаў жабрак,
Як спалілі Жака
За такі «злачын»,
Сіратой застаўся
Невялікі сын.

Не шумі-ж ты, вецер,
У лістах вярбы,
Дай паслухаць сыну
Гэту песню-быль...

Як у працы цяжкай
Вырастаў, дужэў,

Распаляў пажарам
Супроць пана гнеў,
Заклікаў сялянства
У бары-лясы,
Падымаў паўстанне
Смелы Жакаў сын.

Не шумі-ж ты, вецер,
У лістах вярбы,
Дай паслухаць сыну
Гэту песню-быль...

Як паўсталі жакі
На паноў вайной,
Як ішлі са зброяй
Дужай грамадой,
Як палілі замак
З чатырох старон,
Як навек загінуў
Ліхадзей барон.

Не шумі-ж ты, вецер,
У лістах вярбы,
Дай запомніць сыну
Гэту песню-быль.

*1934 г.*

## АБ ПЕСНЯХ І ГЕРОЯХ

*(З паэмы «Карменсіта»)*

Казалі мне калісьці ўсе
(Не верыў я,
Нашто хавацца):
— Ёсць сіла,
Роўная красе,
Багатшая за ўсе багацці.

Я толькі сёння распазнаў
Глыбокі сэнс звычайных ісцін...
Прыйшла,
Як позняя вясна,
І зашумелі дрэвы лісцем.

Я недаверліва спаткаў
Яе мужчынскі,
Цвёрды поступ.
Але кранулася рука
Маіх плячэй
Ласкава й проста.

І дзеўчына сказала мне
(Сястра вядома сінявокай):
— Засумаваў, хлапчук, па мне,
А я хадзіла ў свет далёка.

Як шмат цікавых ёсць краін!
Але шчаслівай я не стрэла.
Ты вопратку маю крані —
Яна ад пылу пасівела.

Як дым,
Ён сцелецца густы
Ад разбурэння

І ад смерці...
А чым-жа нездаволен ты,
Канструктар чалавечых сэрцаў.

Калі рэспубліка твая
Ідзе непераможным крокам,
Калі высока,
Як маяк,
Становяцца над хатай кроквы?

Калі навокала цябе
Гудзе няспынная работа?
Калі і вецер наш цяпер
Прапах наскрозь вясной і потам?

Калі і твой цвілы пакой
Напоен пахам смольнай хвоі...
Змяні свой вузенькі настрой
На шырыню людскіх настрояў.

Вазьмі, жывы,
Сабе жывых,
Адлушч нягодную палову,
І загудзе ў людской крыві
Тваё абноўленае слова.

І водгуллем пальецца спеў
На шырачэзныя прасторы,
І будуць песні твае спець,
Як маладыя нашы зоры.

— Чакай! —
Спыніў дзяўчыну я:
— Мяне-ж гісторыя патурыць,
Калі паэзія мая
Не здолее вякоў культуры.

А хто-ж мне выкрасіць красу
На крэмені чужых настрояў?
Самотную душу нясу
І ўсю на песні перакрою.

— Самота душ —
Мана суздром:
Ёсць пульс жыцця

І рытмы смерці.
Паводле іх пульсуе кроў,
І лучацца людскія сэрцы.

Таму,
Хто першы пульс нясе,
Няма чаго жыцця хавацца:
Ёсць сіла,
Роўная красе,
Багатшая за ўсе багацці.

Глядзі,
Зняверлівы паэт, —
Акно дзяўчына адчыняе, —
Яны стары руйнуюць свет
І новы свет красы ствараюць! —

Над плошчай узнімаўся гмах,
Упарта працавалі цеслі,
І кожны іхні крок і ўзмах
Напоўнен быў маўклівай песняй.

Нарэшце,
Нехта не сцярпеў,
Адбіўшы такт двума нагамі,
Ён выбраў словы
І запеў
Дзівацкую якуюсь гаму.

Яна расла,
І сотні рук
Яе паднялі і панеслі,
Пасля рассыпалі на брук
Кавалкамі жывое песні.

І над галовамі людзей і стрэх
Цягнуўся альт,
Грымеў басіла,
Каціўся дыскантовы смех,
І ў сценах ракатала сіла.

Я сілу гэтую адчуў,
Як незнаёмую прыгожасць,
І я сказаў:

— Я сам хачу
Сыйсці з крывога раздарожжа.

Я сам пазнаў,
Што не Кармен
Гарачым абсыпала прыскам
Сухое дрэва панскіх сцен,
А гэта ты,
Мая актрыса,

Узяўшы песню даўніх дзён,
Сягоннешнім агнём гарэла.
І ты не ведаеш імён,
Але з табой мільёны пелі.

І ты не знаеш іх вачэй,
Але яны цябе віталі —
Над светам голас твой гучэў
Грамамі бур,
Агню
І сталі.

Вядзі-ж у гэты свет цяпер
Мяне ад вузкага пакою.
Няхай жыццё мой сціплы верш
Густымі сокамі напоіць,

Няхай у стройным тканні жыл
Жывая кроў людзей заб'ецца. —
Тады ён толькі будзе жыць
І хваляваць людскія сэрцы. —

Я змоўк...
І на маім вяку
Упершыню маўчала вусціш.
Дзяўчына сціснула руку,
Пацалавала ціха вусны.

Такі шаблонны быў канец
Гісторыі і Кармэнсіты —
Жывая дзеўчына мяне
Прывабіла вачэй блакітам.

Але шчэ ў песнях прапяюць,
Яшчэ у музыцы уславяць,

Якімі сродкамі
Маю
Нягодную ламалі славу.

Якімі горнамі цяпла
Мой голас
І мае настроі
На мужны гартавалі лад
Уласныя мае героі,

Героі фабрык і садоў,
Высозных гор,
Марэй вялізных,
Героі сёл і гарадоў —
Будаўнікі соцыялізма.

*1933 г.*

## НОЧ У ВАЙСКОВЫХ ЛАГЕРАХ

Быў вечар і вецер.
    Вяршаліны гор
Пярэстая хмара
    займала упарта:
Ішла навальніца...
    А мы —
        насупор —
Спявалі,
    смяяліся,
        строілі жарты.
Утому штодзённую
    сівер сагнаў,
І дрэвы пад ёю
    цяжэлі паволі.
Гарністы ігралі
    трывожны сігнал
На цёмную ноч
    і на выхад у поле.
Звінелі падковы,
    шумела трава,
Грымелі тачанкі
    і бразгалі цуглі.

Чатыры палкі,
як адна галава,
Прайшлі скрыжаваннямі
лагерных вуліц.
І вось,
калі зніклі,
палатак уздоўж
(Праз поле,
праз нетры,
праз цёмную буру!)
Таварыш Ганчарык —
наш лепшы яздок —
Прамчаўся,
як віхар,
шалёным алюрам.
Мы змоўклі
і чулі:
гудуць капыты —
Далёка,
як зоры,
трывожна,
як нервы.
І мы прыгадалі
былыя гады,
Каторых ніхто
і ніколі
не верне.
І от
маладзейшая
з нашых гасцей
(Такая танклявая,
быццам травінка,
А вочы —
як сонца,
усмешка —
як дзень)
Спытала ў камдзіва
надзвычай наіўна:
— Скажыце,
якi-ж быў
шалёны алюр,
Якою падучкаю
курчыўся вецер,

Калі цераз горы,
        ваду
                і зямлю
Вы неслі
        жыццё маладое
                планеце? —
Пярэстая хмара
        даўно заняла
Увесь небакрай
        і прастору над намі,
Вятры ацяжэлі,
        і цемра лягла —
Густая,
        як стоптаны жвір
                пад нагамі.
І мы не падолелі
        цемры падняць,
І мы не заўважылі
        сполаху вырыс.
Мы чулі адно,
        як прайшла цішыня,
Як стомлены голас
        падняўся
                і вырас.
Ён сумнай
        іроніяй,
        смехам звінеў,
З адценнем пяшчоты,
        ласкавай на дзіва.
І мы,
        аж пакуль
                не ўзялося віднець,
Уважліва слухалі
        слова камдзіва:
— Вам —
        семнаццаты год...
                маладосць!
                        І таму
Дзе-ж вам
        наша юнацтва —
                жабрацкае —
                        помніць.
З-пад фабрычных ярэм

нас запрэглі ў хамут,
Засупоніўшы туга
салдацкай супоняй.
Дваццаць год!..
гэта-ж толькі —
краса і лятункі!
Але-ж сціснула
жорсткай рукою
вайна,
І з дзесятка
набітых у Туле
ладункаў
Кожны першы
быў супраць
юнацтва і нас.
І калі
страсянулі гарматы
паветра,
Дык не мы
выбівалі чаканку
з-пад ног:
Гэта йшлі на расстрэл
толькі нашы шкілеты,
Бо юнацтва было
расстраляна даўно.
Так прыймалі мы
горкую ісціну смерці,
Але-ж нам
да вар'яцтва
хацелася жыць,
Ненавідзець,
любіць,
колькі выстарчыць сэрца,
І п'янець ад вясны,
ад смалістых ажын.
Вось чаму
з першым поступам
маршавай роты,
Калі з вокан,
балконаў,
кафэ й кабарэ
Асыпалі нас цветам
пад крыкі і рогат,

Узялася нянавісць
        ізноўку гарэць.
І пазней,
        у акопах,
                залітых вадою
І засыпаных градам
        азызлых галоў,
Яна вырасла —
        наша нянавісць —
                прыбоем
І пайшла
        ад салдата
                к салдату
                        без слоў.
Дзе-ж тут занізі
        вашай рамантыкі кволай,
Дзе-ж тут ваш,
        маладая,
                шалёны алюр?!
Мы на нервах сваіх
        перавешалі сволач,
У каторай забралі
        ваду і зямлю.
І здабыткі свае
        баранілі не крыкам:
Калі куль не было
        і клінок быў тупы —
Пад варожымі кулямі
        клаліся крыжам,
А ніхто не хацеў
        і не мог адступіць.
Прыгадалася мне
        Астраханская стэп...
З тых сыпучых пяскоў,
        праз бураны калючыя,
Толькі наша упартасць,
        падняўшы пратэст,
Мужна вынесла
        сцяг баявы рэвалюцыі.
От які абыдзённы
        і шэры
                быў лёс,
Што цвятлівіў смугу

нашых дзён маладосці,
Але кожны яго,
быццам песню,
пранёс,
І на ваша юнацтва
яна не зайздросціць.
Так вучыла жыццё:
каб адолю дастаць —
Мала мчацца,
як віхар,
шалёным алюрам,
Трэба маршам
праз ноч
перайсці й не прыстаць...
І вось гэтую сціпласць
мы вам і даруем!
Ёсць такое жаданне:
калі загрыміць
Непадкупнай расправы
бунтоўная песня,
Каб вы такжа упарта,
як некалі мы,
Роўны сонцу
штандар рэвалюцыі
неслі. —
Так кончыў камдзіў,
І, як чорны вяшчун,
Пярэстая хмара
ўзмахнула крыламі,
Халодныя кроплі
буйнога дажджу
Забомкалі
тонка
па гонтах
над намі.
Наўсцяж
скалыхнуліся бурна
лясы,
І вецер зайграў
вербалозавым тэмбрам,
Маланкі шпурлялі
наніз
паясы,

І ўсё неадступна
        згушчалася цемра.
І мы
        не падолелі
                цемры падняць,
І мы
        не сказалі
                камдзіву
                        ні слова.
Мы чулі адно,
        як ішла цішыня,
Як дзесьці
        далёка
                звінелі падковы.
І толькі пасля, —
        калі чорная сінь,
І гром,
        і маланкі
                спаўзлі за адхоны, —
Мы чулі выразна,
        што блізка зусім
Храпуць неспакойна
        і цокаюць коні.
З паходу вярталіся
        нашы палкі,
Прайшоўшы
        праз ноч,
                кіламетры
                        і плягу,
Пранёсшы
        вінтоўкі свае
                і клінкі,
Няўтомнасць,
        задор,
                маладосць
                        і адвагу.
Яны запявалі
        будзёнаўскі марш,
І песня
        шумела,
                як рокаты мора,
І песня
        расла галасамі да хмар,

І ёй адгукаліся
белыя зоры.
Тады мы й пазналі
сваю маладосць,
Каторая,
вотлю
адкінуўшы жарты,
У гэтую ноч
і праз гэтакі дождж
Ішла у паходзе
нястомна
і ўпарта.
І мы —
непакорнага класа
сыны —
Сказалі такое
звычайнае слова:
— Таварыш камдзіў!
На пагрозу вайны—
Адказ маладосці:
«Заўсёды гатовы!»
Мы добра умеем
лятункі снаваць,
Мы также умеем
за права змагацца,
І мы
абаронім
ад чорных навал
Адзіную ў свеце
рэспубліку працы. —

Праменнае сонца
і дзень малады
Былі задаволены
нашым адказам,
Яны небакрай
абагнулі круты
І весела
з намі
смяяліся разам.

*1932 г.*

## АПОШНЯЯ СТРЭЧА

Час нашай стрэчы спавіты у дым,
І калі вызначыць дату ільга —
Сяброўства маё пачалося тады,
Калі пачалася мая туга.

Нам быў загад наступаць на Казань,
А мы наступалі на цёмную ноч,
Бо мы не маглі ўжо вярнуцца назад,
Хоць нашы палкі адступілі даўно.

Над намі ірваліся горы гранат,
Пад намі зямля ракатала, як гром,
Накрыж агнём частаваў супарат,
Самым пякучым на свеце агнём.

Кругамі маланкі ішлі уваччу,
Кроўю пясок жвіраваты прамок,
І нехта зняверлівы першы пачуў,
Як наш кулямёт захліпнуўся і змоўк.

Прайшла урачыстай хадою смерць,
Праняўшы дрыготнае цела наскрозь...
Я адчуваю яшчэ і цяпер,
Як здрадлівым пульсам забілася кроў.

Цемра на момант сплыла ў далячынь,
Бязмежнасць прасторы мяне абняла.
Я стаў з цэлым светам адзін-на-адзін,
Без кроплі жывога людскога цяпла.

Тады й нахапілася тая туга,
З каторай шукаеш сяброўства сляды,
Каторую чуеш заўсёды наўгад,
З катораю хочацца быць маладым.

І мне стала дарага наша жыццё,
Бо нам даручыла рэспубліка скрозь —
Праз гора,
І радасць,
І карны касцёр —
Пранесці паходняй сваю маладосць.

Я рукі тады палажыў на пясок —
І сілай зямною наліўся мой пульс,
І жвір вокамгненна навылет прасох,
Зацiхлі пявучыя посвісты куль.

Я поўз безупынна...
І раптам пачуў,
Як роспачна катуе некага смерць;
Я хутка намацаў ягоны плячук,
І чалавек зразумеў мой намер.

Аберучкі горача сціснуў руку,
У нас не было аніякіх прысяг:
Мы добра і так разумелі,
Адкуль
Прыходзіць ратунак
І дзе яго шлях.

І мы папаўзлі паміж трупаў далей,
Дзе стыў асірочаны наш кулямёт,
Я справа залёг,
А таварыш — лявей
(І гэта звязала на тысячы год).

Навобмацак ладзілі зрушаны шчыт,
На слых насцярожаны бралі прыцэл.
Ён стужкі падносіў,
Я градам крышыў,
Аж пальцы папухлі на правай руцэ.

Нарэшце адолю зайграў кулямёт,
Залпам яе падхапілі стралкі,
І вораг,
Прабіты агнём навылёт,
Падаўся назад
Цераз ноч і пяскі.

З гэтага бою нас выйшла няшмат,
І кожны сяброўствам сваім даражыў:
Таварыш далёкі —
Стаў блізкі, як брат,
І нам было добра і радасна жыць.

Такі быў пачатак сяброўства майго,
З каторым прайшоў я чатыры франты,

Мінуў,
Як гавораць,
Ваду і агонь
І вынес,
Як кажуць,
Пад сэрцам у тыл.

А тут і спаткала абодвух ваяк
Вялікая ростань
На некалькі год:
У горад вілася дарога мая,
У вёску імкнулася сцежка яго.

І так,
За шляхамі наўсцяж ідучы,
Між намі прастора лажылася зноў...
Усё-ж не магла затапіць далячынь
Сяброўства былога на цёмнае дно.

Дармо,
Што даўно адступілі ў нябыт
Далёкай сустрэчы
Далёкія дні;
Дармо,
Што на новых франтах барацьбы
Ягоных вачэй пацямнелі агні;

Дармо,
Што на ўзмежках паштовых дарог
Лісты размінуліся нашы навек, —
Я верыў:
Шляхамі маіх перамог
Са мною ідзе дарагі чалавек.

Я верыў:
У нашых здабытках усіх
Ёсць права ягоных натруджаных рук,
Ёсць частка ягоных вялізманых сіл,
Каторыя паляць над краем зару.

І дні праміналі...
Я сам пастарэў,
Пад вязкаю год падаліся сябры.
І мне наяву захацелася стрэць
Таго,
Хто начамі са мной гаварыў.

І мы з ім сышліся за круглым сталом,
Не ведаю добра —
Каторага дня,
У зале тады засядаў правяркой:
Два строгія члены
І я — старшыня.

Прыкрыўшы павекі далоняй рукі,
Стаяў чалавек,
Незнаёмы,
Чужы...
Ён доўга казаў пра чыесьці грахі
І плакаў,
Што цяжка змагацца і жыць.

Але ён ніколі не смеў наракаць
На чорнае гора,
На долю сваю.
Дармо,
Што замест двух кварт малака
Яму толькі кварту чамусьці даюць.

Адгэтуль і родзіцца прыкры настрой,
Няхай небараку даруюць яго:
Ён мужна калісьці прайшоў, як герой,
Чатыры франты,
І ваду,
І агонь.

Так гаварыў нам чужы чалавек,
І раптам...
Я голас ягоны пазнаў,
Згадаў,
Што калісь на пясках,
На траве
Нас дружбай навек заручала вайна.

Забілася сэрца...
Ўзнімаючы пыл,
Прамчаліся коні,
Запелі дажджы,
І здрадлівы вецер руку падхапіў —
Падаць чалавеку,
Каторы чужы.

Я сілаю класа стрымаў гэты ўзмах,
Шпурнуў супроць ветру ударам пляча:
Я ўбачыў,
Што друга былога няма,
А хітрага ворага —
Трэба знішчаць.

Тады загарэлася ненавісць мас,
На тло спапяліла варожую кроў,
Судзіла за дружбу няверную нас,
Карала за здраду,
Паліла наскрозь.

Яна ад вачэй чалавечых ішла
І кладкі старыя тапіла нашчэнт,
Агністаю лавай між намі лягла,
І мне стала раптам святлей і лягчэй.

Дзве тысячы коса настромленых рук
Крычалі, сціскаючы пальцамі гнеў:
— Дазвольце мне слова!...
— Я слова бяру!... —
Дзве тысячы рук падтрымалі мяне.

Тады я падняўся
І цвёрда сказаў:
— Я гэтага знаў чалавека даўно...
Нам быў загад наступаць на Казань,
А мы наступалі на цёмную ноч.

І мы з ім, сапраўды,
Чатыры франты
Прайшлі праз агонь,
І ніхто не прыстаў,
І мы з ім, сапраўды,
Былі, як браты,
Аж покуль ён здраднікам нашым не стаў.

Што-ж мне сказаць пра яго вам цяпер,
Вы знаеце добра і самі усё:
Нас заручыла калісьці смерць —
Нас разлучае сягоння жыццё.

Аб мёртвых адно успамін берагуць, —
І я не забуду мінулага век;

З мёртвымі дружбы людской не вядуць,
Ідзі-ж ты ад нас,
Нежывы чалавек!

Так наша стрэча спавіта у дым,
І калі вызначыць дату ільга, —
Сяброўства маё затанула тады,
Калі затанула мая туга.

*1933 г.*

## КАРА

Памяці т. Рэдыкі, забітага агентамі польскай дыфензівы па дарозе ў мястэчка Влохі.

Біце ў далоні,
        іграйце ў літаўры,
Спраўляйце банкеты
        сваім героям,
Нясіце вянкі ім,
        зялёныя лаўры,
Золатам вышыйце
        іхнія строі,
Смейцеся
        і весяліцеся, каты!
Вы не пачуеце
        нашых праклёнаў:

У нас надзвычайна
        вялікая страта,
І слова паэта
        належыць мільёнам

Няхай яно скажа,
        як жыў і загінуў,
Як з ворагам біўся
        таварыш Рэдыка,
І простая мова
        маіх успамінаў
Пракоціцца клічам
        да справы вялікай.

Нявольнікі працы
        адплацяць паўстаннем

За ранную старасць,
        за слёзы маленства.
Так вырасце кара
        і, грозная, стане
Найлепшым адказам
        на ваша шаленства.

Дарога ідзе на Захад.
Цяжкі асядае пыл.
Суровыя дрэвы
Узмахам
Сваіх шырачэзных крыл
Трымаюць нязменна варту
Над гэтым вячорным сном.
Адно чалавек упарта
Спяшаецца недзе праз ноч.

Кашлатага ценю лапы
Паўзуць на пярэймы з нізін,
Кладуцца панура абапал
Глыбокіх, як дол, каляін.

Куды-ж ты ідзеш,
Таварыш?
Вярніся,
Далёкі друг!
Дабрацца табе да Варшавы
Не хопіць
Ні ног,
Ні рук,

Тых ног,
Што на кожнай грэблі
Пакінулі босы след,
Тых рук,
Што дубовую мэблю
Рабілі на цэлы свет.

Вярніся!..
Вялікая стома,
Цяжар не маленькі твой:
Яшчэ у маленстве дома
Цябе нагрузілі бядой.

Каб з голаду сёстры не мерлі,
Каб хлеба скарынкі былі, —
На фабрыку гнутае мэблі
Цябе хлапчуком адвялі.

Ты гнуўся над працаю крукам,
Гады аднастайна ішлі,
Твае аслабелыя рукі
Раз'елі нашчэнт мазалі.

Крывавым абліўшыся потам,
Ты ў стоме на дол прыпадаў,
А катаржны вынік работы
Заўжды спажываў гаспадар.

«За чэрствы кавалак хлеба,
За шклянку халоднай вады —
Хіба-ж чалавеку трэба
Гэтулькі зносіць бяды?»

Праклятае гэта пытанне
Таміла цябе не раз.
Праўдзіваю мовай паўстання
Табе адказаў твой клас.

І ты,
Калі быў над Млавай
Падняты чырвоны сцяг,
Пайшоў ваяваць за права
На роўную долю жыцця.

Крутыя парогі рэўкома,
Чырвонае арміі шлях,
Узмежкі дарог незнаёмых
Твая маладосць прайшла.

Аб тым,
Як далёкі пошчак,
Жывуць успаміны адны,
Бо зноў над прасторамі Польшчы
Пайшлі паднявольныя дні.

Бо зноў на заводах Варшавы,
На роўных пазнанскіх палях,

На вуліцах роднае Млавы
Бізун і прымус загуляў.

У глыб баявога падполля
Адходзіць атрад змагароў,
І ты,
Малады комсамолец,
Вядзеш сваіх юных сяброў.

І ты,
Сакратар комсамола,
Чатыры вясны і зімы
Праходзіш суровую школу
У сценах варшаўскай турмы.

Вось так у змаганні нязменна
Ты рос змагаром з хлапчука,
І з важным цяпер даручэннем
Ідзеш ад самога ЦК.

Відаць,
Што сягоння дзесьці
У цёмных закутках хат
Чакаюць цябе
І дзейсных
Наказаў тваіх і парад.

Чакаюць узрыўных,
Як міны,
Тваіх большэвіцкіх слоў...

І ты,
Мой таварыш,
Няспынна
Мінаеш сяло за сялом.

Я знаю —
Ніякая сіла
Не верне цябе назад.
Прайдзі-ж над глыбокай магілай,
Як вецер — над строем прысад,
Як віхар праходзіць над морам,
Як птушкі ідуць над вадой,
Як рэкі абходзяць горы —
Міні свой смяротны дол.

Напэўна праведаў вораг,
Згадаў па тваёй хадзе,
Ў які ты імкнешся горад,
Якою дарогай ідзеш,
Якія агні паўстання
Нявольнікам працы нясеш.

І вось ля мястэчка Влохі
Рыхтуюць табе засад.
Спяшайся!
Стаміліся ногі?
Наважыў вярнуцца назад?

Цяпер раздумлёўваць па часе
І позна гадаць цяпер.
Няхай наша сіла класа
Праз смерць правядзе цябе.

Імкніся!
Яшчэ два крокі,
І ты перашкоду мінеш...
Чаму-ж гэта цень твой высокі
Пайшоў танцаваць у цямне?

Ты падаеш ніцма, дружа,
А стрэл, як шалёны, завыў.
І вось...
Паміж чорных лужын —
Лужынка свежай крыві.

Далоняй у пыл урастае
Жывая яшчэ рука,
І карай грыміць,
Вырастае
Смерць вернага члена ЦК.

І вочы яго з дакорам
Апошні агонь нясуць,
І вусны нямыя гавораць,
І мы выракаем прысуд:

Біце ў далоні,
 ігрáйце ў літаўры,
Спраўляйце банкеты
 сваім героям,

Нясіце вянкі ім,
зялёныя лаўры,
Золатам вышыйце
іхнія строі,
Смейцеся
і весяліцеся каты!
Вы не пачуеце
нашых праклёнаў:
Мы іншую вам
падрыхтуем расплату
За нашы пакуты,
за гора мільёнаў.
Вы бандай драпежнай
жыццё рабавалі
У тых, што мазольнаю
працай спрадвеку
І потам і кроўю
яго гадавалі,
Як самы вялікасны
дар чалавеку.
Мы гэта прыпомнім!
Ярмо ваша скінем,
Абломім ваш тоўсты
раскормлены карак,
Мы пройдзем па ўсіх
паднявольных краінах
Суроваю
і справядліваю карай.

*1933 г.*

## ПРА ВЯСНУ І РЭВОЛЮЦЫЮ

Гэта вы,
мне здаецца,
нядаўна сказалі?
Ці то ваша суседка,
з паднятым брывом?
Адным словам,
я чуў
кагадзе
ў гэтай залі,

Што вясна не прыносіць
ні дум,
ні трывог.
Я лічыў-бы за жарт
гэтай прыкрасці выраз,
Каб, напоперак думкам
і волі самой,
Аж спадыспаду дзён
у вялізманы вобраз
не вырас
Дзень маленства майго
і вясновых самот.
Я згадаў,
як гайсала
галоднае рэха
Па парожніх свірнах...
І каб толькі пражыць —
Уздзіралі на корм
абымшэлыя стрэхі
Перад тым,
як пачнуць
аплываць капяжы.
Я збіраў басанож
крапіву каля плоту
Перад тым,
як зямля
наліецца цяплом...
Можа, вы
і не ведалі
гэтых клапотаў,
А для нас яно —
нашым маленствам было,
І таму
хлапчукамі
ў семнаццатым годзе,
Занядбаўшы забавы,
не знаючы сну,
Мы галодную восень
пры халоднай пагодзе
Сустракалі,
як лепшую
нашу вясну.

Ды на што перагортваць
старонкі гісторыі,
Калі дзеі сучаснасці
катуюць нас!
Я хачу расказаць,
як няўгойнае гора
Залячыла надзеяй
вялікай
вясна.

Дзесьці блізка зусім
адзінокая маці
Абабіла парогі
пастарункаў
і гмін...
Засталася на ўцеху
вяроўка у хаце,
Бо навекі засуджаны
быў яе сын.
І яна,
што сваю
аднастайную сцежку
Прратаптала
праз гора,
нядолю,
і жвір,
І яна
загубіла
апошнюю ўсмешку,
Без каторай нікому
не суджана жыць.
І на цягу начэй,
да вар'яцтва бяссонных,
Калі месяц
над полем аснежаным
стыў,
Яна білася ў роспачы —
дзікай,
шалёнай,
І чытала напамяць
ад сына лісты:

— Сынку...
Сынку...

Ты пішаш:
«Мужайся!»
Абяцаеш вярнуцца
дваццатай вясной...
Покуль тая паводка —
паводкаю жалю
Захлынецца жыццё маё,
добранькі мой!
Хіба-ж выцерпіць
гэтае
маці пакорна,
Доляй выкляты,
любы мой сын! —
І звіваючы рукі,
рыдаючы горна,
Яна доўга глядзела
кудысь ў далячынь.
Так было,
калі краем
хадзіла зіма,
Калі біліся
цені
і вецер
у хату,
Калі дрэвы,
узняўшы
галіны наўзмах,
Вартавалі дарогі
ў адзенні кашлатым.
А пазней,
на прадвесні,
калі уначы
Варушыліся дрэвы,
збіраліся ў сад,
Калі бразгалі
звонка
вяснянак ключы, —
Сын да маткі
таемна
пісаў:
— Маці...
Матанька...
Надзялі мяне сілай!

Дай мне дужасць
разбіць
мураваныя сцены!
Я сягоння пачуў,
калі ты галасіла...
Галасі-ж,
галасі,
каб рыдала каменне!
Бурны подых вясны
мне прыносіць твой голас.
I ці знаеш,
як жудасна
хочацца жыць,
Калі скрозь
наліваецца сілаю
поле,
Калі скрозь
аплываюць
са стрэх капяжы!
Станеш вечарам,
клічаш, клічаш
Праз турэмныя краты
сваю маладосць,
I яна
з далячынь,
быццам гул навальнічны,
Адгукаецца рэхам
і прыходзіць,
як госць.
Значыць,
вырасце,
чую,
такая адвага,
Што на волю
з каменных муроў
правядзе.
Вельмі просты наш план,
і з халоднай развагай
Мы рыхтуем
сваё вызваленне
штодзень.
Без ключоў адамкнем
заржавелыя дзверы

Перад тым,
як зусім
аплывуць капяжы.
І прыду да цябе,
поўны сілы і веры,
Каб ізноўку
за волю змагацца
і жыць. —

Гэтак сын абяцаў
на мінулым прадвесні,
І ніхто не разважыў,
што гэта вясна
Напляла дзікіх планаў,
каторых не здзейсніць,
Пра каторыя
вязні
адно толькі сняць.
Але-ж сталася штосьці
на свеце
такое,
Што навалай шумяць
на прадвесні лясы.
І самотная маці
з халодным спакоем
І дагэтуль чакае,
што вернецца сын.
Дзе-ж ёй ведаць,
старой,
што не шэнціла сыну
Перайсці цераз сцены —
Лукішскі астрог,
І што сын —
вось за гэты
адважны учынак —
Быў павешан
у ліку
другіх чатырох.

Так бывае...
А вы мне
нядаўна сказалі,
Ці то ваша суседка
з паднятым брывом...

Адным словам,
я чуў
кагадзе
ў гэтай залі,
Што вясна не прыносіць
ні дум,
ні трывог.
Я
жыццём
безыменным сваім
пратэстую
І надзею,
як тая матуля,
рашчу,
Што мы стрэнем яе,
вясну маладую —
Рэвалюцыю свету,
каторай не ўшчуць.
Яна прыдзе
пасля
баявога прадвесня,
Яна стане
на ўсіх
скрыжаваннях дарог,
Яна будзе гучаць,
як магутная песня,
Поўным голасам дум
і вялікіх трывог.

*1936 г.*

## ЭМА

Можа казкай цябе назавуць,
Непачатая
мая паэма,
Будзе слухаць гаворку тваю
Гераіня маленькая Эма.

Засмяецца з выгадкі скупой,
А ці бровы нахмурыць сур'ёзна —
Я пра лёс не гадаю твой,
Бо і лёс надзвычайна розны.

Мы гаворым:
— Гамоняць палі
Віратлівым прыбоем калгасным... —
А нашчадкі запішуць калісь
Нашы словы,
як дзіўную казку.

Мы гаворым звычайна услых:
— Наступіла комуны прадвесне... —
З гэтых слоў,
Як жыццё, дарагіх,
Зложаць некалі дзіўную песню.

Рознастайны на колеры лёс,
Але ўчуюць нашчадкі ў наступным
У дзіцячых усмешках да слёз
Крокі нашай эпохі чыгуннай.

Бо мы гневам змагання гарым,
Мужнай сілай ударнай дэкады,
А усмешкай вясновай зары
Усміхаецца нашая радасць.

Няхай казкай цябе назавуць,
Непачатая
мая паэма.
Развіваю аснову тваю,
Песню мужнае сілы пяю
І усмешку маленькае Эмы.

* * *

*Тысяча дзевяцьсот*
*Дваццаць першы год.*
*Студзень. Сівер. Зіма.*

Вецер салому змяў,
Вецер салому растрос,
Холадам вецер прарос
У цёмным гнілым хляве.

Курчыцца,
Як чалавек,
Сагрэцца не можа цялё.

А вецер —
Яшчэ налёг,
А вецер —

Праз шчыліны сцен і дзвярэй
За горла жыццё бярэ.

Выйшаў з хлява гаспадар,
Патушыў самадзельны ліхтар,
Пастаяў,
Запаліў ізноў,
Моўчкі ў хлеў увайшоў,
На рукі падняў цялё.

Глянула матка здалёк,
Бегма падбегла да госця,
Лізнула цяляці хвосцік,
Лізнула яшчэ капыткі,
І загаласіла:
— Пакінь,
Пакінь мне дачушку маю,
Я ў салому яе спавію,
Я прыгрэю яе сваім целам,
Выліжу лобік белы. —

Гаспадар не паслухаў слоў,
Гаспадар забраў цялё,
Выйшаў з хлява гаспадар,
Патушыў самадзельны ліхтар.

* * *

*Тысяча дзевяцьсот*
*Дваццаць першы год.*
*Студзень. Холадна. Ноч*

Нехта лёг
Каля ног,
Нехта цёплы,
Касматы,
Як воўк...
Эма ножкай пагладзіла шоўк,
Перабегла па целе шчыкотка,
Узнялося дзяўчо на ўзлакоткі —
Штосьці ў змроку ляжыць на палку...
«Можа воўк
Прыблудзіўся адкуль?»

— Мама, —
Шэпча ціханька Эма, —

Паглядзі,
У нас страшная мэма. —
Засмяялася маці:
— Хавай галоўку! —
Запаліла на гзымсе газоўку.
Палахліва пабегла святло.
Бліснуў белы цялячы лоб.

— Бачыш «мэму» цяпер,
Дачушка,
Гэта-ж рыжанькая цялушка,
Холадна ёй у хляве...

— Дык няхай яна з намі жыве,
Мы пагрэцца палезем на печ...

— А яна
Не пакрыўдзіць цябе?

— Не! —
Саскочыла Эма з ложка,
Узагнала цялушку на ножкі,
Пагладзіла белую лысінку:
— Цялушачка мая,
Кісынька! —

Так пазнаёмілася
З цялушкаю Эма,
І гэта пачатак
Маёй паэмы.

* * *

*Тысяча дзевяцьсот*
*Дваццаць першы год.*
*Дванаццаты дзень вясны.*

Сняцца Эме прыгожыя сны
Залатога маленства,
Як песні,
Сакавітыя на прадвесні.

Але існасць над сном усплыла —
Чуе Эма матулін плач.

— Раскажы,
дарагая,
чаго ты?

—Атруцілі мяне клапоты...

Ты не знаеш,
Мая дзяўчынка,
Гаспадарскай тугі і кручыны.
Яна каменем цяжкім на плечы
Апусцілася ўчора увечар...

Пачыналася летась вясна,
Людзі выйшлі палетак узняць
Ад зімовага доўгага сну,
Яны радасна стрэлі вясну.
Толькі вузкая наша палоска
Дзірваном зарастала за вёскай.

І не выцерпеў болей бацька,
Пакланіўся багатаму дзядзьку:
«Узары і засей палетак.
Мы адробім табе за гэта!»

І за гэту кулацкую «ласку»
Петрык лета служыў падпаскам,
Працавалі мы дні і ночы,
Ад натугі вылазілі вочы,
Ад звярэды дрантвелі рукі
І згіналіся плечы крукам.

Але доля прыйшла і да нас —
Далі ў валасці нам каня.

А цяпер,
Дарагая дзяўчынка,
Зноў адолела нас кручына,
Зноў на поле прыйшла вясна:
Трэба-ж мець да каня і снасць.
Бацька вывеў на продаж карову... —

Уздрыгнулі шырокія бровы,
Страпянуліся вейкі-крозы,
Зазвінелі буйныя слёзы.

— Дык чаго-ж ты,
Матулька,
Плачаш?

— Над жыццём тваім,
Дзетка,

Жабрачым.
Зноў сухі будзе хлеб,
Дачушка...

— Дык-жа ў нас засталася цялушка,
Я вадзіць яе буду на пашу,
Маладую кароўку нашу.
Яна вырасце хутка,
Як бачыш,
А ты, мамка, чагосьці плачаш...

Усміхнулася горка маці:
— Што-ж ты скажаш
Такому дзіцяці?

* * *

*Тысяча дзевяцьсот*
*Дваццаць трэці год.*
*Раніца. Верасень. Восень.*

Вецер над полем галосіць,
Вецер праймае наскрозь,
Студзіць і цела і кроў.

Холадна босай дзяўчыне,
Твар аж да чорнага сіні,
Рукі малыя пакрэплі.

— Выглядні,
Сонейка, ветла,
Высвеці, сонейка, цёпла,
Яснае выйдзі на поплаў! —

Марныя толькі упросы —
Ходзіць над пожняю восень,
Хмарныя звесіўшы крыллі,
Сонейка імі укрыла.

Хай сабе!
Хай сабе ходзіць,
Думак яна не пашкодзіць,
Сэрца яна не астудзіць —
Хай сабе,
Хай сабе блудзіць!

Цешыць дзяўчыну надзея:
Будуць зімою завеі,
Пойдзе дзяўчына ў школу,
Будзе у хаце вясёласць;
Стане цялушачка маткай,
Пойдзе на пашу у статак.

— Дык-жа старайся,
Сястрыца,
Жвава скубі ты травіцу. —

Гладзіць дзяўчына цялушку —
Лысінку,
Вочы
І вушкі.

Холадна босай у ногі,
Вецер шуміць на дарогах,
Вецер халодны скуголіць
Над абязлюдзелым полем.

Пэўна чытач ужо сам
Дзеўчынку гэту пазнаў:
Мы ёй далі ў паэме
Імя прыгожае Эмы.

* * *

*Тысяча дзевяцьсот...*

Шмат прамінула год,
Шмат уцякло вады,
Шмат пастарэў малады,
Стаў дзецюком малы...
Словам,
Гады ішлі.

З імі расла ўгару
Творчасць мазольных рук,
З імі напорнасць расла
Вывесці вёску на шлях
Светлай калгаснай зары,
Каб загулі трактары,
Каб заспявалі машыны,

Каб над палеткам загінуў
Сум непатрэбнай самоты,
Смутак мізэрных клапотаў,
Каб гадавалася радасць
Творчай працоўнай брыгадай.

І вось —
Пяцігодкі крок,
Першы яе гудок
Кінуў над краем кліч
Працаўнікам зямлі:

— Сілай мільённых мас
Рушым у бой за калгас! —

З краю
У край,
Наўсцяж
Высячы ленінскі сцяг,
Працы вялікай люд
Наступ павёў на зямлю,
Наступ на ўласную кроў
І на старое нутро, —
Наступ імклівых і смелых
На кулакоў азвярэлых.

Бойкамі фронт гарэў.
Значыць,
Стаяў на двярэ

* * *

*Тысяча дзевяцьсот*
*Дваццаць дзевяты год.*

Горка старому ў хаце,
Словам дакорным маці
Боль несціханы варушыць:
— Бачыш,
Мая дачушка!
Ты адтаптала ногі,
Ты абхадзіла дарогі,
Ты абвадзіла межы,
Чыстай вадою свежай
Ты «Маладуху» паіла,
Ты «Маладуху» карміла,

Цёмныя ночы не спала,
Ты нам яе гадавала.

Дык запытайся-ж,
Дачушка,
Хай, тваю скаргу пачуўшы,
Бацькава сэрца адкажа,
Што ён,
Пракляты,
Наважыў?!

Не,
Мой ліхі і нялюбы!
Хай мяне возьме згуба,
Хай я загіну не ў час,
Ведай адно,
Што ў калгас
Я не аддам каровы...
Гэта апошняе слова.

— Добра! —
Падняўся бацька:
— Зараз мы гэта пабачым.
Я,
Што наважыў,
Зраблю,
Хоць ты зубамі
Грызі зямлю,
Хоць на кавалкі парвіся. —

Ён павярнуўся
І выйшаў.
Роўны,
Шырокі след
Вызлаўся з хаты ў хлеў.
Там на вяровачны повад
Бацька узяў карову,
Тушачы боль і скруху,
Вывеў на двор «Маладуху».

Маці за повад схапіла,
І нехапіла сілы
Вырваць яго з рукі.

— Татачка,
Родны,
Пакінь! —
Эма заплакала горна.

Рукі абмяклі,
Пакорна
Выпусціў бацька повад.

Ціха стаяла карова,
Вочы блішчэлі спакойна
Болем людскім няўгойным.

* * *

*Тысяча дзевяцьсот*
*Дваццаць дзевяты год.*
*Вечар. Цішынь. Прадвесне.*

І раптам —
Прыгожая песня
Шырокаю хваляй,
Як мора,
Ўзнялася высока над горы,
Пераплыла іх вяршыні
І спакойнай такой ручаінай
Пацякла да вясковых хат.

Сёння быў на палетках старт,
І калгасных аратых брыгада
Везла з поля вялікую радасць,
Везла песню калгаснай вясны
Пасля першай сырой баразны.

Песня зноў
Апаразіла сэрца:

— Досыць мучыцца ў паняверцы!
Цэлы век я цярпеў пакуту
За няшчасны вось гэты закутак...
Але болей не буду,
Даволі,
Я ўжо бачу прасвет і волю.
Хай мяне яна
І не асвеціць,
Прычакаюць яе
Мае дзеці. —

І на матчын дакорны пагляд
Бацька кінуў ад сэрца з болем:

— Хмур,
Не хмур
Свае грозныя бровы —
Я аддам у калгас карову,
Я хачу быць з усімі разам,
Разам з нашым калгасам. —

Вось тады
І падняўся вораг:
— Хэ, суседзе,
Ніякага гора,
Як відаць, у жыцці не маеш,
Што дабро за нішто збываеш.
У комуну,
Вядома,
Трэба,
Але-ж можна туды і без хлеба...
Усё адно лысы чорт забярэ,
От вазьмі...
І паціху зарэж. —

Цішыня зазвінела ў хаце.
— Што ты скажаш на гэта,
Маці?
Не маўчы ты цяпер,
Гавары. —
Раззлаваўся ізноў стары.

— Ты-ж не слухаеш маёй гамонкі,
Быццам я табе больш не жонка:
І крычыш,
І зычыш,
І грозіш...
А на мой,
Значыць,
Бабскі розум,
Калі нельга пражыць без калгасу —
Дык, вядома,
Што лепей з мясам. —

Праняла электрычная дрож,
Бацька сціснуў нервова нож
І крануўся ісці да дзвярэй.

— Супыніся!
Ты што,
Азвярэў?
Ты, відаць, не зусім здаровы...
Я не дам на зарэз каровы!

Калі ты ўжо нядужы і хілы,
Калі ў сэрцы няма болей сілы,
Дык я заўтра сама завяду
Гадаванку маю ў чараду. —

Задрыжэлі дзяўчыніны вусны,
І павісла на момант вусціш.
Плечы выпрастаў зноў стары,
Зноўку радасна загаварыў:

— Ты адна,
Дарагая дачушка,
Маё гора вялікае чуеш,
Ты адна не саступіш з дарогі,
Дык вядзі-ж і мяне старога.

* * *

*Тысяча дзевяцьсот*
*Трыццаць першы год.*
*Восень, Кастрычнік. Ноч.*

Вецер шуміць ізноў,
Вецер трывожыць сон,
Бразгае ў шыбы акон,
І...
Прыпынілася сэрца:
Тупае нехта,
Здаецца,
Бродзіць, як вусціш, ля хаты...
«Можа, на ферме прыпадак?»

Звяла напружанасць рук,
Думкі пабеглі ўгрунь:

«Летась спалілі гумно,
Можа, сяголета зноў...

Новую нашу абору?
Хіба-ж урымсціцца вораг?»

Хустку накінула Эма,
Босая выбегла ў цемень.
Ціха навокала,
Толькі
Вецер халодны і золкі
Свішча-шуміць аднастайна.
Воддаль чуваць каля стайні
Ходзіць калгасная варта,
Сон перамогшы упарты.

Роўна забілася кроў,
Дзеўчына сцішыла крок,
Вусны апырскаў смех:
«Мусіць, мне снілася ў сне...»

Гэтак штоночы трывога
Прыдзе,
Стаіць ля парогу
З думак вялікім бярэмем,
Будзіць турботамі Эму,
Будзіць
І не без прычыны...

Ёй —
Маладой дзяўчыне,
Ферму даверыў калгас,
Помніць яна той наказ,
Помніць
І гэтую справу
Здзейсніць
На гонар і славу:
Дзень перамогі сустрэне
Комсамолка-ударніца Эма.

* * *

Можа казкай цябе назавуць,
Маладая мая паэма,
Будзе слухаць гаворку тваю
Гераіня-ударніца Эма.

Засмяецца з выгадкі скупой,
А ці бровы нахмурыць сур'ёзна —
Я пра лёс не гадаю твой,
Бо і лёс надзвычайна розны.

Мы гаворым:
— Гамоняць палі
Віратлівым прыбоем калгасным... —
А нашчадкі запішуць калісь
Нашы словы,
Як дзіўную казку.

Мы гаворым звычайна услых:
— Наступіла комуны прадвесне... —
З гэтых слоў,
Як жыццё, дарагіх,
Зложаць некалі дзіўную песню.

Рознастайны на колеры лёс,
Але ўчуюць нашчадкі ў наступным
У дзіцячых усмешках да слёз
Крокі нашай эпохі чыгуннай.

Бо мы гневам змагання гарым,
Мужнай сілай ударнай дэкады,
А усмешкай вясновай зары
Усміхаецца нашая радасць.

Няхай казкай цябе назавуць,
Маладая мая паэма,
Развінуў я аснову тваю,
Каб уславіць ударніцу Эму.

*1931 г.*

*1936—1940*

## НА ПАЧАТКУ ЛЕТА

Я не знаю месяца
Больш за май шчаслівага,
Калі пушчы цешацца
З гоману шумлівага;

Калі вербы ніцыя
Рвуцца ўвысь галінамі;
Калі скрозь пшаніцаю
Пахне над далінамі...

Але новы сёлета
Подых на аселіцах:
Юны чэрвень молада
Больш за май вяселіцца.

Травы пахнуць кветкамі,
Кветкі пахнуць зорамі,
Зоры над палеткамі —
Лесам і азёрамі.

І наўсцяж краінаю,
Радасць услаўляючы,
Песні салаўіныя
Льюцца не сціхаючы.

Нівы пладавітыя
Шэпчуць грузным коласам,
Людзі працавітыя
Кажуць дружным голасам:

— Лета, болей шчаснага,
Доля не адзначыла,
Сонца, болей яснага,
Беларусь не бачыла! —

І яшчэ гаворыцца
Ў песнях рэвалюцыі,
Як жыццё азорыцца
Новай канстытуцыяй.

І пяройдзе ў спадчыну
Гэта быль вячыстая
Разам з мовай матчынай,
З песняй урачыстаю.

*1936 г.*

## ЛЕТНІ ДЗЕНЬ

За драўлянымі млынамі,
Дзе канчаюцца масты,
Шырачэзнымі лістамі
Ахінуліся кусты.

Ад крутых віроў глыбокіх
На пясчаны перакат
Прамяністая ад спёкі
Выгінаецца рака.

Перад поплавам на градах —
Мак высокі і густы;
Там камандуе парадам
Сам сланечнік залаты.

А за рэчкаю, на правых,
На высокіх берагах
Знепакоіліся травы
У някошаных лугах.

Луг заліўся галасамі:
Да яго ва ўсе канцы
Выйшлі стройнымі радамі
Загарэлыя касцы.

У кашулях ярка белых,
У чырвоных паясах...
І на голас іх запела,
Адгукнулася каса.

Не пракосы, а — палосы
Выжынае чыста сталь,
І навостраныя косы
Асыпаюць звонам даль.

Слава травам, слава кветкам,
Слава летнім яркім дням,
І засеяным палеткам,
І пакошаным лугам!

Слава людзям дружнай працы,
Слава ім!
Мінуць вякі, —
Будзе такжа выгінацца
Шкло празрыстае ракі,

Будзе мак цвісці на градах,
Будзе ў сэрцы з веку ў век
Несці радасць творчай працы
Непакорны чалавек.

*1936 г.*

## КАЛЫХАНКА

Ходзяць зоры над краінай,
Дрэвы стомленыя спяць,
Толькі маці з любым сынам
Будзе доўга размаўляць.

Спаць малога палажыла,
Неспакойны сын не спіць:
— Раскажы, як Варашылаў
Вёў рабочых панства біць. —

І гаворыць калыханка,
Як збіраўся рад у рад
За ракою, за Луганкай
Варашылаўскі атрад.

Выціралі ўпотай слёзы
Непаслушныя жанкі.
Камандзір — луганскі слёсар
Аглядаў браневікі.

Капытамі білі коні —
Беланогія данцы...
Ні атакі, ні пагоні
Не баяліся байцы.

Добра помніць Дубавязка,
Як, пакінуўшы майдан,
Уцякалі немцы ў касках
Ад луганскіх партызан.

Помніць Харкаў і Чугуеў,
Як рабочыя ў той час
Ад германскага буржуя
Баранілі свой Данбас.

Помняць сёлы і станіцы,
Як пад гром гармат і звон
Варашылаў у Царыцын
Вывеў войска цераз Дон.

Як пасля Клімент з Будзённым
Правялі канец вайны,
Як ад шабель першай коннай
Беглі польскія паны.

Слава нашага наркома
Прагрымела з краю ў край!..
Будзь і ты, сынок, свядомы,
Нам на радасць падрастай.

Будзь адважным, мужным сынам,
Падрастай на ўцеху ўсім,
Беражы сваю краіну,
Як луганскі слёсар Клім.

*1936 г.*

## НА ВАРЦЕ

Маўклівая ноч паланіла Дзвіну —
І хвалі звіваюцца вужам,
І вецер імкнецца наўсцяж развінуць
Сваю першабытную дужасць.

Ён доўга блукаў па краінах чужых,
Балотам прапах і паморкам,

І вось ён наважыў
Праз грані мяжы
Прабіцца да нашых узгоркаў.

Дарэмна!
Найлепш было крылле зламаць,
Як біцца ў тузе навальнічнай:
Бяскрайні прастор наш і творчы размах
Вартуе мой брат — паграчнік.

Да болю напяўшы і позірк і слых,
Ён чуе хаду тваю, вецер!
Ён крокі пазнае сваіх і чужых
Па лёгкаму шэлесту вецця.

У вечную спадчыну
Пільнасць і спрыт
Яму адказалі героі —
Вялікай радзімы маёй змагары
За наша жыццё маладое.

Сягоння ўзмужалае гэта жыццё
На варту пастаўлена класам,
Каб вораг крывавай рукі не прасцёр
Над нашым прасторам і часам.

Няхай сабе ноч агартае Дзвіну
І хвалі звіваюцца вужам,
І вецер імкнецца наўсцяж развінуць
Сваю першабытную дужасць, —

Не спіць пагранічнік.
Напружыўшы слых,
Пакуль цішыня не парвецца,
Ён слухае крокі рэспублік сваіх,
Пульсацыю іхняга сэрца.

Шырокі прастор за плячыма ляжыць...
А вецер,
Балотны і горкі,
Імкнецца ізноў цераз грані мяжы
Прабіцца да нашых узгоркаў.

За ветрам з-пад шыбеніц чорных ідуць
Нямотныя стогны і лямант;

Чуваць, як гарматы над светам гудуць,
Як ходзіць вайна над палямі.

Мужайся, таварыш мой!
Нашы сыны
Запішуць імя тваё ў вечнасць:
Адны мы баронім ад страшнай вайны
Работу і мір чалавечы.

*1936 г.*

## ДАЗОРНЫ

Мінала ноч.
Займаўся ранак.
На снежных верхавінах дрэў,
Ні ў якіх казках несказаны,
Ружовы досвітак гарэў.

Уздоўж мяжы ішоў дазорны,
Успамінаў утульнасць хат,
Вясёлы твар
І позірк зорны
І ўсмешкі ветлыя дзяўчат.

Успамінаў...
А пільным вокам
Сачыў трушчобы дзікіх нетр,
І раптам —
У снягах глыбокіх
Заўважыў нейчы свежы след.

Відаць, нядаўна,
На світанні,
Граніцу вораг перайшоў;
Яго слядоў незатаптаных
Яшчэ і вецер не замёў.

Да баявой прыгоды звычны,
Без меркаванняў і разваг
Шынель скідае пагранічнік,
Бяжыць з вінтоўкай па слядах.

Абліўся твар гарачым потам,
А цела ўсё
Калоціць дрож...
Цяжэюць ногі...
Скінуў боты
І вось —
Імчыцца басанож...

Калючы снег у ногі коле...
Дармо!..
Настаў апошні час:
Ужо відаць за лесам поле,
А там —
Дарога і калгас.

Ужо калгаснікі і дзеці
Бягуць гуртом наперарэз,
Але і вораг іх прыкмеціў
І — зноў, як воўк, пабег у лес.

Бяжы.
Не ўдасца план злачынны!
Сабраўшы сілы,
Вартавы
Прабег яшчэ адну хвіліну,
І вораг здаўся,
Ледзь жывы...

А ногі белы снег крывавяць,
Дазорны нікне галавой...
— Скажыце хлопцам на заставе,
Я здзейсніў абавязак свой..., —

І ён упаў.
Да бліжняй хаты
Яго панеслі на руках,
І ён ледзь помніў,
Як дзяўчаты
Яго праводзілі ў слязах.

*1936 г.*

## ПЕСНІ АБ ГРАНІЦЫ

### I

На захадзе і ўсходзе
Па лініях крывых
Уздоўж граніцы ходзіць
Совецкі вартавы.

Таварыш, будзь-жа пільны,
Святыя рубяжы
Вялікае краіны
Адважна беражы!

Няспынна поўным ходам
Працуюць за табой
Магутныя заводы
І новых фабрык строй.

Таварыш, будзь-жа пільны,
Святыя рубяжы
Вялікае краіны
Адважна беражы!

Жытамі і пшаніцай
Шумяць твае палі,
Па рэках у сталіцу
Прыходзяць караблі.

Таварыш, будзь-жа пільны,
Святыя рубяжы
Вялікае краіны
Адважна беражы!

Работай мірнай, шчаснай
Заняты твой народ:
Рабочы і калгаснік,
Вучоны і пілот.

Таварыш, будзь-жа пільны,
Святыя рубяжы
Вялікае краіны
Адважна беражы!

Па гарадах і сёлах,
Далёкі наш зямляк,

Заможна і вясёла
Жыве твая сям'я.

Таварыш, будзь-жа пільны,
Святыя рубяжы
Вялікае краіны
Адважна беражы!

На край твой працавіты,
На мірны твой народ
Фашысты і бандыты
Рыхтуюць свой налёт.

Таварыш, будзь-жа пільны,
Святыя рубяжы
Вялікае краіны
Адважна беражы!

Табе надалі права
Стаяць на варце дзён
Радзіма гордай славы
І сталінскі закон.

Таварыш, будзь-жа пільны,
Святыя рубяжы
Вялікае краіны
Адважна беражы!

*1937 г.*

II

Ад зорак вячорных
Да ранняй зарніцы,
Калі непагоды гудуць,
Праз цэлую ноч
Да заходняй граніцы
За думамі думы лятуць.

Там сын, там каханы,
Там брат і таварыш
На варце краіны стаяць.
Над імі — завеі
І чорныя хмары,
Над імі вятры шалясцяць.

Іх мерныя крокі,
Іх погляд крыштальны
Варожая сочыць рука.
А вочы стаміліся,
Ногі прысталі,
І вісне цяжар на штыках.

Устань-жа, высокае
Сонца, над імі
І выйдзі дазоры мяняць,
Хай першым на змену
Прасторы радзімы
Другія ідуць вартаваць!

І яснае сонца
У ясных вышынях
Над краем ізноў устае.
Спакойна на працу
Выходзіць краіна, —
Надзейная варта ў яе.

І гэтак штоночы,
Да першай зарніцы,
Калі непагоды гудуць,
Адна за другой
Да заходняй граніцы
Турботныя думы лятуць.

*1936 г.*

## НА ПРАДВЕСНІ

*Петрусю Броўку*

Яшчэ сняжыць сырымі днямі,
Яшчэ марозіць ноч-у-ноч,
А над высокімі палямі
Праменні падаюць насторч.

І на маўклівыя нізіны
Бяжыць, шалеючы, вада,
І ломяцца, як шкло, ільдзіны,
І крыгі гнуцца, як слюда.

У бронь закованыя рэкі
Разносяць штурмам берагі,
Паводак безупынных рэхі
Ідуць за стромкі перагіб.

Там прагне высмяглая глеба
Напіцца соку на ўмалот,
Там у блакітах ясных неба
Ідзе высокі самалёт.

Там пачынаюцца густыя
І задуменныя бары,
Там трактарысты маладыя
Вядуць у поле трактары.

Там агнявой вяснянкай-песняй,
Што сэрца выпаліць да дна,
Канчаецца ізноў прадвесне
І пачынаецца вясна.

Мая вялікая радзіма,
Люблю твой бурны подых дзён!..
Нядаўні леташні зазімак
Успамінаецца, як сон.

І мы вясну вітаем дбала,
Бо толькі нам вядома двум,
Што надышла і наша сталасць
З трывогамі суровых дум.

*1937 г.*

## ПРОВАДЫ

Ходзяць зоры над краінай,
А дарожанька бяжыць...
Выпраўляе маці сына
У чырвоны полк служыць:

— Будзь адважны і харобры,
Рэволюцыі салдат,
І з няславаю нядобрай
Не варочайся назад! —

Ходзяць зорачкі над ярам...
Сын матулі адказаў:
— За спакой твой і за старасць
Не ступлю ў баях назад.

А калі ад ран нязмерных
Над акопам упаду,
Я памру, як сын твой верны,
Але з ганьбай не прыду. —

Ходзяць зоранькі над хатай,
А дарожанька бяжыць...
Выпраўляюць сёстры брата
У чырвоны полк служыць:

— Будзь адважны і харобры,
Рэвалюцыі салдат,
І з няславаю нядобрай
Не варочайся назад! —

Ходзяць зоранькі над полем...
Брат сястрыцам адказаў:
— Я за светласць вашай долі
Не ступлю ў баях назад.

А калі ад ран нязмерных
Над акопам упаду,
Я памру, як брат ваш верны.
Але з ганьбай не прыду. —

Ходзяць зоры над залужжам,
А дарожанька бяжыць...
Выпраўляе жонка мужа
У чырвоны полк служыць:

— Будзь адважны і харобры,
Рэвалюцыі салдат,
І з няславаю нядобрай
Не варочайся назад! —

Ходзяць зоранькі над нівай...
Муж каханай адказаў:
— За дзяцей сваіх шчаслівых
Не ступлю ў баях назад.

А калі ад ран нязмерных
Над акопам упаду,
Я памру, як бацька верны,
Але з ганьбай не прыду. —

Ходзяць зоры над далінай,
А дарожанька бяжыць...
Выпраўляе нас краіна
У чырвоны полк служыць:

— Будзь адважны і харобры,
Рэвалюцыі салдат,
І з няславаю нядобрай
Не варочайся назад!

Ходзяць зоры ў небе сінім...
Сын радзіме адказаў:
— За жыццё тваё, краіна,
Не ступлю ў баях назад.

А калі ад ран нязмерных
Над акопам упаду,
Я памру салдатам верным,
Але з ганьбай не прыду.

*1937 г.*

## ПАЛЁТ

Гарачы дзень.
Ад лютай спёкі,
Згубіўшы прыкры сорам свой,
У рэчку чыстую глыбока
Упала сонца з галавой.

А там,
Высока па-над намі,
У сінь,
Халодную, як лёд,
Не страпянуўшыся крыламі,
Паплыў празрысты самалёт.

Пад залатой планетай зоркі,
Што яркім знакам на крыле,

Ідуць чародамі узгоркі
І табунамі цёмны лес.

Пілот,
Імклівы і адважны,
Яшчэ вышэй бярэ разгон,
І вось —
Нікому недасяжны —
Ідзе за сіні гарызонт.

Але і там праходзяць міма
Шырокіх крылляў карабля:
Пад левым —
Воблакі радзімы,
Пад правым —
Родная зямля.

Але і там,
Нячутным ценем
Мінаючы заслоны хмар,
Ён чуе нашы лятуценні
І нашыя палёты мар:

У крыллях і маторах б'ецца
Жывая кроў гарачых жыл,
Часцінка нашых чыстых сэрцаў,
Замілавання і душы.

*1937 г.*

## ПІЛОТАМ

Я ведаю вашу усмешку:
Шырокай ракою цяпла
Ад сонца праменная сцежка
Да вашых вачэй працякла.

Я ведаю вашу паходку:
Разлічаны крок і размах
І лёгкасць у жэстах кароткіх,
Якой не ўладае і птах.

Я ведаю вашу пасадку:
Упэўнены курс на маяк,

Тры кропкі на вузкіх плашчадках
І тонкае лініі знак.

Я ведаю вашы палёты
У лютых завеях пургі,
Над страшным нязведаным лёдам,
Праз вечную ноч і снягі.

Я ведаю вашы рэкорды
Па роўнай, крутой і крывой,
На веліч і мужнасць,
На гордасць
За славу краіны сваёй.

Адно не абняць і не змераць
Пачуццяў совецкіх людзей,
Чыя непарушная вера
Да мэты нязменна вядзе,

Чый смутак па вас і клапоты
І шчырае сэрца чыё
За вамі і з вамі ў палётах,
Пілоты радзімы маёй.

*1937 г.*

## ПРЫСЯГА

У бярозавых прысадах
Ападае голле нізка.
Ты ідзеш вясновым садам
Маладая трактарыстка.

З лапушнога лісця росы
Асыпаеш поўнай жменяй.
Ручаём спадаюць косы,
Разліваюцца струменем.

Лёгкім крокам трактарысткі
Узыходзіш ты на ганак,
І адразу-ж прамяністы
Без цябе смутнее ранак.

У вачах,
Як вір глыбокіх,
Ты нясеш усю уцеху,
Нават ямачкі на шчоках
Поўны радаснага смеху.

Гэта радасць льецца лавай
У пакоі сельсовета,
І ўсміхаюцца ласкава
Вочы Сталіна з партрэта.

Зараз ён устане, здэцца,
Дапаможа
І навучыць...
І ў тваім маленькім сэрцы
Абуджаецца рашучасць.

Ты гаворыш вельмі мала:
— Пад чырвоным стаўшы сцягам,
Я, шчаслівая, трымала
Перад Сталіным прысягу.

Паклялася смертнай клятвай —
Дзень і ноч руплівай працай
За дзве тысячы на трактар,
Як за гонар свой, змагацца. —

Словы гэтай клятвы думнай
Да нямоты ўсіх здзівілі:
— Дзе-ж ёй, беднай, лёгкадумнай,
Адшукаць на гэта сілы?!

І заўвагай недарэчнай
Хтосьці крыўдна сэрца коле,
Што і Сталіна, бясспрэчна,
Ты не бачыла ніколі.

І тваіх вачэй крышталі
Пацямнелі пад навалай:
— У мяне —
У сэрцы Сталін,
Я душою прысягала. —

Дзве гарачыя слязінкі
Пакаціліся, як зоры...
Ты стаіш, мая дзяўчынка,
І нічога не гаворыш.

Але ведаю, што справу,
За якую ты клялася,
Ажыццёвіш...
Пойдзе слава
Пра цябе па ўсіх калгасах.

Хто душою чыстай, светлай
Перад Сталіным клянецца, —
Знойдзе сілы здзейсніць мэту
І прысягі не зрачэцца.

*1937 г.*

## ПРЫЗНАННЕ

Колькі вытаптана сцежак,
Колькі выбіта дарог!..
Па цяпло тваіх усмешак
Шмат хадзіла на парог.

Камандзір высокі танка,
Трактарысты,
Кавалі
Кожны вечар каля ганка
За цябе вайну вялі.

Там вясной
Шумелі травы,
А ў кастрычніку —
Лісты...
Ты смяялася ласкава
Звонкім смехам залатым.

З кожным
Добрых ці суровых
Гаварыла колькі слоў;
Аднаму ў тваіх размовах —
Мне
Увагі не было.

Быццам нашая брыгада
Першых месц не заняла?!
Быццам мы на ўсіх парадах
Не праславілі сяла?!

Быццам сам я,
Асабіста,
Не пад густ тваёй красе.
Не высокі,
Не плячысты,
Не прыгожы,
Як усе?!

Адкажы-ж мне,
Толькі шчыра,
Што за прыхамаць была,
Калі моўчкі брыгадзіра
Ты увагай абыйшла?

Толькі раз пры нашай стрэчы
Усміхнулася няўзнак...
Што-ж мне думаць
Пра той вечар,
Разумець цябе мне як?!

І дзяўчына адказала:
— Я шчаслівая была,
І з усімі
Жартавала,
А з табою —
Не магла.

І не дарам біты сцежкі
Непракладзеных дарог,
І не дарам па усмешкі
Ты хадзіў на мой парог.

*1937 г.*

## РАДАСЦЬ

Над галавой шумелі клёны,
І вадаспадамі лісты
Ліліся на мурог зялёны,
Дзе ціхая стаяла ты.

Канчаўся дзень,
Над зжатай нівай
Ішлі ключамі журавы.
Ты іх праводзіла маўклівым
Узмахам русай галавы.

На момант у вачах самотных
Успалыхнуў асенні сум.
І лёгкі вецер бестурботна
Развіў завітую касу.

І шкода стала маладосці
І перажытых летніх дзён...
Але, як сокам, весялосцю
Наліўся дбайнай працы плён.

Ад ярыны трашчалі гумны,
Раслі высокія стагі,
І малатарні хорам шумным
Будзілі рэчак берагі.

Там на калгасных агародах
Багаты бралі ураджай,
Там за турботы нагарода
Лілася мёдам цераз край.

Там ціхія рачныя тоні
Гулі ад рыб, як вір круты,
Там спелі познія антоны,
Гарэлі сонцам залатым.

І, моўчкі, мы гарэлі самі
Вялікай радасцю зямлі.
І над шчаслівымі над намі
Аблокі вечнасці ішлі.

*1937 г.*

## ЛІСТ БРАТУ

Мой друг, мой брат!
У летні вечар,
Калі цямнее шкло ракі,
На стромкім беразе

Сустрэчы
Са мной чакаюць рыбакі.

Спускаем лодку...
Лёгкай чайкай
Яна кранаецца вады.
І грудзі пад вільготнай майкай
Гарацъ парывам маладым.

Узмах вясла, —
І сонны бераг
Адразу пачынае жыць:
Ідуць радамі ў шапках шэрых
Кусты парэчак і ажын.

На водах згушчанай затокі
Адбіткі зорнага агню.
І месяц, строгі і высокі,
Вартуе сон і цішыню.

І нам тады прыходзіць думка,
Што дзесьці над другой ракой
І ты з вінтоўкай,
У падсумках
Вартуеш такжа наш спакой.

На хвалях заміраюць вёслы
Ад успамінаў рыбакоў.
І нашы зімы,
Нашы вёсны
Ідуць у далячынь вякоў...

Там накрыж бізуном крывавым
Запісана на спінах дзён
Народу змучанага права —
Былой імперыі закон.

Як на старонках кніг,
На гонях
Чытаю літары слядоў.
Перада мной,
Як на далоні,
Ідзе жыццё маіх дзядоў.

Сляпыя,
Нізенькія хаты
Травой і мохам парасл.
Пляцецца згорблены араты
На вузенькім шнуры зямлі.

А на шырокай,
Панскай ніве,
Стаіўшы чалавечы боль,
Спяваюць жнеі...
Спеў тужлівы
На сэрца сцелецца, як золь.

Старымі,
Бітымі шляхамі,
Цераз усю нямую шыр,
Вядуць закутых ланцугамі
У непраходную Сібір.

Там замірае шлях жыццёвы,
І супакоеным у снах
Прытулак пад крыжом сасновым
Дае сасновая труна.

На змену прадзедам і дзедам —
Рабамі працы і турмы,
Шляхамі тымі-ж,
Тым-жа следам
Ішлі-б, асуджаныя, мы.

І на пясках дрымотных поля,
Разняўшы прывіды свае,
Мая няздзейсненая доля
Такою, брат мой, паўстае:

Заліўшыся дзіцячым плачам,
Пад злымі сцюжамі калець;
Маўклівым позіркам жабрачым
Прасіць пад вокнамі на хлеб;

Пакорным парабкам да ночы
На панскай ніве спіну гнуць;
У шахтах
Катаржным рабочым
Ярмо праклятае цягнуць;

Цярпець пабоі,
Здзек і кпіны,
Звярыны нораў кулака;
Бяздомным пасынкам краіны
Шляхамі роднымі блукаць;

На войнах паміраць крывавых
За панскі хлеб,
За царскі гнеў —
Было-б маім адзіным правам,
Законам царскім для мяне.

Мой друг, мой брат,
Якое шчасце!
Ужо мінула дваццаць год,
Як на законы самаўладства
Паўстаў прыгнечаны народ.

І ў тыя дні вячыстай славы
Абрабаваны,
Бедны люд
Крывёй плаціў за наша права
На хлеб,
На працу,
На зямлю;

За права на лясы і горы,
На залатыя скарбы руд;
За права цеслі і шахцёра
На ўласныя здабыткі рук;

За права змучаных аратых
На каласісты ураджай;
За наша права
На багаты,
На сонечны,
Квяцісты край;

За права жыць і гаспадарыць,
Людзьмі назвацца між людзей;
За права на спакой пад старасць
І на вясёлы смех дзяцей.

І мы ні слёз,
Ні крыўд не знаем:

Работу нашу,
Быт і сон
Ад хіжых рук аберагае
Вялікі Сталінскі Закон.

Скажы,
А чым-жа мы заплацім
За ўсе клапоты і любоў,
За супакой старэнькай маці,
За бесклапотны смех братоў,

За нашы вёсны,
Нашы зімы,
За радасць нашых светлых дзён,
За хараство сваёй радзімы,
За мудры Сталінскі Закон?

Наш скарб,
Мой брат,
Уся краіна.
Дык помні гордыя правы:
Дастойным будзь грамадзянінам —
Работнікам і вартавым.

І ў час вялікай абароны,
Калі загадны ўзмах рукі,
Якой напісаны законы,
На бітву выведзе палкі, —

Умей адважна, друг, змагацца
І ворагаў перамагаць,
Каб добры гонар сына працы
Жыццём і смерцю апраўдаць.

Але жыццё аддай не дарам:
Памры,
На прыступ ідучы,
Як паміраюць комунары,
Каб смерцю
Смерць перамагчы.

*1937 г.*

# СНЕЖАНЬСКІ ВЕЧАР

Снежаньскі вечар.
У мораку шэрым
Яркне радзімы маёй шырыня.
Думак народных сягоння не змераць,
Шчырых пачуццяў нічым не абняць.

Сэрца-ж маё!
Будзь вялікім, як мора,
Радасць і шчасце людское змясці.
Чуеш,
Ідзе над шырокім прасторам
Самая светлая хваля ў жыцці.

Дрэвы маўкліва на варце насталі,
Сціх нават гоман і шум баравы...
З намі гаворыць любімы наш Сталін —
Ленінскі голас мы чуем з Масквы.

Гэта прамова найлепшага сына,
Друга жывога ў вяках Ільіча...
З краю да краю заціхла краіна,
Толькі магутныя словы гучаць:

«Сталін заўжды абавязак свой здзейсніць
Перад народам любімым сваім!..»
Гэтыя думы імкліваю песняй
Коцяцца гучна над краем маім.

Чуюць іх фабрыкі,
Чуюць заводы,
Чуюць шырокія нашы палі.
І, як прысяга,
Як клятва народу,
Сталіна словы ідуць па зямлі.

*1937 г.*

## ПЕСНЯ ПРА НАРКОМА

Збірайся дружна сябрынаю цеснай,
Спяем пра наркома, таварышы, песню,
Яшчэ раз успомнім мінулыя годы,
Суровыя бітвы і нашы паходы.

За шчасце людское, за волю радзімы —
На ворагаў лютых, да радасных мэт
Вёў нашую армію маршал любімы
І наш дэпутат у Вярхоўны Совет.

Супроць акупантаў і наймітаў панскіх
Збіраў Варашылаў атрад партызанскі,
Праз голыя стэпы, глухія станіцы
Пад сталінскім сцягам ішоў у Царыцын.

За шчасце людское, за волю радзімы —
На ворагаў лютых, да радасных мэт
Вёў нашую армію маршал любімы
І наш дэпутат у Вярхоўны Совет.

У шэрагах першае арміі коннай
На польскае панства ён вёў эскадроны,
І помніць дагэтуль Замосце і Снежна,
Як беглі палкі генералаў мяцежных.

За шчасце людское, за волю радзімы —
На ворагаў лютых, да радасных мэт
Вёў нашую армію маршал любімы
І наш дэпутат у Вярхоўны Совет.

На хвалях жывых пад крутым Перакопам,
На роўных палях і лугах пад Майкопам,
На сцягах армейскіх, на шаблях і піках
Гарыць яго слава зарою вялікай.

За шчасце людское, за волю радзімы —
На ворагаў лютых, да радасных мэт
Вёў нашую армію маршал любімы
І наш дэпутат у Вярхоўны Совет.

І хай паспрабуюць бандыты напасці
На сонечны край чалавечага шчасця,
На мірную працу, палі і заводы, —
Ізноў мы успомнім былыя паходы.

І нас на змаганне за волю радзімы
На ворагаў лютых, да радасных мэт
Усіх павядзе палкаводзец любімы
І наш дэпутат у Вярхоўны Совет.

*1938 г.*

## ПЕСНЯ СЛАВЫ

З магутнаю песняй, як зоры высокай,
Выходжу ў прасторы дарогай шырокай,
У думках і марах раблю свой абход
На поўнач і поўдзень, на захад і ўсход.

Я сам гаспадар неабсяжнай краіны
І верны слуга дарагое айчыны,
Народа майго гераічнага сын —
Совецкай рэспублікі грамадзянін.

Са мною гаворыць, як быццам жывая,
Сагрэтая сонцам зямля маладая,
Імклівыя рэкі, дарог паясы,
Лугі і палеткі, бары і лясы.

І ўвесь гэты скарб, незлічона багаты:
Шырокія нівы і светлыя хаты,
Укрытыя лістам і цветам сады,
Залітыя срэбным святлом гарады,

Чыгункі і шахты, палі і заводы,
Глыбокія нетры і плынныя воды,
Высокага неба празрысты блакіт,
І гоманы пушчы, і шэлест ракіт; —

Усё, да апошняй пясчынкі зямлі
На ўзоранай трактарным плугам раллі,
Ад краю — у край, ад захаду — да ўсходу,
Належыць майму маладому народу.

І скрозь, над усім неабсяжным прасцягам
Жыццё пурпуровым абвеяна сцягам,
Дзе золатам радасці вышыты герб:
У сонечных праменях молат і серп.

І скрозь наша доля пад сцягам чырвоным
Асвечана сталінскім мудрым законам,
Дзе кожная літара шчасцем для нас
Гарыць, як крыштальна-агністы алмаз.

І вольны народ за жыццё і дзяржаву
Спявае вялікаму Сталіну славу.

Беларуская краіна,
Твой шырокі шлях!
Над табой у зорнай сіні
Палымнее сцяг.

Гэта ты упартай воляй
На прастор і шыр
Вывеў нас з былой няволі,
Мудры правадыр.

І цвіце мой край чароўных
Пушчаў і азёр
У сям'і свабодных, роўных
Маладых сясцёр.

Гэта ты рукою дужай
Даў народам мір,
Нас навек з'яднаўшы дружбай,
Мудры правадыр.

І ніякія напасці
У самы трудны час
Не парушаць долі-шчасця,
Не падзеляць нас.

Мы ідзем адной калонай,
Бурнаю, што вір,
Пад зарой твайго закона,
Мудры правадыр.

І сабраўшыся на першы
Незвычайны сход,
У Совет сыноў найлепшых
Выбера народ.

Ты да новай перамогі
На простор і шыр
Нам паказваеш дарогі,
Мудры правадыр.

*1938 г.*

## ПОМНІК

Пагасаюць агні над сталіцай,
Засынаюць кварталы Масквы...
Толькі нам, падарожным, не спіцца,
Як не спіцца цяпер вартавым.

І праходзім, маўклівыя, часта,
Выбіраючы радасны шлях,
Каля сцен старадаўніх зубчастых,
Каля Троіцкай вежы Крэмля.

За музеем, над Краснаю плошчай,
Дзе заветны стаіць маўзалей,
Вецер сцягі высока палошча,
Але думы лунаюць вышэй:

Перад намі пад сонцам Комуны
Адзінаццаць рэспублік-сясцёр;
Перад намі з дзяржаўнай трыбуны
Выступае касец і шахцёр;

Перад намі нарком абароны —
Першы маршал і першы салдат

Баявыя выводзіць калоны
На агульнанародны парад.

Перад намі на поўначы дзікай
У пустэльнях растуць гарады,
На абшарах радзімы вялікай
Зацвітаюць палі і сады;

Ажываюць заводы і домны,
Гоман поўніць прасторы дарог...
І выраствае Леніну помнік
У легенду людскіх перамог.

Ён—жывы, ён—бяссмертны, ён—вечны,
Покуль сэрцы у грудзях жывуць,
Покуль людзі пад сонцам спрадвечным
Безупынна да шчасця ідуць.

Дружнай сілай сялян і рабочых
Будаваў гэты помнік жывы
Самы смелы ў гісторыі зодчы,
Самы мудры ў вяках бальшэвік.

*1938 г.*

## ВЯЛІКІ СЫН НАРОДА

Калісьці даўняю часінай,
Пад царскім гнётам і ярмом
Мая цудоўная краіна
Была магілай і турмой.

І вось над цемрай вуліц цесных,
Над жудасцю куткоў лясных
Узняўся горды буравеснік —
Вяшчун змагання і вясны.

Бясстрашны сын свайго народа,
Ён сэрца аддаваў з грудзей
За наша шчасце і свабоду,
За гонар скрыўджаных людзей.

Пад небам восені панурай
Пры цьмяных вогнішчах палян

Яго жыццё шумела бурай
І хвалявала акіян.

Травою крыліся узгоркі,
Кіпела ціш глухіх нізін,
Дзе ён ішоў, магутны Горкі —
Паэт, баец, грамадзянін.

Прачутае, жывое слова,
Як сталь адменнага ліцця,
Грымела мужна і сурова
Над злой няпраўдаю жыцця.

А ў час трывожнае самоты,
Калі на сэрцы слаўся сум,
Яго праўдзівых слоў яснѳты
І залатыя скарбы дум

На лёгкіх крыллях летуцення,
На бурных хвалях пачуцця
Зноў неслі людзям захапленне
І радасць творчага жыцця.

І над абуджаным прасцягам,
Увысь узнятае плячом,
Жывое слова стала сцягам
І загартаваным мячом.

З-пад цёмнай хмары недаяркі,
Найміты панскія і псы
Перад яго паходняй яркай
Магутнай сілы і красы

Дрыжалі ў сполаху, і люта
Непераможнага арла
Паілі ўпотайкі атрутай,
Каб смерць бяссмертнага змагла.

Ён паў, аплаканы народам...
Але жыве ягоны гнеў,
Яго любоў, яго пяшчота,
Ягоны неўміручы спеў.

І гэта сіла агнявая —
Усе пачуцці, думкі ўсе
І нават смерць — жыццё сцвярджае
І кару ворагам нясе.

І светлы воблік не пагасне,
Не згіне памяць у вяках
Таго, хто нёс паходню яснай
У струджаных сваіх руках.

Жывой паэзіі крыніца
Напоіць смагу маладых
І будзе, светлая, бруіцца
Праз незлічоныя гады.

Над ёю нават непагодай
Сяброўскі не замкнецца круг:
Пясняр быў сын свайго народа
І Сталіна вялікі друг.

*1938 г.*

## ЗІМОВЫ МАЛЮНАК

Шпарка санкі імчацца з горкі,
Рассыпаецца звонкі смех,
Толькі дзеўчынка плача горка,
Атрасаючы мокры снег.

Невялікая крыўда ў дзіцяці,
Але рэкамі слёзы цякуць.
Маладая, вясёлая маці
Суцяшае малую дачку:

— Вытры слёзы, умыйся снегам,
Будзь румяная, быццам зара,
Хай звініць серабрыстым смехам
Залатога маленства пара.

Будуць горшыя дні напасці
На тваім чалавечым вяку.
Але наша агульнае шчасце
Падтрымае цябе пад руку.

Ты не будзеш адна ніколі
Ні ў трывогах сваіх, ні ў бядзе:
Нас усіх непадзельная доля
Не пакіне самотных нідзе.

Вытры-ж слёзы, умыйся снегам,
Будзь румяная, быццам зара,
Хай звініць серабрыстым смехам
Залатога маленства пара.

*1938 г.*

## ПРЫВІТАННЕ

Радзіма, прымі маё шчырае слова
І сціплага верша не зганьбі сурова!

Чыё можа сэрца адклікнуцца песняй,
Дастойнай тваёй маладосці пачэснай?

Сама ты, радзіма, жывая паэма,
Вялікасны твор большэвіцкага племя.

І кожны радок твае светлае долі
На плошчах шырокіх, на стоптаным полі

У годы змагання, часінай паходнай
Напісан крывёю і славай народнай.

У роўным дыханні жыцця твайго б'ецца
І Леніна думка, і Сталіна сэрца.

Як глянеш, здаецца, прасцяг твой прасторны
Пакрыты не снегам, а полымем зорным.

І скрозь — тваім чыстым, няспламленым словам
Гамоняць сягоння лясы і дубровы,

Пяюць гарады і багатыя сёлы,
І люд разняволены, дужы й вясёлы.

Жыві-ж і красуйся у вёсны і зімы,
Краіна свабодных, шчаслівых радзіма!

Ты мужная ў працы і ў подзвігах ратных,
Ты верная ў дружбе рэспублікаў братніх.

Твой шлях гераічны, былы і наступны,
Твой дружны народ, працавіты і рупны,

Ад веку на век, маладая дзяржава,
Абвеяны ленінскай, сталінскай славай.

*1939 г.*

## НАШЫ ДНІ

У вялізнай рабоце харобрая,
Працавітая ў мужных баях
І, як маці, уважліва-добрая
Маладая радзіма мая.

З ёю гонар і радасці дзелячы,—
Ці за трактарам, ці за станком,—
Хто не дзівіцца з дужае велічы,
Хто не горды яе харaством?

Шпаркім лётам над гэтай краінаю
Пралятаюць імклівыя дні.
Паспрабуй, чарадой сакалінаю
Іх на торных шляхах дагані.

Яшчэ вечар кладзецца на захадзе,
А на ўсходзе ўжо ясная рань.
Падыміся да сонейка загадзе,
На прасторы шырокія глянь.

Яркне скрозь сакавітая раніца,
Сыпле промені, кветкі і снег.
Камяніцы і горы туманяцца,
Як у дзіўным, у казачным сне.

Хвалі мора да берагу туляцца,
Ружавеюць бары і лясы,
Ажываюць палеткі і вуліцы,
Блішчуць рэек стальных паясы.

Плешчуць плошчы трамвайнымі дзверцамі,
Ад уцехі шалеюць гудкі.
Гэты гоман вітаючы сэрцамі,
Машыністы вядуць цягнікі,

Стружуць сталь працавітыя токары;
Падымаюць шахцёры руду;
Выпускаюць умелыя докеры
Караблі на тугую ваду;

Камяніцы будуюць багатыя
Спрактыкаваныя муляры;
На палеткі выходзяць аратыя,
Табуном ведучы трактары.

З векавой нематы і адсталасці,
Узнімаючы ленінскі сцяг,
Мы прыйшлі да заможнае сталасці,
Да вялікага сэнсу жыцця.

І найлепшай работай і песнямі,
Нашы душы паклаўшы ў іх змест,
Мы ідзем, як дарамі пачэснымі,
Прывітаць Восемнаццаты з'езд.

Мы чытаем яшчэ раз і нанава,
Каб у сэрцы наскрозь прарасла,
Веліч думак таварыша Жданава,
Веліч веры, святла і цяпла.

Кроў пульсуе заўзята і молада
Новым дням і пачуццям у лад.
Перад намі разгортвае Молатаў
Небывалы яшчэ далягляд.

З хваляваннем, з уцехаю бурнаю
Мы чакаем вялікага дня,
Калі там — над Крэмлёўскай трыбунаю
Запануе вакол цішыня.

І, як зоркай, над светам запаленай,
Асвятляючы ленінскі сцяг,
Будзе мудрымі словамі Сталіна
Нам паказаны ў будучнасць шлях.

На скрыжалях шчаслівае вечнасці
Выб'юць золатам гэтыя дні
Нашай працы, і сілы, і еднасці,
Нашых сэрцаў жывыя агні.

*1939 г.*

## ПЕСНЯ ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ

Як зайграюць трывожнай хвілінаю
Маладыя гарністы паход —
Стане дружнай сям'ёй сакалінаю
На змаганне савецкі народ.

І мая Беларусь пагранічная,
Уручыўшы нам сталінскі сцяг,

Напаіўшы вадою крынічнаю,
Правядзе нас далёка на шлях.

Прастаяўшыся з вечара цёмнага,
Заірзуць нашы коні-данцы,
І па першай камандзе Будзённага
Паімчацца, як віхар, байцы.

Рынуць танкі лавінаю бурнаю,
Самалёты ўзвіюцца ў прасцяг.
Маладая краса фізкультурная
Пойдзе ў першых ударных радах.

Абдарованы спрытам і сілаю,
Кожны будзе шчаслівы і рад
Палкаводца свайго Варашылава
Баявы ажыццёвіць загад.

У нас хопіць адвагі і пораху,
Каб радзіму сваю адстаяць,
І ніколі драпежнаму ворагу
Нашай вольнай зямлі не таптаць.

Сэрцы нашы адвагай запалены,
Мужнай сілай гарыць пачуццё.
Мы па слову любімага Сталіна
Аддадзім за радзіму жыццё.

*1939 г.*

## РОДНЫМ БРАТАМ

Родны брат мой, таварыш гаротны,
Сонца праўды і волю вітай.
Станавіся ў шарэнгі свабодных
Будаваць свой разбураны край!

Нас адна нарадзіла краіна,
Ды няроўнае шчасце дала:
Мы квітнелі, раслі безупынна, —
Ваша доля пакутнай была.

У каляным ад поту шарачку,
Зруйнаваны пакінуўшы дом,
Ваша маці стаяла жабрачкай
На марозе пад панскім акном;

Сёстры мерлі на вуліцах брудных;
Ад цямна да цямна праз вякі
За сахою хадзілі пакутнай,
Парабкамі служылі бацькі.

Край заходні зямлі беларускай,
Край, растоптаны панскай нагой!
Колькі слёз на палях тваіх вузкіх,
Колькі здзекаў, палітых крывёй!

Годзе гэтых пакут і знямогі,
Вызваляйся з няволі і з крат!
Па-братэрску руку дапамогі
Падаем мы табе, родны брат.

Кроч у новыя, светлыя далі,
Разарваўшы прымусу ланцуг!
За цябе непакоіцца Сталін —
Усіх прыгнечаных бацька і друг.

*1939 г.*

## МОЙ ДЭПУТАТ

Ад Стаўбцоў наўсцяж да Аўгустова,
Дзе ні стань, каго ні запытай,
Кожны вам раскажа роднай мовай,
Як жыве мой вызвалены край.

Знята з люду векавая кара,
І разбіт нявольнічы ланцуг.
Плешчацца раскованая Шара,
Вольна коціцца Заходні Буг.

Запявае песні ціхі Нёман
І заўсёды, — днём і раніцой, —
Ходзіць радасны, святочны гоман
Па маёй краіне маладой.

Нават сосны даўняй Белавежы
Зелянеюць, як у дні вясны.
Ажываюць гарадскія вежы,
Фабрык і заводаў каміны...

Па зямлі па гэтай я ступаю
Як свабодны, дбайны гаспадар,
Гэта ўсё — ад краю і да краю —
Сталіна вялікаснага дар.

Гэта ён, руплівы і любімы,
Дапамог мне чалавекам стаць...
За яго, за лепшых у радзімы
Я ішоў душой галасаваць.

Дэпутат, мной выбраны, вядомы:
Мы з ім гадаваліся, раслі,
Гаравалі дома і не дома,
Парабкамі вечнымі былі.

Ён згінаўся над варштатам крукам,
У турме яго жыццё ішло.
На Сабранні падымаў ён руку,
Каб няпраўды гэтай не было;

Каб народы вольна працавалі,
Каб хапала хлеба нам цяпер,
Каб шчасліва дзеці падрасталі
У адной сям'і з БССР;

Каб ляжалі вольна перад намі
У жыццё свабодныя шляхі;
Каб шумелі такжа і над намі
Леніна і Сталіна сцягі.

*1939 г.*

## НОВАГОДНІ ТОСТ

Сябры! Прыгожая зіма
У нас па ўсёй краіне.
Нідзе на свеце больш няма
Такой прасторы сіняй.

Вы паглядзіце — што за ноч,
Якая урачыстасць!
Блакітам сцелецца да ног
Марозная празрыстасць.

Заснулі дрэвы ў пухавых
Аснежаных уборах,
І чыстым золатам на іх
Ліюцца ціха зоры.

У бляску іхняга святла
Снуюцца нашы мары.
Устаньце-ж дружна з-за стала,
Наліце поўна чары.

Дванаццаць раз гадзіннік б'е,
Адзначым год спатканне:
Старому славу прапяем,
А новаму — вітанне.

Падымем самы шчыры тост
За хараство радзімы,
За новы год, за новы рост,
За наш народ любімы;

За чэсных сталінскіх людзей,
Людзей вялікай справы;
За нашых матак і дзяцей,
Шчаслівых і ласкавых;

За ўсю сям'ю большэвікоў,
За славу нашай зброі,
За камандзіраў і байцоў,
За тысячы герояў;

За веліч дум і пачуцця,
За нашы лятуценні,
За радасць творчага жыцця,
За наш вялікі геній,

За геній славы і дабра,
Любімейшае імя,
За доўгі век правадыра —
За Сталіна падымем!

*1939 г.*

## ПАМЯЦІ СЕРГО ОРДЖАНІКІДЗЕ

Мне вечна помняцца хвіліны,
Калі вялікая Масква
І ўся магутная краіна
Стаялі ціха ўгалавах

Свайго любімага наркома,
І безупынна дні-у-дні
Плылі натоўпы нерухома,
Гарэлі мірныя агні.

Так у апошнюю дарогу
Мы ўсе праводзілі свайго
Героя слаўных перамогаў,
Свайго любімага Серго.

І ў першых кроках за труною
У зялёным і жывым вянцы —
Ішлі суроваю ступою
Яго саратнікі-байцы.

Калісьці так са сцягам волі
За ім праходзілі яны
Шляхі суровага падполля
І грамадзянскае вайны.

Ні сцюжы дальняга Якуцка,
Ні холад лютае зімы,
Ні жудасць катаргі нялюдскай,
Ні жахі царскае турмы

Ягонай сілы не зламалі...
З геройствам мужнага байца
Ён быў між тымі, што паўсталі
На штурм Зімовага дварца.

Ён гнаў няшчадна акупантаў,
У першых шэрагах ішоў,
Граміў бязлітасныя банды
Белагвардзейцаў і паноў.

І не забудзе Украіна,
Ні бурны Тэрэк, ні Каўказ.
Ні Беларусь, мая краіна,
Дзе ён праславіўся не раз.

Дзе пад Барысавам, як сведка,
Вам кожная раскажа з хат,
Як у атаку і разведку
Хадзіў ён просты, як салдат.

Народа друг і смелы воін,
Ад самых першых, юных дзён
Не пакідаў ён поля бою
І нашых баявых калон.

Калі у верасні уранку
На захадзе успыхнуў бой —
Ішлі збудаваныя танкі
Ягонай воляй і рукой.

І вось цяпер ізноў — на ратных
Фінляндскіх водах і палях
У залпах велічных гарматных,
Ва ўсіх снасцях на караблях,

У дужых крыллях самалётаў,
У кожнай кропельцы свінца —
Жыве ягоная работа,
Душа адважнага байца.

Не зарасце яго дарога!..
Вякамі будзе бачыць свет
Ва ўсіх баях і перамогах
Яго жывы і верны след.

І не забудзе век краіна
І ўсе працоўныя зямлі
Наркома ленінскай дружыны
І сына сталінскай сям'і.

*1940 г.*

## НА НІВАХ КАЛГАСНЫХ

На нівах калгасных вясна,
Вясна на бязмежных прасторах.
Гайдаецца шумна сасна,
І хвалі трымцяць на азёрах,

І грукаюць голлем дубы,
І ветры паўднёвыя веюць,
І ўзгоркі крутыя гарбы
Пад сонечнай спёкаю грэюць.

На нівы прыйшоў першамай,
І ў гуках празрыстых і яркіх
Чуваць, як ад краю у край
Гудуць трактары і сявалкі.

Што снілася некалі ў снах —
Праўдзіваю сталася явай:
На нівах калгасных вясна
Адзначана справай і славай.

*1940 г.*

## ХМАРКІ

Ад лютай летняй спёкі
Гарыць сухі пясок,
І пачарнеў далёкі
Нахмураны лясок.

Заціхлі скрозь жняяркі —
Прыпынак на абед.
А перыстыя хмаркі
Плывуць няспынна ў свет.

Ад іхніх крыл у ясны,
Гарачы летні дзень
На поле невыразны
Кладзецца лёгкі цень.

І павявае з долаў
Цудоўным халадком,
І жыта хіліць голаў
Пад свежым вецярком.

Падзяку шэпчуць дрэвы
За гэты добры дар,
І жывяць іх павевы
Людскі спацелы твар.

Вітанне-ж вам, аблокі!
Вы, быццам чарадзей,
Бароніце ад спёкі
І травы і людзей.

*1940 г.*

## НАШ ЛЕС

Вузкаю палоскаю
На краі нябес
Лёг за нашай вёскаю
Старадаўні лес.

Там, казалі, водзяцца
Сарны і дзікі,
Там, казалі, плодзяцца
Ў норах барсукі.

Там у таямнічыя
Ночы ля дубоў
Нашы паляўнічыя
Вабілі ваўкоў.

Дзівамі і казкамі
Быў ахутан лес,
Залатымі краскамі
Ён парос увесь.

І пайшлі аднойчы мы
На высокі груд
З выжламі і гончымі —
Паглядзець на цуд.

Мы ішлі дарогаю,
Мы блукалі дзесь
І пасля з трывогаю
Уступілі ў лес.

Там задорна-смелыя
Сосны параслі,
Там бярозы белыя
Нікнуць да зямлі.

Цішынёй і холадам
Вее ад нізін.
Дзяцел носам-долатам
Стукае адзін.

Ды ваверкі жвавыя
То вось тут, то там
Лапкамі, ласкавыя,
Пагражаюць нам.

Мы ідзем, галёкаем,
І аж восем раз
Водгулле далёкае
Паўтарае нас.

І ні следу сквапнага,
Ні звяроў жывых,
І ні паху вабнага
Красак залатых.

Але пушча вырасце,
Родзяцца ласі,
Бо у нас, па шчырасці,
Добрыя лясы.

А найлепшы з бачаных
Аж на свет увесь —
Цішынёй адзначаны
Наш дрымотны лес.

*1940 г.*

## НА РЭЧЦЫ

На небе ані хмары...
Такой часінай дня
Густая, быццам пара,
Стаіць гарачыня.

Замерлі дрэў макушкі,
Не зварухнецца ліст;
Пявучай самай птушкі
Замоўк апошні свіст.

Адно пярэстым роем
Ля самае зямлі
У каляровых строях
Лятаюць матылі.

Ды трапяткія хвалі
Вясёлай чарадой
Спяваюць, як спявалі,
Гамоняць з асакой.

І вее прахалодай
Ад чыстае ракі,
І на жывыя воды
Спяшаюць хлапчукі.

Ад променяў пякучых
У глыб вады рачной
Яны з высокай кручы
Ныраюць з галавой.

Ляцяць навокал пырскі,
І жвавыя кругі
Бягуць і мыюць блізкі
І дальні берагі.

І ў дружны хор шчаслівы
Зліваецца шчыльней
І гоман хваль шумлівых,
І звонкі смех дзяцей.

*1940 г.*

## ПЛЫТЫ

Над вадой шумяць крушыны
І лазовыя кусты.
Загарэлыя мужчыны
Гоняць рэчкаю плыты.

Дбайна ўзрошчаныя клёны,
Сосны звонкія, як сталь,
Туга звязаныя ў згоны
Без канца плывуць у даль.

Мы, сустрэўшы іх, гадаем,
Як далёка і куды.
Плытагон стары махае:
«Паплывем у гарады.

Там з такой красы-пароды,
Небывалай доўгі час,
Лесапільныя заводы
Дзіва вырабяць для вас.

Пойдзе клён і ясень гэты
І дубовыя ствалы
На узорныя паркеты,
На цудоўныя сталы».

Голас дзеда далятае,
Быццам гоман вецярка,
І ў адказ яму спявае
Наша быстрая рака.

І спяваюць плытагоны
Пра далёкі акіян,
І плывуць за згонам згоны,
Як дзівосны караван.

*1940 г.*

## РЫБАК

Як толькі выходны дзянёк настае,
Ён вуды і снасці збірае свае,
І досвіткам раннім на бераг ідзе,
І ціха спускаецца к цёмнай вадзе.

Стаіўшыся ў дзікім, густым лазняку,
Ён вуды свае закідае ў раку.
А там, адліваючы срэбнай луской,
Бліскучыя рыбы ідуць чарадой.

Напяўшы тугія свае плаўнікі,
Хвастамі ад прагнасці б'юць шчупакі.
Шырокія плоткі з чырвоным пяром
Снуюць над празрыстым, прасвечаным дном.

У змроку, у іле ляжаць карасі,
У зеллі багністым жыруюць язі,
У ціне лянівыя ходзяць ліні,
А ў тонях пярэстыя спяць акуні.

Мільёны вялікіх і дробненькіх рыб
Наверх усплываюць, ныраюць углыб,
Гуляюць на хвалях, жыруюць на дне,
А вось за кручок ні адна не кране.

І раптам, схіліўшыся трошкі на бок,
Схінуўся і знік пад вадой паплавок,
Вудзільна сагнулася ў спрытнай руцэ
І хвалі кругамі пайшлі па рацэ.

І вось праз секунду, а можа праз дзве
Трапечацца лешч на вільготнай траве.
На шчасце закінуўшы вуду ізноў,
Рыбак аглядае свой першы улоў.

*1940 г.*

## ГРЫБЫ

Нам сказалі, што за борам,
Дзе растуць адны дубы,
Зацвіла зямля, і скора
Ў лесе з'явяцца грыбы.

Дзён праз сем, а можа дзесяць,
Не забыўшы гэтых слоў,
Мы ўсямёх сышліся ў лесе
І пайшлі шукаць грыбоў.

Мы хадзілі, мы шукалі,
Кожны кусцік аглядалі, —
Хоць-бы дзе адзін грыбок,
Толькі мох ды верасок,
Ды навокала палянкі
Чарадой раслі паганкі,

Ды пад сонцам на прасторы
Чырванелі мухаморы.

Мы гадалі, што за ліха?
А грыбы сядзелі ціха,
Так схаваўшыся у мох,
Што не толькі белых ног —
Не відаць было і шапак.
Ды не выцерпеў абабак:
З моху выглянуў, гарэза.

Я нагнуўся яго зрэзаць.
А нагнуўся, аглянуўся —
І ад радасці схіснуўся:
Ля абабка — махавік,
А наводдаль — чашчавік,
А за імі каля сцежкі —
Чарадою сыраежкі
І, як родныя сястрычкі,
Маладзенькія лісічкі.

Я сяброў сваіх склікаю,
Далей-болей аглядаю:
Паміж леташніх лістоў
Чырванее асавік,
А за ім — кароль грыбоў,
Сам магутны баравік.

Я набраў іх цэлы кошык,
Палажыў наверсе ножык
І падумаў, што кашолкі
І сябрам ільга набраць,
Калі толькі, калі толькі
Добра ўмеючы шукаць.

Трудна першы грыб здабудзеш,
А другі ўжо сам ідзе,
Бо яны, як мы, як людзі,
Любяць жыць у грамадзе.

*1940 г.*

## ЯГАДЫ

Які сяголета шчаслівы
І ураджайны выпаў год:
Ва ўсіх садах агрэст і слівы,
Клубнікі повен агарод.

Пустыр закінуты калішні
І той увесь зазелянеў,
І наліліся сокам вішні,
Аж ломяцца галіны дрэў.

А за аселіцай, над рэчкай,
Паміж разгалістых крушын,
Набракла дзікая парэчка,
Кусты смародзін і ажын.

А што за ягады лясныя
У нас адразу зацвілі,
Як толькі промні веснавыя
Цяпло разнеслі па зямлі!

Спачатку сочныя суніцы
Заружавелі па лясах,
За імі следам і чарніцы
Закрасавалі ў верасах.

Цяпер салодкія маліны
Свае галовы хіляць ніц,
І ўсе сухія баравіны
Пакрыты завяззю брусніц,

І ўсе балотныя палянкі
Цвітуць агнямі журавін,
І неўзабаве ўспыхнуць гранкі
Чырвоных, яркіх арабін.

Які сяголета шчаслівы
І незвычайны выпаў год,
Які багаты і ўрадлівы
І сад, і лес, і агарод!

*1940 г.*

## КАНЕЦ ЛЕТА

Яблыкі даспелі...
У ярах глыбокіх
Дацвітае лета
Цветам журавін.
Адспявалі жнеі
На палях шырокіх.
Заспяваюць скора
Ў небе журавы.

Заўтра нам у школу...
Развітацца трэба
З тымі, з кім гулялі
Летняю парой:
З нашым шумным лесам,
З нашым сінім небам,
З нашаю блакітнай,
Быстраю ракой.

Мы ідзем на поле...
Тонкім павучыннем
І расой халоднай
Крыецца прастор.
Мы ідзем у пушчу...
Быццам у кручыне
Галаву схіляе
Старадаўні бор.

Мы ідзем да рэчкі...
З намі па дарозе —
З поўначы сцюдзёны
Подых вецярка.
І пад ім на воды
Ліст раняюць лозы,
І шуміць маркотна
Нашая рака.

Чуе, скора лёдам
Будзе ўся адзета,
На палях закружаць
Белыя снягі...
Да спаткання-ж, рэчка!
Да другога лета,

Дарагія пушчы,
Нівы і лугі!

Заўтра нам у школу...
За сталы, за парты
Сядзем мы па класах,
Будзем працаваць,
Будзем весяліцца
І вучыцца ўпарта,
Будзем вечарамі
Лета ўспамінаць.

*1940 г.*

## ДНІ СУЧАСНАСЦІ

Дні вялікай сучаснасці,
Нашы бурныя дні!
У праменнях, у яснасці,
У святочным агні

Бачу вас, залацістыя,
Праз гады і вякі.
Вас спаўюць у квяцістыя,
У жывыя вянкі.

Вас аздобяць паданнямі
Нашых дум і трывог.
Вы багаты змаганнямі
І красой перамог.

Вы геройствам адзначаны
Небывалых падзей.
Вы крывёю аплачаны
Нашых лепшых людзей.

Вы аплачаны дорага.
Ды затое ўвесь час
Рукі бруднага ворага
Не крануліся вас.

І — часамі суровыя,
Часам ветлыя — скрозь

Вы, адменныя й новыя,
Як аблокі нябёс,

Пралятаеце выраем
Насустрэчу вякам,
Многа радасці шчырае
Пакідаючы нам.

І трывогі назолыя
Нашых душ не змаглі:
Усё так-жа вясёлыя
Мы ідзем па зямлі.

А прыляжам, канаючы,
На дарожны пясок,
Скалыхнецца, рыдаючы,
Кожны куст і лясок.

Шчыра выплачуць росамі
Горкі смутак і жаль,
З маладымі бярозамі
Зноў заглядзяцца ў даль.

Там пракладзенай сцежкаю
На прасторы вясны
З нашым гартам і ўсмешкаю
Выйдуць нашы сыны.

Вы ніколі не згаснеце —
Ні пры нас, ні пры іх,
Дні вялікай сучаснасці,
Дні трывог баявых.

*1940 г.*

## ПРЫСЯГА

Асенняй раніцою,
Па нашай звычцы свойскай,
Нас цэлай грамадою
Праводзілі у войска.

Рвануліся вагоны,
І сотні рук зычліва

І родны сцяг чырвоны
Махнулі нам: —Шчасліва!

І праз адну хвіліну
Расталі і прапалі...
А мы яшчэ гадзіну
У той бок пазіралі.

Нарэшце, зняўшы ранцы,
На трэцім перагоне
Чатыры навабранцы
Сабраліся ў вагоне.

Успомнілі, згадалі
Яны свае мясціны:
Хто палявыя далі,
Хто гоман ручаіны,

Хто лісцік на бярозе,
Хто воблака на ўсходзе,
Хто пыл на той дарозе,
Якою ён праходзіў.

І мы паабяцалі:
Не баючыся смерці,
За палявыя далі,
За родны край памерці.

Пад гэтыя пагудкі,
Прагнаўшы засмучэнне,
Прыехалі праз суткі
На месца прызначэння.

І там, пры самым выйсці
На вуліцу з вакзала,
Я ўспомніў, як калісьці
Мне маці так казала:

— Цаніць ты маеш права
І недруга і друга
Па іх сапраўдных справах,
Па іх жывых заслугах. —

У форме, у падсумках
Ля палкавога сцяга

З адзінай гэтай думкай
Я падпісаў прысягу.

Пакляўся быць сумленным,
Харобрым скрозь і дбайным,
Дзяржаўнай і ваеннай
Не распаўсюджваць тайны.

Пакляўся быць навечна
Байцом краіны шчырым,
Выконваць беспярэчна
Загады камандзіраў.

Пакляўся авалодаць
Як след ваеннай справай,
Каб за спакой народа
Змагацца мог са славай.

Стрымаў я гэта слова
У вучобе і ў рабоце,
І на парад маёвы
Я выйду ў першай роце.

Калі-ж напад стрывожыць
Жыццё маёй краіны —
Ад ярых куль варожых
Я марна не загіну.

Раней, чым вораг злосны
Праз труп мой пераступіць,
Ён крок неасцярожны
Цаной вялікай купіць.

Бо ўмела штык мой коле,
Удар прыклада — трапны...
На наш прастор ніколі
Не ступіць вораг сквапны!

І я сваю прысягу
Ніколі не парушу:
Калі і мёртвы злягу —
Прыкрыю целам сушу,

Заллю крывёю рэкі,
Каб захлынуўся вораг,
Каб расцвіла навекі
Радзіма ў мірных зорах.

*1940 г.*

*1941—1945*

## БЛАГАСЛАВЕННЕ

Суровы час. Мая радзіма
Гарыць у полымі вайны.
З паходнай кайстрай за плячыма
На зборны пункт ідуць сыны.

Яны надоўга пакідаюць
Свой родны дом, свой мілы кут,
Усіх, усіх, каго кахаюць,
Усё, усё, што люба тут.

Употай ніцыя бярозы
І задуменныя лясы
Па іх раняюць горка слёзы
Буйнымі кроплямі расы.

А ім насустрач сонца ўсходзіць,
Махаюць крыллем ветракі,
І ў дальні шлях, на ратны подзвіг
Благаслаўляюць іх бацькі.

— Ідзі, мой сын, — гаворыць маці, —
Будзь непахісным у баю
За мір і шчасце ў нашай хаце,
Спакой і маладосць тваю.

Цябе на гэтыя паходы
Благаслаўляю, сыне мой,
Вялікай мужнасцю народа
І шчырай любасцю сваёй.

Хай беражэ цябе ад кулі
І ад варожых злых штыкоў

Святое пачуццё матулі —
Мая бязмежная любоў.

І горда выпрастаўшы плечы,
Шляхамі цяжкімі вайны,
Баям і славе насустрэчу
Ідуць адважныя сыны.

*1941 г.*

## ДЗЕНЬ ВАЙНЫ

Праз цэлы дзень гулі зенíткі.
У бомбы злітыя агні
І зло, спрасованае ў плíткі,
Знішчаючы жыццё й набыткі,
Ляцелі з чорнай вышыні.

І заняліся скрозь пажары —
Гарэў завод, кнігарня, дом...
І дыму шэрыя стажары,
І пах удушлівае гары
Заслалі горад палатном.

І хоць адзіны светлы дом-бы!
Вісіць пад небам бляхі ліст,
Руіны, прорвы, катакомбы,
І скрозь агонь, і бомбы, бомбы,
І страшны гул, і страшны свіст.

Нарэшце вызарыўся вечар,
І стала ціха. З блізкіх гор
Падзьмуў лясны гарачы вецер.
Унурыўшы галовы ў плечы,
Жывыя выпаўзалі з нóр.

Збянтэжаны, але разважны
І абнадзеяны народ
Зашавяліўся, як мурашнік,
І па руінах вуліц страшных
У поле рынуўся — на ўсход.

Ён вы́сыпаў на ўсе дарогі —
Жывыя тысячы людзей.

Балелі рукі, млелі ногі,
Старыя падалі ад змогі,
І чуўся плач і крык дзяцей.

Яны ішлі ўсё далей, далей,
А гнеў назад, на помсту зваў.
І перад імі днелі далі,
За імі вуліцы палалі —
Там родны горад дагараў.

*1941 г.*

## МУЖАЙСЯ

Чорнай зграяй у небе кружаць
Над краінай маёй груганы...
Будзь адважны, мужайся, дружа,
Помні вечны закон вайны:

Толькі той у баях пераможа,
Зломіць люты чужынскі рух,
Хто пад націскам зграі варожай
Захавае свой цвёрды дух.

Добра ведаю: вельмі горка —
Пад дажджамі снарадаў і мін
Пакідаць на высокіх узгорках
Цяжка ранены родны Мінск.

Хто яго ў навальніцу прытуліць?
Хто прыкрые сабой ад завей
З гэтай веліччу мяккіх вуліц,
З гэтай жменькай самотных людзей?

Ёсць, мой друг, цесляры-мінчане:
Камень Мінска ў іх сэрцы звініць,
Сэрца кожнага каменем стане —
Легчы ў сцены яго камяніц.

Каб у іх не абвялі рукі,
Не размылася вапна ад слёз, —
Не патрэбна ні скарг, ні скрухі,
Ні глухіх нараканняў на лёс.

Толькі той у баях пераможа,
Зломіць люты чужынскі рух,
Хто пад націскам зграі варожай
Захавае свой цвёрды дух.

*1941 г.*

## ГАЛАСЫ ДАРОГ

Штодзень па гэтай магістралі
Мы праязджалі ў мірны час.
У сёлах людзі нас віталі,
У лесе дрэвы зналі нас.

Цяпер выгнаннікам, без песні
Брыду праз вёскі, сасьнякі,
І ўсюды з клёкатам злавесным
У небе кружаць хіжакі.

Як дзікі вецер, кулямёты
Змялі з дарог людзей і пыл.
На ўзмежках, скручаныя дротам,
Гараць і курчацца слупы.

У каляіне злёгшы гразкай,
Уся дзіравая ад ран,
Стаіць дзіцячая каляска,
Ляжыць разбіты чамадан.

Вакол яго бялеюць крупы,
І па абочынах равоў
Забытыя сінеюць трупы,
І яркая цямнее кроў.

А воддаль на грудку высокім,
Нібы не зрокшыся жыцця,
Ляжыць пажоўклае ад спёкі
І нерухомае дзіця.

Падол і рукавы кашулькі
Пасек густы свінцовы град.
Чатыры хвойныя шыпулькі
Прыкрылі зрэнкі вачанят.

І разам з мёртвымі вачамі
Яны гукаюць у прасцяг,
І разам з іншымі шляхамі
Крычыць і Магілеўскі шлях:

— Адпомсці ім!
— Адпомсці! — ўторыць
Маскоўска-Мінскае шасе.
Усе шляхі ў адно гавораць,
Дарогі ўсе, і сцежкі ўсе.

*1941 г.*

## МЫ ВЕРНЕМСЯ

У засціле пылу, шляхамі вайны,
Як знак набліжэння баёў,
Плятуцца пад спёкай авец табуны,
Чароды маркотных кароў.

Ім помняцца сочныя дома лугі
І засень кляновых прысад,
І вочы іх нема галосяць з тугі:
— Мы вернемся скора,
Мы прыдзем назад!

Забіты чыгункі. Ахрыплі гудкі.
Трывожна сірэны крычаць.
І круглыя суткі не спяць цягнікі,
Начальнікі станцый не спяць.

Марудна паўзуць эшалоны машын,
Грукоча жалеза не ў лад,
А голас і ў стогнах, і ў скаргах — адзін:
— Мы вернемся скора,
Мы прыдзем назад!

У смутку пакінуўшы бацькаўскі кут,
Ідзе на выгнанне народ:
Ад чорнай заразы, ад лютых пакут
Да сонца спяшае на ўсход.

Далёка ўжо родная дзесь старана,
І хаты, і поле, і сад...
Вядзе іх наперад надзея адна:
— Мы вернемся скора,
Мы прыдзем назад!

Пад націскам тройчы узбольшаных сіл,
На бераг шырокай ракі
Апошнімі, мужна, між свежых магіл,
З баямі адходзяць палкі.

Гатовыя к смерці ў няроўным баю,
Слухмяна спаўняюць загад,
І толькі маўкліва прысягу даюць:
— Мы вернемся скора,
Мы прыдзем назад!

Зямля беларуская, сонечны край,
Пачуй нашы модлы любві!
У шчодрасці стомленым дужасці дай,
Знябытых ад мук ажыві.

Услаўшы да родных аселішчаў шлях
Касцямі варожых салдат,
Па трупах, па жылах, па гэтых касцях
— Мы вернемся скора,
Мы прыдзем назад!

*1941 г.*

## УПАРТАСЦЬ

Ідуць крывавыя баі —
Па сем атак на дню.
Чацверты дзень мае сябры
На лініі агню.

Два разы танкі іх прайшлі,
Засыпалі зямлёй.
Яны ўзняліся з-пад зямлі
І рушаць зноў у бой.

Жалезам волі не зламаць!
Яны адступяць з агнявых,
Калі не будзе больш відаць
За трупамі жывых.

*1941 г.*

## ПЕСНЯ ПАРТЫЗАН

Ад краю у край
Цераз поле і гай
Паклікаў нас бацька любімы:
— Збірайся ў паход,
Беларускі народ,
За чэсць і свабоду радзімы. —

І ўсталі сыны
Разарваць кайданы
Праклятай фашысцкай няволі.
На ўсе галасы
Зашумелі лясы,
І цёмныя пушчы, і поле.

За слёзы дзяцей,
За пакуты людзей
Адпомсціць ідуць партызаны,
І мужна ў лясах,
І ў шырокіх палях
Знішчаюць чужынцаў нязваных.

І прыдзе пара —
Разгарыцца зара
Свабоды і шчасця радзімы,
Бо наша зямля
Чуе заклік з Крэмля,
Твой заклік, наш бацька любімы.

*1941 г.*

## КАЛГАСНЫ ВАРТАЎНІК

На родным прыгуменні
Калгасны вартаўнік
Спыніўся ў задуменні
І галавой панік.

Уздоўж знаёмай сцежкі
Ляжалі трупы ў рад,
Чарнелі галавешкі
І печы мірных хат.

Блукала ў небе зорка,
Адна на ўвесь прасцяг...
І дзед заплакаў горка,
Заплакаў, як дзіця.

Пакінь, не трэба плакаць,
А трэба злом гарэць
І помсціць ім, сабакам,
За здзекі і за смерць.

Пакуль старая ведзьма —
Нямецкі капітан,
Балюе дзесьці, — едзьма
У лес да партызан.

За вёскай на пагоне
Сябры чакаюць нас,
І нецярпліва коні
Ірвуцца на папас.

Там нашы трактарысты
На ўскраіне лясной
Адбітыя ў фашыстаў
Рыхтуюць танкі ў бой

Дзед горача і чула
Прыпаў да долу ніц.
І вочы ўспалыхнулі
Агнямі бліскавіц.

Абвёўшы зрокам нівы,
Ён выпрастаў свой стан
І рушыўся маўкліва
У лес да партызан.

Ён быў суровы й грозны,
Калгасны вартаўнік,
Над ім у небе зорным
Усходзіў маладзік.

Таварышы з атрада,
Прыміце дзеда ў часць,
Я ведаю, спагады
Ён ворагу не дасць.

Ніякія цяжары
Старога не сагнуць,
І справядлівай кары
Фашыстам не мінуць.

*1941 г.*

## ЖНІВО

Шырокія нашы палеткі,
Паглядзіш — адно хараство.
Ды труднае сёлета ўлетку,
Нязвыклае будзе жніво.

Мне помніцца, як рыхтавала
Любоўна брыгада раллю,
Як лепшыя сейбіты дбала
Пасеялі зерне ў зямлю.

А ў холад, пад лютым вятрыскам
Штоночы з трывогай нямой
Мы так, як бацькі над калыскай,
Стаялі над нівай сваёй.

Гарачаю, дружнаю працай
Расцілі мы свой ураджай.
І вось пачало наліваццa
Высокае жыта, як гай.

За ім зашумела пшаніца,
Пайшла бушаваць ярына...
І раптам, як гром-навальніца,
Ударыла грозна вайна.

Здрадлівы, бязлітасны вораг
Прабраўся, як злодзей, у край
І прагне на нашых прасторах
Багаты пажаць ураджай.

Ад голаду спухнеш, пракляты,
Раней, чым паспееш сабраць,
Бо цвёрда наважыў араты
Ні зерняці гадам не даць.

Аралі і сеялі самі,
Дык самі і нівы сажнём,
Сажнём не крывымі сярпамі,
А лютым і грозным агнём.

А вам, ашалелым бандытам,
Ад нашай жняі і сяўца
Замест беларускага жыта
Дадзім на дарогу свінца.

*1941 г.*

## ГЕРОІ

Краса маёй краіны роднай —
Свабодалюбны мой народ!
Супроць фашысцкай банды збродпай
Ты мужна рушыў у паход.

Да ратных подзвігаў прывычны
І загартованы ў баях,
Ты ўстаў, жывы і гераічны,
На ўсіх дарогах і шляхах.

Твае сыны з пагардай к смерці
Сустрэлі ворага свінцом,
Бо лепш са славаю памерці,
Як жыць у ганьбе пад ярмом.

І зазвінела грозна зброя
Па цёмных пушчах і лясах,
І сотні, тысячы герояў
Там нараджаецца ў баях.

Ярчэюць іх штодзённа справы,
І, як магутны акіян,
Шуміць над краем гоман славы
Пра беларускіх партызан.

Свабодна весць у Крэмль маскоўскі
Ідзе з сяла і да сяла,
Як б'ецца з ворагам Паўлоўскі,
Як нішчыць зграю іх датла;

Як пад ударам Бумажкова
Дрыжаць нямецкія палкі,
Як па лясах і па дубровах
Бяруць фашыстаў у штыкі.

Героі мужнага народа,
Яны праслаўлены ў баях
І найвышэйшай нагародай
Цяпер увенчаны ў вяках.

Смялей-жа ў бой услед за імі,
Сыны рабочых і сялян,
Краса і цвет маёй радзімы —
Атрады храбрых партызан!

*1941 г.*

## ДА МОЛАДЗІ

Узгадаваныя на волі,
Пад сонцам Сталінскай вясны,
Вы не згіналі плеч ніколі,
Свабодалюбныя сыны.

Вам з нараджэння невядома
Нядоля палкі і ярма.
І вось над вашым мірным домам
Навісла рабства і турма.

І вашы светлыя надзеі
І вашу радасць без тугі
З-пад чорнай хмары ліхадзеі
Закуць імкнуцца ў ланцугі.

Няўжо-ж вы схіліце калені,
Сябры геройскіх, мужных спраў,
Каторым даў свабоду Ленін,
Каторым Сталін шчасце даў?

О, не! На ўзгорках і між долаў
Магутны чую ваш адказ:
— Не схіліць той пакорна голаў,
Хто волю зведаў хоць-бы раз!

Паўстань-жа, моладзь Беларусі,
Сыны рабочых і сялян,
Супроць няволі і прымусу,
Гуртуй атрады партызан!

Няхай зазвоняць пушчы зброяй,
Хай зашумяць агнём лясы,
Няхай ад вашых рук, герої,
Канаюць гітлераўцы-псы.

Ізноў тады над нашым домам
Заззяе радасць, шчасце, мір,
І светлым поглядам знаёмым
На нас паглядзіць правадыр.

*1941 г.*

## ПРАВАДЫР

Цяжкая, суровая доля нам выпала...
Мы цвёрда сустрэлі каварны удар!
Нянавісць успыхнула полымем вымпела —
І грознага гневу разліўся пажар.

У гэтым агні наша вытрымка кована,
Каторай нікому нічым не зламаць,
У гэтым агні наша мужнасць гартована,
Якая на подзвігі рушыла рать.

І мы пад цяжарам бяды не сагнуліся, —
На ўсю неабдымную веліч і шыр
Народныя сілы ў баях развінуліся,
Бо з намі, у сэрцах у нас — правадыр.

Глядзіце, прыкрыўшы магутнымі крыллямі
Ад банды варожай совецкі прастор,
У даль самалёты плывуць эскадрыллямі
І ў небе высокім трымаюць дазор.

На снежнай зямлі, палыхаючы зорамі,
Магутныя танкі ідуць чарадой...
Усё гэта сталінскім розумам створана
І воляю Сталіна рушана ў бой,

У бой за Радзіму, за славу народную,
За творчую працу, за шчасце і мір...
На плечы шынель апрануўшы паходную,
Наперадзе войска ідзе правадыр.

Наперад, лясамі, палямі, гасцінцамі,
Вядзе ён на ворага нашы палкі,
Нябачна ў зямлянках жыве з пехацінцамі
І водзіць гвардзейскія часці ў штыкі.

Калі-ж пранізаныя лютаю куляю
Мы падаем ніц у няроўным баю,
Ён ціха падходзіць і з ласкаю чулаю
На помач руку падае нам сваю.

І мы падымаемся хвалямі ярымі,
Кідаемся ў бітвы раз'ятраны вір,
І коціцца вораг пад нашымі ўдарамі,
Бо з намі, у сэрцах у нас — правадыр.

Ідзе ён знаёмай паходкаю простаю,
І рунь зелянее на чорных палях,
І скрозь над людзьмі, як з легенды, вырастае,
Гарыць і трапечацца сонечны сцяг.

Ён бурай ваеннай, агнямі апалены,
На ім палымнее гарачая кроў.
Пад сцягам пурпуравым Леніна—Сталіна
Мы прыдзем да мірнага шчасця ізноў.

Мы духам — нязломныя, воляй — упартыя,
Бо ведае кожны баец, камандзір,
Што з намі вялікая мудрая партыя,
Што з намі, наперадзе нас — правадыр.

*1942 г.*

## ЗЯМЛЯ

Дол, узгоркі, лугі і ралля...
Гэта наша, таварыш, зямля!

Як-жа можна яе не любіць?
Тут з табой пачыналі мы жыць.

Тут рабілі мы першы свой крок,
Тут знаёмы нам кожны куток.

Тут умыўшыся белай расой,
Мы з табою хадзілі з касой.

Тут збіралі мы свой ураджай,
Тут спявалі нам рэкі і гай.

Тут, на гэтай чароўнай зямлі,
Нашы думы і годы прайшлі.

А як прыдзе апошні наш дзень,
Яна дасць нам магілу і цень.

Хіба-ж можам яе мы аддаць
Чорнай бандзе дзяліць і таптаць?

Мы напоўнім прасторы крывёй,
Мы патопім бандытаў у ёй.

А свабодную нашу зямлю —
Дол, узгоркі, лугі і раллю —

Зберажэм ад чужынцаў ліхіх
Для сябе і патомкаў сваіх,

Так, як нам зберагалі бацькі
Праз суровыя годы-вякі.

*1942 г.*

## ХМАРА

Ёсць на Беларусі,
За ракой Бярозай,
Ціхая хаціна
З вокнамі у сад.

Там маё прыстанішча.
Залатыя росы
Ападаюць з яблыні,
Быццам вадаспад.

Некаму сабраць іх:
Зараслі крыніцы;
Некаму іх выпіць:
Людзям досыць слёз;
Некаму і высушыць:
На галінах ніцых
Сонца не развесіла
Прамяністых кос.

Надышла хмурынка,
Пазбірала росы,
Стала цёмнай хмарай,
Рушылася ў свет:
За былою доляю,
За мінулым лёсам,
За калішняй радасцю
І за намі ўслед.

Дзесьці за Валдаем
Нас яна дагнала
І пайшла над намі,
Хілячы лясы,
Бліснула маланкамі,
На палеткі ўпала
Залатымі кроплямі
Роднае расы.

Ґрукнула мне ў сэрца,
Як у тыя шыбы
Ціхае хаціны
З вокнамі у сад:
— Дзе-ж тваё прыстанішча?
Дзе твая сяліба?
Што-ж ты не вяртаешся
Цэлы год назад?

*1942 г.*

## СЛОВА ПРЫСЯГІ

Светлыя вобразы роднай краіны,
Горкая мука і радасць мая!
Сіняе неба і вочы дзяўчыны,
Гоманы нівы і спеў салаўя...

Я не пазбудуся вас і па смерці —
Кожная рыска на сэрцы ляжыць.
Лёсам мне суджана з вамі памерці,
Нельга без вас сіратою мне жыць.

Ліст, ападаючы, шасне над вухам —
Мне ў гэтым шэлесце родным чуваць:
Бурай вайны разгайданыя, глуха
Пушчы маёй Белавежы шумяць.

Дождж за акном паліецца, як слёзы, —
Я ў гэтых кроплях асенняй тугі
Чую, як плешчуцца хвалі Бярозы,
Чую, як Нарач ірве берагі.

Пазарасталі дзядоўнікам сцежкі
Сёлетнім летам да нашых азёр,
Трупамі накрыж ляглі галавешкі,
Прывіды шыбеніц сталі ў дазор.

Ты ці не ты гэта, наша краіна?!
Перад расхістаным ветрам акном
На пажарышчы адна арабіна
Яркім, святочным палае агнём.

Глянь на яе і чырвоныя сцягі,
Хоць на хвіліну ізноў прыгадай,
Словы успомні свяшчэннай прысягі:
Жыць і памерці — за родны свой край!

*1942 г.*

## ГОРАДУ НА ДЗВІНЕ

Устаўшы смела, без апаскі
На стромкіх берагах Дзвіны,
Ты баяў нам легенды-казкі,
Ты навяваў нам мары-сны.

І перад намі паўставалі
Сівыя, даўнія вякі,
Калі жылі і ваявалі
Не мы, а нашы землякі.

І я ўзыходзіў на званіцы,
Хадзіў па Замкавай гары
І аглядаў твае байніцы
І старадаўнія муры.

Як гэта ўсё цяпер далёка!
Тым болей прагна кліча кроў:
Упэўненым, шырокім крокам
Прайсціся каля тых муроў;

Прыпасці вуснамі і піць-бы,
Пакуль дазволяць берагі,
Блакітныя струмені Віцьбы
З адценнем чорным ад тугі.

А потым, выпраставўшы плечы,
Глядзець на зьбітае шкло,
Успомніць нашыя сустрэчы
І ўсё, што некалі было:

Як раніцой спяваў рубанак,
Як заліваліся гудкі,
Спакойны гоман віцяблянак
І неспакойны шум ракі.

Ды пуста скрозь. І вецер свішча,
І ў небе стынуць каміны,
І на шырокіх папялішчах
Начуюць совы й груганы.

Пустыя, выбітыя вокны
Палошчуць спорныя дажджы.
Ты, як жабрак, стаіш і мокнеш
У чорным латаным плашчы.

І твой яшчэ гарачы попел
Нясуць вятры ва ўсе канцы,
І немка тоўстая з пантопель
Яго страсае на пляцы.

Але пад нашымі рукамі
З'явіўшыся на гэты свет,
Прыступка кожная і камень
Хаваюць наш гарачы след.

І мы цябе не кінем, горад:
У славе нашых перамог
Мы станем, ціхія ад гора,
На абгарэлы твой парог.

Як некалі ты ўзняўся з казкі,
Так после ўзнімешся з руін
І смела будзеш, без апаскі
Глядзець ізноў у далячынь.

*1942 г.*

## НЕ СПІЦЕ

На полі — ноч. На сэрцы — ноч.
Ноч над усім забраным краем.
І людзі падаюць насторч,
І дрэвы стогнуць: — Паміраем!

Знясілеўшы ад цяжкіх дум,
Ад слёз, што ўпотай праліваеш, —
Кароткім сном пад гэты шум
Ты кожнай ночы засынаеш.

І покуль ты трывожна спіш,
Крывавай здрадніцкаю лапай
Тваё імя ў смяротны спіс
Заносяць вылюдкі з гестапа.

Яны з цябе не зводзяць воч,
І ноч, страшнейшую за гэту, —
Варфаламееўскую ноч
Табе рыхтуюць людаеды.

Цяжкую, жудасную смерць
Яны нясуць твайму дзіцяці.
Няўжо-ж вы будзеце цярпець?
Устань, мой брат! Прачніся, маці!

Бяжыце ў пушчы, у атрад,
Туды, дзе вашы абаронцы,
Далей ад чорных, бурных здрад,
Бліжэй да волі і да сонца.

*1942 г.*

## ВІНТОЎКА

Зняважаны, стаптаны,
Пад ботам чорных зграй,
Да ніткі зрабаваны
Ляжыць наш родны край.

Тудою, па гасцінцы,
Дзе высяцца бары,
Ідуць гурбой чужынцы,
Нібы гаспадары.

Твае-ж малыя дзеці,
І сёстры і браты
Развеяны па свеце,
Як жоўтыя лісты.

Адна ў цябе сяброўка
І друг табе адзін —
Халодная вінтоўка,
Надзейны карабін.

Вазьмі яго і дбайна,
Як будзе цішыня,
Схавай у месцы тайным
Да заўтрашняга дня.

У гэты дзень расплаты
Ты будзеш не адзін —
З табой, як з родным братам,
Падружыць карабін.

І, выпрастаўшы плечы,
З намерам баявым
Ты выйдзеш насустрэчу
Крыўдзіцелям тваім.

Адпомсціш ім за сына,
За здзекі, за прымус,
За родную краіну,
За нашу Беларусь.

*1942 г.*

## ПЕРШАМАЙСКІ САЛЮТ

І ў мяне на радзіме сягоння вясна:
Па-вясноваму вецер шуміць баравы,
Дрэмле, грэючы рукі, старая сасна,
На азёры з-за мора лятуць журавы.

Дакраніся да дрэва, зрабі толькі знак —
Шчодра рыне густы, узбунтованы сок.
Толькі некаму будзе падставіць латак,
І гарачыя кроплі ўпадуць на пясок.

Я адчую па адной толькі з гэтых драбніц,
Як сумуюць па нас і палеткі і гай,
Як галосяць употай струмені крыніц,
Як маркотна сустрэнуць сяголета май.

На світанні, па звычаю гэтага дня,
У акно асцярожна пастукае клён.
Не адкажа нічога яму цішыня,
І ніхто не пачуе знаёмых імён.

Што-ж, мужайся, сяброўка, жыві і трывай,
Хай не цешыцца вораг, пачуўшы твой плач.
Прыгадай нашу дружбу, усё прыгадай
І чым-небудзь па-даўняму свята адзнач.

А пачуўшы, як гул патрасае зямлю,
Узнімі, абнадзей заняволены люд —
Гэта я прывітанне табе перашлю,
Гэта вам будзе наш першамайскі салют.

*1942 г.*

## АБ ЧЫМ СПЯВАЮЦЬ САЛАЎІ

Аб чым спяваюць салаўі?
Я часта думаю над гэтым,
Калі вясёлыя гаі
І горкі смутак дум маіх
Птушыным шчэбетам сагрэты.

І сніцца мне мой родны край,
Мая далёкая радзіма,
Кляновы ліст, дубовы гай
І ружаваты небакрай,
Засланы злёгку белым дымам.

З руін на момант уваскрос
І шэлест лісця асцярожны,
І на шляху даўгі абоз,
І ў цeню ветлівых бяроз
З кійком і кайстрай падарожны.

Малюнкі бацькаўскай зямлі!
Нічым вас з памяці не сцерці.
Мы змалку там з табой жылі
І ўсё да радасці ішлі,
А набліжаліся да смерці.

І ўсё, ад кветак на лугу
Да рыжай палявой пясчынкі,
Я дбайна ў сэрцы берагу,
І толькі ўспомніць не магу
Усмешку роднае дзяўчынкі.

Ад той усмешкі дарагой
Ёсць штосці ў песнях салаўіных —
Пявучасць хвоі маладой,
І звон крыніцы пад гарой,
І смутны гоман арабіны.

І мне ўжо мроіцца парой,
Як мы, пазбыўшыся напасці,
Ізноў сустрэнемся з табой
І пойдзем роўнаю хадой
Не да магілы, а да шчасця.

Ці-ж не аб гэтым у гаі,
Ледзь толькі неба пацямнее,
Пяюць штоночы салаўі
І горкі смутак дум маіх
Вяселяць добраю надзеяй.

*1942 г.*

## ПАСЫЛКА

Ноч. Халодная зямлянка.
Перастрэлка. Цішыня.
Неба, чыстае, як шклянка.
Тупат быстрага каня.

Мы пазналі без памылкі,
Што пад сховай цемнаты
Нам даставілі пасылкі,
Тэлеграмы і лісты.

Хто ад маткі, хто ад жонкі —
Кожны вестку атрымаў,
Толькі мне з маёй старонкі
Ні пасылкі, ні пісьма.

Што-ж, яна сама сягоння
Тужыць горкай сіратой
У няволі, у палоне,
Пад нямецкаю пятой.

Не заныю, не заплачу,
Я да ласкі не прывык...
Да мяне раптоўна, бачу,
Падыходзіць паштавік.
Ён выймае мне са скрынкі
Шоўкам вышыты кісет,
Дзве квадратныя хусцінкі
І малюсенькі пакет.

Незнаёмаю рукою
Там напісана ўгары:
«Беларускаму герою
Ад сяброўкі і сястры.

Вышываны там, дзе горы
На святой зямлі грузін,
Каб ты ведаў, што і ў горы
Ты на свеце не адзін».

Я прыняў дарунак мілы
Перад боем уначы
І да самае магілы
Буду шчыра берагчы.

Не пасылка дарагая,
А братэрская любоў,
Наша дружба векавая,
Дружба верная сяброў.

*1942 г.*

## ВЯЧЭРНІЯ ДУМЫ

Байцы вярнуліся з перадавых.
Атросшы з гімнасцёрак шэры пыл,
Умыўшыся сцюдзёнаю вадой,
Старэйшыя ляглі адпачываць,
А маладыя выйшлі на гулянку.
Мы самі некалі з табой любілі
Пажартаваць з вясковаю красуняй,
Сказаць ёй некалькі ласкавых слоў,
Якім яна ніколі не паверыць,
А слухаць будзе ўсё-ж такі з увагай.
Ды ўсё мінаецца на гэтым свеце, —
На захадзе яшчэ палае неба,
А над сялом ужо кладзецца змрок.
Вось так з гадамі лёгка і нячутна
На нашы скроні ляжа сівізна.
Мы нават не заўважылі з табой,
Як прамінула наша маладосць
І мы ўступілі ў сталыя гады:
Спаць з вечара — мы трохі маладыя,
А для гулянак — лішне пастарэлі.
Але аб гэтым сумаваць не трэба.
Давай закурым, пасядзім пад ліпай,
Прасочым тую ціхую заранку,
Што раніцой ідзе на Беларусь.

Успомнім... Ведаеш, аб чым успомнім?
Пад Мінскам летась я пакінуў маці,
У Полацку ў цябе застаўся сын,
А ў гэтае жанчыны, што сумуе,
У Чэрвені маленькая дачка,
Якую людзі называлі Славай.
Як многа сірат засталося там!
Мы ўсіх успомнілі: і пастухоў,
І тых, што спяць пад небам у калысках,
Старэйшым пажадалі добрай ночы,
А меншым ціха спелі калыханку.
Яшчэ мы прыгадалі партызан,
Што берагуць маркотны сон дзяцей
І грэюць іх сваёй суровай ласкай.
І між імён, праслаўленых навек,
Былі імёны блізкіх і знаёмых.
І гэтак лёгка стала ў нас на сэрцы,
Што мы пачулі голас цішыні:
На дрэве калыхаўся жоўты ліст,
Шумела воблака над галавой
І падалі з вядра ля студні кроплі...

*1942 г.*

## ПАРТЫЗАНЫ

Перад захадам сонца
Ёсць хвіліна тугі...
Аднастайна бясконца
Шалясцяць сітнягі.

На асеннія пожні,
Завяршаючы дзень,
Ападае апошні
Надвячоркавы цень.

Потым лёгка па дрэвах,
Па шурпатай кары
Пройдуць справа налева
І замоўкнуць вятры.

Жоўты ліст, непрыкметна
Збіты імі з галін,
Доўга кружыць бязмэтна,
Ў цэлым свеце адзін.

Апусціўшы ад стомы
Нізка рукі на дол,
Тужыць лес нерухомы
Над магіламі сёл.

Моўчкі думае думу
Аб пакутлівых днях.
І ні шэпту, ні шуму —
Цішыня, цішыня...

Ды такая нямая,
Што, калі не прывык,
Ты пачуеш над краем
Сэрца кожнага крык.

І здаецца, што грудзі
Здушыць чорны адчай,
І не ўздымуцца людзі
І не ўстане мой край.

Раптам вырвуцца крокі
З нежывой цішыні,
Быццам дзесьці далёка
Едзе хтось на кані.

Клён нахіліцца к вязу,
Шэпнуць мовай галля
Штось другім... І адразу
Ажывае зямля.

На лясныя паляны
З цёмных нетраў і нор
Устаюць партызаны
І выходзяць на збор.

Ноч, густая, як сажа,
Зберажэ іх ад куль,
Не прадасць і не скажа,
Хто яны і адкуль.

Толькі мы, ды радзіма,
Ды балотны гушчар
Помнім кожнага імя,
Знаем многіх у твар.

Гэта — нашы суседзі:
З тым сумесна жылі,
З гэтым, помніцца, недзе
Нават чарку пілі...

Мы-б пагутарыць рады,
Ды цяпер не пара:
Камандзіру брыгады
Час, як кажуць, з двара.

Дзед — таксама знаёмы,
Можа, нават радня —
Клапатліва, як дома,
Запрагае каня.

Хлопцы з першае роты,
З кім дружыў я і рос,
Два ручных кулямёты
Ставяць дзеду на воз.

Пажылыя мужчыны,
Угінаючы дол,
Носяць палкія міны,
Грузяць ярасны тол.

Маладая кабета
Правярае курок.
А наводдаль падлетак,
Селавы пастушок,

Пагарджаючы боязь,
Як бывалы салдат,
Затыкае за пояс
Пяць гарачых гранат.

Я не ведаю — порах
Ці нянавісць у іх,
Гэта зведае вораг
На галовах сваіх.

Помста добра паспела!
І, пачуўшы загад,
Рушыць дружна і смела
Партызанскі атрад.

На якімсь кілометры
Ад лясной глухаты —
Узляцяць у паветра
Цягнікі і масты.

Грымне ярасны выбух,
Як маланкавы гром,
Бразне ў кожную шыбу,
Страсяне кожны дом.

Бляск поўнеба асвеціць,
І, прачнуўшыся ўраз,
Скажуць шэпатам дзеці:
— Гэта бацька за нас. —

Сцепануўшыся зябка,
Як таймуючы плач,
Перахрысціцца бабка:
— Дай ім, божа, удач! —

Маці выйдзе ў вароты,
Доўга будзе лавіць
Роўны стук кулямёта,
Шэлест роснай травы.

После ў сінім сутонні,
На світальнай зары
Знікнуць людзі і коні
У лясным гушчары.

Ноч, густая, як сажа,
Зберажэ іх ад куль,
Не прадасць і не скажа,
Хто яны і адкуль.

Толькі мы, ды радзіма,
Ды балотны гушчар
Помнім кожнага імя,
Знаем многіх у твар.

*1942 г.*

## ПАСЛАНЕЦ

Па сцежках таемных, з ляска да ляска,
Ідзе ў Беларусь пасланец ад ЦК.

Заданне адказнае: спешна з Масквы
Даставіць атрадам наказ баявы.

За поясам — фінка, мяшок на плячах.
А ў полі мяцеліцы спяць на шляхах.

Кранешся іх дотыкам лёгкім нагі —
Завые вятрыска, закружыць снягі:

— Спяшай, чалавеча, да выбраных мэт,
Мы зараз засыплем, завеем твой след! —

І вось — ані сцежак ужо, ні дарог...
А нельга зайсці да людзей на парог!

Абходзячы вабны над хатай дымок,
Ганец павяртае ізноў у лясок.

У лесе зацішна. Не блага-б спачыць,
Ды важны наказ пад ватоўкай ляжыць.

І ноч навылёт чалавек не засне —
Ці дзяцел застукае дзе на сасне,

Ці шышка пакоціцца з елкі наніз,
Ці пройдзе, павольна ступаючы, ліс,

Ці заяц праскочыць па свежым сняжку —
Не спіць пасланец, пасланец начыку.

Не гэтак уласнай шкада галавы,
Як шкода заветнага слова з Масквы,

Якое ганец пад ватоўкай нясе,
Якога так прагна чакаюць усе.

І, ледзь адпачыўшы, з ляска да ляска
Ідзе ў Беларусь пасланец ад ЦК.

Заданне адказнае: трэба з Масквы
Даставіць атрадам наказ баявы.

За поясам — фінка, мяшок на плячах...
Нямецкая варта стаіць на шляхах.

Благія шляхі, і няма ім канца,
Ды ў крыўду радзіма не дасць пасланца.

Кашлатыя пушчы даюць яму дом,
Ад сцюжы кусты ахінаюць крысом,

Мільёны на небе рассыпаных зор
Выводзяць з аблуды на чысты прастор,

А ў чыстых палях ад пагібельных воч
Яго прыкрывае завейная ноч.

І ён без спазнення, ў прызначаны час
Прыносіць з Масквы партызанам наказ.

Яго абступаюць, пытаюць навін.
Ён гутарыць з хлопцамі пару гадзін,

Гаворыць ім простыя словы: «Братва!
Трымайцеся, з вамі заўсёды Масква!»

І вестка ідзе ад байца да байца,
Яна абганяе свайго пасланца,

Яна падымае атрады на бой
І новыя сілы вядзе за сабой.

Аж неба ад выбухаў грозных гудзе,
І вораг не мае спакою нідзе.

Тым часам ізноў ад ляска да ляска
Ідзе пасланец з даручэннем ЦК.

Заданне адказнае: спешна з Масквы
Даставіць атрадам наказ баявы.

За поясам — фінка, мяшок на плячах...
Мяцеліцы белыя спяць на шляхах...

*1943 г.*

## РАЙКОМ

Я помню ў Мінску строгі дом,
Мураваны з камення.
Там быў калісьці наш райком —
Мой гонар і сумленне.

Ці радасць білася ў грудзях,
Ці смутак віўся горкі —
Я да райкома ведаў шлях:
Уніз з высокай горкі.

Бывала, з чым-бы ні прыйшоў —
Уважліва і ветла
З табой пагутараць, і зноў
На сэрцы стане светла.

Каб не схлусіць, было і так:
Сустрэлі раз сурова,
Абмеркавалі так і сяк
І вынеслі вымову.

Разбурыў вораг светлы дом,
Мураваны з камення,
Але працуе наш райком —
Мой гонар і сумленне.

Ён там — у пушчах і лясах,
Паблізу ад палянкі,
І людзі добра знаюць шлях
Да патайной зямлянкі.

Яна, нібы даўнейшы дом,
У сцюжы, у завеі
І грэе іх сваім цяплом,
І жывіць іх надзеі.

О, калі-б мне туды ізноў —
У свой райком папасці,
Я пагадзіўся-б пяць вымоў
Цярпець за гэта шчасце!

*1943 г.*

## РОДНЫ ХЛЕБ

Гарыць агонь. Каля зямлянкі
Аб доме тужаць землякі,
А маладыя партызанкі
Пякуць і сушаць праснакі.

Навечна будзь благаславёны,
Запрацаваны ў поце хлеб —
Не квашаны і не салёны,
Для важных спечаны патрэб!

Ад пагарэлага парогу,
Як нашай скаргі пасланец,
З табой на досвітку ў дарогу
З атрада выедзе хлапец.

Пасля пяшком з-пад самай Гродні
Ісці ён будзе да Масквы,
Не раз затоміцца галодны
І прыдзе, можа, ледзь жывы.

Але з апошняе скарынкі,
Што ў кайстры змуліцца на дне,
Ён не адломіць ні крупінкі
І да сустрэчы не кране.

І толькі выйшаўшы з нyволі,
З сябрамі сеўшы за сталом,
Успомніць хлеб, што на вуголлі
Пячэцца з кмінам і з дымком.

І так, як след па-беларуску
Прынесці ў хату лепшы дар, —
Ён выме з кайстры на закуску
Скарынку чэрствую — сухар.

Разломіць ён яе як трэба
І скажа: «Покуль не пілі,
Закусім, хлопцы, родным хлебам
З далёкай бацькаўскай зямлі».

І — божа мой! — якім духмяным
Павее водарам яна!
Адразу кожны стане п'яны,
Але не з горкага віна.

Ён будзе п'яны з успамінаў
Аб нашай роднай старане,
Аб той калысцы і краіне,
Дзе маці песціла мяне,

Дзе кожны вечар ля зямлянкі
Сумуюць нашы зямлякі,
Дзе маладыя партызанкі
Пякуць і сушаць праснакі.

*1943 г.*

## ДЗЯЎЧЫНЕ З КЛІМАВІЧ

Незнаёмая дзяўчына з Клімавіч,
Добры веснік радасных надзей!
Як імя тваё найлепей вымавіць,
Каб яно гучала ласкавей?

Што ты глянула з такой апаскаю?
А ці ведаеш, чаму я рад
Самай цёплай, самай шчырай ласкаю
Ахінуць цябе, як родны брат?

Ты прыйшла, маўклівая пакутніца,
З той зямлі, з якой у горкі час
Злая доля — чорная разлучніца
Разлучыла, раз'еднала нас.

Ты хадзіла палявымі ўзгоркамі,
Дзе шумела наша маладосць,
На твае далоні адвячоркамі
Церусіўся магілёўскі дождж.

На цябе з Вялікае Мядзведзіцы
Гром заранкі нашыя атрос,
І таму вось кожны не нагледзіцца,
Хто пад тымі зорамі узрос.

Ты зірнеш, вясёлая й харошая,
Сінімі вачамі, як блакіт, —
Мне здаецца: на палях пад Оршаю
Зацвітаюць летам васількі.

А нахмурыш цёмна бровы грозныя —
Мне тады не цяжка адгадаць,
Як у ночы лютыя, марозныя
Каля Шклова шаблямі звіняць.

І я ведаю і цвёрда верую,
Што народ мой выйдзе з нематы.
Апранутая ў ватоўку шэрую,
Гэту веру мне прынесла ты.

Вось чаму імя тваё мне дорага,
Адназемка добрая мая.
Ды каб часам не пачулі ворагі,
Я не выкажу твайго імя.

Толькі блізкім самым ціхім гоманам
Намякну, што дзесьці трошкі ўбок
Ад Баранавіч, ад Слоніма, ад Нёмана —
Гэта імя носіць гарадок.

Як-жа мне яго найлепей вымавіць,
Каб яно гучала ласкавей,
Незнаёмая дзяўчына з Клімавіч,
Добры веснік радасных надзей?

*1943 г.*

## НАКАЗ

Зямляк мой шчыры, мой таварыш!
На ратны подзвіг ідучы,
Пад бляскам жудасных пажарышч
На варце стоячы ўначы,

На адпачынку перад боем
Успамінаючы свой край,
Сваё юнацтва залатое, —
Ніколі, друг, не забывай:

Пад небам бацькаўшчыны нашай,
Шляхамі чорнымі вайны,
У світках, тканых зрэбнай пражай,
Закутых моцна ў кайданы —

Ад роднай хаты і крыніцы,
Ад роднай пушчы і азёр
Вядуць у рабства чужаніцы
Тваіх замучаных сясцёр.

Спяшай да родных! Помні тое,
Што больш нікога ў іх няма.
Вярні жыццё ім маладое,
Ратуй з нямецкага ярма!

*1943 г.*

## ГАЙ

Зламаўшы к вечару варожы
Умацаваны левы край,
Мы выйшлі з вёскі і на Сожы
Убачылі дубовы гай.

Ён пачарнеў увесь ад дыму,
І многія яго камлі,
Нібы салдаты за радзіму,
На полі бою паляглі.

Але і ў горы быў ён светлы,
І хоць ні гром, ні пыл не знік,
Над ім сінела неба ветла,
І ўсходзіў ясны маладзік.

І ў гэтым казачна-праменным
Святле прастораў залатых
Гай зіхацеў усім адценнем
Асенніх колераў сваіх.

Ён з вышыні празрыстасіняй
Пад ногі сыпаў нам лісты
На цёмны дол, дзе першы іней
Крануў расліны і кусты.

Мы прыпыніліся ў задуме,
А гай шумеў усё, шумеў...
І ў неспакойным гэтым шуме
Яшчэ раз кожны зразумеў,

Што не з марозу пабялела
На ўзлессі чорная ралля, —
Яна ад гора пасівела,
Ад мукі высахла зямля.

Але душа ўсё такжа рвецца,
І ўсімі фарбамі, як гай,
Трымціць маё жывое сэрца,
Цябе пачуўшы, родны край.

Там нас у кожным, кожным доме
Чакае любая сям'я...
Наперад, хлопцы, блізка Гомель —
Радзіма добрая мая.

*1943 г.*

## БЕЛАРУСІ

Мая радзіма-паланянка!
Я сніў цябе штоночы ў снах,
Як светлы прывід, кожным ранкам
Стаяла ты ў маіх вачах.

Цяпер ты ўстала яснай явай,
Такой, якую я люблю:
Байцы, абвеяныя славай,
Ступілі на тваю зямлю.

За нас усіх падзякі словы
Скажы заступнікам тваім,
Асенні́м золатам дубровы
Азалаці дарогі ім.

Прытулак дай пад родным небам,
Ад зла лясамі ахіні,
І пачастуй іх нашым хлебам,
І ласкай сэрцы іх крані.

Напой крынічнаю вадою,
Прыкрый ад холаду ў палях
І добрай матчынай рукою
Благаславі на трудны шлях.

Далёка ім яшчэ, далёка
Ісці дарогамі вайны:
Ад Крычава да Беластока
Твае прасторы ледзь відны.

І шмат падзе ў баях крывавых,
Да мэт не здолеўшы дайсці.
Складзі-ж ім песні, гімны славы,
Складзі, радзіма, пры жыцці.

Падбай аб кожным, як аб сыне,
Хай добра ведае герой:
Хто за цябе ў баях загіне,
Век будзе ў памяці тваёй.

*1943 г.*

## РОЗДУМ ПАД НОВЫ ГОД

Мінуў яшчэ адзін суровы год,
Яшчэ гусцей укрылі твар маршчыны —
Сляды выпрабаванняў і нягод
Маіх уласных і маёй краіны.
Дзень навагодні! Толькі ты, як цень,
Мінеш без следу, адляціш у вырай.
Калісьці-ж на радзіме ў гэты дзень
Мяне віталі горача і шчыра.
Бяссмертнай бацькаўшчыны светлы дом!
Я да цябе навек цяпер вярнуўся,
Але адзін яшчэ я за сталом,
Засланым беленым тваім абрусам.
Дзе-ж вы, мае вясёлыя сябры?
Як многа вас загінула дачасна
На Прыпяці, на Сожы, на Дняпры,
На плошчах гарадскіх і на калгасных
Шырокіх нівах. Памяці аб вас
З душы маёй ні выпаліць, ні сцерці.
Вы храбра біліся, і вы між нас
Былі ў жыцці і засталіся ў смерці.
Вінтоўкі ўзяўшы з вашых цёплых рук,
На змену вам жывыя мужна ўсталі
І выйшлі ў бой. Зарос травою брук
Той вуліцы, з якой іх выпраўлялі

На подзвіг і на славу. З іх адны
Таксама мо' не вернуцца ніколі,
Другія прыдуць з полымя вайны
Пад сцягам перамог і шчаснай долі.
А трэція... Між іх і ты, мой друг,
Што на чужыне сёння паланянкай...
Калі-ж мы зноў збярэмся ў цесны круг,
Як раніцой збіраюцца заранкі?
Не за гарамі гэты дзень, сябры,
Ён набліжаецца ў праменнях перамог·
І не міне без следу: рана на зары
Мы вернемся на родныя парогі.
Мы ўсе збярэмся там у пэўны час —
Гаспадары, вандроўнікі і госці,
І толькі, мусіць, між вясёлых нас
Не будзе з намі нашай маладосці.
Не трэба наракаць. Яе красой
Мы будучыню нашу здабывалі,
І мы за дзень сівелі й паміралі
Не марна: у шчаслівых нашых дзецях
Ёсць наша юнасць і на гэтым свеце.

*1943 г.*

## СМЕРЦЬ САЛДАТА

На ратным полі паміраў салдат.
Ён мужна біўся да апошняй кулі,
Ужо сябры яго навек заснулі,
І поруч з імі злёг і ён у рад.

Але не марна ён аддаў сваё жыццё:
Прастрэліўшы дзесяткі чорных касак,
Ён выканаў сумленна абавязак
І адыходзіў ціха ў небыццё.

І толькі прагна аднаго хацеў:
Апошні раз убачыць луг зялёны,
Узяць травінку кволую ў далоні,
Паслухаць зважны гоман родных дрэў

Ды пуста навакол было зусім —
Трава счарнела, хвоі пагарэлі,

Пластом ляжалі скошаныя елі,
І па зямлі качаўся горкі дым.

Як даўнія асілкі-змагары,
Ўжо на парозе цёмнае магілы
Салдат сабраў астаткі сілы
І павярнуўся тварам дагары.

Над галавой цямнеў густы блакіт.
Дзень пагасаў, і сонца памірала,
За край зямлі спакойна адплывала,
Нібы плыло пад цень магільных пліт.

Але яго бяссмертнае святло
Паружавіла белыя аблокі,
Пазалаціла небакрай далёкі
І кожную пясчынку і сцябло.

Нарэшце сонца ўжо зайшло на чвэрць.
Салдат глядзеў шырокімі вачыма:
«Якое хараство ў цябе, радзіма,
Калі так пышна ўбрала нават смерць!

Я не вярнуся больш да родных хат,
Але жыццё ніколі там не згасне.
Красуйся-ж вечна, мілы край мой, шчасна!»
Так, паміраючы, казаў салдат.

Мы ўсе памалу прыдзем к небыццю.
Судзі мне, доля, мужнаму памерці
І праспяваць перад вачамі смерці
Апошняй песняю хвалу жыццю!

*1944 г.*

## АПОВЕСЦЬ ПРА КАНЯ

Дзесяцёх уздоўж вуліцы гразкай
Сталі пільна пад кожным акном;
Чатырох у блішчастых касках
Увайшлі асцярожна у дом.

Гаварылі спачатку спакойна:
— Нам вядома, што дзень пры дні
Хлеб і зброю у зараснік хвойны
Ты вазіў на сваім кані.

Там твой сын, — нам і гэта вядома,
Можа, хлопец і сам не рад.
Мы не помсцімся. Будзе дома.
Толькі выкажы, дзе атрад. —

Горка ныла душа аб дзіцяці,
Але моўчкі стаяў стары.
Доўга білі яго у хаце,
Потым білі яшчэ на двары.

— Запрагай і паедзеш з намі.
Трэба справу зрабіць да поўдня! —
Не сваімі — чужымі нагамі
Гаспадар падышоў да каня.

Што ён выказаць мог жывёле?
Прыгадаў яго спрытны бег
І прыпомніў, як хлопчык вясёлы
Часта ездзіў на ім на начлег.

А на лузе раса буйная,
Хоць па каліву падбірай.
Конь дарогі туды не пытае,
Толькі поўную волю дай.

«Што-ж, мой быстры, ты будзеш вольны,
Выбірай куды хочаш шлях.
Па дарозе-ж у зараснік хвойны
Заблудзіся ў знаёмых палях.

Калі-ж ты, неразумны, чужынца
Павядзеш да патайных дарог,
Хай цябе на шырокім гасцінцы
Пакарае бязлітасны бог».

Конь пастукаў у дол капытамі,
Грывай веючы, рыжай, як медзь,
Неспакойна пастрыг вушамі,
Ды нічога не мог зразумець.

Пакасіўся чуток, што чужыя,
Прывязаўшы старога за плот,
Узлажылі хамут на шыю
І, запрогшы, пусцілі з варот.

Конь слухмяна пайшоў самапасам,
Не бывала, каб ён заблудзіў:
Хіба-ж мала апошнім часам
Ён па гэтай дарозе хадзіў?

Неўзабаве, за грэбляй выбойнай,
Будзе там, дзе канчаецца гаць,
Паваротка у зараснік хвойны.
Вось і сосны на ўзлессі відаць.

Пах мурожны, густы і востры,
Кружыць хмелем каню галаву.
Конь ідзе, раздзьмухаючы ноздры,
Час-ад-часу зрывае траву.

Пільна з хвоі высокай сочыць
За бяздомным канём хлапец.
Пацямнелі блакітныя вочы,
Сэрца ўпала, як грузны свінец.

Ён пазнаў іх, у шэрых мундзірах,
Хітраватых нямецкіх салдат.
Без дазволу свайго камандзіра
Зняў з пляча баявы аўтамат.

Я не знаю, куды ён цэліў,
Але хлопец быў добры стралок.
З дробным калівам сырадэлі
Конь зваліўся на цёплы пясок.

Недаўменна глядзела вока
Сінім позіркам нежывым:
Як у возеры тым глыбокім,
Абярнулася неба ў ім.

*1944 г.*

## ВЕРШ ПРА МЕДАЛЬ

Аб нашых смелых справах,
Таварыш партызан,
Ідзе над светам слава
За мора-акіян.

І хоць мы тоім самі,
Ды што там ні кажы,
Прыемна, што вякамі
Наш подзвіг будзе жыць.

Здабудзем перамогу
І прыдзем, ты і я,
Да роднага парогу,
Дзе нашая сям'я.

І ўсе адразу ўцямяць:
Былі хлапцы ў баях —
У кожнага, як памяць,
Медалі на грудзях.

Не будзе нават п'яны
Пытацца: — Хто яны?
Відаць, што партызаны
Айчыннае вайны.

Прыемна будзе выйсці
З суседам пакурыць,
Аб зробленым калісьці
З людзьмі пагаварыць.

Старэйшага з пашанай
Абступіць гурт дзяцей,
Малодшаму каханка
Ўсміхнецца ласкавей.

Раскажа ўсім падружкам
Пра светлы, як паркаль,
З муаравай істужкай
Сярэбраны медаль.

Раскажа, як аддана
Мы пралівалі кроў,
Як нішчылі старанна
Нямецкіх лютых псоў.

Мацней-жа бі, таварыш,
Знішчай паганы дух!
А тых, якіх не зваліш,
Павалім, брат, удвух.

Павалім і засыплем
Халоднаю зямлёй,
Каб гаварылі сціпла
Сябры пра нас з табой:

Яны краіне славу
Кавалі так, як сталь,
І ў кожнага па праву
Сярэбраны медаль.

*1944 г.*

## ПІСЬМО З НЯВОЛІ

Яно прыйшло з далёкай вёскі,
Дзе каля хаты, пры акне
Раслі. як сёстры, дзве бярозкі
І ўдзвёх памерлі без мяне.

Яго пісала Маці тая,
Каторай слову кожны рад;
Яго разведчыца малая
Прынесла ў кошыку ў атрад.

Яго па лесе і балоце
Насілі, можа, два гады
І на крылатым самалёце
Вясной адправілі сюды.

Яно без штампаў і пячатак;
Яго даставіў мне баец;
І невыразны ў ім пачатак
І нечытабельны канец.

Але і так пазнае ўсякі,
Што нам хацелі расказаць:
На ім, як гербавыя знакі,
Буйная горкая сляза.

*1944 г.*

## ПРА КНІГІ

Мне гаварылі: ты ў няволі
Так страшна тужыш аба мне,
Як не тужыў ніхто ніколі
Ў вясёлай нашай старане.

І ты чытаеш часта вершы,
Калісь напісаныя мной...
Я не апошні і не першы
Быў зачарованы вясной.

Яна мне тэмы вызначала,
Памеры значыла радкоў.
І мне здаецца — там нямала
Вясёлых дум і добрых слоў.

Чаго-ж, схіліўшыся начамі
Над сціплым зборнікам маім,
Ты плачаш горкімі слязамі —
Няўжо ты плачаш аб былым?

Я там пісаў пра снег, адлігу,
Пра ўсё, што больш не напішу,
А што-ж, калі-б цяпер, як кнігу,
Раскрыла ты маю душу?

У ёй запісана ў паходах
Крывёй дасведчання майго
І гора нашага народа,
І веліч мужнасці яго.

*1944 г.*

## СНЫ ХЛАПЧУКА

На нейкай станцыі у зале
Мы ўсе чакалі цягніка,
І ці сядзелі, ці ляжалі,
Адно чамусь для хлапчука
Мясціны здатнай не знайшлося.
Як нізкаслы васілёк
Сярод высокага калосся,
Ён загубіўся. Я здалёк

Яго паклікаў. Ён павольна
Прабраўся моўчкі да мяне.
Мы адшукалі лапік вольны
І ўдвух прыселі пры сцяне.
Пагаварылі. А праз момант
Ён спаў дзіцячым моцным сном
І сніў, што там, за фронтам, «дома»
Ёсць і ў яго бацькоўскі дом;
Мінаюць вёсны, леты, зімы...

Шануй-жа сны свае, дзіця:
Я сам стаміўся без радзімы
І ведаю цану жыцця!

*1944 г.*

## ЖЫВОЕ СЛОВА

Варожыя бомбы насторч
Лажыліся шчыльна радамі.
Над намі стамілася ноч,
Пяскі галасілі пад намі.

Нарэшце зайшлася зямля,
У полымі неба сканала,
І стала маўклівa. Тады спакваля
Хтось вымавіў словы Купалы:

— А ты, сіраціна, жыві,
Як ветрам лісток адарваны!.. —
І слова упала на жвір,
Свінцовым дажджом спаласканы.

І гэтага слова цяпло
Прабілася ў глебу праз камень,
У сэрцы людскім прарасло
Жывымі, як травы, расткамі.

І ўжо аксамітная рунь
На чорных палях красавала,
І поруч была Беларусь,
Апетая Янкам Купалам.

І ярасна біўся ў крыві
Той покліч жыцця нестрыманы:
— А ты, сіраціна, жыві,
Як ветрам лісток адарваны!...

*1944 г.*

## НАША СЛАВА

Калі сэрца балюча затужыць,
Што надзеі цябе падвялі —
Прыгадай непакорных і дужых
Мужных волатаў нашай зямлі.

Прыгадай іх усіх — з Магілёва,
З Наваградка, Дняпра і Дзвіны...
Прыгадай пастуха Смалячкова —
Радавога Айчыннай вайны.

Пад яго зачараванай куляй
На пясках узбярэжных у рад
Як упала, дык так і заснула
Больш за сотню варожых салдат.

Хай-жа згіне тваё засмучэнне,
Цвёрды будзь у цяжкой барацьбе!
Твой адважны зямляк Палаўчэня
Падтрымае заўсёды цябе.

Рынься ў бітву, як лётчык Гастэла,
Каб гарачае сэрца з табой
І ў жыцці, і ўміраючы пела
Перамогу над лютай ардой.

Знай, што добрае імя салдата
Не памеркне на цягу вякоў.
Так жыве легендарны Даватар
У грудзях беззаветных байцоў.

Чуеш тупат узмыленых коней?
Як суладна спяваюць клінкі!
Быццам сам ён за фронт у пагоню
Вывеў конныя нашы палкі.

К ім з лясоў старадаўне-крывіцкіх,
Праз блакітны, як неба, туман
Узнімаецца Міша Сільніцкі —
Неўміручы герой-партызан.

А між самых славутых імёнаў,
Што грымяць па дрымотных лясах,
Устае непакорны Заслонаў —
Нашай сонечнай славы краса.

І як сэрца часамі затужыць,
Што надзеі цябе падвялі —
Прыгадай непакорных і дужых
Змагароў беларускай зямлі.

Не пакорыцца наша радзіма,
Дзе адзінаю дружнай сям'ёй
І жывыя, і мёртвага імя
Супраць ворага ўсталі на бой!

*1944 г.*

## ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Змучаны смуткам па роднай краіне,
Вестак чакаючы з мілых мясцін,
Горкімі днямі, як радасць пакіне
І застануся з тугой на адзін, —

Думкай трывожнай і сэрцам збалелым
Зноў у цябе я шукаю надзей,
Армія волатаў, армія смелых,
Армія мужных савецкіх людзей.

Подзвігаў ратных гартаючы кнігу,
Прагна чытаю пра ўсё, што было;
Смутак знікае, і ў сэрцы паціху
Цепліцца новае веры цяпло.

Узгадаваная сталінскай воляй,
Загартаваная ў грозных баях,
Ты не пакінеш мой край у няволі.
Над занядбаным узнімеш свой сцяг.

Веру, што радасць мая недалёка,
Марна трывожныя думкі ўсплылі:
Ты ўжо ступаеш вялікасным крокам
Па беларускай свяшчэннай зямлі.

І не загіне на свеце ніколі
Воля і шчасце бацькоў і сыноў, —
Біцца за праўду на ратнае поле
Выйдзе Чырвоная Армія зноў.

*1944 г.*

## ВЯСНА

Чулі добрыя навіны?
Кажуць, ёсць паведамленне,
Што вясна маёй краіны
Перайшла да наступлення.

Зрыхтаваўшыся наславу,
Сонца выслаўшы ў разведку,
Захапіла пераправу
І чыгуначную ветку.

І пасля, як пішуць зводкі,
Змыўшы рвы і агарожы,
Бурным націскам паводкі
Па тылах прайшла варожых.

Днём сарвала насціл з моста,
Шлях нашчэнт размыла ранкам,
Разышлася так, што, проста,
Не вясна, а партызанка.

Вось ідзе яна лясамі,
Скрозь кладзе сваю адзнаку
І з чырвонымі байцамі
Дружна рушыць у атаку.

Не праспі-ж яе, суседзе!
Гаварыла мне вяснянка,
Што вясна з байцамі едзе
На машынах і на танках.

Рух імклівы іх і спорны.
Стань-жа, выпраставўшы плечы,
Раздзьмухай у кузнях горны,
Будзь гатовы да сустрэчы!

Загартоўвай цвёрда зброю,
А не мірныя нарогі,
Выйдзі з першаю зарою
На зарослыя аблогі.

Уздымай іх не сахою,
А гарматнымі плугамі,
Засявай не збажыною,
А нямецкімі касцямі.

Свой палетак палыновы
Палівай ты не вадою,
А густым дажджом свінцовым
І варожаю крывёю.

Будзеш рупіцца, араты, —
Атрымаеш нагароду:
Ураджай сажнеш багаты —
Вызваленне і свабоду.

Не праспі-ж вясны, суседзе,
Бо яна — нібы маланка,
Не пяшком ідзе, а едзе
На машынах і на танках.

*1944г.*

## ВЫЗВАЛЕНАМУ МІНСКУ

Не марна мы таілі мару —
Яна збылася: у прасцяг,
Ярчэй ад полымя пажару,
Над Мінскам зноў узвіўся сцяг,
Чырвонай Арміі рукой
Пранесены праз люты бой.

І так навокал стала светла,
Што з гэтай радаснай пары

Глядзяць руіны болей ветла
І абгарэлыя муры,
Нібы на чорны дробны брук
Упалі зоры з шчодрых рук

І асвяцілі ўсю краіну.
На бляск узняўся цэлы люд,
І Мінску нашаму, як сыну,
Сталіца-маці шле салют:
— За вернасць шчырую ў баях
Благаславёны ты ў вяках! —

Жыві-ж, красуйся, горад стольны,
З руін да славы уставай,
Ты стаў ізноў навекі вольны,
І над табою з краю ў край
Гарыць чырвоны, яркі сцяг —
Знак адраджэння і жыцця.

*1944 г.*

## ПЕРАМОГА

Бой адгрымеў. Машын шасцёркі
На адпачын павёў пілот.
Працёртым краем гімнасцёркі
Баец з аблічча выцер пот.

І ў ноч, на цёмныя парогі,
У кожнае акно і дом
Упала вестка перамогі,
Нібы раптоўны першы гром.

Але між намі нечаканай
Яна ніколі не была:
У снах байца і партызана
Ад першых дзён вайны жыла.

Калі-ж памерці мы кляліся
За кожны родны нам куток,
Яе ледзь значныя абрысы
Былі нам бачныя здалёк.

У мужнай веры Ленінграда,
У грозных бітвах за Маскву,
У першых залпах Сталінграда
Яна паўстала наяву.

Яе мы працаю кавалі
На прадпрыемствах і палях,
Яе мы кроўю здабывалі
У самых жудасных баях.

І ў дзень вялікаснага свята —
З братэрскім шчырым пачуццём —
Мы помнім кожнага салдата,
Што за яе аддаў жыццё.

І мы ўзнімаем чаркі нашы
За камандзіраў баявых,
За памяць вечную аб паўшых,
За славу вечную жывых;

За ўсе ваенныя дарогі,
Што мы прайшлі дзеля дабра;
За палкаводца перамогі,
За нашага правадыра.

*1944 г.*

## ЗВАРОТ

Ну, вось — і мы з табою дома!
За павароткай будзе сад,
А потым — хаты... Нам знаёма
Усё ад самых даўніх дат.

Тут вельмі борзда вечарэе,
Давай, зямляк, паскорым крок.
Вядзі нас, добрая надзея,
У занядбаны наш куток!

Вайною гнаныя па свеце,
Мы не былі ў ім тры гады,
І можа здарыцца, што вецер
Замёў і нашыя сляды.

Але нам тут усё знаёма:
За паваротк	ай будзе сад,
А потым — хаты... Вось і дома!
Ды што такое? Стой, салдат!

Ці мы з табой зблудзілі ў змроку,
Ці лішне выпілі чуток?
Давай яшчэ прыбавім кроку,
Я помню добра — быў садок.

За ім вось тут стаяла хата,
Раслі таполі рад-у-рад...
Не ашукала смерць салдата,
Дык насмяяўся люты кат.

Няма і нашага прыстанку,
Згарэлі хаты і сады.
На чорным друзе каля ганку
Парос алешнік малады.

Якіх прыкмет яшчэ нам трэба?
Я пазнаю цябе, зямля,
Па тым, як свецяць зоры з неба,
Як пахне свежая ралля.

І тут памылкі быць не можа,
Бо сэрца верыць у зварот.
Давай, зямляк, мяшкі паложым,
Спачнем ля бацькаўскіх варот.

Дзе бушавала смерць з пажарам,
Разложым ціхі аганёк,
Абутак высушым, наварым
Салдацкай кашы кацялок.

Крыху паспім, а заўтра рана
Я — за сякеру, ты — за лом,
І ў добры час пачнем старанна
Ізноў узводзіць новы дом.

І стане зноў усё знаёма:
За паваротк	ай будзе сад,
А потым — хаты... Знаеш, дома
Лягчэй гаруецца, салдат.

*1945 г.*

## НОВЫ ДОМ

На зарослым травой пажарышчы,
Толькі золак заплешча крылом,
Звоняць пілы, гудуць тапарышчы,
Стогне дрэва — будуецца дом.

Разгінаючы дужыя рукі,
Працавітыя людзі ў лясах
Смаглі гэтага звону і груку,
Сумавалі аб ім па начах.

Сталяры, распілоўшчыкі, цеслі,
Падкладаючы міны і тол,
Гэту смагу няўтольную неслі
Да разбураных вёсак і сёл.

На світанні зычліва і дбайна
Падымае на працу яна,
Бо жыве між таварышаў тайна
Запаветная думка адна.

Дачакаемся мы перамогі,
І не доўга, здаецца, чакаць.
Прыдуць хлопцы з далёкай дарогі —
Трэба-ж будзе іх недзе прыняць.

Трэба так, каб яны пры сустрэчы
У цяпле распрануцца маглі,
На абжытай, распаленай печы
Прасушылі свае шынялі.

Мір-жа новаму, цёпламу дому!
Слава добрая будаўнікам,
Клапатліваму сэрцу людскому
І людскім клапатлівым рукам!

*1945 г*

## ПАД НЕБАМ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

Пад небам бацькаўшчыны нашай
Прайшла суровая вайна,
А над палеткамі, над пашай,
Над цёмнай пушчаю — вясна.

Сям-там цвісці прабуе вішня,
І тым ясней нам, што парой
Мы паспыталі, аж залішне,
І добрай долі і благой.

Вайною выгнаныя з хаты,
Утраціўшы абжыты кут,
Мы ўсе — і цеслі і салдаты —
Нямала вынеслі пакут.

Але і ў горкі час выгнання,
Дзе ні ступалі па зямлі,
Мы не былі без спачування
І на чужыне не жылі.

Бо хоць брылі з цяжкой паклажай,
Усё-ж ішлі мы дзень пры дні
Пад небам бацькаўшчыны нашай,
Між таварыства і радні.

Дарог багата за плячыма
І па куп'і і па трысці,
З трывогай думаю: магчыма,
Мне столькі ўжо і не прайсці.

Як глеба прагне на прадвесні
Аддаць расткам апошні плён,
Так я адной-адзінай песні
Аддаць хацеў-бы рэшту дзён.

Маўклівы, нават нелюдзімы,
Я склаў-бы гэты любы спеў
У гонар дружбы і радзімы,
Ласкавых траў і чулых дрэў.

Хай зачараванаю пражай
Яны прывяжуць нас навек
Пад небам бацькаўшчыны нашай,
Да родных ніў, лясоў і рэк.

*1945 г.*

# СЦЯГ ПЕРАМОГІ

## У ТЫЯ ДНІ

У тыя дні, мае сябры,
Крывёй гарэла неба,
У тыя дні былі жадны
Скарынцы чэрствай хлеба.

У тыя дні, мае сябры,
Цямнелі грозна далі,
У тыя дні жалезным сном
Пад сцюжай засыналі.

У тыя дні, мае сябры,
Мы вельмі мала мелі:
Вінтоўку, шаблю, кулямёт
І шэрыя шынелі.

Мінуліся, мае сябры,
Падзеі жорсткай явы,
Але застаўся успамін
І песні мужнай славы.

Сягоння я, мае сябры,
Да краю імі повен...
Паслухайце-ж пра тыя дні
Суровую аповесць.

### I

Вайна...
Адзінокія фабрыкі тужаць,
Апусцелі палі —

Ні касцоў, ні аратых...
Па загаду цара
Усіх здаровых і дужых,
Ад малых да старых,
Паздавалі ў салдаты.

Не пачуеш ні смеху,
Ні песень вясёлых,
Толькі — стогны і плач,
Толькі — слёзы і лямант.
Гарады — у трывозе,
Калоцяцца сёлы,
Дні і ночы
Гарматы гудуць над палямі.

Па старых,
Зруйнаваных вайною гасцінцах
Цягнуць бежанцы бедны,
Убогі пажытак.
У падраных шынелях
Ідуць пехацінцы,
Кавалерыя топча
Высокае жыта.

Цішыня, цішыня!..
Нават гром кананады
Не развее тугі
З амярцвелага сэрца:
Ні адзення, ні хлеба,
Ні слова спагады...
З набалелай душы
Крык на вусны ірвецца:

— Эх, каб сілы былі,
Ды каб дружна паўсталі!..
Толькі, мусіць, ніколі
Такога не будзе:
У Швейцарыі Ленін,
На катарзе Сталін,
У выгнаннях, у турмах
Найлепшыя людзі. —

Але голас,
Узняты над лямантам бойні,
І адтуль урываецца

Ў рокаты бою,
Заклікае закончыць
Нялюдскія войны
Поўным мірам людскім —
Грамадзянскай вайною.

Кліч ідзе на заводы,
Трапляе ў акопы
І, памножаны сілаю
Зброі і працы,
Навальніцай грыміць:
— Нацярпеліся! Хопіць!

— Мір хацінам,
Вайна апантаным палацам! —

Вее з Балтыкі
Лютаўскі вецер халодны.
Петраград — у агні,
У завеях суровых —
Пачынае шумець.
Сотні тысяч галодных
Узнімаюць, як сцяг,
Два агністыя словы:

— Мір і хлеб!
Поўніць вуліцы
Крык Петраграда.
Забастоўкі растуць,
Спавяшчаюць змаганне.
І надзейных салдат
І рабочых атрады
У зімовую ноч
Падымаюць паўстанне.

Дружным націскам
Царскія збіты аковы,
Але новыя ладзяць
Народу кайданы:
У Часовым урадзе —
Паны Мілюковы,
У Советах рабочых —
Прадажныя Даны.

Не для гэтага мерлі
Таварышы нашы,
Не для гэтага бура
Імперыю трэсла,
Каб змяніць рэвалюцыю
Мірненькім маршам
Ад прастола цара
Да прэм'ерскага крэсла!

II

Далёкі да Цурыха шлях...
Ляці, наша думка, туды!
Там Ленін — прыгнечаных сцяг,
Народаў усіх правадыр.

Далёка палярны круг...
Ляці, наша думка, жвавей!
Там Сталін — наш бацька і друг —
У цяжкай няволі жыве.

Галосіць у тундры зіма,
Мяце над Курэйкаю снег,
А вестак ніякіх няма,
Трывога на яве і ў сне.

Ляці-ж, наша думка, ляці,
Зламаўшы граніц берагі,
Ляці-ж, наша думка, ляці
Праз ноч і завею тайгі!

Аж рэха над светам грыміць,
Ідзе устрывожаны гул,
Мінае заставы граніц,
Палярную ноч і тайгу.

І поўны руплівасці кліч
Раней за дэпешы паспеў.
Граніцамі скуты Ільіч
На волю імкнецца, як леў.

І выбухам першых гранат
Ірвуцца здалёку лісты:
— Ваюйце за ўласны урад,
Мае дарагія браты!

Вы скінулі мужна цара...
Да зброі-ж усе, як адзін!
Настане другая пара
Вялікіх і цяжкіх гадзін.

Настане час боек другіх,
Мацуйце-ж рабочы атрад!..—
І Сталін з далёкай тайгі
Спяшае прыйсці ў Петраград.

Не скора прахопіцца дзень,
Далёка да ранішніх зор,
А ён ужо тундрай ідзе,
Мінае сібірскі прастор.

III

Вясна ішла шырокім крокам,
Але не цешыла вясна —
Лілася кроў густым патокам,
І не канчалася вайна.

— Зямлі! — крычалі грозна вёскі,
Прасіла іхніх рук зямля.
Міністры пасылалі войска
Душыць абураных сялян.

— Даволі! — хмурныя салдаты
Складалі шаблі і штыкі.
А трапяткія адвакаты
Збіралі новыя палкі.

Крывёй, а не вясновым сокам
Скрозь налівалася зямля.
Але ішлі «Лісты здалёку»
І асвятлялі цёмны шлях.

У кожным ракатала сіла,
Гатовая зламаць граніт.
Яе не дарам паланілі
Глухімі кратамі граніц.

Не заняволяць толькі сэрца,
Яно з народам прагне жыць

І ў родную краіну рвецца
Цераз граніцы й рубяжы.

Бо хіба-ж выкажаш у словах
Усе шляхі да перамог?!
І Ленін кожны дзень нанова
Шукае сцежак і дарог

Туды, туды...
Дзе супраць здрады
Мільёны рушаць у паход,
Дзе на крывавых барыкадах
Змагаецца яго народ.

Радзіма!
Доўгімі начамі
Ты снілася ў кароткіх снах
З тваімі ціхімі палямі,
З маркотным шумам па лясах,

З тваім народам працавітым,
Гатовым на рашучы бой,
Каб імператары-бандыты
Не панавалі над табой.

Ты блізка, родная!..
Вагоны
Прайшлі слупоў гранічных рад.
Салдаты рускія гамоняць,
І Ленін слухае салдат.

IV

Паўсталі
Вякамі закутыя сілы,
Магутнаю хваляю
Змылі цара
І рушаць па ціхіх
Прасторах Расіі
У вобразе Леніна —
Правадыра...

Палацы і замкі
Трасе ліхаманка,

Князі і магнаты
Ад злосці дрыжаць:
Цяпер не паверыць народ
Абяцанкам,
Не будзе пакорны
Цярпець і стагнаць.

Не будзе калець
У сцюдзёных акопах,
Не будзе вякамі
На катарзе гніць...

І вось — засвісталі
Майстры на паклёпы
І прагнуць
Імя Ільіча ачарніць.

Хто сам бессаромна
Рабуе і крадзе,
Імперскай ахранкі
Служылыя псы —
Імкнуцца чарніць,
Вінаваціць у здрадзе
Таго, хто душою
Чысцей ад расы,

Таго, чыё сэрца
Гадамі балела
За долю краіны,
За струджаны лёс,
Таго, хто заўсёды
Адважна і смела
Вялікую праўду
Прыгнечаным нёс.

Ні земным праклёнам,
Ні карай найвышняй
Ніхто не запляміць
Святое імя...
Насустрач любімаму Леніну
Выйшла
Уся неабдымная
Наша сям'я:

Паплечнікі, вучні,
Салдаты, матросы,
Чырвонае гвардыі
Першы атрад,
Увесь працавіты
Мільённагалосы,
Закураны дымам,
Стары Петраград.

Фінляндскі вакзал
Баявыя калоны
З усіх чатырох
Замыкаюць старон.
Узрушаны Ленін
Выходзіць з вагона
І шпаркай хадою
Мінае перон.

Вось ён узышоў
На прыступкі вакзала.
Аркестры ударылі
Радасны марш.
І мора людское
Кругом задрыжала:
— Няхай жыве Ленін!
Ён з намі і наш! —

Не сілаю рук,
А пачуццямі сэрца
Узнеслі яго
На круты бранявік.
Самкнулі шарэнгі
Чырвонагвардзейцы,
І Ленінскі заклік
Ад бурнай Нявы

Імчыцца па земных
Прасторах вялізных:
— Няхай для шчаслівых
І радасных мэт
Зара рэвалюцыі
Сацыялізма
Запаліць увесь
Заняволены свет. —

Бяссмертную ісціну
Вызналі людзі,
І радасна пела
Гарачая кроў:
Вялікі змагар,
Правадыр рэволюцыі
Заняў сваё месца
У радах змагароў.

V

Слова маё!
Узнімайся высока,
Будзь загартованым,
Цвёрдым, як сталь,
Вечна імкніся,
Наліўшыся сокам,
Чыстым, як гэта
Празрыстая даль!

Стань у рады,
Хоць ад самага краю,
Слоў гартаваных
У яркім агні!..
Гонару большага —
Я не жадаю...
Помніш, у тыя
Вялікія дні:

Леніна слова —
Мільёны збірала,
Сталіна слова —
На бітву вяло!
Вось яны коцяцца
Ўзрушаным валам
З горада ў горад,
З сяла — у сяло.

Дом — асабняк
Балярыны Кшасінскай
Поўняць прыбоі
Жывых галасоў:

Молатаў, Куйбышэў,
Фелікс Дзержынскі,
Клім Варашылаў
І Якаў Свердлоў...

З высылкі, з фронту,
З далёкіх ускраін
Дружна збіралася
Гвардыя мас.
Быў красавік.
Над разбураным краем
Бурна каціўся
Ўстрывожаны час.

Кожны павет
Выбіраў дэлегатаў,
З цвёрдым наказам
Усіх пасылаў:
Выслухаць Леніна
Думкі-парады,
Вырашыць з Сталіным
Тысячы спраў.

Дзесяць гадзін...
На высокай трыбуне
Стомлены Ленін
Чытае даклад:
— Наша задача —
Дзяржава-комуна,
Новы грамадскі
Парадак і лад.

Мір і братанне!..
Улада — Советам,
Шахты — рабочым,
Сялянам — зямля,
Зброя — народу...
Да гэтае мэты
Нам рэвалюцыя
Выракла шлях. —

І на змаганне
З часовым урадам
Сілы збіраць
Заклікае Ільіч.

Цераз заставы
Вакол Петраграда
Скрозь над Расіяй
Ідзе гэты кліч.

Слова пранята
Маўклівым пажарам,
Толькі кранi —
Запалае агонь.
Людзям заводаў,
Палёў і казарам
Сэрцам нясуць
Комуністы яго...

VI

А тым часам так званы
Часовы урад,
Меншавіцкая сволач
І гады-эсэры
Замест хлеба і міру
Падносяць загад,
Выкрываючы планы
Свае і намеры:

— Рэволюцыя — скончана,
Годзе сядзець!
Пад гарматы айчына
Свабодная кліча.
Памірайце дзесяткамі
Тысяч штодзень,
Мы яшчэ не дабіліся
Нашай здабычы. —

Маршыруюць студэнты...
У радасным сне
Зіхацяць пад нагамі
Квадраты брушчаткі...
— Слава нашым міністрам!
— Вітанне вайне! —
Афіцэры і крамнікі
Плешчуць у ладкі:

— У акопы! На фронт,
Разняволены брат! —
Але іншыя спеюць
Настроі і думкі:
Шчыльна зубы сціскае
Матрос і салдат,
Нецярплівай рукой
Папраўляюць падсумкі.

Разлятаецца дымам
Даверлівасць мас:
— Вы-ж нядаўна за мір,
За спакой прысягалі,
А цяпер на франты
Выганяеце нас?!
Значыць, зноў прадалі?!
Значыць, зноў ашукалі?! —

Ад палка да палка
Голас гневу ідзе:
— У калоны! На вуліцы!
Строем на плошчы! —
Дэманстрацыя вірам
Грымотным гудзе,
Над галовамі вецер
Плакаты палошча:

— Прэч прадажных міністраў!
— Даволі вайны!
— Мір краінам!
— Улада Советам рабочых! —
Браніраваным мурам
Жалезнай сцяны
Экіпажы, палкі
І рабочыя крочаць.

Ад ускраін да Неўскага
Рушыцца вал.
Заціхаюць адразу-ж
Калоны багатых.
І Ліцейны праспект,
За кварталам квартал,
Як чужыя акопы,
Займаюць салдаты.

Не, не будуць над намі
Купцы панаваць,
Не паложаць ярма
На гарбатыя шыі!
Дні і ночы кіпіць
Петраград і Масква,
Гарады і мястэчкі,
І вёскі Расіі.

## VII

Ледзянымі крыгамі
І марозам хваленым,
З цёплымі адлігамі,
З трапяткімі хвалямі,

Звонам рэчак песенных,
Бурнаю паводкаю —
Адышло прадвесенне
І вясна кароткая.

Зацвіталі яблыні,
Белым цветам крыліся
І ніколі, зяблыя,
Сцюжам не карыліся.

Што-ж цяпер пялёсткамі
Цёмны дол усыпалі
Пад дубамі жорсткімі,
Пад старымі ліпамі?!

Як відаць, нягодаю
Ваша доля чэрнена —
Душнаю пагодаю
Маладога чэрвеня.

Ён прышоў нясмелаю,
Ды хадою спорнаю.
Сталі ночы белыя,
А падзеі — чорныя.

Склікалы Советамі
Першы з'езд збіраецца.
Здраднікі з кадэтамі
Пахаджаюць, раюцца...

Столь і сцены белыя
Курывам ахутаны.
Дні і ночы цэлыя
Засядаюць, гутараць.

Слухаюць рабочыя,
Засынаюць з прыкрасці...
Згоднікі-ж саймуюцца,
Як уладу выкрасці.

На трыбуне трагікам
Цэратэлі курчыцца,
Соладка і прагненька
Цешыцца і мучыцца.

Тонкаю руладаю
Цягне, аж заходзіцца:
— Стаць цяпер уладаю —
Партыі не знойдзецца!.. —

Над крыклівай помпаю
Трагікаў і эпікаў
Выбухае бомбаю
Ленінская рэпліка:

— Ёсць такая партыя!.. —
І крутой лавінаю
Цішыня упартая
У праходы рынула.

Як вулей развязаны,
Загулі, прачнуліся:
— Што за словы сказаны?
— І адкуль пачуліся?

VIII

А ён, вялікі і магутны,
І радасны, як светлы дзень,
Паходкай лёгкай і нячутнай
Ужо ў прэзідыум ідзе.

— Міністр сказаў нядаўна слова,
Што партыі няма цяпер,

Каторая была-б гатова
Узяць уладу на сябе.

А я сцвярджаю — ёсць! Дачасна
Вы засмяяліся, міністр...
Шляхі да мэты сонцам ясным
Нам асвятляе комунізм. —

І, як вясною па каменнях
Празрысты залаты ручай,
Гарачым і жывым струменем
Ліюцца словы Ільіча:

Як у акопах людзі гінуць,
Як трусяць мас меншавікі,
Як нішчаць волю і краіну
Нажывы прагнай хіжакі.

Ні гучных фраз, ні спрытных жэстаў,
Але праўдзівых слоў цяжар,
Насычаных глыбокім зместам,
Гарыць у сэрцах, як пажар.

Заціхла зала. Вымер лямант.
Як вадаспад, імчыцца час.
Ужо канчаецца рэгламент
І завадатаі крычаць:

— Даволі!
— Час! —
Але, як бура,
Устрапянуўся злы пратэст,
Зляцелі воплескі віхурай
І зашумелі, быццам лес.

Салдатам і рабочым люба
Паслухаць словы Ільіча.
Кіраўнікі, зацяўшы зубы,
Прымушаны прадоўжыць час.

За сказам — сказ, за словам — слова,
Ізноў вядзе расказ Ільіч.
І з слоў спакойных і суровых
Выраствае грымотны кліч:

— Мы не баімся ўзяць уладу:
Мы — партыя рабочых мас... —
І радавыя дэлегаты
Прыймаюць ленінскі наказ.

IX

Абурэнне расце.
Гневам стомленых мас
Дышуць вуліцы фабрык
І сцены казарам.
Толькі словам кранi —
І навальна, не ў час
Аблiюцца панелi
Крывёй і пажарам.

Нельга болей цярпець,
Нельга далей чакаць,
Покуль здраднiкi рук
У крыві не спалошчуць.
І прыймае наказ
Большэвіцкі ЦК:
На дзесятае чэрвеня
Выйсці на плошчы.

Дэманстрацыя мірных
Рабочых калон
Ставіць лозунгам дня
Непарушную мэту:
Вызнаць волю працоўных,
Іх цвёрды закон —
Перадаць над краінай
Уладу Советам.

Хай народнае волі
Гучаць галасы,
Хай пачуюць трывогу
Прадажныя душы.
І адразу-ж кругом
Меншавіцкія псы
Навастрылі свой нюх,
Натапырылі вушы.

Чуюць, рушыцца
Іхні пагібельны лад.

І, каб толькі на хлебе
У пана застацца,
Слугі вынесці рады
Суровы загад:
Выступленне — спыніць,
Адмяніць дэманстрацыю.

Ды ніякія сілы
Не могуць стрымаць
Разлютованай хвалі
Рабочых ускраін.
Ні дарог, ні ратунку,
Ні выйсця няма
Напалоханым лідэрам
Чорнае зграі.

Моляць бога яны
За Часовы урад,
Але слугі прыносяць
Нядобрыя весці,
І тады вырашаюць
Прызначыць парад
І пад згодніцкім сцягам
Калоны павесці.

Ашукаліся!..
Сонечны чэрвеньскі дзень
Іх надзеі не спраўдзіў.
На Марсавым полі
Сотні тысяч галодных,
Пакутных людзей
Галасуюць за мір,
За Советы і волю.

Большэвіцкае слова,
І лозунг, і сцяг,
Нават поступ калоны
І крок — большэвіцкі.
І дрыжыць напалоханы
Неўскі прасцяг
І Зімовы палац,
Шырачэзны і нізкі.

Праваліўся нашчэнт
Аб'еднаны паход
Верных служак цара
І французскіх банкіраў:
Узнімае гатовы
На бітвы народ
Супраць панскай вайны
Сцяг народнага міру.

Міністэрскія крэслы,
Як некалі трон,
Скалануліся дробна
Дрыготкаю частай.
І чыны з Петраграда
Імчацца на фронт —
Непакорную армію
Рушыць у наступ.

X

Над фронтам ціш. Маўчаць гарматы,
Але ў вушах не моўкне гром...
У круг сабраўшыся, салдаты
Успамінаюць родны дом.

Якая ціш у іхняй хаце!
Якая скруха і туга!
Чыясьці згорбленая маці
Збірае шчаўе на лугах.

Чыясьці жонка-парабчанка,
Чужое поле аручы,
Спявае сыну калыханку
І горка плача пеючы.

Чыесьці скрыўджаныя дзеці
Ідуць па сёлах жабраваць...
Навошта-ж гэты плач на свеце?!
За што-ж пакутным ваяваць?!

Жыццём клянецца агітатар:
— Як выйграем апошні бой,
Вас павязуць усіх дахаты,
Надзеляць хлебам і зямлёй. —

І, ашуканыя падманам,
Без кіраўнічае рукі,
Па недарэчных царскіх планах
У наступ рушылі палкі.

На мармуровых плітах высеч
Патрэбна-б золата імён:
Іх шэсцьдзесят суровых тысяч
Загінула за дзесяць дзён.

Урад спраўляе перамогу,
Смяецца хіжы Мілюкоў:
— Віншую панства! Дзякуй богу,
Паменшала большэвікоў! —

Дачасна цешыцеся, гады!..
Саюз рабочых і сялян
Змяце, як логавішча здрады,
Увесь часовы балаган.

Грымяць суровай эпапеяй
«Акопнай праўды» тыражы...
Не дарма медзь сваіх капеек,
Свае медалі і крыжы,

Свой крык, надзеямі сагрэты,
Душу маўклівую сваю —
Салдаты за жыццё газеты,
Як за радзіму, аддаюць.

## XI

Трывожныя весці
Трасуць Петраград:
На фронце — пагібель!
Над горадам — голад!
І трэцяга ліпеня
Сходы салдат
У першым палку
Падымаюць свой голас:

— Да зброі, таварышы! —
Грозна штыкі
Замерлі дазорам
На крыллях машыны.

З Кранштата на помач
Ідуць маракі,
З ускраін рабочыя
Рушаць лавіны.

— Спыніце сяброў,
Дэлегаты палка,
Яшчэ не пара
І не час для атакі:
Над намі пагрозаю —
Кара штыка,
Вас юнкеры знішчаць,
Раздушаць казакі.—

— Не можа салдацкае
Сэрца цярпець! —
Дакорамі сыплюцца
Словы адказу:
— Як мае нас мучыць
Павольная смерць,
Дык лепей на бруку
Загінуць адразу. —

Канчаецца ноч.
У бялёсай імгле
Абуджаных вуліц
Расце ажыўленне.
І Ленінскі штаб
Паўстае на чале,
Сваімі шляхамі
Вядзе выступленне.

Па слову ЦК,
На мастах над Нявой
Атрады займаюць
Пасты абароны.
Спакойна і мірна
Суровай хадой
Пад ленінскім сцягам
Праходзяць калоны.

І раптам жалезны,
Распалены град
Бунтуе калоны,
Змятае і косіць...

Агнём кулямётным
Часовы урад
Вітае салдата,
Частуе матроса.

— Вы хочаце міру?
Вам трэба Совет?
Мы самі калісь
Ваявалі з арламі,
Але не да гэтых
Імкнуліся мэт —
Расіі патрэбна
Вайна і парламент! —

Ізноў наступіла
І вымерла ноч,
А чорная зграя
Грыміць і скрыгоча.
Маўклівыя плошчы,
Як пенным віном,
Заліты свінцом
І крывёю рабочых.

Разбіты рэдакцыі
Нашых газет,
Палацы Кшасінскай
Займаюць казакі.
— На катаргу Леніна! —
Хрыпне кадзет,
І кожную сцежку
Віжуюць сабакі.

У ноч, у падполле
Ідзе правадыр,
У бедных хацінах
Шукае прыстанку.
І нюхаюць доўга
На бруку сляды
Халодныя ноздры
Сабак і ахранкі.

## XII

Так на трыбунах Марсавага поля
І па дварцах на берагах Нявы

Сваёй камедыі сыграўшы ролі,
Міністры сталі ў строй гарадавых.

Але маны крывёю не спалошчуць:
Сляпая вера і цярплівасць мас
Расстрэлены нашчэнт на мірных плошчах.
І ведае цяпер рабочы клас,

Куды ісці, за што і як змагацца,
Каму гаротнае жыццё аддаць,
Каб занядбаная спрадвеку праца
Магла жыццём краіны заўладаць.

Няясныя пачуцці і настроі
Гартуюць думкамі большэвікі:
«Прыходзіць час узяцца ўсім за зброю,
Узняць над ворагам свае штыкі».

І сёлы разгінаюць стан пахілы,
Становяцца ў шарэнгу гарады,
І кожны дзень дужэюць нашы сілы,
Шырэюць большэвіцкія рады.

Хто-ж вернымі і простымі шляхамі
У грозны час на бітву павядзе?
Далёка дзесь за цёмнымі лясамі
Вялікі Ленін сустракае дзень.

За ім ахраннікі па следу шараць,
Шукаючы ахвяры для мяча.
І рыкавы спакойна вырашаюць
На суд ганьбы павесьці Ільіча.

На чый-жа суд? На суд ваеннай банды,
Нядаўніх слуг крывавага цара,
На люты суд банкірскіх ад'ютантаў,
Каторым трэба смерць правадыра.

Не, здраднікі і гандляры! Не выйдзе:
Ад вашых рук і ненавісці злой —
Дзержынскі і Серго Орджанікідзе
Яго заслоняць радасна сабой.

На варце Леніна мільёны сталі,
Запаленыя гнеўным пачуццём,

І першы ленінец — таварыш Сталін
Аддасць за Леніна сваё жыццё.

Яго дарогамі, яго шляхамі
Ён павядзе на бой рабочы клас,
Ён — ленінская мудрасць паміж намі
Ён — ленінская воля сярод нас.

## XIII

Маладыя вятры адшумелі,
Ціха плешчацца сонны прыбой.
Чалавек у армейскім шынелі
Задуменны ідзе над Нявой.

Штосьці новае ў рысах знаёмых:
А ці ветлая ўсмешка вачэй,
А ці вуснаў абрыс нерухомы,
А ці контуры стромкіх плячэй?

Не, ён той-жа, прыветны і строгі,
Тая-ж бурная сіла вясны,
Толькі вочы цямнейшыя трохі
І над скронямі цень сівізны.

Многа горкіх хвілін праляцела,
Шмат мінула суровых падзей...
Нічыя так душа не балела
За гаротную долю людзей!

Узнімаюцца думкі высока,
Шмат на сэрцы трывог і клапот.
Задуменны, хадою шырокай
Ён спяшае да Нарвскіх варот.

Ціш і цемра. Туманная бездань.
Ён ідзе. І праз нейкі ўжо час
На паседжанні Шостага з'езда
Яго мудрыя словы гучаць.

Бурным строем ліецца прамова...
Колькі гневу у ёй і цяпла,
Колькі кожная думка і слова
Вылучаюць жывога святла!

— Рэвалюцыя працы і міру
Не памерла ў ліпнёвыя дні.
Рана цешыцца сталі банкіры,
Рана свята спраўляюць паны.

Мы жывыя! Нястрачанай сілай,
Як агнямі, кіпіць наша кроў.
Мы свой гнеў у глыбінях сталілі
І падымем на ворага зноў.

Штык павінен быць востра натачан
У змаганні за шчасце сваё.
Мірны ход рэвалюцыі скончан,
Час настаў для вялікіх баёў. —

І на заклік выходзяць мільёны,
Баявыя вінтоўкі бяруць;
У абоймах застылі патроны —
Нечуваныя дні настаюць.

XIV

Мінае лета. Першыя лісты,
Пакрытыя сухім налётам сонца,
Спадаюць з дрэва. Ціхія кусты
Палаюць залатым агнём чырвонца.

Начамі зябка. Лёгкае пальто
Падшыта ветрам і асенняй сцюжай.
Усё пазбудзецца, усё — нішто,
Абы змагчы бяду і гора здужаць.

Абы жыццё рабочых і сялян
Навек збыло ярмо капіталізма.
І Ленін у Разліве піша план —
Пралог рэспублікі соцыялізма.

Ён вернай партыі дае наказ:
— Большэвікі павінны ўзяць уладу! —
І неўзабаве сам у грозны час
З'яўляецца на плошчах Петраграда.

Паўстанне блізіцца. Ужо ЦК
На вырашэнне дзень і план выносіць.

А ворагаў прадажная рука
Ахранкам шле на партыю даносы.

Спужаліся, штрэйкбрэхеры, вайны?!
Вам страшна, што народ на бітву крочыць?!
А дзе-ж былі, калі ў крыві паны
Тапілі тысячы і тысячы рабочых?!

Праклён вам, здраднікі, жыць будзе век.
Не спыніце жыцця ганебнай здрадай.
Па слову Леніна адважны чалавек
Вядзе прыгнечаных на барыкады.

XV

Горад вымер і згас.
Толькі свеціцца Смольны.
Штаб паўстання жыве
Небывалым жыццём.
А ні страху, ні болю
Ў вачах навакольных,
Нават смутак гарыць
Баявым пачуццём.

У пакоях ад дыму
Няма куды дзецца.
За акном пад нагамі
Грукочуць тарцы:
Адыходзяць атрады
Чырвонагвардзейцаў,
Прабягаюць разведчыкі
І пасланцы.

І на момант усё
Заціхае і гасне —
І гамонкі, і крокі,
І словы, і шум...
Ленін моўчкі стаіць.
У вачах яго ясных
Многа светлых надзей
І нияздзейсненых дум.

Заклапочаны Сталін
Схіліўся над картай.

А хвіліны ідуць,
Быццам тысячы дзён.
Узрастае трывога...
І раптам упарта
У глухой цішыні
Зазваніў тэлефон.

— Я вас слухаю... Сталін.
Вакзалы заняты?..
Тэлеграф і паштамт?..
І сенат?... Малайцы!
Што далей? У Зімовы,
На помач салдатам.
Атакуйце палац
На дварцовым пляцы. —

Першы залп за Няву
Пасылае «Аўрора»,
Ды не хоча здавацца
Зімовы палац:
Кулямётным агнём
З залатых калідораў
Афіцэры бароняць
Пакінуты пляц.

Зноў ударыў з гармат
Браніраваны крэйсер,
Дробным шротам пасыпаўся
Белы карніз.
І міністры з высокіх
Наседжаных крэсел —
Недаступных вышынь —
Апаўзаюць наніз.

З Петрапаўлаўскай крэпасці
Б'юць кулямёты,
І чырвонагвардзейцы
Выходзяць на пляц,
Маракі і адборныя
Часці пяхоты
Дружным штурмам займаюць
Зімовы палац.

Ноч мінае.
Зара над краінай усходзіць.
Над жыццём гаспадарыць
Рабочы Совет.
Аб зямлі, аб сапраўднай
Народнай свабодзе
Мудры Ленін падпісвае
Першы дэкрэт.

## XVI

Многа дзён я знаю урачыстых,
Непаўтораных ніколі і нідзе,
Ды няма на свеце больш вячыстых,
Як жывы кастрычнікаўскі дзень.

Дні такія не забудуцца ніколі!..
У жыцці, на працы, у баю,
Паміраючы на ратным полі
За радзіму слаўную сваю,

Хто не ўспомніць гэтай светлай даты?
Хто не ўспомніць, як ішлі на бой
Верныя матросы і салдаты
І рабочыя дружынай баявой,

Як адважна моўчкі паміралі
На дварцовых плошчах і палях,
Як навек над Смольным падымалі
Апалосканы крывёю сцяг,

Як на шэрых лапленых шынелях
Неслі раненых сваіх сяброў,
Як ішлі па вуліцах і пелі
Песню новых легендарных слоў,

Як усюды на шырокім свеце
Тысячы рабочых і салдат
Плакалі ад радасці, як дзеці,
Абдымаліся, як з братам брат?

Слава вам, байцы суровай бітвы!
Слава вам, памёршым і жывым!
Ваша мужнасць намі не забыта,
Не забыт і шлях ваш баявы.

Вамі заваёваны Кастрычнік,
Вамі высака падняты сцяг —
Беражэ адважны пагранічнік
Кожнай кропляю свайго жыцця.

У вяках не згасне ваша слава:
Помнікам былых вялікіх дзён
Вырасла людское наша права —
Неўміручы Сталінскі закон.

*1937 г.*

## МУЖНАСЦЬ

Падымі мяне,
Мужнасць класа,
Над галовамі паўшых ніц,
Правядзі над імклівым часам,
Над палётам планет і зарніц!

Дай звычайнаму слову дужасць,
Каб шумела яно,
Як пажар!
Ты-ж спыніла калісьці,
Мужнасць,
Загаіла найбольшы жаль.

Роўным крокам тады з узгоркаў
Зледзянелая ноч ішла.
Чалавек пад Масквой у Горках
Скончыў свой непаўторны шлях.

І калі над зімовым усходам
Праразаецца воблік дня,—
Па крутых і суровых усходах
Адплывае наніз труна.

На прастор вырываецца скруха,
Асірочаны кінуўшы дом,
І ад болю знямелыя рукі
Апускаюць труну на дол.

Гэта ногі ад гора прысталі,
Гэта рукі спавіты тугой,

Гэта плача таварыш Сталін,
Нахіліўшыся над труной.

Ападаюць сняжынкі на вусны,
На высокі адкрыты лоб...
Баявыя таварышы й вучні
Закрываюць астанкі шклом.

І празрыстае тонкае века
З ледзяного халоднага шкла
Адлучае ад нас чалавека,
Што прайшоў непаўторны шлях.

* * *

Белая дарога,
Векавая глуш,
Сосны снегавыя
Сцежку сцерагуць.

Селянін пануры
На крывых санях
Ельнікам зялёным
Высцілае шлях.

На глухі паўстанак
(Пяць далёкіх вёрст)
Будзе слацца ельнік
Лапкамі напрост.

Гэтаю дарогай,
Дзе галосіць сум,
Ленінцы палямі
Леніна нясуць.

Над шырокай Волгай
Хлапчуком ён рос,
Паднявольным людзям
Сваю праўду нёс.

Ён паўстаў над светам
Навальнічых хмар,
Як жывы і грозны
Агнявы штандар.

Выгадаваў класу
Партыю ў баях,
На прастор шырокі
Паказаў нам шлях.

І рабоў калоній,
Фабрык і палёў
На цара,
На пана
Ваяваць павёў.

З-пад ярма краіну
Вызваліў маю
І з рэспублік вольных
Утварыў Саюз.

Ён душу і сэрца
Палажыў у грунт,
Каб над светам здзеку
Вырас свет Комун,

Каб прастор Расіі —
Гэта глуш і шыр
Гаманілі,
Пелі
Голасам машын.

А цяпер палямі,
Цераз гэту-ж глуш,
Дзе сухія дрэвы
Сцежку сцерагуць,

Дзе рыдае скруха,
Дзе галосіць сум —
Ленінцы маўкліва
Леніна нясуць.

Ані слоў,
Ні песень,
Толькі стогне крок...
Ад вялікай крыўды
Ледзянее кроў:

Той,
Каторы вечна

Працаваў і жыў,
Каб змяніць краіну
Рускае глушы, —

Па глухой дарозе,
Цераз стэп і лес
Пракладае ў горад
Свой апошні след!

Ашукала смерць нас,
Насмяяўся лёс...
На абмёрзлых вейках
Стынуць зоры слёз.

На глухім паўстанку
Журацца агні,
У жалобных сцягах
Рушыцца цягнік.

* * *

Белым снегам усыпаны плошчы,
Белым снегам укрыты сады.
Золкі вецер штандары палошча,
Замятае на бруку сляды.

Мы ідзем —
І падзёншчык,
І токар,
І шахцёр,
І марак,
І гарбар,
І студэнт,
Малады і высокі,
І пануры сівы качагар.

Мы ідзем —
У палапленых світках,
У шынелях,
Падраных з вайны,
У падшытых вятрамі намітках —
Мы ідзем да ягонай труны.

Дом Саюзаў,
Калонная зала.

Чорным крэпам спавіта труна.
Мы прыйшлі...
І наўсцяж зарыдала
Насцярожаная цішыня.

І ніколі не знойдзеш ні ў якіх
Летапісных аналах пяра,
Каб народ гэтак горка плакаў
Над магілаю правадыра.

Нашы сэрцы наўзрыд галасілі,
Нашы вочы заслала імгла...
Чалавечага плачу сіла
Горы змыць векавыя магла.

Але вырасла мужнасць класа,
Падняла нас ізноў на бой:
Над палётам планет,
Над часам,
Над праклятай суровай зімой,

Над снягамі,
Над горам,
Над жалем,
Над законамі смерці й жыцця
Падымаецца ленінец Сталін,
Узнімаючы ленінскі сцяг.

— Мы людзі адменнага складу:
Сыны векавой барацьбы.
Нам дадзена права і радасць
У ленінскіх шэрагах быць.
Заўсёды-ж —
У маршах паходных,
У жорсткіх баях,
У агні —
Высока партыйную годнасць
Павінен трымаць комуніст.

Так гаварыў нам Ленін,
Навек пакідаючы нас.
Клянемся,
Таварыш Ленін,
Што мы ажыццёвім наказ.

— Цямнейшай за цёмныя ночы
Працоўнага доля была,

Адна толькі ўлада рабочых
Сапраўдную волю дала.
І покуль не скончыцца бура
Да самых бяскласавых дзён,
Гартуйце цвярдзей дыктатуру —
Рабочага класа закон.

Так гаварыў нам Ленін,
Навек пакідаючы нас.
Клянемся,
Таварыш Ленін,
Што мы ажыццёвім наказ.

— Нам рочылі гібель,
Магілу...
Супроць азвярэлых банд
Мы рушылі дужую сілу —
Сяброўства рабочых,
Сялян.
І зараз
На ўзораных нівах,
На фабрыках,
Стаўшых у строй,
Саюз гэты трэба рупліва
Расціць пролетарскай рукой.

Так гаварыў нам Ленін.
Навек пакідаючы нас.
Клянемся,
Таварыш Ленін,
Што мы ажыццёвім наказ.

— У час незабыўных паходаў,
Гуртуючы нашы палкі,
Жалезная дружба народаў
Высока ўзнімала штыкі.
Ад Новай зямлі да Паміра,
Да самых далёкіх юрт
Упарта-ж разгортвайце шырай
Совецкіх Рэспублік Саюз.

Так гаварыў нам Ленін,
Навек пакідаючы нас.
Клянемся,

Таварыш Ленін,
Што мы ажыццёвім наказ.

— Вось так у змаганні напружным
Мы свой здабывалі спакой —
Саюзам,
Братэрствам
І дружбай,
Чырвонаармейскай рукой.
Але неадступна,
Штодзённа
Рыхтуецца новы налёт.
Мацуйце-ж сваю абарону —
Чырвоную армію й флот.

Так гаварыў нам Ленін,
Навек пакідаючы нас.
Клянемся,
Таварыш Ленін,
Што мы ажыццёвім наказ.

— На бой за вялікія мэты
Узнімаецца Захад і Усход,
Усе пролетарыі свету
Ідуць у рашучы паход.
І вось,
Каб дарогаю вернай
Мільёны працоўных пайшлі,
Змыкайце рады Комінтэрна
На ўсіх паралелях зямлі.

Так гаварыў нам Ленін,
Навек пакідаючы нас.
Клянемся,
Таварыш Ленін,
Што мы ажыццёвім наказ.

На кожнае слова прысягі
Мы цвёрды давалі зарок:
— Пад ленінска-сталінскім сцягам
Ад мэт не адступім на крок! —

І мы сваё цяжкае гора
Панеслі маўкліва, без слёз.
На снежных шырокіх прасторах
Хадзіла зіма і мароз.

Але нашых плеч не сагнулі
Ні замяць,
Ні снег,
Ні скавыш, —
Гайдаліся рэчышчы вуліц,
Высокія вежы Масквы.

Пад маршы,
Пад гром барабанаў,
На стромкіх шырокіх плячах
На самы апошні прыстанак
Мы неслі труну Ільіча.

І вось наступіла часіна,
Адна з найцяжэйшых часін,
І сэрца бязмежнай краіны
Замерла на пяць хвілін.

У роспачы сціснуўшы зубы,
Мы чулі,
Як стогнуць гудкі,
Як горна рыдаюць трубы,
Як ціха стаяць палкі,
Як страшна равуць сірэны,
Як віхрам імчыцца зямля,
Як стынуць нямыя сцены,
Высокія сцены Крэмля,
Як гулка цяжкія гарматы
Апошні салют аддаюць,
Як плача над страшнай утратай
Савецкіх Рэспублік Саюз.

Чырвона-жалобныя сцягі
Схіліліся ў горы наніз.
І словы нядаўняй прысягі
Ізноў прагулі ў цішыні.

Мы цвёрда ў калоны пасталі,
Нас мужнасць ізноў узняла,
Бо з намі быў ленінец Сталін
І партыя наша была.

* * *

Мінаюць гады за гадамі,
Суровыя нашы гады.

Наперад крутымі шляхамі
Краіну вядзе правадыр.

І гэтай нязменнай дарогай —
Праверыць здабыткі свае,
Адзначыць свае перамогі
Прыходзіць Семнаццаты з'езд.

Ізноў наступае часіна,
Схіляемся ўсе,
Як адзін.
І сэрца бязмежнай краіны
На пяць замірае хвілін.

Нібы па сігналу трывогі,
Становімся зноў у рады,
І голасам,
Мужным і строгім,
Загад аддае правадыр:

— Устань,
Саюз сямі рэспублік,
Шарэнгамі,
Раўней струны,
Міні рады маскоўскіх вуліц,
Прайдзі каля яго труны.
Ударная брыгада класа,
Рабочым свету дай адказ:
Ці здзейсніла,
Як ты клялася,
Вялікі ленінскі наказ?
Ці стала слова
Словам справы,
Узлётам дум,
Геройствам дзей?
Ці ляжа гонар,
Наша слава
Вянком на строгі маўзалей?

На ўсіх шырынях земнай кулі
Маўчаць станкі,
Гудуць гудкі:
З трыбуны ўсіх сямі рэспублік
Даюць адказ бальшэвікі:

— Мы кляліся:
Трымаць высока
Сцяг,
Асвечаны яснай зарой.
Кожным рухам сваім і крокам,
Кожнай думкай сцвярджалі зарок.
І ніхто не пакажа справы,
Ад якой адступіў большэвік:
Як геройства,
Як гонар,
Як славу,
Мы праносім штандар баявы.
Апалосканы дымам і кроўю
На франтах грамадзянскай вайны,
Ён узвіўся над нашай будоўляй,
Самай стромкай дасяг вышыні.
Ён лунае ў міжзорнай сіні,
Дзе шумяць стратасферы вятры,
Ён, як сэрца жывое краіны,
На паўночных ільдзінах гарыць.

— Мы кляліся:
Адзінства партыі,
Быццам вока сваё, берагчы.
Процьма хіжых галоў упарта
Падымалася з брудных лагчын.
Мы грамілі іх —
«Левых» і правых,
Адсякалі няшчадна з пляча,
Каб аматары чорнае справы
Не скрывілі дарог Ільіча,
Каб ніколі,
Ні ў якіх варунках
Не крануў нашых сіл разлад.
Так у жорсткіх баях за комуну
Непарушная еднасць расла.
Як кавалак адменнае сталі,
Загартованы сёння рады.
Гартаваў іх таварыш Сталін —
Першы ленінец,
Наш правадыр.

— Мы кляліся:
Насмерць змагацца,
Пасці трупамі,



14

Стаць на касцёр,
Каб жыццё дыктатуры працы
Бараніла рэспублік жыццё.
Ад нацдэмаўскіх збродных шаек,
Ад прадажных служак Рамзіна
Выпаўзала,
Ішла глухая,
Наступала на нас вайна.
Кожны хутар,
Абнесены садам,
Па дарозе да нашых мэт —
Гэта дваццаць чатыры засады
На адзін усяго кілометр.
Безліч іх,
Што хацелі краіну
І ўладарства над намі займець!
Берагла нас нястомная пільнасць,
Дыктатуры навостраны меч.

— Мы кляліся:
Расціць рупліва
Пралетарска-сялянскі саюз
І сягоння на ўзораных нівах
Аглядаем работу сваю.
Па калгасных палях
(Аж рэха
Векавыя калыша бары)
Ходзяць нашы найлепшыя шэфы —
Сталінградскія трактары.
За іх следам шуміць пшаніца,
Канюшына шалее,
Аўсы,
Аж на дол прыпадаюць ніцма
Пад цяжарам зярна каласы.
Лапушацца сады...
Увечар
Яркнуць вуліцы ў песнях дзяўчат.
Так мяняецца лёс чалавечы
Ля сялянскіх абноўленых хат.

— Мы кляліся:
Ад гор Паміра
І да самых далёкіх юрт
Мацаваць і разгортваць шырай

Пролетарскіх рэспублік саюз.
Мы выконвалі нашу прысягу
Дзень і ноч над работай сваёй:
Кожны край надзялялі пасагам —
Гарадамі,
Садамі,
Зямлёй.
Ад усходніх граніц да заходніх,
Праз увесь велізарны абшар,
Б'юцца роўна,
Упэўнена,
Згодна
Сэрцы нашых заводаў і шахт.
Больш няма занядбаных ускраін,
Дзе зацішак і лямант стаяў,
Дзе няшчадна каралі і кралі, —
Скрозь квітнее радзіма мая.

— Мы кляліся:
І мора,
І сушу,
І вышыні аблок бараніць.
І ніколі ніхто не парушыць
Умацованых нашых граніц.
Хай паслухаюць летам уранку,
Як спяваюць прасторы зямлі —
Гэта ходзяць жалезныя танкі,
Баявыя плывуць караблі,
Самалёты ідуць,
Аж вецер
Прыгінае галовы лясоў...
Наймацнейшая армія ў свеце
Беражэ нашу працу і сон.
І калі, азвярэўшы, падымуць
Ліхадзеі на нас нажы —
Будзем мы за сваю радзіму
Ваяваць на прасторах чужых.

— Мы кляліся:
Сумленна і мужна
Нашу працу і сілы аддаць,
Каб расла пролетарская дружнасць
Па ўсіх сёлах,
Па ўсіх гарадах.

І мы прагна ішлі да мэты:
Дзень і ноч,
У любую пару
Будавалі краіну Советаў,
Не шкадуючы стомленых рук.
Яна сонцам сягоння свеціць,
Як маяк, над сусветам гарыць...
З цёмных турам нявольнага свету
Прыязджаюць да нас змагары.
Мы прымаем іх ветла і проста,
Згуртаваныя ўсе, як адзін.
І расце баявое сяброўства
Між працоўнымі розных краін.

— Мы кляліся...
І кожнае слова —
На вадзе,
На агні,
На зямлі,
На вышынях,
На стромкіх будовах —
Ператворана ў сацыялізм. —

Грыміць адказ з мільённых вуснаў,
Шарэнгамі,
Раўней струны,
Парадным маршам,
Крокам мужным
Праходзім мы каля труны.

Мінаем час няшчаднай смерці,
Смуткуем зноў аб ім усе,
І кожны з нас глыбока ў сэрцы
Часцінку Леніна нясе.

Ягоны смех,
Яго вясёласць
Гарыць на тварах окцябрат,
Жыве ў рабоце комсамола,
У песнях маладых дзяўчат.

Ягоных спраў размах вялізны,
Яго нянавісць і любоў
Нясуць будаўнікі соцыялізма —
Героі фабрык і палёў.

Яго упартасць,
Волю,
Мудрасць,
Што абняла прастор і час,
Яго вялікасную мужнасць
Нясе увесь рабочы клас.

Яна згаіла нашы раны,
Пякучы патушыла боль,
Яна ішла заўсёды з намі,
Вяла і павядзе у бой.

І мы ніколі не прыстанем
Ні ў цяжкай працы,
Ні ў хадзе,
Бо з намі наш любімы Сталін,
Бо з намі партыя ідзе.

Бо чуем кожнае імгненне
І кожнай кропляю крыві —
Вялікі і магутны Ленін
Сярод жывых
Ідзе жывы.

*1934 г.*

# НАД БЯРОЗАЙ-РАКОЙ

## ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

Серго Орджанікідзе—член Рэвваенсовета 16-й арміі.
Тарас Іванавіч Азорыч—камісар чырвонаармейскай часці.
Наста—яго маці.
Тацяна Марыч—маладая дзяўчына, сірата, Азорычава выхаванка.
Адась Валошын—рабочы-чыгуначнік, камандзір атрада абароны.
Даніла Карабан—матрос, памочнік камандзіра атрада.
Сімха Штэйнар, Васіль Шчырэц — байцы атрада абароны.
Баяновіч—камандзір чырвонаармейскай брыгады.
Макарэнка, Кузьмін, Нічыпар Мелех, Алёшка Семізвон — чырвонаармейцы.
Сёмка Бегунок—местачковы бабыль.
Алена—жонка Васіля Шчырца.
Нохім—бацька Сімхі Штэйнара.
Зяма—хлапчук, сын Сімхі Штэйнара.
Марыся—маці Данілы Карабана.
Казімер Бэсман—начальнік разведкі чырвонаармейскай часці.
Браніслаў Свідэрскі—капітан польскай арміі.
Дамброўскі—палкоўнік польскай арміі.
Дамейка—камандзір чырвонаармейскага батальёна.
Ксаверы Стрыж—вясковы стараста.
Матрона Ксаверыха—яго жонка.
Мікола—іхні сын, настаўнік.
Тэкля—местачковая баба.
Сержант польскай арміі.

Сяляне, чырвонаармейцы, партызаны, жабракі, легіянеры.

Дзея адбываецца на Барысаўшчыне пад восень 1919 года, у час вайны з белапанскай Польшчай.

## АКТ ПЕРШЫ

### МАЛЮНАК ПЕРШЫ

Ускраіна невялікага мястэчка. Справа на ўзгорку — бедная адзінокая сяліба, каля яе ў лагчыне — студня. Злева — у поле ідуць старадаўнія ліпавыя прысады. Дзесьці блізка за мястэчкам — бой: стракочуць кулямёты, грымяць вінтовачныя залпы. Прысадамі брыдуць бежанцы, раненыя чырвонаармейцы і партызаны. З хаты выходзіць Адась Валошын і Даніла Карабан.

Валошын

Пакінь пра гэта нават гаварыць!
Ты зразумей, што наша адступленне
Агаліць фланг дзевятага палка,
Адкрые шлях палякам на Барысаў.
А варта ім прабрацца за Бярозу,
Як просты ход на Оршу і Смаленск.
Вось для чаго Серго Орджанікідзе
І загадаў: Барысаў і Бярозу
Абараняць, наколькі хопіць сіл.

Карабан

І гэтых сіл у нас ужо няма:
Наспех згуртаваны адзін атрад
Не затрымае рэгулярнай часці.
І лепей біць у лоб ці адступіць.

Валошын

Нам дапамогу дасць дзевяты полк.
Трымацца трэба, Карабан, зубамі.

Карабан

Пакуль апошняга не выб'юць зуба,
Папробуем трымацца, камандзір.

Уваходзіць ранены баец.

Валошын

Ну што?.. Ты ранены?..

Баец

Полк адступіў...
Учора Рудню занялі палякі.

Валошын

Не можа быць! Адкуль-жа там палякі?

Карабан

Цяпер адна надзея на Барысаў.

Баец

Гавораць, і ў Барысаве паны.

Валошын

Хлусня! Учора горад быў у нас.
Барысава без бою не здадуць.

Баец

Ратуйце лепш... людзей... *(падае мёртвы.)*

Валошын

Памёр?

Карабан

Памёр.

Валошын

Нясіце пахавайце.

Мёртвага выносяць.

Карабан

Камандзір,
А што калі Барысаў паў сапраўды?

Валошын

Тады дарэмна губім мы людзей.

Уваходзіць ледзь жывая Тацяна.

Тацяна

Адась!..

Валошын

Тацяна? Ну, Барысаў наш?
Падмога будзе нам? Чаго-ж ты плачаш?

Тацяна

Хіба я плачу? Не...

Валошын

А слёзы?

Тацяна

Слёзы? *(Рыдае.)*

Валошын

Ды ты не плач, а гавары хутчэй!

Тацяна

Барысаў... занялі белапалякі.

Валошын

Дык значыць, праўда!

Карабан

Што-ж цяпер рабіць?

Убягае Сімха Штэйнар.

Сімха

Таварыш камандзір, давай патроны.

Валошын

Патронаў больш няма.

Сімха

А полк?

Валошын

Полк адступіў, нас абышлі кругом.

Карабан

*Выхапіўшы гранату і ірвануўшыся ісці.*

Не, я жыўцом не здамся ім ніколі!
Я напралом пайду і лепш загіну...

Валошын

*Стрымліваючы Данілу Карабана.*

Не вар'яцей! Загінуць вельмі лёгка,
Падумай лепш, як ратаваць людзей.

Карабан

Усё загінула...

Валошын

Яшчэ не ўсё.
У нас яшчэ адзін застаўся шлях:
Прабіцца на балота, у лясы
І пробаваць адтуль прайсці да нашых.
Бяры, Даніла, зараз-жа людзей
І адступай. Я з часткаю атрада
Прыкрыю з тылу ваша адступленне.
Спяшайце.

Карабан і Сімха

Слухаем! *(Выходзяць.)*

Валошын

А ты, Тацяна...

Тацяна

Я слухаю цябе, Адась.

Валошын

Ды не,
Рызыкаваць тваім жыццём няможна.

Тацяна

Я застануся тут.

Валошын

Не дазваляю!
Збірайся зараз-жа і пойдзеш з намі.

Тацяна

Я не магу пайсці.

Валошын

Чаму не можаш?

Тацяна

Ты-ж ведаеш, што на маіх руках
Нядужая Азорычава маці.
А для мяне Азорыч, быццам брат:
Ён выхаваў мяне, памог вучыцца,
І за дабро я заплачу дабром.

Валошын

Дарма! Азорыч так не разважае:
Сам адступіў, а нас, нябось, пакінуў.

Тацяна

Калі Тарас Іванавіч жывы,
Я ведаю, ён дапаможа нам!

Валошын

Надзеі марныя! Нам вельмі цяжка,
І страшна мне цябе адну пакінуць.
Ты ведаеш, чым гэта пагражае?

Тацяна

Я буду асцярожная.

Валошын

Тацяна,

Я гавару пра гэта назнарок.
Нам трэба тут пакінуць чалавека.
Калі ты не спужаешся застацца —
Тады я дам табе прыпаручэнне.

Тацяна

Які ты недаверлівы, Адась!

Валошын

Збяры дакладныя, як можна, весткі,
Якія будуць часці, колькі сіл,
І перадай, калі сустрэнеш нашых,
Куды, калі і як мы адступілі.
Без вестак ад цябе — нам некуды ісці.

Тацяна

Я ўсё зраблю, Адась... А ты глядзі,
Любі мяне, як ты любіў заўсёды,
Успамінай у вольныя хвіліны,
Што я адна, сумую па табе.

Валошын

Тацяна, я цябе магу забыць
Хіба тады, як анямее сэрца.
А покуль я змагаюся, жыву —
Ты будзеш жыць са мной у кожнай думцы.
І вер, настане некалі часіна,

Калі мы зноў спаткаемся з табой.
Я буду гладзіць валасы твае,
Глядзець у вочы сінія, як неба,
І гаварыць аб шчасці. Помні-ж, Таня,
Калі з табою здарыцца што-небудзь,
Мне будзе вельмі цяжка і балюча.
Бывай!

Тацяна

Бывай і беражы жыццё!

Убягае Алена.

Алена

Дзе камандзір? Чаго-ж вы стаіцё?
Раты раззявілі сабе й стаяць...
Параненых-жа трэба адпраўляць.

Валошын

Пра гэта мы і гутарым, Алена.
Ідзіце і падрыхтуйце іх.

Алена

Ах, божа!

І колькі іх сягоння паглумілі,
Здаровых, маладых... Хадзем, Тацяна!

Тацяна выходзіць. Алена на момант затрымліваецца.

А мой-жа там стары жывы?

Валошын

Жывы.

Алена

Скажы яму, няхай не вельмі лезе,
Але няхай не вельмі й паддаецца,
Няхай трымаецца. *(Выходзіць.)*

Валошын

Карысці мала:
Ні зброі, ні людзей... Эх, падвялі!

Выходзіць. Да студні з вёдрамі падыходзіць Тэкля.

Тэкля

Вось навіна, дык навіна,
А расказаць каму й няма!
Э! Сёмка Бегунок ідзе.
Вы не чулі?

Сёмка

Што?

Тэкля

Не чулі?!
Весці дрэнныя лятаюць:
Кажуць, нашых падманулі,
Кажуць, нашы адступаюць.

Сёмка

Хто сказаў, што адступаюць?
Пэўна бабы байкі баюць.

Уваходзяць змораныя партызаны.

Шчырэц

Ох, стаміўся, хоць напіцца,
Дай нам, Тэклечка, вадзіцы.

Партызаны прагна п'юць ваду. Ля студні збіраюцца сяляне.

Сёмка

Праўда, хлопцы, ваша войска
Не пакіне нашай вёскі?

Шчырэц

Дзе там нам ужо змагацца,
Каб хоць як ўратавацца!

Сімха

Ай, ваяка-небарака,
Перастань ты ныць і плакаць!

Уваходзіць Даніла Карабан.

Карабан

Гатовы?

Сімха

Гатовы, вядзі, Карабан,
Пакуль не апаў на дарогі туман.

Карабан

Нам трэба да ночы дайсці да балот,
Дарога благая, і трудны паход.
Спяшайцеся-ж, хлопцы, не гутарце шмат,
Цалуйце бацькоў і каханых дзяўчат.
Бывайце, старыя, маўклівыя хаты!
Бывай, мая маці! Бывайце, дзяўчаты!

Марыся

А куды-ж вы ад нас адлятаеце?
На каго-ж вы нас пакідаеце?
А хто-ж нашы палоскі ўзарэ,
А хто-ж нашы нівы ўбярэ,
Хто нашы вочы пяском прысыпле?

Карабан

Не плачце, мы прыдзем, мы вернемся к вам,
І гэтых вось слёз не даруем панам.

Байцы развітваюцца і адыходзяць. Нехта дзесьці заспяваў. Яго падхапілі другія, і пакацілася журботная, але магутная песня.

Песня

Не журыся горненька
І не плач,
Што са мною, любая,
Не была.
Каб былі шчаслівыя
Нашы дні,
Я пайшоў рэспубліку
Бараніць.

І не будуць ворагі
Панаваць,
Покуль з плеч не скоціцца
Галава.
А калі і суджана
Мне не жыць —
Не журыся горненька,
Не тужы.
Добрым словам, ласкаю
Памяні
І выходзь рэспубліку
Бараніць.

Песня паволі аддаляецца. Байцоў праводзяць сяляне. Апошнімі ідуць Тэкля, Васіль Шчырэц, Алена, Сімха Штэйнар, Нохім, Зяма і Тацяна.

Шчырэц

Ты, значыць... гэта... беражы сям'ю.

Алена

Пра нас не думай, а глядзі свайго.
На, хлеба хоць вазьмі. От чалавек!

Сімха

Ну, Зяма, будзь, сынок, гаспадаром...
І дзеда слухайся. Бывайце, бацька!

Нохім

Шчаслівa, сыне мой!

Сімха

Хадзем, Шчырэц!

Шчырэц

Ды я вось з бабай не дайду ладу.

Алена

Васіль, не гавары, чаго не трэба.

Сімха

І не забудзься, што цябе чакаюць.

Сімха, Нохім і Зяма выходзяць.

Тэкля

А божа-ж мой, і я-ж забыла,
Што мне Матрона гаварыла
Усё разведаць і дазнаць.
Ну, пабягу-ж ёй расказаць.

Шпарка бяжыць у мястэчка.

Шчырэц

Я гавару табе, Алена, слушна:
Не забывайся замыкаць гумна...

Алена

А божа мой, калі ты гэта скончыш?
Нібы ў яго вялікае багацце!

Шчырэц

Якое ёсць і тое можа згінуць.
Бывай здарова!

Алена

Будзь і ты здароў!

Выходзяць. Застаецца адна Тацяна.

Тацяна

Вось і адзінокая... Дзе-ж вы, хлопцы, дзе?
Труднымі дарогамі доля вас вядзе.
З кім я прывітаюся, як не будзе вас?
Дзе я з вамі стрэнуся ў гэты цяжкі час?
А ні смеху ветлага, а ні ветлых слоў
Я ад вас увечары не пачую зноў.
Ціхая, самотная буду скрозь блукаць,
Пра свайго каханага стану ўспамінаць.
А ці ён паранены у баях ідзе,
Ці яго забітага пахавалі дзе.
Сэрца адзінокае апануе сум,
І ніхто не ўзрадуе, не развее дум.

У задуменні садзіцца на ўзмежку дарогі. Праз момант паказваецца Матрона Ксаверыха і Тэкля.

Тэкля

Няма... А вунь, глядзі, засумавала!

Ксаверыха

Нябось, цяпер ёй горка стала.

Тэкля

Не дзіва, быўшы партызанкай
І камісарскай выхаванкай.

Ксаверыха

Якая чорта выхаванка!
Яна была яго каханкай.

З мястэчка, з бел-чырвона-белай павязкай на рукаве, бяжыць узбуджаны Мікола Стрыж.

Мікола

А вы чаго тут? Смерці захацелі?!

Ксаверыха

Сынок!.. Мікола!

Мікола

Марш адгэтуль, маці.

Ксаверыха і Тэкля выбягаюць. Мікола заўважыў Таццяну.

Мікола

Вы? Гэта вы?! Вось не чакаў... Ані!
Дык, значыць, засталіся? не паспелі?

Таццяна

Я й не спяшалася нікуды.

Мікола

Што?
Ах, кінулі! Вас кінулі? Ну, так?

Таццяна

Не ваша справа, Стрыж.

Мікола

Чакайце, што вы?
Я цэлы год ганяюся за вамі.

Таццяна

Настаўнік, а займаецеся глупствам.
Адстаньце вы!.. Я ненавіджу вас.

Мікола

Не, выслухайце да канца. Я знаю,
Што вы не любіце мяне. І я
Не дамагаюся ад вас кахання.
Але... але я не дазволю вам
Быць здрадніцай і прадаваць краіну.

Таццяна

Заявіце палякам?

Мікола

Заяўлю.
Падумайце і помніце, Таццяна,
Што я, дзеля майго да вас кахання,
Заўсёды буду рад вам памагчы.

Таццяна

Мне не патрэбна вашай дапамогі:
Мяне абараняе мой народ. *(Выходзіць)*

Мікола

Цяпер ты будзеш у маіх руках,
А после звыкнешся і пакахаеш.

Выходзіць. Страляніна ўзмацняецца. На чале з Валошыным, адстрэльваючыся, цераз дарогу перабягаюць апошнія партызаны. Праз момант каля адзінокай сялібы з'яўляецца некалькі жаўнераў з кулямётам і Мікола Стрыж. Ён паказвае белапалякам, у якім кірунку пабеглі партызаны. Выбух гарматнага снарада пылам і дымам засцілае ўсё далейшае. Калі-ж гэтая заслона знікае, мы бачым, што на ўзгорку каля разбуранай сялібы стаіць ужо капітан Свідэрскі і перад ім натоўп маўклівых сялян, ачэплены кругом польскімі салдатамі.

Свідэрскі

Па-першае, я мушу вам зазначыць,
Што я люблю вясёлы гоман, шум
І мілыя, прыветлівыя твары.
Пасля... Ага, нарэшце, з хлебам-соллю...

Уваходзіць Матрона і Ксавэры Стрыж.

Ксавэры

Дазвольце, пане, прывітаць,
Хлеб-соль з пашанай перадаць.
Дай бог, каб вы запанавалі,
Ніколі-б мы бяды не знаді.

Свідэрскі

Дзенькуе вам за соль, за хлеб,
Але нам мала для патрэб;
Павінны мець мае жаўнеры
І хлеб, і мяса, і кватэры.

Ксавэры

Усё, усё, паночак, будзе.
Вось толькі... ёсць благія людзі.

Свідэрскі

Перапішы мне ўсіх западазроных.

Мікола

Аб гэтым з паважаным капітанам
За гонар меў-бы гаварыць я сам.

Свідэрскі

Ага, я разумею пана... Добра!

Алена

Нячыстая вы сіла!

Жаўнер

Цыць, баба, цыць!

Свідэрскі

Чаго вы, людзі, крычыце? Цішэй.
Я з вамі гутарыць хачу паціху.
Збярыце мне пудоў поўсотні мяса,
Аўса пудоў чатырыста, пшаніцы
І пойдзеце, як добрыя суседзі.

Сёмка

Дай хлеба ды гуляй колькі трэба.

Свідэрскі

А ты вясёлы, я такіх люблю.

Сёмка

Трэба жыць, як набяжыць.

Свідэрскі

Дык чулі, людзі, мой загад пра хлеб?

Алена

А дзе-ж яго, скажы, панок, узяць?

Свідэрскі

А тым, большэвікам, адкуль вы бралі?

Сёмка

За Саса было хлеба і мяса,

А прыйшоў Панятоўскі —
Стаў хлеб не такоўскі.

Свідэрскі

Я — чалавек спакойны вельмі і вясёлы,
Але мяне, стары, у злосць не ўводзь.

Сёмка

Паказваючы ўгару, на неба.

Бога хвалі, ды й чорта не гняві?

Свідэрскі

Убачыўшы на дрэве чырвоны сцяг.

А гэта што яшчэ?

Алена

А гэта сцяг.
Ці пан такі стары, што не дабачыць?

Сёмка

Чырвоны колер вока коле,
А мужыку, што чырвона — то й хораша.

Свідэрскі

Зняць зараз-жа, зняць, лайдакі!

Зяма

Давай!
Нашто дабром мазоліць пану вочы.

Спрытна ўзлазіць на дрэва.

Нохім

Унучак!

Сёмка

Добра, сынку!

Свідэрскі

Сукін сын!
Арыштаваць усіх, хто тут крычаў.

Ксаверы

Усё, усё, паночак, добра будзе.

Свідэрскі

Ну, марш, нясіце хлеб і мяса, людзі!

Людзі разыходзяцца. Намерыўся выйсці і Свідэрскі, але яго запыняе сержант.

Сержант

Пан капітан, дазорцы нашы
Ля магазінаў местачковых
Злавілі нейкіх двух вайсковых.

Свідэрскі

Большэвікі?

Сержант

А мы не знаем.

Свідэрскі

Адвесці ў штаб, там дапытаем.

Свідэрскі выходзіць. Тацяна, пачуўшы, размову, затрымалася.

Тацяна

Каго-ж бы там яны спаймалі?
А можа нашыя адсталі?

Праводзяць Азорыча і Бэсмана.

Тарас Іванавіч? Азорыч!

Сержант

Вам што, знаёмы з іх каторы?

Азорыч

Мы вас не ведаем, не знаем...
З Барысава дарэмна адышлі.

Сержант

Прэч адыдзі! У штаб яго, у штаб!
Азорыча і Бэсмана выводзяць.

Тацяна

На смерць, на ганьбу павялі,
І слова не далі сказаць...
А што хацеў ён перадаць?

Уваходзіць Наста.

Наста

Ты тут? А я цябе шукаю...
Чаго сумуеш?

Тацяна

Гора душыць.

Наста

Не выплачаш, Тацяна, слёз,
Маліся лепш, каб грэшных душы
Да неба бог святы данёс.

Тацяна

Маліцца мне? За што? За слёзы?
За здзек? За гора і за кроў?

Наста

Маліся за няшчасных мёртвых,
Забітых тут тваіх сяброў,
За Тараса...

Тацяна

Яму да бога
Няма патрэбы на зямлі.

Наста

Тацяна!

Тацяна

Гэтаю дарогай
Яго палякі павялі.

Наста

Што ты гаворыш?.. Божа, божа,
Што-ж мне рабіць? Што дзеяць мне?
Ісці прасіць?

Тацяна

Не дапаможа,
Іх сэрцаў просьба не кране.

Наста

Тарас... Ратуй яго, Тацяна!

Тацяна

Цішэй!

Наста

Прашу цябе, малю...

Тацяна

Не плачце, бедная, не плачце.
Я ўсё, што здолею, зраблю.
Я пабягу ў атрад да хлопцаў,
Яны тут блізка, я знайду...

Наста

Бяжы-ж хутчэй, бяжы, Тацяна,
Нясі да іх маю бяду,
Скажы ты ім пра наша гора.

Тацяна

А што-ж я ім магу сказаць?
Не, я павінна тут дазнацца,
Што ён хацеў мне перадаць?
І я дазнаюся. Ні краты,
Ні вартавыя, ні турма,
Нішто, нішто на гэтым свеце
Мяне не зможа затрымаць.

Тацяна і Наста выходзяць.

Зяма

Прытаіўся на дрэве.

Калі дайшло, што і жанчыны
Пайшлі таксама ваяваць,
То, мне здаецца, можна смела
Чырвоны сцяг ізноў узняць.

Ізноў вешае чырвоны сцяг.

**МАЛЮНАК ДРУГІ.**

Мураваны склеп у панскім маёнтку,ператвораны белапалякамі ў турму. Праз невялікае акно, што знаходзіцца амаль над зямлёй, відаць, як за сцяною ходзіць вартавы. У склепе пануе густы змрок. На цаглянай падлозе сядзяць і ляжаць арыштаваныя. Сярод іх: Азорыч, Бэсман, Алена з дзіцем, Марыся і Нохім.

Азорыч

Ах, каб зламаць, разбіць глухія краты,
Каб вырвацца на волю і сказаць:
Смялей наперад — перамога наша!
За гэта я не толькі рад памерці,
Гатоў па кроплі кроў сваю аддаць.

Бэсман

А ты упэўнены, што гэта здрада?

Азорыч

Ты бачыў сам. З табою мы прайшлі
З Барысава семнаццаць кілометраў —
І хоць-бы дзе адна буйная часць!

Разведка толькі, рэдкія заставы...
Скажы, якія-ж тут былі падставы
Аб адступленні выдаваць загад.
Павесіць мала за такую здраду!

Бэсман

Ты не хвалюйся — разбяруцца з часам.

Азорыч

Ды позна будзе, Бэсман! Зразумей,
Калі-б цяпер мы перадалі весткі,
Што сілы польскія малыя тут,
Што покуль навядуць яны масты
І перакінуць за Бярозу войска —
Барысаў лёгка можна ўзяць назад.

Бэсман

Ты гэта і хацеў сказаць дзяўчыне,
Калі нас вуліцай з табой вялі?

Азорыч

На жаль, яна не зразумела нас.

Бэсман

Твая знаёмая?

Азорыч

Дзяўчына? Так!

Марыся

Ой... піць...

Азорыч

Спакойнай ночы.

Ад Бэсмана падыходзіць да Марысі.

Што вам?

Марыся

Піць...

Азорыч

Вады няма. Вы сядзьце вось сюды
І голаў прытуліце да сцяны.
Каменне тут халоднае, як лёд.
Вам будзе так лягчэй. Во-во, вось так.

Марыся

Дачушка!.. Дзеці!.. Бедныя сіроты,
І хто-ж вас без мяне дагледзіць там?!
Пагінеце адны малыя...

Алена

Годзе,
Не плач, нейк выжывуць. Глядзі сябе,
А то вунь бачыш, як уся змарнела.

Азорыч

Дзяцей суседзі вашыя дагледзяць,
Свет не без добрых, кажуць-жа, людзей.
А вас саміх за што-ж арыштавалі?

Нохім

За што? За што і ўсіх — за праўду, сыне.

Азорыч

Не любяць, значыць, праўды?

Нохім

Ой, не любяць!

Азорыч

Якую-ж праўду вы сказалі ім?

Нохім

Сыны, яе і мой, пайшлі к чырвоным,
Дык вось пытаюцца: куды пайшлі?
Як быццам гэта нам яны сказалі!

Азорыч

Канечне, дзе-ж яны вам гэта скажуць!

Нохім

А я гляджу на вас, гляджу, і здэцца,
Як быццам вы Азорыч. Не?

Азорыч

О, не!

Нохім

Ну, не — дык не. Стары, відаць, змыліўся.

Алена

Сваіх цурацца стаў. Хоць запытаўся-б,
Як маці там жыве...

Азорыч

Не трэба, ціха!
Я вас не ведаю, а вы — мяне.

Нохім

Ці-ж я малы!

Марыся

А я і не пазнала.

Азорыч

Не трэба й пазнаваць. Ну, добрай ночы!
Кладзіцеся ды адпачніце трохі.
А як яна? Здаровая? Жыве?

Алена

Жыве... Ты выбач мне, дурной.

Азорыч

Дармо.

Стала зусім цёмна. Бэсман і арыштаваныя дрэмлюць. Азорыч пазірае ў турэмнае акно. Заплакала дзіця; Алена пачынае яго калыхаць і спявае калыханку. Спачатку чуваць толькі адна мелодыя, а пасля вылучаюцца і словы.

Алена

Спі, мой хлопчык, ноч малая.
Ходзіць вецер, казкі бае.

Азорыч

Калісьці так пра нашу долю
Спявала маці часта й мне.
Матуля добрая, ніколі
Ты не пабачыш больш мяне.

Алена

На галінцы ў чыстым полі
Ён калыша тваю долю.

Азорыч

Як выйдзеш рана да крыніцы
Вады сцюдзёнае набраць —
Зазвоняць тройчы на званіцы
І павядуць мяне страляць.

Алена

Няхай доля не прачнецца,
Горкай слёзкай захлынецца.

Азорыч

Апошні раз пабачыў вёску,
Дзе гадаваўся, падрастаў,

Дзе на крывых шнурах-палосках
Хадзіў за плугам, жыта жаў...

Алена

Можа збудзеш ты напасці,
Можа будзеш меці шчасце.

Азорыч

Мне выкапаюць дол за местам,
І ўжо ніхто з тае пары
Не перадасць вам гэтых вестак,
Мае далёкія сябры.

Алена

Спі, мой хлопчык, ноч малая,
Ходзіць вецер, казкі бае.

Азорыч

Куды-ж, чаго ймчышся, сэрца?!
Навокал мёртва, ціха скрозь.
Ды што такое? Мне здаецца,
Ці там сапраўды ходзіць хтось?
Няма. Схаваўся за будынкам.
Ідзе сюды... Тацяна?.. Ты?

У акне паказваецца Тацяна.

Тацяна

Тарас Іванавіч?

Азорыч

Дзяўчынка,
Як ты патрапіла сюды?

Тацяна

Я слоў не зразумела вашых.
Што вы сказалі ідучы?

Азорыч

Спяшайся як мага да нашых.
Ідзі сягоння-ж уначы

І перадай Орджанікідзе,
Што горад здраднікі здалі.
Пакуль сюды-ж падмога прыдзе,
Пакуль мастоў не навялі
І фронт яшчэ не ўмацаваны —
Барысаў можна ўзяць назад.
Бяжы-ж хутчэй, бяжы, Тацяна,
Ад гэтых страшных цесных крат.
Бывай!

Тацяна

А як-жа вы?

Азорыч

Нічога,
Няхай сябры успомняць нас.
Шчаслівая табе дарога.
Спяшай!

Тацяна

Бывайце! *(Выходзіць.)*

Азорыч

Добры час!
Вось маладзец! Устань, прачніся, Бэсман.

Бэсман

Што сталася?

Азорыч

Паслухай, Бэсман, радасць:
Са мной нядаўна гаварылі з волі.

Бэсман

Дзяўчына тая?

Азорыч

Так, мая дзяўчынка.
Не дарам я узгадаваў яе!

Бэсман

І ты ёй перадаў свае здагадкі?

Азорыч

Не бойся, брат, яна іх данясе.
Цяпер спакойна можам і памерці.

Бэсман

Памерці? Не! Жыць! Жыць! Гэй, вартавы!

Барабаніць кулакамі ў дзверы.

Хутчэй, хутчэй вядзі мяне на допыт!

Азорыч

Ты звар'яцеў?

Марыся

Што з ім такое?

Нохім

Хворы.

Алена

Ну й чалавек!

Жаўнер адчыняе дзверы.

Жаўнер

Хто падымае лямант?

Бэсман

Не смей мяне чапаць! Вядзі на допыт.
Ідзі скажы, арыштаваны Бэсман
На допыт просіцца.

Жаўнер

Зачыняе дзверы.

От свалата!

Азорыч

Ты гэтым толькі сам сабе пашкодзіў.

Бэсман

Душа баліць. Я не магу цярпець.
Ты паглядзі, што робіцца, Азорыч:
Навокал кроў, пажары, здзекі... Людзі
Мруць на дарогах, гінуць у баях...
Дзяўчына, рызыкуючы жыццём,
Ідзе праведаць нас і памагчы,
А мы сядзім у гэтым сутарэнні.
Я не магу! І я ім не дарую
Ні вёсак спаленых, ні слёз дзяцей,
Ні гэтай крыўды і няволі нашай.
За ўсё адпомшчуся. Гэй, вартавы!
Вядзі мяне на допыт! Вартавы!

Барабаніць кулакамі ў дзверы.

## МАЛЮНАК ТРЭЦІ.

Вялікі і раскошны пакой у панскіх палацах пад Барысавам. Тут змяшчаецца штаб польскай часці. У штабе палкоўнік Дамброўскі і капітан Свідэрскі. Дамброўскі чытае спісак.

Дамброўскі

Шчырэц Алена?

Свідэрскі

Ёсць такая.

Дамброўскі

Штэйнар?

Свідэрскі

І гэты ў нас.

Дамброўскі

Марыся Карабан?

Свідэрскі

Таксама тут.

Дамброўскі

Чаму ў вас толькі бабы?

Свідэрскі

Мужчыны, пан палкоўнік, там, у іх...

Дамброўскі

Тацяна Марыч? Дзе Тацяна Марыч?
У спіску сказана, што праз яе
Вядуцца сувязі з атрадам?

Свідэрскі

Так.

Дамброўскі

Чаму-ж яе дагэтуль не забралі?

Свідэрскі

Шукалі цэлы дзень і не знайшлі.

Дамброўскі

Шукайце ноч, але знайсці павінны!
Пан капітан залішне бесклапотны:
У вас пад бокам тоіцца атрад,
Бальшэвікі гуляюць на свабодзе,
А вы спакойна седзіцё ў палацах.
Атрад патрэбна выведаць і знішчыць.
Тыл арміі павінен быць надзейны,
Іначай мы не зможам наступаць.

Уваходзіць сержант.

Сержант

Дазвольце, пан палкоўнік, далажыць.

Дамброўскі

Што там яшчэ?

Сержант

Арыштаваны Бэсман
На допыт просіцца.

Дамброўскі

То дапытай,
А ці ў тваіх жаўнераў рук няма?!

Сержант выходзіць.

Дамброўскі

Не забывайцеся, што ў іх цяпер
Камандуе Орджанікідзе сам,
І нашым прыяцелям у чырвоных
Не лёгка будзе нам дапамагчы.
А Оршу і Смаленск нам трэба ўзяць,
Пакуль яшчэ трымаецца Дзенікін.

Свідэрскі

Там чалавек прыйшоў з мясцовай рады,
Ён можа быць у гэтым нам карысны.

Дамброўскі

Малая з іх карысць! Паклічце.

Свідэрскі выходзіць і прыводзіць Міколу.

Мікола

Добры вечар.
Мікола Стрыж, настаўнік, прадстаўнік
Тутэйшай беларускай рады.

Дамброўскі

Вельмі рад.
Чым вам магу служыць, пан прадстаўнік?

Мікола

У Мінску, пан палкоўнік, ёсць кантакт
Паміж уладай польскаю і нашай.
Хацелася-б наладзіць гэта й тут.

Дамброўскі

А для чаго?

Мікола

Каб разам кіраваць.

Дамброўскі

Чым кіраваць?

Мікола

Народам, пан палкоўнік.

Дамброўскі

Народ увесь пайшоў к большэвікам,
А з рэштаю мы справімся і самі.

Мікола

Дарэмна адмаўляеце падмогу.

Дамброўскі

А чым вы нам паможаце? Вось гляньце,
Усе запісаны большэвікі?

Мікола

*Прагледзеўшы спісак.*

Па воласці іх набярэцца болей.

Дамброўскі

Назваць іх можаце?

Мікола

Магу назваць.

Дамброўскі

Тады ільга наладзіць і кантакт.
Скажыце, пане Стрыж, Таццяна Марыч
Вядома вам?

Мікола

Таццяна Марыч?.. Так...
Яна папала пад благі ўплыў,
І я хацеў вас сам прасіць аб тым,
Каб дзеўчыне чым-небудзь прыгразіць.

Дамброўскі

Вы штосьці да яе нераўнадушны?

Мікола

У нас свае асобыя разлікі.

Дамброўскі

Ну што-ж, для вас мы зробім ласку, Стрыж:
Вы заўтра нам пакажаце дзяўчыну,
І мы яе пасадзім у турму.

Мікола

Завошта-ж?.. Ах, я разумею... Добра.
Я вельмі й вельмі буду вам удзячны.
Вы толькі дайце мне, палкоўнік, слова,
Што пагрымаеце Таццяну трохі
І аддадзіце мне на парукі яе.

Дамброўскі

Вы забываецеся, пане Стрыж!
Калі Дамброўскі скажа — значыць, свята.

Мікола

Даруйце, пан палкоўнік!

Дамброўскі

Не прыстойна
Не давяраць таму, хто вам даверыў.

Мікола

Я вашае давер'е апраўдаю:
Тацяна Марыч заўтра будзе тут.

Уваходзіць сержант.

Сержант

Дазвольце, пан палкоўнік, далажыць:
Арыштаваны Бэсман пагражае...

Дамброўскі

Ізноў?

Сержант

Ён проста разбівае дзверы.

Дамброўскі

Давай!

Сержант

Я слухаюся, пан палкоўнік. *(Выходзіць.)*

Дамброўскі

Пан капітан, вы правядзіце пана
І там складзіце новы спіс людзей.

Мікола

А як-жа мы дамовімся наконт?..

Дамброўскі

Наконт чаго?

Мікола

Наконт сумеснай працы?

Дамброўскі

А хіба не дамовіліся мы?!
У вас надзвычай важная работа,
Адно старайцеся. Пасля пабачым.
Усё. Бывайце, пане Стрыж.

Мікола

Бывайце.

Свідэрскі і Мікола Стрыж выходзяць; праз другія дзверы прыводзяць Бэсмана; ён адпіхае вартавых і ўрываецца ў пакой.

Бэсман

Злачынцы!

Дамброўскі

Стой! Назад! Застрэлю!

Бэсман

Я — польскі афіцэр. Злачынцы вы!

Дамброўскі

Няма дурных, таварыш камісар.

Бэсман

Найбольшы дурань, пан палкоўнік, вы!
Маё імя — Казімер Завішынскі.

Дамброўскі

Даруйце. Выйдзіце!

Вартавыя выходзяць.

Бэсман

Вады падайце.
З турмы нядаўна перадалі весткі...

Дамброўскі

Хто перадаў? Каму?

Бэсман

Дзяўчыне...

Дамброўскі

Што?
Тацяне Марыч?

Бэсман

Прозвішча не знаю.
Пашліце зараз-жа услед пагоню,
І вы захопіце яе ў мястэчку.

Дамброўскі

Пан капітан!

Уваходзіць Свідэрскі.

Свідэрскі

Я слухаю... Казімер?

Бэсман

Свідэрскі?

Свідэрскі

Друг!

Дамброўскі

Ваш друг?

Бэсман

Пасля, пасля!
Не траціце марна часу на размовы.

Дамброўскі

Пан капітан, мястэчка ачапіць,
Паслаць нарад... А дзе яна жыве?

Свідэрскі

Хто?

Дамброўскі

Марыч.

Свідэрскі

Не магу сказаць, палкоўнік.

Дамброўскі

Вярніце зараз-жа мне гэту птушку...
Стрыжа.

Свідэрскі

Я слухаюся, пан палкоўнік. *(Выходзіць.)*

Дамброўскі

Даруйце, выйшла неяк недарэчна.

Бэсман

У замшавых пальчатках не ваююць.

Уваходзіць Свідэрскі і Стрыж.

Мікола

Вы клікалі, палкоўнік?

Дамброўскі

Пане Стрыж,
Асоба ваша зараз, здэцца, дома.
Вы пакажыце, дзе яна жыве,
І будзе так, як мы і гаварылі.

Мікола

Я вельмі шчыра буду вам удзячны.

Дамброўскі

Спяшайцеся!

Свідэрскі і Мікола выходзяць.

Бэсман
Марудзіце, палкоўнік!

Дамброўскі
Вы, як агонь, гарачы, Завішынскі.

Бэсман
Халодныя сядзяць на печы дома.

Дамброўскі
Ну, мы таксама сёе-тое робім,
Бярэм вось гарадок за гарадком.

Бэсман
Вы думаеце, вы ўзялі Барысаў?!
Барысаў бралі мы і нашы людзі,
Не на пазіцыях, а ў штабах армій,
У габінеце Троцкага. І вы
Ледзь-ледзь не загубілі нашай справы.
Калі брыгадны даў палкам загад
З Бярозы адступіць на бераг Схі —
Наш камісар стаў штосьці сумнявацца
І вырашыў праверыць вашы сілы.
Я, будучы начальнікам разведкі,
Яго праводзіў і прывёў сюды.
Вучыцеся, як трэба ваяваць!
Вы нават нас яшчэ не дапыталі,
А камісар паспеў ужо звязацца
З тутэйшымі людзьмі і перадаць,
Што горад здраднікі здалі без бою,
Што сілы вашыя малыя тут
І што Барысаў можна ўзяць назад.
Вы разумееце цяпер, якія
Панесла весткі гэтая дзяўчына?
Калі іх данясуць Орджанікідзе —
Не бачыць нам ні Оршы, ні Смаленска.
Яператрэсся ўвесь за гэты час,
Я рукі пазбіваў аб вашы дзверы,
Я сцены грызці мог... А вы... А вы...
Як мокрыя анучы, прабачайце.

Уваходзіць Свідэрскі.

Свідэрскі

Нарад пасланы, пан палкоўнік.

Дамброўскі

Дзякуй.

Свідэрскі

Абдымемся, Казімер.

Бэсман

Добры вечар.
Я вельмі рад, што стрэў цябе, Браніслаў.
Дай, дружа мой, пераадзецца мне.
Апрыкрала ўсё гэта барахло.

Свідэрскі

Я прынясу табе сюды, Казімер. *(Выходзіць)*

Бэсман

Далёка да мястэчка?

Дамброўскі

Поўвярсты.

Бэсман

Паслалі конных?

Дамброўскі

Конных, пан паручнік.

Бэсман

Шмат нашых сіл па гэты бок Бярозы?

Дамброўскі

Дзевятага ля Пяліка прайшло
Тры сотні чалавек. За ноч і дзень
Мы перакінулі яшчэ пяцьсот.

Бэсман

І ўсё? Марудзіце вы, пан палкоўнік.

Дамброўскі

Ды зразумейце-ж, што няма мастоў,
Сіл супраціўніка ніхто не знае...

Бэсман

На гэта камісар Азорыч ёсць.

Дамброўскі

Вы думаеце, ён раскажа што?

Бэсман

Я думаю, што ёсць заўсёды сродкі
Прымусіць чалавека гаварыць.

Дамброўскі

На жаль, існуюць звычаі вайны,
Якія берагуць жыццё палонных.

Бэсман

Азорыч быццам-бы адгэтуль родам.
Калі яго дзяўчына апазнае
І дасць пры пэўных сведках паказанні,
Што ён ёй перадаў якіясь весткі,
Мы будзем мець фармальную прычыну
Вініць палоннага у шпіянажы.
А перад карай смерці за шпіёнства,
Я думаю, што загаворыць кожны.

Свідэрскі прыносіць Бэсману польскую афіцэрскую вопратку.

Свідэрскі

Ну, вось уборы, вартыя героя.

Бэсман

Выходзячы пераапрануцца.

Бронь божа-ж дзеўкі гэтай не захопяць,

Барысава не адстаяць, палкоўнік.

Дамброўскі

Я штосьці сумняваюся ў Стрыжы.

Свідэрскі

Калі ён прадстаўнік мясцовай рады,
Дык сумнявацца ў ім няма чаго.

Дамброўскі

А друг ваш маладзец.

Свідэрскі

Не мне раўня?
Я-ж не ваяка, пан палкоўнік, так...

Дамброўскі

Але за тое першы між гуляк?

Свідэрскі

Вы адгадалі, пан палкоўнік...

На дварэ чуваць нейкі гоман.

Дамброўскі

Ціха.

Здаецца на дварэ гамоніць хтосьці.

Бэсман

Выбягаючы з сумежнага пакою; ён ужо ў вопратцы польскага афіцэра.

Дазнайцеся! Бронь божа, упусцілі!..

Уваходзіць сержант.

Сержант

Дазвольце, пан палкоўнік, далажыць:
Дзяўчына, значыць...

Б э с м а н

Дзе?

С е р ж а н т

Дзяўчына?

Б э с м а н

Дзе?

С е р ж а н т

Дзяўчына тут.

Д а м б р о ў с к і

Хвалю!

Б э с м а н

Праверыць трэба:
Яны маглі схапіць любую дзеўку.

Д а м б р о ў с к і

А гэты... праваднік ваш з вамі?

С е р ж а н т

Так.

Д а м б р о ў с к і

Паклічце.

С в і д э р с к і

Пане Стрыж!

Уваходзіць Мікола Стрыж.

Д а м б р о ў с к і

Яна?

М і к о л а

Яна.

Бэсман

Ну, дзякуй богу, тут.

Дамброўскі

Вядзі, сержант!

Бэсман

*Да Міколы Стрыжа.*

А вы сядайце, будзеце за сведку.

Дамброўскі

Прыняць яе, панове, трэба ветла:
Ад іх пагрозаю не возьмеш анічога,
А ласкаю дасягнеш вельмі шмат.

Свідэрскі

А пан палкоўнік ведае дзяўчат.

*У пакой прыводзяць Таццяну.*

Свідэрскі

О, пекная!

Дамброўскі

Сядайце, проша, панна.
Як ваша прозвішча?

Таццяна

Таццяна Марыч.

Дамброўскі

Адкуль?

Таццяна

Тутэйшая.

Дамброўскі

Занятак ваш?

Таццяна

Раней вучылася, цяпер без працы.

Дамброўскі

За што вас затрымалі?

Тацяна

Я не знаю.

Дамброўскі

Сержант, за што вы затрымалі панну?

Сержант

Яе? За гутарку з арыштаваным.

Дамброўскі

Вы чуеце? Ён што, каханак ваш?
Знаёмы? Брат?

Тацяна

Не ведаю, аб кім
Вы мне гаворыце.

Бэсман

Якая святасць!
Палкоўнік пра Азорыча гаворыць.

Тацяна

Азорыч? Так? Такога я не знаю.

Бэсман

Адкуль-жа вам імя яго вядома?

Тацяна

Імя? Я першы раз ад вас пачула.

Бэсман

Ды ён-жа з гэтага мястэчка родам.
Яго пад вартаю вялі,
А вы на вуліцы былі,
І вы яго тады-ж пазналі,
Азорычам яшчэ назвалі.

Тацяна

Вы памыліліся.

Бэсман

Ты хлусіш, дзеўка!

Дамброўскі

Навошта гэты гоман, пан паручнік?
Дзяўчынцы трэба проста растлумачыць:
Калі-б ён быў каханак ваш,
Тады было-б нам зразумела,
Што вы ішлі спаткацца з ім,
І мы маглі-б вам даравАць,
А так — вас трэба затрымаць.
Дык не каханак?

Тацяна

Не.

Дамброўскі

Шкада.
Вы гэткая прыгожая дзяўчына
І марна губіце сваё жыццё.
Даводзіцца замкнуць вас у турму,
А так свабодна вы маглі-б ісці.
Сержант, вазьмі!

Тацяна

Чакайце, дайце слова,
Што вы адпусціце мяне на волю,
І я скажу вам праўду.

Дамброўскі

Слова, панна!

Дамброўскі

Тацяна Марыч, што-ж вы маўчыцё?

Тацяна

Вы здагадаліся: ён мой жаніх.

Бэсман

І ён вам перадаў якіясь весткі?

Тацяна

Няпраўда, вестак ён не перадаў.

Бэсман

А мы вось запытаем у яго.

Дамброўскі

Пан капітан, прывесці камісара.

Свідэрскі выходзіць.

Тацяна

Дазналіся. Дарэмна я сказала.

Дамброўскі

Вы не хвалюйцеся, нічога
Не зробім мы яму благога.
Вы толькі скажаце, што ён — Азорыч.

Тацяна

Я не знаёма з ім.

Бэсман

Як вам не сорам:
Сказаць і адрачыся ўласных слоў!

Тацяна

А як не сорам вам...

Бэсман

Маўчаць! Маўчаць!

Дамброўскі

Ды спакайней-жа, пане Завішынскі.

Мікола

Дарма, няхай, няхай прыгрозяць трохі.

Вартавыя прыводзяць Азорыча.

Дамброўскі

А вось і камісар. Смялей, Азорыч,
Вас хоча бачыць вашая дзяўчына.
Пазнаеце? Жаніх?

Азорыч

Адкуль ёй знаць.
Я першы раз яе цяпер страчаю.

Дамброўскі

Пытаюць не ў цябе. Пазнаеце?
Азорыч гэта, ваш жаніх ці не?

Тацяна

Не ведаю, а мой жаніх другі.

Дамброўскі

Не хочаш гаварыць? Прызнайся лепш!

Азорыч

Я пра сябе усё скажу вам сам.

Дамброўскі

Кажы... Ты не Азорыч? Не?
Не камісар?

Азорыч

Не камісар і не Азорыч.

Дамброўскі

Стрыж,
Азорыч гэта?

Мікола

Так, Азорыч, пане...
Але ён не жаніх, а камісар.
А жаніхом, здаецца, буду я.

Азорыч

І ты тут, шэльма бітая!

Дамброўскі

Ну жто-ж,
Цяпер — Азорыч ты і камісар?

Азорыч

Не камісар, хоць і Азорыч.

Дамброўскі

Божа!
Як можа гаварыць яго язык!
Паручнік, хто ён ёсць такі, скажыце?

Бэсман

Ён камісар чырвонай часці.

Азорыч

Брэшаш!

Бэсман

Ты што, не пазнаеш сапраўды?

Азорыч

Ты?..
Цяпер я пазнаю аблічча гада!

Дамброўскі

О, псякрэў, большэвік! Ты знаеш тое...
Ты ведаеш, што мы цябе павесім?

Азорыч

Ну і здзівілі! Быццам я не ведаў,
Што раз папаўся я сюды да вас,
Дык вы мяне павесіце напэўна.
Скажу па шчырасці: калі-б і вы
Патрапілі, палкоўнік, да мяне,
Я расстраляў-бы вас...

Дамброўскі

Б'е Азорыча па твары.

О, брудны пёс!

Тацяна

Тарас Іванавіч!.. Няшчасны, бедны...

Дамброўскі

Цяпер і ты пазнала. Позна!
Якая ганьба, жах! Дзяўчына
Зракаецца сваіх беларусоў,
Ганебна здраджвае айчыне,
Ідзе за бандай мужыкоў.
Дзе-ж сорам твой і дзе твой гонар?

Тацяна

Мой гонар на маіх руках:
Яны пакрыты мазалямі...
І горка мне цяпер адно,
Што я вось гэтымі рукамі
Бінтоўкі мужна не ўзняла
І супраць вас-жа не пайшла.
У гэтым сорам мой. Даруй,
Даруй, Тарас Іванавіч, за слабасць:
Я ратаваць хацела нашу справу
І выдала цябе.

Азорыч

Не ты, дзяўчынка,
А вось прадажны гад! (*Кідаецца да Бэсмана.*)

Дамбро́ўскі

Сержант, забраць!

Азорыча і Тацяну выводзяць.

А вы, мой пане, падпішыце акт.

Мікола

Я падпішу, але Тацяну Марыч
Вы аддадзіце, спадзяюся, мне?

Дамброўскі

Пасля — вядома... А на нейкі час
Яе цяпер адправіць трэба ў тыл.

Мікола

Я вельмі дзякую. *(Падпісвае акт.)*

Дамброўскі

Бывайце, Стрыж.

Мікола

Бывайце, пан палкоўнік, вельмі дзякуй.

Мікола Стрыж выходзіць.

Дамброўскі

Пан капітан, цяпер у камісара
З-пад языка дастаньце ўсё, што трэба.
А Марыч заўтра раніцой у тыл,
Хай у Стрыжа не будзе на вачах.
Як вы мяркуеце?

Бэсман

Рабіце так,
Каб весткі аб Барысаве навек
Памерлі тут.

Дамброўскі

Ды гэта зразумела.
Цяпер прашу, паручнік, да мяне.

Бэсман

Дзенькуе, пан палкоўнік, не магу:
Мяне, на жаль, чакаюць у чырвоных,
А служба — перш за ўсё.

Свідэрскі

Калі ты рушыш?

Бэсман

Вось адпачну гадзінку і ў дарогу.

Дамброўскі

Ну што-ж, няхай вам дапаможа бог!

---

## АКТ ДРУГІ

### МАЛЮНАК ЧАЦВЕРТЫ.

Туманная верасьнёўская раніца. На ўзлессі па-асенняму шумяць хвоі. Каля іх прытаіўся партызанскі дазор: пад кашлатай сасной Сімха Штэйнер, а высока на дрэве — Зяма. Углыбіні — нізіна, парослая балотным хмызняком. Там размясціўся атрад абароны, і адтуль час-ад-часу даносіцца ціхая песня:

Пад цёмным ляском
Бяроза з лістком
Усё лета шумела:
— Ты, мой лісточак,
Ты, мой зялёны,
Ты мяне кідаць будзеш.
Ветры павеюць,
Цябе абвеюць,
Я адна застануся.
— Мая бярозка,
Мая белая,
Я-ж цябе не забуду,
На вясну к табе буду
І шумець з табой буду.

А ў цёмным ляску
Дзяўчына дружку
У слязах гаварыла:
— Ты, мой малойчык,
Ты, мой саколік,
Ты мяне кідаць будзеш.
Трубы зайграюць,
У бой паклічуць,

Я адна застануся.
— Мая дзяўчынка,
Мая каханка,
Я-ж цябе не забуду,
Па вайне к табе буду
І гуляць з табой буду.

Сімха

Ты маеш вочы лепшыя, сынок,
Прыгледзься добра: там ніхто не ходзіць?
Ну, не відаць нікога?

Зяма

Не відаць.

Сімха

Каб там не сталася якой бяды:
Ужо мінула досыць многа часу,
Данілу з хлопцамі пара-б вярнуцца.
Як думаеш, удасца ім сягоння
З няволі панскай вызваліць Тацяну.

Зяма

Яны-ж з вінтоўкамі, дык дзіва што!..

Сімха

А ці на верны мы напалі след:
Сюдою павязуць яе ці не?
Ты раскажы яшчэ раз мне аб тым,
Як ты дазнаўся.

Зяма

Я-ж казаў. Учора
Вялі палякі двух арыштаваных...

Сімха

Я гэта ведаю, ты раскажы,
Што гаварыў людзям Мікола Стрыж.

З я м а

Ён выхваляўся, быццам-бы Таццяну
Узяў напарукі, і сёння рана
Яе адправяць недзе ў тыл, у штаб.

С і м х а

Відаць, у штаб дывізіі. Тады
Яны паедуць толькі гэтым шляхам,
І нашы могуць вызваліць Таццяну.
А весткі, мусіць, важныя былі.

З я м а

Напэўна важныя, калі за Таняй
Па ўсіх дарогах выслалі ганцоў,
Мястэчка ачапілі ланцугом
Іператрэслі кожны двор і хату.

Уваходзіць Адась Валошын.

В а л о ш ы н

Ну што, Данілы не відаць з хлапцамі?

С і м х а

Не, не відаць.

В а л о ш ы н

Няшчасная дзяўчына!

С і м х а

Ты не гаруй, таварыш камандзір,
Таццяну вызваляць.

В а л о ш ы н

Ты верыш, Сімха?
Я веру, брат, і сам. А ўсё-ж часамі
Туга на часткі разрывае сэрца.
Я так любіў яе і так нядбайна
Рызыкаваў яе жыццём і маладосцю.

Дзесьці далёка чуваць глухія стрэлы.

Зяма

Вы чуеце, страляюць!

Валошын

Мусіць, нашы...

Сімха

Пайшлі ім, доля, добрую удачу.

Крадучыся ідзе Шчырэц і яшчэ некалькі партызан.

Валошын

А вы куды?

Шчырэц

Куды? Дахаты.

Валошын

Стой!
Спужаўся, баязлівая душа?
Уласную сваю ратуеш скуру,
Калі нам трэба ратаваць другіх?

Шчырэц

А для чаго нам лезці на пагібель?
Ты ведаеш, пашто ішла Тацяна:
Каб весткі важныя прынесці нам
Ці каб пабачыцца з сваім каханкам?

Валошын

З каханкам, ты сказаў?!.. Васіль Шчырэц!
Я куляю заткну тваё старое горла!

Шчырэц

Не пойдзем мы на верную пагібель,
Каб ратаваць для некага дзяўчат.
Нам трэба ратаваць саміх сябе.

Валошын

А як-жа, як ты будзеш ратавацца?

Пакуль не маем мы ніякіх вестак,
Дзе нашы часці, дзе свабодны шлях, —
Не рушым мы адгэтуль ні на крок.
І мы павінны вызваліць Тацяну.

Шчырэц

А нашы дзеці, хаты і палеткі?
Ты — гарадскі, табе бяда малая:
Тваіх палёў жаўнеры не патопчуць,
Дзяцей не скрыўдзяць, хаты не запаляць...
Хто-ж абароніць нас і нашы сем'і?

Партызан

Ён праўду кажа: трэба ратавацца.

Валошын

Вар'яты вы! Малыя дзеці! Смешна:
Як будзеце вы ратаваць сям'ю,
Калі сям'я твая даўно ў турме?
Як будзеце вы ратаваць сябе,
Калі адгэтуль вам дарог няма?

Шчырэц

Нячыстая мяне звязала з вамі.

Зяма

Ой, там ідуць.

Валошын

Ідуць? Чужыя? Нашы?

Сімха

Даніла Карабан, Даніла... Нашы!

Валошын

Тацяна з імі, там?

Зяма

Тацяна? Там!

Валошын

Якія-ж весткі ў іх. Пайду насустрач.

Выходзіць. Зяма злазіць з дрэва.

Шчырэц

Пры нас і сустракацца не жадае.

Сімха

А ты, Васіль Шчырэц, ізноў сваё.
А бачыш, як ты горка памыліўся?

Шчырэц

Ды чорт яго тут разбярэцца з вамі!

Уваходзіць Даніла Карабан, за ім група партызан, Тацяна і Валошын.

Карабан

Здарова, малайцы!

Шчырэц

Здароў! А дзе-ж Тацяна?

Карабан

А мы яе пад варту ўзялі,
Каб з панамі не гуляла,
Нашых душ не засмучала.

Сімха

Тацяначка, хадзі пад мой нагляд,
І не падступіцца ніякі гад.

Валошын

Яна змарылася.

Карабан

Пусціце сесці.

Сімха

А можа, Таня, хочаш есці?
Я тут за кухара слыву
І крупнік, брат, такі звару,
Што пан палкоўнік будзе есці...

Карабан

Калі над ім з вінтоўкай сесці.

Тацяна

Сябры мае, нічога мне не трэба,
Я не стамілася, я проста — рада,
Расчулена увагай вашай, ласкай...
Ды горка мне, што зараз недзе там
Азорыча караюць, б'юць і мучаць.
Таварышы, ратуйце вы яго
Усімі сіламі, якія ёсць.

Валошын

Пагібельная справа: мы не можам
Ахвяраваць усім за аднаго.

Тацяна

Бесчалавечны ты!

Валошын

Не я, а ты:
Я бараню жыццё людзей і справу,
А ты свайго...

Тацяна

Каго? Валошын,
Відаць ты мала ведаеш мяне
І забываешся, што нам Азорыч
Дастаў каштоўныя надзвычай весткі,
А мы яго кідаем на пакуты.

Валошын

Навошта кроіш ты маю душу?
Ты ведаеш, я сам яго люблю,

Аднак ніякага не маю права
Рызыкаваць. Асудзіць і Азорыч,
Калі яго наказаў не даставім.
Сябры, Таццяна атрымала весткі,
Што горад здраднікі здалі без бою.
На шчасце, у паноў не многа сіл.
Калі-б цяпер па іх ударыць дружна,
Напэўна, што Барысаў быў-бы наш.
Вось гэта трэба перадаць у штаб,
А лепш за ўсё — Серго Орджанікідзе.
Што-ж нам рабіць?

Карабан

Прабіцца цераз фронт!
Ударыць і прарвацца!

Валошын

Рызыкоўна.
Загінем самі і загубім справу.
Я думаю, што лепш паслаць людзей тайком.
Так... Чалавекі два, а, можа, тры.
Адзін загіне — данясе другі,
Другі загіне — трэці дабярэцца.
Для гэтай труднай і пачэснай справы
Мне трэба двух адважных чалавек.

Таццяна

Я панясу сама.

Карабан

І я не зломак.

Сімха

Няхай Валошын выбірае сам.

Валошын

Даніла двое сутак на нагах.
Ён застанецца тут за камандзіра.
А пойдзе... Штэйнар і... Таццяна Марыч.

Збірайцеся, мы зараз-жа і рушым.
Даніла, падрыхтуй Тацяне зброю.

Усе, апрача Валошына і Тацяны, выходзяць.

А ў чым ты пойдзеш? Ты-ж уся азябла.
Бяры піджак.

Тацяна

А як-жа ты, Адась?
Ты-ж можаш прастудзіцца праз мяне.

Валошын

Бяры, бяры. Я праз цябе, на жаль,
Заўсёды гарачуся, а не стыну.
Даруй, Тацяна, мне.

Тацяна

За што?..

Валошын

Скажы,
Ён вельмі мучыцца?

Тацяна

Азорыч? Вельмі,
Хоць і стараецца не паказаць.

Валошын

Я страціў шмат сяброў, але ніколі
Мне гэтак цяжка не было, Тацяна.
Азорыч — мой старэйшы друг. Калісьці
Ён першы вочы мне раскрыў на праўду,
Навучыў змагацца з крыўдай і няволяй.
Успамінаецца, як у вайну
Мы з ім ляжалі разам у акопах,
Чыталі ўпотай розныя лістоўкі
І марылі аб новых, лепшых днях.
І вось... разбіты нашы мары. Цяжка!

Тацяна

Ты не сумуй, Адась. А можа быць,
Што нашы часці скора падаспеюць
І выратуюць.

Валошын

Будзем спадзявацца,
Калі ён выжыве да тых часоў.

Уваходзіць Даніла Карабан.

Карабан

А вось і я. Аб кім ідзе размова?

Валошын

Ну, я пайду збірацца, будзьце тут.

Выходзіць. Тацяна сядзіць задуменная.

Тацяна

Які ён слаўны!

Карабан

Хто?

Тацяна

Адась.

Карабан

Валошын?
Звычайны чалавек, такі, як я.

Тацяна

Гарачы толькі.

Карабан

Ён? Як рыба, што ты!
Вось я — гарачы, гэта праўда. Знаеш,
Калі-б мяне любілі, як яго,
Я не піджак, кашулю зняў-бы з плеч,
І то не замёрз-бы. Гэта, значыць, сэрца!

Тацяна

Я не пра тое гавару, Даніла,
Я гавару, што ён залішне строгі.

Карабан

І асабліва, мусіць, да цябе.
Таму, відаць, баішся ты сказаць,
Як ты яго кахаеш.

Тацяна

Карабан,
Навошта ты жартуеш так няўдала?

Карабан

Даруй, даруй, Тацяна, мір. Давай,
Узброю я цябе, нібы антанту.
Страляць умееш? Вось табе наган,
А вось патроны. Захавай іх добра.

Уваходзіць Валошын і партызаны.

Валошын

Гатовы?

Тацяна

Я гатова.

Валошын

Сімха Штэйнар?

Штэйнар

Уваходзячы з некалькімі партызанамі.

Тут, камандзір.

Валошын

Пайшлі, таварышы,
Пайшлі. Да скорага спаткання, хлопцы.
Жывіце дружна, слухайце Данілу,
Трымайце сувязь цесную з мястэчкам,
Сачыце за Азорычам. А мы...

Мы пастараемся зрабіць усё,
Каб падаспець яму і вам на помач.

Галасы

Шчасліва вам! Да скорага спаткання!

Валошын, Тацяна і Штэйнар выходзяць.

**МАЛЮНАК ПЯТЫ**

Станцыя Прыяміна. Штаб чырвонаармейскай часці. Два вакзальныя пакоі: пасажырская зала і пакой дзяжурнага. У пакоі дзяжурнага тэлеграф і тэлефон, а ў зале стаіць стол, завалены паперамі, на сцяне вісіць карта і розныя плакаты. У штабе Баяновіч і Казімер Бэсман.

Баяновіч

Пакіньце жартаваць!

Бэсман

Я не жартую.

Баяновіч

Вы самі бачылі?

Бэсман

Я сам не бачыў,
Але мне перадалі нашы людзі:
Тарас Азорыч перайшоў к палякам.

Баяновіч

Якая здрада!.. Не магу паверыць.

Бэсман

Паверыць цяжка. Сам-бы не паверыў.
Ды мне назвалі вельмі падрабязна
І час і месца, дзе ён перайшоў,
І тут ужо сумненняў быць не можа.

Баяновіч

Падлец! Нанесці гэтакі удар!
Вы разумееце, таварыш Бэсман,

Былы камбрыг і камандзір палка
За здачу горада пайшлі пад суд.
Я — новы чалавек, кругом разлад,
Байцы стаміліся, рэзерваў мала,
Дзе супраціўнік наш — ніхто не знае...
У нас была надзея, што Азорыч
Дастане весткі, выручыць з бяды...
Зарэзаў ён мяне!

Бэсман

А вы пры чым?

Баяновіч

Ды мне-ж загад узяць назад Барысаў.

Бэсман

Узяць Барысаў? Я не разумею:
Ці я вар'ят, ці ў штабе звар'яцелі.
Каля Барысава стаіць брыгада,
Палякі абышлі наш правы фланг,
У тыле з бандай ходзіць Семянюк,
І думаць аб Барысаве — вар'яцтва.

Баяновіч

А што-ж мне выбіраць — ісці пад суд?

Бэсман

А вы ім давядзіце, што загад
Аб наступленні зараз на Барысаў —
Фантазія штабных. Каб наступаць,
На падрыхтоўку трэба тыдні два.
Я гавару вам на падставе вестак,
Якія сам сабраў.

Баяновіч

Вы — маладзец!

*Уваходзіць Мелех.*

Мелех

Таварыш камандзір, у трэцім батальёне
Пяць чалавек не выйшла на паверку.

Баяновіч

У дэзертырах?

Мелех

Не, на месцы ўсе.

Баяновіч

Хто батальённы камандзір?

Мелех

Дамейка.

Баяновіч

Пяць чалавек арыштаваць. Дамейку...
Вы, здэцца, добра знаеце Дамейку?

Бэсман

Былі у школе прапаршчыкаў разам.

Баяновіч

Што ён за чалавек?

Бэсман

Ну, як сказаць...
Ён чалавек не падазроны.

Баяновіч

Мелех,
Паведаміце, што я там буду сам.

Мелех

Я слухаю. *(Выходзіць.)*

Бэсман

Мне можна ў часць ісці?

Баяновіч

Пакіньце зводку вашых вестак мне
І можаце ісці. Ну, я паехаў. *(Выходзіць.)*

Бэсман

Дамейка маладзец, не спіць у шапку.
А весткі я вам дам. *(Піша).* Нічыпар Мелех!

Уваходзіць Нічыпар Мелех.

Мелех

Я слухаю.

Бэсман

Перадасі камбрыгу.

Кладзе напісаную ім зводку на стол.

А ты усё, гаротнік, служыш? А?

Мелех

Служу.

Бэсман

Эх, шкода мне цябе, службіст!
Стары салдат, у доме жонка, дзеці,
А бачыць іх не давядзецца, мусіць,
Ты чуеш, а?

Мелех

Я слухаю цябе.

Бэсман

Нам вельмі крута, брат. Азорыч збег,
А мы, дурныя, будзем ваяваць,
Пакуль і не пагінем. Ну, бывай! *(Выходзіць.)*

Мелех

Вось і мяркуй, як хочаш тут, Алёшка!

Уваходзіць Алёшка Семізвон.

Семізвон

Ну што?

Мелех

Хадзі сюды. Ты чуў ці не?

Семізвон

А што?

Мелех

Азорыч, кажуць, недзе збег.

Семізвон

Давай дамоў, Нічыпар?

Мелех

Не магу,
Я шосты год ваюю, і нязручна
Пабітаму варочацца дамоў.

Алёшка

Яно, канечна, трэба ваяваць...
Гавораць, сам Орджанікідзе тут.

Мелех

Каб ён прыехаў, ён-бы разабраўся!
Пабудзь, а я пайду вазьму вячэру.

Бярэ кацялок і выходзіць.

Алёшка

Эх чорт, благія справы, Аляксей!
Ісці дахаты нейк не выпадае,
А заставацца тут таксама страшна...

Уваходзіць Серго Орджанікідзе. Ён у армейскім шынялі і шлёме.

Серго

Дзень добры, друг!

Алёшка

Дзень добры і табе!

Серго

Ну, як ваюецца?

Алёшка

А паспрабуй,
Пазнаеш сам.

Серго

Я спрабаваў.

Алёшка

І што-ж?

Серго

Нішто, дармо, калі умела біцца.

Алёшка

За пяць гадоў навучыліся.

Серго

Не вельмі!
Барысава, нябось, не адстаялі?

Алёшка

Папробуй адстаяць, калі іх процьма.

Серго

Каго?

Алёшка

Паноў.

Серго

А колькі іх? Дакладна?

Алёшка

А чорт іх ведае!

Серго

А дзе стаяць?

Алёшка

Да Нічыпара Мелеха, які пры гэтым зайшоў у пакой з кацялком у руках.

Глянь, прычапіўся чалавек! Стаяць...
Калі-б мы ведалі!..

Серго

А што-ж разведка?
Хадзілі вы да іх?

Алёшка

Схадзі, брат, сам,
Калі ты гэтакі храбрэц.

Серго

А ты?
Баішся? А?

Алёшка

Баюся.

Серго

Да Нічыпара Мелеха.

Ну, а ты?
Няўжо-ж у вас сярод усіх людзей
Ніводнага адважнага няма?

Мелех

А ты чаго выпытываеш тут?
Ты хто такі? Падай дакумант мне.

Серго

Я з штаба арміі, Орджанікідзе.

Алёшка

Орджанікідзе? Сам Орджанікідзе?
Не можа быць! Чытай, Нічыпар. Ну?

Мелех

*Прачытаўшы пасведчанне.*

Паперы быццам-бы ў парадку ўсе.

Алёшка

Уліп.

Серго

А ты, скажы мне, хто такі?

Мелех

А я, таварыш камісар, дзяжурны...
Па сувязі... Нічыпар Мелех.

Серго

Добра.

Мелех

Нядобра нейк я вас прыняў, таварыш...

Серго

Нічога, дарагі, нічога, добра.
А ты... як зваць?

Алёшка

Алёшка Семізвон.

Серго

А ты, Алёшка Семізвон, глядзі,
Не гавары, не ведаючы з кім.

Алёшка

Ёсць, камісар.

Серго

Пакліч камбрыга.

Алёшка

Ёсць!

Алёшка Семізвон выбягае.

Сядай, таварыш Мелех, закусі.

Мелех

А можа... вы?

Серго

А хопіць нам на двух?

Мелех

Павінна.

Серго

Што-ж, дай лыжку, паспрабую. У арміі даўно?

Мелех

Пяць год ужо.

Серго

Абрыдала?

Мелех

Абрыдала нашчэнт.

Серго

Дадому хочацца?

Мелех

Не гавары.

Серго

А дома як, жывуць нішто?

Мелех

Нішто...
Ды крыўдзяць іх, зямлі не хочуць даць

Серго

Ты камандзіру гаварыў?

Мелех

Казаў...
Малы ім клопат.

Серго

Дай твой адрас,
Папробую табе дапамагчы.

Мелех

Сяло Высокае, Тверской губерні.

Серго

Так, вельмі добра. А скажы мне, Мелех,
Чаму парадку тут у вас няма?

Мелех

Змарыліся.

Серго

Не тое, хтосьці шкодзіць...

Мелех

І кожны шкуру беражэ сваю.

Серго

Вось, вось! Такіх няшчадна трэба біць!

Мелех

Ды людзі-ж гэта, камісар! Дармо,
Што ўсе яны з звярынаю душой,

А глянеш, як яны дубеюць, мокнуць,
І шкода неяк стане. Як-жа біць?

Серго

А немцаў біў? Белапалякаў б'еш?

Мелех

Там — ворагі...

Серго

А тут? А гэта? Той,
Хто разлагае арімю знутры,
Той самы подлы, самы страшны вораг.

Уваходзіць камбрыг Баяновіч.

Баяновіч

З'явіўся згодна вашаму загаду.

Серго

Вы камандзір брыгады Баяновіч?
Вы можаце ісці, таварыш Мелех.

Нічыпар Мелех выходзіць.

Сядайце. Я даволі пахадзіў,
Пагаварыў з байцамі вашай часці
І не магу павіншаваць вас з тым,
Што я застаў. Няма парадку ў вас.

Баяновіч

Таварыш...

Серго

Пачакайце! Часць старая,
Народ абучаны, страляць умее,
А поспехаў у вас чамусь няма.
У чым-жа справа тут? Дзе корань зла?
Хто вінаваты? Мы — і ты і я.
Так, дарагі таварыш, толькі мы.
Не ўмееце камандаваць як след.

Баяновіч

Я два гады камандаваў палком.

Серго

Я сам з вусамі? Вусы, сапраўды,
Вялікія ў цябе, а дысцыпліны —
Усё-ж няма. Вось і хадзі з вусамі.

Баяновіч

Вы крыўдзіце, таварыш камісар.

Серго

Крыўдуйце, не крыўдуйце — ваша справа,
Усё, што бачыў я, не дысцыпліна.

Баяновіч

На жаль, адзін у полі не ваяка.

Серго

Чаму адзін?

Баяновіч

Таму, што камісар
Наважыў сам чамусь ісці ў разведку
І перайшоў к палякам.

Серго

Хто? Азорыч?
Як вам не сорам паўтараць паклёп?!

Баяновіч

Здаецца, гэта не паклёп, а праўда:
Азорыча няма чацверты дзень.
Начальнік нашай коннае разведкі
Паведаміў сягоння, што яму
Сказалі, быццам-бы Азорыч там.

Серго

Азорыча я знаю асабіста:
Калі ён там, дык не па ўласнай волі, —
Напэўна здарылася з ім няшчасце.
Тым больш вы абавязаны былі
Рассеяць паніку, зрабіць парадак
І згуртаваць увесь народ.

Баяновіч

Народ
Не пра вайну гамоніць, а пра дом.

Серго

Мой дарагі, а вы пра іхні дом
Хоць трохі думаеце? Вам вядома,
Ці далі сем'ям іх зямлю, ці не?

Баяновіч

Не наша гэта справа.

Серго

Наша справа!
Аб дзецях і бацьках тваіх байцоў
Павінен першы клапаціцца ты.

Баяновіч

За няньку быць і ваяваць — не ўмею.

Серго

Я гэтага ад вас не патрабую!
Але вам трэба ведаць, што байцы
Пакінулі бацькоў, дзяцей і жонак
І думаюць: а як яны жывуць?
Ці ёсць у іх там хлеб? карова? хата?
І ты павінен ім дапамагаць
У іхніх клопатах. Павінен ведаць,
Чым ты камандуеш, таварыш мой.
Так, дарагі.

Баяновіч

Я толькі трэці дзень
Камандую брыгадай.

Серго

Часу досыць,
Каб выканаць загад і ўзяць Барысаў.
Вы разумееце, мяне таксама
За гэта па галоўцы не пагладзяць,
І вашаму пакорнаму слузе
Даць справаздачу прыдзецца ЦК.
Сягоння я пытанне стаўлю рубам:
Праз колькі дзён вы займеце Барысаў?

Баяновіч

На гэта мне спатрэбіцца два тыдні.

Серго

Барысаў будзе наш праз дні... чатыры.
Я цвёрда ведаю. Не знаю толькі,
Вы будзеце камбрыгам там ці не.
Тут ваша справа, выбірайце самі.

Баяновіч

Праз дні чатыры нельга аніяк.
Праз тыдзень — можа...

Серго

А праз трое сутак?
Які на гэта будзе ваш адказ?

Баяновіч

Я пастараюся...

Серго

Тады запішам:
Барысаў зоймем цераз двое сутак,
Чаго-ж вы маўчыце? Не зоймем, а?

Баяновіч

Не ведаю.

Серго

Патрэбна толькі верыць,
І перамога будзе наша, друг.
Якая вам патрэбна дапамога?

Баяновіч

Людзей няма, асноўнае — людзей.

Серго

Людзей я абяцаць вам не магу.
Што вам яшчэ?

Баяновіч

З харчамі, з хлебам дрэнна.

Серго

Я знаю, хлеб даставяць. Што яшчэ?

Баяновіч

Абутку малавата.

Серго

Колькі трэба?

Баяновіч

Ну, хоць для самых босых — трыста пар.

Серго

Не будзе многа?

Баяновіч

Гэта сама меней.

Серго

Я дам усё, але глядзіце мне,
Каб цераз двое сутак быў Барысаў.
З пазіцыі якія весткі ёсць?

Баяновіч

Вось самыя апошнія навіны.

Падае зводкі, Серго чытае.

Серго

Дзе-ж супрацІўнік ваш? То ён вось тут,
То ён вось там. Нядобра! Што? Мана!
Там столькі сіл не можа быць.
Туды пасланы быў бронецягнік,
Бронецягнік дайшоў да вёскі Стайкі
І супрацІўніка нідзе не стрэў.
Разведка хлусіць! Хто прыносіў весткі?

Баяновіч

Начальнік коннае разведкі Бэсман...

Серго

Той самы, значыць, што даставіў чуткі
І пра Азорыча?

Баяновіч

Той самы, так.

Серго

Відаць, ён толькі чуткамі й жыве.
А гэта?

Баяновіч

Макарэнка.

Серго

Макарэнка?
Што затрымаў адзін узвод паноў?

Баяновіч

Ён сам.

Серго

Ану, паклічце!

Баяновіч

Зараз. *(Выходзіць)*.

Серго

Мелех!

Уваходзіць Нічыпар Мелех.

Мелех

Я слухаю.

Серго

Звяжыся, друг, са штабам
І пазаві начальніка снабжэння.

Мелех

Я слухаю. *(Выходзіць.)*

Серго

Няўжо за гэты час
Палякі столькі сіл маглі сабраць?
Не можа быць.

Мелех

Таварыш камісар,
Начальнік ёсць.

Серго ідзе да тэлефона.

Серго

Начальнік па снабжэнню?
Дзень добры! Што? Орджанікідзе, так.
Вы чым займаецеся? Вам вядома,
Што людзі тут сядзяць зусім без хлеба?!
Няма чаго? Вагоны скора будуць:
Я сёння з Оршы выслаў тры пляцоўкі.
Паклапаціцеся адправіць так,
Каб раніцой былі прадукты тут.
Пад вашую адказнасць. Па-другое,

Прышліце мне абутку трыста пар.
Няма? А ў Віцебску? Вось гэта блага.
Ну што-ж, нічога не папішаш. Так,
Усё. Бывайце. Блага! Як-жа быць?
Дзе нам дастаць абутку, Мелех, а?

Мелех

Я слухаю.

Серго

А ты мне лепш скажы.

Мелех

Не ведаю.

Серго

І я таксама, друг.

*Задумаўся. Уваходзіць Баяновіч.*

Серго

Чакай, знайшлі! Таварыш Баяновіч,
А што ў кавалерыйскай, ёсць абутак?

Баяновіч

Напэўна, ёсць.

Серго

Пазычце.

Баяновіч

Не дадуць.

Серго

Чаму? Што за мясцовыя настроі!

Баяновіч

А хто-ж ім будзе аддаваць?

Серго

Я сам.
Аддам вось гэтыя свае лакіркі.
Чаго ўсміхаешся, таварыш Мелех?

Мелех

Няважныя лакіркі, камісар.
Не возьмуць іх.

Серго

Нічога, возьмуць, Мелех.

Мелех

Вы падашліце іх увечар нам,
Дык нашы хлопцы тут паставяць латку.

Серго

А гэта ўжо хіба пасля вайны.

Мелех

Як знаеце, таварыш камісар.

Выходзіць. Серго штосьці піша.

Серго

Таварыш Баяновіч, вось запіска,
Пашліце з ёю зараз чалавека,
І ён даставіць вам абутак.

Баяновіч

Добра.

Серго

Вы па людзей паслалі?

Баяновіч

Бэсман тут.

Серго

Гукніце, хай заходзіць.

Баяновіч

Зараз клікну.

Выходзіць. Серго разглядае карту.

Серго

Няважныя, зусім благія справы.
Без вестак палкаводзец не ваяка.
І як магло зрабіцца, што Азорыч
Так па-дзівацку трапіў да паноў?

Уваходзіць Бэсман. Ён пільна прыглядаецца да Орджанікідзе. Серго заўважае яго толькі праз нейкі час.

Серго

Ты хто такі?

Бэсман

Казімер Бэсман.

Серго

Чын?

Бэсман

Начальнік коннае разведкі.

Серго

Ты!..
Ты як стаіш?! Ты перад кім стаіш?!
Расхлістаны, абвіслы... Камандзір!
Папраўць рэмень, зашпіліцца. Так.
Сядайце, Бэсман, раскажыце мне,
Адкуль дасталі вы такія весткі?

Бэсман

Я сам хадзіў за фронт.

Серго

І асабіста
Сабралі весткі там?

Бэсман

Канечна, так.

Серго

Дык пад Барысавам стаіць брыгада?
Вы самі бачылі?

Бэсман

Так, бачыў сам.

Серго

Не разумею. А скажыце мне,
Масты наведзены?

Бэсман

Паромы ходзяць.

Серго

А як на правым флангу, многа сіл?

Бэсман

Дакладна не магу сказаць, але...
Наш правы фланг глыбока абышлі:
У Хохлаве, у Рудні — скрозь палякі.

Серго

А пад Барысавам?

Бэсман

Я ўжо сказаў,
Што пад Барысавам стаіць брыгада.

Серго

А наш бронецягнік дайшоў да Стаек
І супрацiўніка нідзе не стрэў.

Бэсман

Не ведаю.

Серго

Відаць, што пан схаваўся.
Вы што-ж такі пануры, невясёлы?

Бэсман

У нас вясёлага не вельмі шмат.

Серго

Пачуцце гумару прыносіць сілу.
Нічога больш не скажаце, начальнік?

Бэсман

Я расказаў усё.

Серго

А што Азорыч?

Бэсман

Я думаў, гэта вам ужо вядома.

Серго

Мне хочацца пачуць ад вас саміх.

Бэсман

Я новага нічога не дадам,
Бо мы з ім развіталіся ля Стаек:
Я ўзяў кірунак проста ўздоўж чыгункі,
А камісар пайшоў на Слабаду.
Крыху пазней, у Рудні, я дачуўся,
Нібы Азорыч перайшоў к палякам.

Серго

Ён быў адзін?

Бэсман

Здаецца... Не! Чакайце...
За ім пайшоў яшчэ адзін баец.

Серго

І гэта ўсё?

Бэсман

Усё.

Серго

Ну, што-ж, ідзіце.

Бэсман выходзіць; у дзвярах ён сутыкаецца з Баяновічам.

Бэсман

Што за камедыя?

Баяновіч

Якая? Дзе?

Бэсман

Здаецца, мне не хочуць давяраць?

Ён крута павярнуўся і выйшаў.

Серго

Таварыш Баяновіч...

Баяновіч

Я.

Серго

Скажы,
Хто гэты Бэсман?

Баяновіч

Быўшы афіцэр.
У нас ён, здэцца, больш ужо за год.

Серго

Ён рэдка усміхаецца.

Баяновіч

Не, ён вясёлы,
З байцамі ён жартуе вельмі часта.

Серго

А Макарэнка ёсць?

Баяновіч

Прыйшоў.

Серго

Пакліч.

Баяновіч выходзіць; з-за сцэны чуваць яго голас.

Баяновіч

Таварыш Макарэнка, к камісару!

Уваходзіць малады баец Макарэнка.

Макарэнка

Дазволіце зайсці?

Серго

Давай, давай.

Макарэнка

Баец дзевятай роты Макарэнка.

Серго

Прыемна. Рад. Сядай. Глядзі які!
А мне здавалася, што ты асілак.

Макарэнка

Я й не слабы, таварыш камісар,
Хаця звычайны, гэтакі-ж, як быў...
І вы такі-ж, як і раней былі.

Серго

А дзе мы сустракаліся з табой?

Макарэнка

У восемнаццатым... На Украіне...
Не помніце? Зімой, як немцаў білі?

Серго

Успамінаю, верна... Памужнеў!
А я намнога пастарэў?

Макарэнка

Ані.

Серго

Ну, гавары. Глядзі, маршчыны скрозь.

Макарэнка

Жыццё заўсёды пакідае след.

Серго

Філосаф.

Макарэнка

Што-ж, даводзіцца часамі думаць,
Без гэтага жывым маркотна жыць.

Серго

Вось гэта ісціна. А раскажы,
Як ты адзін супроць палякаў біўся.

Макарэнка

Даруйце мне, таварыш камісар.
Ну, праўда, быў загад нам адступіць.
А глянуў я кругом — прыгожы край,
Зялёны, залацісты, поўны песень...
І вось яго патопчуць капытамі,
Заль'юць крывёй людскою і слязьмі.
І зашчымела сэрца моцна, моцна.
Забыўся на загад, на ўсё на свеце,
За кулямётам лёг і гавару:

Нічога не ўступлю панам —
Ні лесу цёмнага, ні жоўтых стэпаў,
Ні ясных зор, ні спелых вішань,
Ні песень нашых, сумных і вясёлых.

Усё — маё, усё — народнае і наша!
Канечна, быў загад нам адступіць...
Не падчыніўся... сэрца падвяло.

Серго

Геройства паказнога нам не трэба,
А ненавісць да ворагаў сваіх,
Сваю святую любасць да краіны —
У благародным сэрцы беражы.

Паклікаў я цябе не для вымовы.
Ты раскажы, адкуль табе вядома,
Што пад Барысавам не многа сіл?

Макарэнка

Я быў сягоння ноччу у разведцы.

Серго

І сам праверыў?

Макарэнка

Мне казалі людзі.

Серго

Надзейныя?

Макарэнка

Сяляне, нашы людзі.

Серго

А Бэсман тут нядаўна гаварыў,
Што пад Барысавам стаіць брыгада,
І ў Хохлаве, у Рудні — скрозь палякі.

Макарэнка

Вось гэта ўжо хлусня! Сягоння ўночы
Я сам хадзіў у Хохлава, і там —
Ніводнага паляка. Сам я бачыў.

Серго

І ён гаворыць, сам. Дык як-жа так?

Макарэнка

За Хохлава ручаюся жыццём:
Ніводнага паляка там няма.

Серго

А пра Азорыча не чуў нічога?

Макарэнка

Нічога.

Серго

Штосьці дзіўна... Вельмі дзіўна!
Вось што яшчэ, таварыш Макарэнка:
Мне трэба некалькі адборных малайцоў,
Адважных і напорыстых, як ты.

Макарэнка

Такіх, як я, у нас не вельмі многа,
А лепшых я магу знайсці вам безліч.

Серго

Цудоўна, друг. Народ надзейны, пэўны?

Макарэнка

За іх ручаюся, як за сябе.

Серго

У дзевяць вечара будзь з імі тут.
Прыходзьце ўзброеныя, як да бою.
Усё.

Макарэнка

Дазволіцеісці?

Серго

Бывай!

Макарэнка выходзіць. За акном на пероне чуваць песня «Над Бярозай-ракой». Серго падыходзіць да акна, задуменна напяваючы:

«Над Бярозай-ракой, над далінаю
Заігралі гарністы паход.
Узнімайся сям'я сакаліная,
Уставай на змаганне, народ!»

А песня верная. З такою песняй
Чырвоныя палкі падымуць сцяг,
Згуртаваныя рушацца на бой,
Я сам ім пакажу надзейны шлях,
І горад наш, клянуся галавой,
Барысаў будзе наш! Што там за шум?

З перона даносяцца ўзбуджаныя галасы Штэйнара і вартавога.

Сімха

Ды прапусці-ж ты, добры чалавек!

Адпіхае вартавога і заходзіць у пакой. За ім уваходзіць Валошын і Таццяна.

Сімха

Галоўным камісарам будзеш ты?

Серго

Як быццам — я.

Сімха

Орджанікідзе?

Серго

Так.

Сімха

Дзень добры вам!

Валошын

Таварыш камісар,
Мы перайшлі з-за фронта, з Слабады...

Серго

Вы з Слабады? Сябры мае!.. Сябры!
Вось гэта здорава! Што там чуваць?

Тацяна

Нам перадаў Азорыч...

Серго

Дзе ён сам?

Валошын

Арыштаваны.

Серго

Як-жа ён патрапіў?

Тацяна

Яго прадаў адзін знаёмы.

Серго

З нашых?

Тацяна

На вуліцы ён быў у нашай форме,
А ў штабе ў іх — у форме афіцэра.

Серго

Пазналі-б вы яго?

Тацяна

Ва ўсякі час.
Я нават помню, што ягоназвалі
Паручнік Завішынскі.

Серго

Гэта добра.

Тацяна

Скажыце, нельга вызваліць яго?

Валошын

Як можна, Таня, гаварыць аб гэтым,
Калі ёсць болей важныя задачы.

Серго

Жыццё людзей таксама, друг, не дробязь,
Тым больш, жыццё такога чалавека.
Я абяцаць напэўна не магу,
Аднак усё, што толькі можна, зробім,
Каб зноў вярнуць Азорыча на волю.
А як вы з ім звязаліся, сябры?

Сімха

Цераз яе, таварыш камісар,
Яна прабралася да самых крат.

Серго

Вы — смелая! І што-ж ён перадаў?

Тацяна

Барысаў здраднікі здалі без бою.
У ворага пакуль што мала сіл,
І горад можна нам узяць ізноў.

Серго

Мы так і думалі. Якія-ж сілы
У іх па гэты бок ракі Бярозы?

Сімха

Ды сілы невялікія.

Серго

Дакладна?

Валошын

Дакладна мы не можам вам сказаць.

Серго

А дзе і як размешчаны?

Валошын

Не знаю.

Серго

Вось гэта блага. А скажыце мне,
Масты наведзены?

Сімха

Мастоў няма.

Серго

Паромы ходзяць?

Тацяна

Можна мне прысесці?

Серго

Вы стомлены?

Валошын

Не спалі двое сутак.

Серго

Даруйце, я расхваляваўся вельмі.
Ідзіце ў той пакой. Таварыш Мелех!

З сумежнага пакою ўваходзіць Мелех.

Нікога не пускаць, хай адпачнуць.
А покуль вас зусім не зморыць сон,
Раскажаце мне болей падрабязна.

Выходзіць з прышоўшымі ў другі пакой.

Мелех

Турботны чалавек: за ўсіх — клапоты.

Праз нейкі час Серго варочаецца.

Серго

Ужо і спяць. Цікавыя навіны.
Выходзіць, Бэсман нахлусіў. Праверым.
Нічыпар Мелех, дай мне, друг, Смаленск.

Мелех

Я слухаю, таварыш камісар.

Ідзе ў сумежны пакой да тэлефона.

Серго

Калі разведка нам удасца сёння,
Дык мы Барысаў забярэм напэўна.

Мелех

Смаленск вас слухае.

Серго

Іду, іду.
Смаленск? З Прыяміна. Орджанікідзе.
Таварыш Сталін там? Паклікаць можна?
Мне вельмі спешна. Добра, я чакаю.
Даруйце мне, што я вас патрывожыў.
Здагадкі вашы правільныя. Што?
Здаецца, што на гэты бок Бярозы
Іх перайшло не вельмі многа. Колькі?
Разведка блытае, гаворыць розна.
Я пасылаю новую разведку.
Хто павядзе яе? Таварыш Сталін,
Начальніка яшчэ я не прызначыў.
Тут ёсць адзін надзейны чалавек.
Як прозвішча? Баюся вам сказаць,
Таму што гэта покуль што няпэўна.
Не можа гэта быць? Што, што? Я сам?
Не, не, я не збіраюся. Ды што вы!
У крайнім выпадку, калі нікога

Не будзе іншага, тады — магчыма.
Не дазваляеце? Таварыш Сталін,
Я правяду іх толькі да акопаў.
Ну, можа там яшчэ вярсты са дзве.
Не, не, я буду асцярожны, буду.
Так. Добра. Слухаю. Ніколі, не!
Запэўніваю вас, таварыш Сталін,
Што лепей мы загінем у няроўнай бітве,
А славы партыі не зганьбім адступленнем.
Бывайце! Дзякую за клопат і парады.

Уваходзіць камбрыг Баяновіч.

Баяновіч

Таварыш камісар, да вас прыйшоў
З байцамі Макарэнка.

Серго

Вельмі добра.
Не помніце, таварыш Баяновіч,
У часці Завішынскага няма?

Баяновіч

Не помню штось.

Серго

Вы запытайце ў ротных,
Калі такі дзе-небудзь ёсць у нас,
Арыштаваць на месцы, хто-б ні быў.

Баяновіч

Я слухаю.

Серго

А па-другое. Зараз
У тыл да ворага ідзе разведка.
Начальнікам разведкі буду я.
Пад вашу асабістую адказнасць
Я пакідаю часць. Згуртуйце сілы,
Узорны навядзіце скрозь парадак,
Каб заўтра часць была напагатове.

За ўсякія праявы панікёрства,
Непаслушэнства і варожых дзей
Карайце ўсіх бязлітасна і жорстка.
Я раю, паміж іншым, пасачыць
За Бэсманам.

Баяновіч

Я слухаю.

Серго

Усё.
Вы можаце ісці. Бывайце, друг.

Баяновіч

Бывайце.

Серго

Клікніце байцоў сюды.

Баяновіч выходзіць. Праз некалькі хвілін у пакой заходзяць байцы. Сярод іх Макарэнка і Кузьмін.

Галасы

Дзень добры! Добры дзень!

Серго

Вітаю вас.
І ты, Кузьмін?

Кузьмін

Таварыш камісар!..

Серго

Хто вам дазволіў выйсці з лазарэта?
Кантужаны, ледзь-ледзь жывы — і ён!
Ну і характар!

Кузьмін

Гэткі, як у вас.

Серго

Прабач, я хворы ваяваць не лезу.

Кузьмін

А помніце, як на Каўказе вы?..

Серго

Даволі, тут не вечар успамінаў.
Таварышы, я вас усіх паклікаў
Для вельмі важнай і адказнай справы.
А для якой, я зараз растлумачу.

Падыходзіць і паказвае на карце.

Дзенікін з поўдня рушыць на Маскву.
Патрэбна кінуць сілы ўсе туды.
Каб развязаць для гэтага нам рукі,
Каб утрымаць Калінкавічы, Гомель —
Цэнтральныя вузлы ад поўдня на Маскву, —
Спыніць палякаў трэба на Бярозе.
І вось мяне паслаў таварыш Сталін
І наказаў узяць назад Барысаў.
Звяртаюся да вас: дапамажыце!
Разведка наша зблытала нашчэнт:
Дзе вораг, колькі сіл у іх — не знае.
Нам трэба з вамі перайсці за фронт,
Прабрацца непрыкметна ў тыл паноў
І аб усім даведацца дакладна.
Калі хто сумняваецца, баіцца,
Хай не ідзе, не замінае нам.
Такія ёсць? Няма? Цудоўна. Мелех!

Уваходзіць Нічыпар Мелех.

Мелех

Я слухаю.

Серго

Пакліч людзей з атрада.

Мелех выходзіць у суседні пакой.

Серго

А вы сягоння елі?

Галасы

Елі.

Серго

Добра.
Вінтоўкі ў спраўнасці? Патроны ёсць?

Правярае вінтоўкі, падсумкі.

Макарэнка

Усё, таварыш камісар, як след.
Мы самі правяралі.

Серго

Малайцы.

Уваходзяць Штэйнар, Тацяна і Валошын.

Серго

Ну, як паспалі? Адпачылі трохі?

Сімха

Што адпачыць, дык адпачылі добра.
А спаць, таварыш камісар, не вельмі...

Серго

Ну што-ж, сябры, крыўдуйце на сябе,
Калі не выспаліся. Зараз нам
Вялікая прадбачыцца работа.
Мне трэба ваш тутэйшы чалавек,
Які мяне правёў-бы у Барысаў.
Хто добра ведае дарогу з вас?

Тацяна

Я тысячу разоў туды хадзіла.

Валошын

Дык я тады — дзесяткі тысяч раз.

Сімха

А я сказаў-бы вам, таварыш камісар,
Дык не магу і падлічыць дакладна.
Я балаголам трыццаць восем год.

Памножце іх на трыста з лішнім дзён,
Пасля яшчэ памножце на чатыры,
І мы даведаемся, колькі раз
Праехаў я барысаўскай дарогай.

Серго

Я мушу вам сказаць, што мы ідзем
У вельмі небяспечную дарогу,
У тыл. Вы зразумейце гэта, Штэйнар.

Сімха

За вамі я пайду хоць да Варшавы.

Серго *(да Валошына).*

Тады вы заставайцеся, мой друг,
І падрыхтуйцеся сустрэць людзей, —
Мы ваш атрад далучым да палка.
А ты таксама не сумуй, дзяўчынка,
Азорыча мы ў крыўду не дадзім.

Тацяна

Навек запомню вашу дабрату.

Серго

Ну што-ж, сябры, не будзем траціць часу.
Ноч цёмная, якраз нам на руку.
Бывайце дарагія!

Валошын

Добры шлях!

Тацяна

Шчаслівай вам дарогі!

Серго

Ну, пайшлі.
Смялей наперад — будучыня наша!

Усе, апрача Валошына і Тацяны, выходзяць.

Валошын

А ноч, як дзёгаць, не відаць нічога.

Тацяна

І дождж ліе.

Валошын

Адважны чалавек!

Тацяна

Такіх людзей на свеце, мусіць, мала.

---

## АКТ ТРЭЦІ

### МАЛЮНАК ШОСТЫ.

Местачковы рыначны пляц. У цэнтры стаіць мураваны касцёл, справа— турма, а злева — латкі і крамы. Раніца ў нядзелю. У касцёле звоняць званы. На цвінтары спяваюць жабракі. З групаю афіцэраў праходзіць Свідэрскі і Ксаверы Стрыж.

Жабракі

Злітуйцеся, добрыя людзі,
Няхай ваша ласка будзе
Над сляпымі, глухімі,
Над крывымі, нямымі,
Над усімі калекамі,
Няшчаснымі чалавекамі.

Свідэрскі

Ну, як кірмаш, Ксаверы?

Ксаверы

Як даўней!
Я чатырох прыказчыкаў паставіў:
Два ў краме бегаюць, а два — на рынку.
Вось Нохім Штэйнар, там яго унук, —
Усё мае прыказчыкі. Базар
Увесь загружаны маім таварам.
Ды вось няма купцоў, пан капітан.

Свідэрскі

Калі я загадаў зрабіць кірмаш,
То будуць і купцы.

Ксаверы

Ды дай-жа, божа!

Свідэрскі

Прыехаць сказана усёй акрузе.
Я паважаю мірнае жыццё:
Кірмаш, касцельны звон, дзяўчат...
Вы-ж да царквы ці да касцёла?

Ксаверы

І сам не ведаю, куды падацца.

Свідэрскі

Чаго вам з мужыкамі пхацца.
Хадзем, мой пане, да касцёла,
Там і чысцей і больш вясёла.
Прыгожанькія панны ёсць?

Ксаверы

На дзіва!

Свідэрскі

Хадзем, панове. Шуму, шуму, Стрыж!

Свідэрскі і афіцэры ідуць у касцёл.

Ксаверы

Прыказчыкі, жвавей! У, чэрці вы!

Бяжыць следам у касцёл.

Нохім

Гнутыя палкі,
Тытунь і запалкі,
Шпількі, іголкі
І перац горкі.

Зяма

У пана Стрыжа
У краме ляжаць,

Людзям прадаюцца,
Дарам аддаюцца
Найлепшыя тавары
На ўсім базары.

Уваходзіць Карабан, пераапрануты так, што яго не пазнаць.

Карабан

Купляйце, панове,
На косы брускі,
За сем залатовак —
Чатыры кускі,
Ільга і касу
І язык падвастрыць,
Лягчэй будзе з жонкай
Тады гаварыць.
Навін няма ніякіх?

Зяма

Не, няма.

Карабан

Відаць, яшчэ не знаюць пра забітых.
Сачы за кожным панскім крокам.

Зяма

Добра.

Разыходзяцца ў розныя бакі.

Жабракі

На калені ўпадаем,
Хрыста праслаўляем,
Памяні таго, божа,
Хто няшчасным паможа.

Уваходзіць Сёмка Бегунок.

Сёмка

Святы божа, святы крэпкі,
Хто ў цымбалы, а хто ў скрыпкі.
Няшчасныя вы людзі, жабракі.

Нохім

А, Сёмка Бегунок! Куды бяжыш?

Сёмка

Бягу на раздабыткі,
Падвязаўшы лыткі,
А Нохім у купцы пайшоў ці што?

Нохім

Халера на яго з яго купцамі!

Сёмка

А на каго?

Нохім

На пана капітана.
Ён выпусціў мяне з турмы ў ярмо,
Прыказчыкам да солтыса Стрыжа.
Ён загадаў купляць і прадаваць.
Ён загадаў цяпер рабіць кірмаш.
Ён паважае мірнае жыццё.
Які тут мір, хваробы ім у бок,
Калі вайна.

Сёмка

А чуў, што кажуць?

Нохім

Што?

Сёмка

На тракце бачылі паноў забітых.

Нохім

А дзе?

Сёмка

Ды на барысаўскай дарозе.

Нохім

Ты, Сёмка, болей не кажы нікому.

Сёмка

Ці я дурны?

Нохім

Дурны, то не дурны,
А падап'еш — язык бывае доўгі.
Няма ў цябе ў жыцці апоры, Сёмка.

Сёмка

Бабыль, як мае быць. Каўнер шырокі,
А пяты голыя. Які-ж тут грунт?
Нічога ў спадчыну не даў мне бацька,
Апроч вядомай прыказкі людской:
«Менш гавары, а болей слухай, Сёмка».
Я загубіў і гэтую апору.
І, праўда, балбачу часамі лішне...
Злосць, Нохім, на жыццё і на людзей.

Нохім

На гэты раз папробуй памаўчаць,
Каб не было якой бяды.

Сёмка

Маўчы,
Бяда, як дуда:
Станеш дзьмуць —
Слёзы самі ідуць.
Пайду я вып'ю з гора, Нохім, чарку.

Нохім

Ізноў? Ты-ж, здэцца, піў ужо. Глядзі,
Каб не зашкодзіла на твой язык.

Сёмка

Палка на палку шкодзіць,
А чарка на чарку ніколі.

Нохім ідзе ў адзін бок, а Сёмка намерыўся ісці ў другі, але яго затрымлівае Ксаверы, які перад гэтым выйшаў з касцёла і чуў канец Сёмкавай размовы з Нохімам.

Ксаверы

Аб чым вы гэта, Сёмка, гаварылі?

Сёмка

Не ўсё кажы, што ведаеш, мой пане.

Сержант

Ты не жартуй, а то й заплакаць можаш.

Сёмка

Голы разбою не баіцца.

Ксаверы

Вялікай сілы кожны забаіцца.

Сёмка

Пашчыплюць вашу сілу вераб'і.

Ксаверы

А хто гэта пасмее?

Сёмка

Не пасмеюць?
А вось-жа пашчыпалі.

Ксаверы

Хлусіш, Сёмка.

Сёмка

Хлушу?

Ксаверы

Канечна.

Сёмка

Ну, а як праўда?

Ксаверы

А чым-жа ты дакажаш гэту праўду?

Сёмка

А ты схадзі на тракт, і сам пабачыш.

Ксаверы

Каго?

Сёмка

Жаўнераў вашых перабітых.

Ксаверы

Што ты гаворыш? Божа мой!

Сёмка

Ага,
Спалохаўся!

Ксаверы

Ідзі, брат, і маўчы.
Ідзі. На вось табе на чарку, Сёмка.

Дае грошы. Сёмка напявае.

Сёмка

Я задком, перадком
Перад панам Хведарком;
Не я скачу — няволя:
Загадалі панове.

Ксаверы

Адстань-жа, Сёмка! Дурань ты набіты!

Адпіхае Сёмку і шпарка ідзе ў касцёл.

Сёмка

Пастой!.. За што-ж ён даў мне грошы, а?
Выходзіць, я зрабіў яму паслугу?
Не выцерпеў і прабрахаўся, Сёмка,
Прадаў, а грошы думаеш прапіць.
Не, наце вам. Маліцеся людцы,
За грэшнага Сымона Бегунка.
Эх, стварыў мяне бог,
Ды і сам каецца.

Аддае грошы жабракам і выходзіць.

Жабракі

Каб вам бог здароўя даў,
Скацінку гадаваў,
Хлеба-солі засылаў,
І жыта і пшаніцы,
І ўсякія пашніцы.

З касцёла выходзіць Свідэрскі, за ім сержант і Ксаверы Стрыж.

Свідэрскі

Што сталася?

Ксаверы

Няшчасце, панічок:
Жаўнераў, кажуць, перабілі нашых.

Свідэрскі

Што ты пляцеш? Якіх жаўнераў? Хто?

Ксаверы

Напэўна, партызаны, іх работа...

Свідэрскі

Ох, насмяшыў! Ва ўсёй маёй акрузе
Ніякіх партызан не можа быць!

Убягае жаўнер увесь у балоце.

Жаўнер

Пан капітан!..

Свідэрскі

Ты хто — жаўнер ці чорт?

Жаўнер

Я двое сутак поўз сюды балотам...
На наш канвой напалі партызаны,
Усіх легіянераў перабілі
І павялі дзяўчыну да сябе.

Свідэрскі

Дзяўчыну вызвалілі? Чорт!
Сержант! Базар спыніць, тавары ўзяць,
Людзей сагнаць сюды і дапытаць:
Яны павінны ведаць, дзе атрад.

Сержант, Ксаверы і жаўнер выбягаюць.

Дзяўчыну вызвалілі... гэта дрэнна...
Калі яна патрапіць да чырвоных —
Загіне ўсё: і друг мой Завішынскі,
І наша справа. Трэба ратаваць.

Убягае ўстрывожаны Мікола.

Мікола

Што здарылася тут?

Свідэрскі

Мікола Стрыж,
Вы паручыліся за Марыч, так?
Дзяўчыну вызвалілі партызаны.
Адкажаце за гэта вы, мой пане.
Ды не палохайцеся, я жартую...
Прабрацца трэба цераз фронт,
Знайсці там... Бэсмана...

Мікола

Каго?

Свідэрскі

Таго,
Каго вы бачылі у нас у штабе.
Ён называецца: Казімер Бэсман.
Няхай ратуецца, пакуль дзяўчына
Яго не стрэла дзе і не пазнала.
Вам ясна ўсё?

Мікола

Даруйце, капітан.
Ягорка памыліўся з гэтай Марыч,
І просты абавязак мой цяпер
Зрабіць з дзяўчынай гэтаю разлік.

Свідэрскі

І лепш за ўсё, калі разлік навек.

Мікола

Клянуся гонарам, што гэт будзе
Маё апошняе спатканне з Марыч.

Свідэрскі

Збірайцеся і зараз-жа ідзіце.

Мікола Стрыж шпарка выходзіць.

Свідэрскі

Свідэрскі не ваяка, гэта так,
Але затое першы між гуляк,
І ён задасць такі крывавы баль,
Што будуць памятаць сыны і ўнукі.

На рынку падымаецца гоман і крык. На пляц у роспачы выбягае Тэкля.

Тэкля

Паночак, дарагі, скажы-ж ты ім...
Скажы-ж ты ім аддаць маю кароўку!
Я вывела яе на хлеб прадаць...
Малым на хлеб... Паночак, дарагі!

Свідэрскі

Адстань! Што цапаеш? Адстань, назола!

Жаўнеры выганяюць натоўп людзей. Уперадзе ідзе Матрона і Ксаверы.

Галасы

За што ганяеце! За што б'яце!

Тэкля

Мужчынкі, людзі, што-ж гэта такое?!

Галасы

Разбой! Які-ж гэта кірмаш? Які закон?
Удзень і на людзях рабуюць.

Тэкля

Пан стараста, ну заступіся-ж ты.

Ксаверы

Эх, неразумная ты баба, Тэкля!
А хіба-ж ім не трэба піць і есці?

Тэкля

Дык вось якая мне твая падзяка?!
Хай-жа развее вас сіверны вецер,
Хай размятуць вас віхуры крутыя,
Каб не марыліся нашыя дзеці,
Каб не стагналі ў няволі старыя!
Здзейсні-ж праклён гэты, божачка мой!

Падае ў дзікай роспачы на калені.

Свідэрскі

Шапкі, паганае быдла!
Хто перабіў на дарозе канвой?
Воля бандыту абрыдла?!
Я ў вас пытаю, дзе вашы сыны?

Ксавэрыха

Я скажу...

Сёмка

Сціхні ты, лёкай!

Ксавэрыха

Гэта — Валошын з атрадам, яны
Дзесьці не так і далёка.

Свідэрскі

Хто мае войска туды завядзе?
Што-ж вы усе анямелі?

Нохім

Пан афіцэр, мы-ж не ведаем дзе,
Самі мы вестак не мелі. (*Да Сёмкі*)
Бачыш, які ты дурны, хоць стары.

Сёмка

Трэ' разумнець. Калі ласка,
Я раскажу.

Свідэрскі

Ну, давай, гавары.

Сёмка

Так пачынаецца казка:
Ой, з гары, з гары, з даліны
Беглі конікі чатыры,
Усе конікі сівыя,
На іх хлопцы маладыя.

Свідэрскі

А што далей?

Сёмка

Далей пяецца так:
Паны коні даганяюць,
Ды шляхоў яны не знаюць.

Свідэрскі

Што ты пляцеш? Ты мне кажы ясней.

Сёмка

Ішоў лысы і пляшывы,
Знайшлі яны грэбень,
Сталі радзіцца, судзіць,
Каму ён патрэбен.

Свідэрскі

О, галган, стары пёс! Узяць
І даць яму двадзесце пяць!

Жаўнеры хапаюць Сёмку.

Сёмка

Гні, пане, дрэўца, покуль гнецца,
Прыдзе пара — адрыгнецца.

Свідэрскі

Я вас сагну, што ніводзін не ўстане!
Дзе твой, старая бязбожніца, сын?

Наста

Там ён ужо, у цябе, ясны пане.

Ксаверыха

Гэта-ж і скажа Азорыч адзін.

Свідэрскі

Верна!.. Азорыча!

Жаўнеры бягуць да турмы.

Наста

Змеі вы, людзі!
Як твой язык мог сказаць?

Ксаверыха

Вось яго маці...

Свідэрскі

Пры мацеры будзе
Сына лягчэй дапытаць.

Наста

Не дапытаеце! Сынок мой, сыне!
Ці-ж я цябе для таго гадавала,

Над калыскай тваёй стаяла,
Цёмных ночак не спала,
Каб цябе ў кайданы забілі,
Рукі, ногі твае скруцілі,
Па людзях вадзілі?

Канвой выводзіць з турмы Азорыча. Наста кідаецца яму насустрач.

Наста

Тарас!

Азорыч

Цярпі, матуля.

Наста

Сыне мой,
На гора спарадзіла я цябе.

Азорыч

Не плач, матуленька, не плач,
Ты прычакаеш скора шчасця.
Не дарам ты жыццё дала,
Хоць мне і суджана прапасці.
Будзе гаротны, забіты наш край
Сонцам свабоды гарэць!

Свідэрскі

Годзе там гутарыць! Ну, выбірай:
Ці вызваленне, ці смерць?

Азорыч

Дзякуй, паночку, за ласку тваю,
Марныя толькі стараннi:
Я не купляю і не прадаю,
А волю бяру у змаганні.

Свідэрскі

Не ганарыся, твой гонар спадзе.
Ведаеш, дзе партызаны?
Ты наша войска туды павядзеш.

Азорыч

Не дачакаешся, пане.

Свідэрскі

Скажаш! *(Б'е Азорыча.)*

Наста

Сынок мой!

Азорыч

Матуля, маўчы...

Свідэрскі

Я цябе вымушу, злодзей!

Нохім

Сорам, паночку!

Свідэрскі

А ты не вучы!

Б'е нагайкаю Нохіма па галаве. Акрываўлены стары падае на брук.

Нохім

Зяма!..

Зяма

Не катуйце, годзе!

Свідэрскі

Я супакою цябе, супастат.
Ну, камісар, задаволен?
Выкажаш, дзе партызанскі атрад?

Азорыч

Не прычакаеш ніколі.
Можаш жывога загнаць у зямлю,

Кары не страшна суровай.
Вусны свае да крыві сашчамлю,
І не пачуеш ні слова.

Свідэрскі

Не заракайся, бо будзеш не рад.
Слухай, сержант, мой загад:
Кожнага пятага — розгамі біць,
Кожнага сотага — вешаць,
Хаты разграбіць, мястэчка спаліць,
Хай сваё сэрца пацешыць.

Галасы

Божачка, што-ж гэта будзе цяпер?
Дзе-ж мы прытулімся? Дзе заначуем?

Тэкля

Богам святым заклінаем цябе,
Рукі і ногі цалуем...

Азорыч

Ціха, не плачце, не трэба стагнаць.
Сцісніце зубы сурова:
Раз чалавеку ў жыцці паміраць,
Трэба-ж памерці талкова.

Ксаверы

Людзі, нашто-ж, каб за тых партызан
Нас вынішчалі пажарам?
Людзі, скажыце-ж вы! Пан капітан,
Знойдзем мы іх за імшарай.

Карабан

Ведае, сволач!

Тэкля

Даруй нам, панок!

Галасы

Не пакарай! Заступіся!

Свідэрскі

Што вы прысталі? Прасіце яго...

Тэкля *(да Азорыча)*.

Родненькі наш, пакарыся.
Ён-жа запаліць, загубіць навек,
Выратуй нас ад напасці.

Карабан

Выратуй! *(Цішком.)* Сто пяцьдзесят чалавек
Можа ў імшарах прапасці. *(Голасна.)*
Выратуй!

Галасы

Выратуй бедных сялян.
Спаліць ён нас да сарочкі.

Азорыч

Дапамажы мне задуманы план
Здзейсніць, дажджлівая ночка.

Свідэрскі

Скора сержант ажыццёвіць загад...
Думай!

Азорыч

Я вырашыў, пане.

Свідэрскі

Вырашыў?

Азорыч

Я пакажу вам атрад.
Хай не гаруюць сяляне.

Свідэрскі

Роце пастроіцца!

Наста

Што-ж ты зрабіў?
Сынку мой! Сынку мой!.. Сыне...
Ты-ж і Тацяну і ўсіх загубіў,
Матку на ганьбу пакінуў.

Азорыч

Не дакарай мяне, маці мая...

Наста

Прэч! Ты — не сын, ты — чужынец.
Сэрца тваё нарадзіла змяя...

Азорыч

Маці...

Наста

Няма ў мяне сына.

Падае ў зняменні на зямлю.

Свідэрскі

Выгнаць! Даволі размовы.

Людзей усіх выганяюць, застаецца адна Наста.

Свідэрскі

За мной!

Азорыч *(да маці).*

Хай-жа спакойная будзе
Старасць твая і сумленне тваё...

Жаўнеры выходзяць і выводзяць Азорыча.

Наста

Ачнуўшыся, прыпадымаецца з зямлі.

Што-ж гэта сталася? Людзі!
Што я зрабіла, адзіны ты мой?
Збіты, праклятый, закуты...
Не, да канца буду несці з табой
Ганьбу тваю і пакуты.

Ідзе ўслед за Азорычам.

## МАЛЮНАК СЁМЫ

Цёмная ноч. Старадаўні лес. Лье спорны дождж. Бліскавіцы асвятляюць вузкую лясную дарогу і, на заднім плане, нізкарослы балотны хмызняк.

Свідэрскі

Яшчэ далёка?

Азорыч

Скора будзем там.

Свідэрскі

Ты водзіш нас па лесе цэлу ноч,
Мы стомлены, я не магу ісці.

Азорыч

Яшчэ хвілінку цярплівасці, пане,
І мы дасягнем мэты.

Свідэрскі

Брэшаш, мусіць,
Ты водзіш нас знарок. Глядзі, Азорыч,
Калі ты хлусіш — не чакай дабра!
Пайшлі, мінае ноч.

Азорыч

Ну што-ж, пайшлі,
Цяпер да нашай мэты вельмі блізка.

Галасы

Балота! Гінем!

Свідэрскі

Стой! Назад, назад!
Дык вось ты нас куды завёў, сабака?

Азорыч

А ты-ж куды хацеў? Куды хацеў?!

Галасы

Ратуйце нас! Дапамажыце! Гінем!

Азорыч

На партызан павесці? Не, панок,
Ніколі вырадкаў здрадлівых
На нашай не было зямлі,
Каб вас, разбэшчаных і хцівых,
Супроць сваіх людзей вялі.
Мне лепш ад вашых рук загінуць,
Дык хоць народная сляза
Маю аплача дамавіну,
А не бур'ян і не лаза.

Свідэрскі

Загінь-жа, пёс! *(страляе)*

Азорыч

Матуля... Ма...

Свідэрскі

Назад,
Пакуль не трапілі да партызан!

Белапалякі паспешна адыходзяць.

Галасы

Ратуйце! Гінем! Ой, ратуйце, людзі!..

Шукаючы слядоў, ідзе Наста.

Наста

Ізноў я загубіла іхні след.
Здаецца, галасы ішлі адгэтуль.
Якая цемра! Дзе ты, мой Тарас?

Натыкаецца на труп Азорыча.

Што тут такое? Чалавек? Тарас?..
Тарас, дзіця маё, даруй мне, сыне,
Не ведала я тайных дум тваіх...
Што-ж ты маўчыш? не чуеш? Кроў... Забіты!
Устань, Тарас! Мне страшна тут:
Адна, кругом балота, лес гамоніць...
Пагавары са мной, скажы мне слова.

І я адна, і ты цяпер адзін.
Як мала ў нас было такіх хвілін!
Маўчыш, астылі рукі, твар халодны.
Табе сцюдзёна ноччу непагоднай.
І дождж шуміць, як гоман баравы.
Не, я не веру, ты — жывы, жывы!
Перада мной тваё маленства паўстае,
І крыўды горкія і радасці твае
Праходзяць чарадой. Ты помніш, даўняю парой
Ты пасвіў скот. Каровы заблудзілі,
Цябе гаспадары да смерці збілі.
Ты вусны сцяў і выбег на раку.
Была вясна, шумелі ціха дрэвы.
На беразе шырокае Бярозы,
Стаіўшыся ў зялёным лазняку,
Ты слухаў іх дзівосныя напевы,
І ціхія, як град, буйныя слёзы
Ліліся на пясок. Сынок, сынок,
Не ўстанеш ты і не заплачаш болей,
Не выпаліш слязамі горкай долі
І не адпомсціш ім, разбойнікам тваім,
Тваім забойцам. Вусны анямелі,
Маўчаць. А помніш, кожнае нядзелі
Ты прыязджаў з Барысава са школы.
Прыходзілі суседзі. Ты, вясёлы
І гаваркі, расказваў нам гаротным,
Як добра будзе жыць народ свабодны,
Здабыўшы волю. І вось ужо ніколі
Не загаворыш ты, не скажаш слова,
Не паглядзіш ласкава і сурова
На занядбаных, стомленых людзей.
Дай прытуліцца да тваіх грудзей,
Дай выслухаць апошні крык надзей
І дум тваіх. Я разгадаю іх
І панясу на свет, людзям, якіх любіў
І для якіх змагаўся ты і жыў
І паміраў. Я панясу. А ты,
Ты спі, ты спі спакойна, добры сын.
І я адна, і ты цяпер адзін,
Не шмат у нас такіх бывала дзён,
І твой сягоння будзе ціхі сон.

Наста змаўкае. Гамоніць лес, шуміць дождж. Праз нейкі час на дарозе з'яўляецца Орджанікідзе і яго разведка.

Сімха

Спыніцеся, таварыш камісар.

Серго

А што?

Сімха

Тут пачынаецца балота.
Нямала ў ім загінула людзей,
Не знаючы дарогі. А тым часам
Тут кладкі ёсць. Я зараз іх праверу,
Калі дажджом не пазмывала часам,
Праз пяць хвілін мы будзем на сухім.

Серго

Было-б нядрэнна. Мы ад Навасёлак
Пайшлі-б адны, а ты — у свой атрад.
І гэтым шляхам вывеў-бы і іх.
Чаго ім там сядзець і сумаваць,
Калі з панамі выйгранкі няма.

Сімха

Дык вы спачніце тут, а я праверу.

Серго

Будзь асцярожны, цёмна, Штэйнар.

Сімха

Я вочы завязаўшы тут прайду.

Сімха Штэйнар знікае ў цемры.

Серго

Не патаміліся?

Галасы

Прысталі трохі.

Серго

Дарога наша трудная была

Макарэнка

Калі-б не адпачылі трохі ў лесе,
Я-б, мусіць, не дайшоў.

Серго

Благі хадок!
А што гадзінку адпачылі ў лесе —
Нядрэнна: зараз ахватней ісці.
Вось часу толькі шкода. Нам цяпер
Няможна траціць ні хвіліны лішняй.
Аб супрацiўніку мы весткі маем,
І неадкладна трэба наступаць.

Макарэнка

А гарадок разграбілі нашчэнт,
Я не пазнаў Барысава. Нашчэнт!

Серго

Ламаць яны аматары. А нам —
Вучыцца трэба будаваць, сябры.
Не холадна?

Галасы

Ды не.

Серго

Нябось, прамоклі.

Галасы

Памыліся і вымаклі на год.

Серго

Дзеля дабра краіны і народа
Нам давядзецца выцерпець нямала.

Чырвонаармейцы замаўкаюць. Шуміць вецер і дождж. У перапынкі паміж завываннем ветру чуваць спачатку глуха, а потым усё больш выразна галашэнні Насты.

Наста

Заснуў. Навек заснуў. Тарас, Тарас...

Серго

Цішэй, там нехта стогне.

Макарэнка

Сосны стогнуць.

Наста

Ой, як мне цяжка, як мне горка жыць!

Серго

Не, не, там хтосьці плача.

Макарэнка

Дождж шуміць.

Наста

Ці дараваў ты мне за мой праклён?

Серго

Вы чуеце? Гаворыць.

Макарэнка

Можа Штэйнар?

Наста

Што-ж ты маўчыш, Тарас? Скажы мне слова.

Серго

Не, гэта ў тым баку. Жаночы голас.

Раптам маланка асвятляе Насту.

Макарэнка

Жанчына, бачыце?!

Серго

Адкуль яна?
Зблудзіла? Трэба ёй дапамагчы.

Серго і байцы падыходзяць да Насты.

Серго

Вы што тут робіце?

Наста

Не падыходзь!

Серго

Не бойцеся, мы вашыя сябры.
Як вы сюды папалі гэткай ноччу?

Наста

Цяпер ён мой, я вам яго не дам.

Серго

Каго?

Макарэнка

Глядзіце, тут-жа чалавек.

Серго *(прыглядаецца)*.

У шынялі. Забіты. Хтосьці наш.
Устань, старэнькая, не бойся нас.
І мы-ж чырвоныя таксама.

Наста

Вы?
Чырвоныя? Дапамажыце-ж мне!

Серго

Няшчасная, устань. Адкуль-жа ты?

Наста

Я з Слабады.

Серго

А хто забіты?

Наста

Сын.

Серго

Пакутная, старая наша маці,
Я пазнаю тваю душу і сэрца,
Вялікасную любасць да дзяцей.
Чыя-ж рука не скамянела мёртва,
Узняўшыся над галавою сына!
Скажы нам, хто яго забойцы, маці?

Наста

Паны.

Серго

За што?

Наста

Завёў іх на пагібель,
А ім хацелася да партызан.

*Варочаецца Сімха Штэйнар.*

Штэйнар

Прайшоў наскрозь, дарога наша ёсць.

Серго

Здыміце шапкі, за жыццё радзімы
Памёр таварыш наш.

Сімха *(прыглядаючыся.)*

Які? Азорыч? 0

Серго

Што? Камісар палка?

Макарэкна *(прыгледзеўшыся.)*

Наш камісар.

Серго

Дык вы Азорычава маці?

Наста

Маці.

Сімха

Ты, цётка Наста?

Наста

Сімха? Бачыш, Сімха,
Якое гора!.. *(Плача.)*

Серго

Выкапайце дол.
Не плач, старэнькая, твой добры сын
Быў добрым сынам і сваёй радзімы.

Наста

Я засталася круглай сіратой.
Нашто мне жыць?

Серго

Не ты адна, у нас
Сям'я вялікая і сірат многа,
Будзь маткаю для іх, для нас усіх.

Сімха

Ёсць, цётка, у цябе яшчэ Тацяна,
Жыві для сіраты.

Серго

Жыві для справы.
Змагайся з ворагам, як сын змагаўся,
За памяць светлую аб ім у людзях.

Наста

Скажы мне, што-ж рабіць?

Серго

Ты пойдзеш з намі,

Работа ёсць.

Макарэнка

Гатова, камісар.

Серго

Таварышы, нізка схіліце галовы
Над прахам байца, камісара і сына.
Сумленна прайшоў ён дарогай жыццёвай,
Сумленна загінуў за волю краіны.
Яго не зламалі ні краты, ні турмы,
І родная пушча прыймае астанкі.
Над ім не іграюць ні трубы, ні сурмы,
А вецер спявае, гамоняць маланкі.
Але за сцюдзёнай асенняй нягодай
Настане вясна, закрасуюць палеткі,
Абудзяцца пушчы, успеняцца воды,
І вырастуць тут над магілаю кветкі.
Не згінуць ніколі шляхі баявыя,
Ні дзейнасць яго, ні бяссмертная слава.
Ідзіце-ж на подзвіг, устаньце, жывыя,
Змагацца за ту-ж вялікую справу.
Бывай, наш таварыш. Будзь пэўны, што скора
Пазбудзецца цяжкай няволі краіна.
Спакой-жа і мір твайму праху, Азорыч,
А мацеры — дзякуй за добрага сына.

Наста

Вам дзякуй, добры чалавек і людзі,
За слова добрае. Бывай, Тарас,
Бывай, мой сыне! Я к табе вярнуся...

Ціха напяваючы пахавальны марш, байцы падымаюць нябожчыка.

## АКТ ЧАЦВЕРТЫ

### МАЛЮНАК ВОСЬМЫ

Ваколіца вёскі каля Прыяміна. На скрыжаванні дарог стаіць старая карчма, у якой змяшчаецца штаб чырвонаармейскага палка. Воддаль распасцёр панурыя крыллі адзінокі вятрак. За ім адкрываецца шырокі палявы прастор. Досвітак. Каля штаба ходзіць вартавы. Праз момант з штаба выходзіць Бэсман і Дамейка.

Бэсман

Марудзіць нельга больш: Орджанікідзе
Вярнуцца можа кожную хвіліну.
І трэба полк змяшаць, узбурыць так,
Каб камісар, вярнуўшыся з разведкі,
Не меў каго павесці ў наступленне.

Дамейка

Ты захапляешся, Казімер Бэсман:
Палком не вельмі лёгка заўладаць.

Бэсман

Цяпер не цяжка: камісар палка
Ляжыць без памяці. А наш камбрыг —
Ён чалавек і новы і бязвольны.
І сёння самы лепшы час, Дамейка.
Што падрыхтована? Якія роты?

Дамейка

Мой батальён за намі пойдзе цалкам.

Бэсман

А як каманда сувязі, за нас?

Дамейка

Там ёсць у іх стары, Нічыпар Мелех,
Калі ён пойдзе — пойдзе і каманда.

Бэсман

Я ведаю яго, пагавару...
Галоўнае — кругом пасеяць страх,
Сказаць, што камісар Азорыч збег,
Орджанікідзе трапіў у палон,
Мы зноў абкружаны...

Дамейка

Сюды ідуць.

Бэсман і Дамейка хаваюцца. У штаб праходзяць Валошын і Тацяна.

Прайшлі.

Бэсман

Якое падабенства, чорт!
Няўжо яна?

Дамейка

Знаёмая?

Бэсман

Наўрад!
Ідзі, Дамейка, дзейнічай адзін.
Нас не павінны зараз бачыць разам.

Разыходзяцца. Нечакана паказваецца Мікола Стрыж і аклікае Бэсмана.

Мікола

Таварыш Бэсман!

Бэсман

Што? Мікола Стрыж?
Чаго ты тут?

Мікола

Набліжаецца і шэпча Бэсману.

Мяне паслаў Свідэрскі.

Бэсман

Паказваючы Міколу на Дамейку

Пры ім ты можаш гаварыць усё.

Мікола

Тацяну вызвалілі партызаны.

Бэсман

Дык гэта тут ішла яна?

Мікола

Ды не,
Яна яшчэ у лесе ў партызан.
Магчыма, іх усіх там і захопяць,
Бо капітан Азорыча прымусіў
Павесці паказаць, дзе іх атрад.

Бэсман

І вы паверылі яму, дурніцы!
Тацяна Марыч тут.

Мікола

Тацяна тут?

Бэсман

Зноў на маёй дарозе гэта дзеўка.
Яна мяне пазнае і загубіць.
Ды не, я загублю яе раней,
А справу да канца мы давядзем!

Мікола

Вы лепш ратуйцеся, пакуль не позна.

Бэсман

Ты мне сказаў, што быццам-бы Азорыч
Павёў на партызан жаўнераў?

Мікола

Так.

Бэсман

Перад людзьмі ты гэта можыш сведчыць?

Мікола

Мяне пазнаюць, хто-ж паверыць мне?
Я не хачу рызыкаваць жыццём.

Бэсман

Тацяны Марыч у жывых не будзе.

Мікола

Другія людзі ёсць, якія знаюць.

Бэсман

Адкуль?

Мікола

Таксама перайшлі за фронт.
Я Сёмку Бегунка сустрэў нядаўна.

Бэсман

А Сёмка гэты знае, што Азорыч
Згадзіўся весці паказаць атрад?

Мікола

Пры ім усё было.

Бэсман

Вось гэта козыр!

Мікола

Што вы надумалі?

Бэсман

Цудоўны план!

Хадзем, ты мне пакажаш Бегунка,
А ты, Дамейка, тут рабі сваё.

Бэсман і Мікола выходзяць. Дамейка накіроўваецца ў штаб. У гэты час іграюць сігнал на пад'ём. На пляцоўку перад штабам высыпаюць чырвонаармейцы. Сярод іх Нічыпар Мелех і Алёшка Семізвон.

Алёшка

І вось Орджанікідзе мне і кажа:
Ты, кажа ён, Алёша, маладзец,
З такімі толькі нам і ваяваць.

Чырвонаармеец

Ну, і брахун-жа ты, Алёшка!

Алёшка

Я?
Нічыпар Мелех, што казаў Серго?

Мелех

Серго — душэўны, шчыры чалавек.
Ды штосьці доўга вось яго няма.

З штаба выходзіць Дамейка.

Дамейка

Здарова, малайцы! Аб чым размова?

Мелех

Ды вось няма Серго Орджанікідзе.

Дамейка

А вы не чулі?

Алёшка

Што?

Дамейка

Не чулі?

Мелех

Не.

Дамейка

Не ведаю, ці варта вам казаць.

Мелех

Скажыце, камандзір, мы-ж не малыя.

Дамейка

Я гавару вам, хлопцы, па сакрэту:
Серго папаўся, кажуць, у палон.

Галасы

Серго? Орджанікідзе? Быць не можа!

Дамейка

Вы запытайце ў Бэсмана, ён знае лепш.

Алёшка

Браткі, што-ж гэта робіцца? Браткі,
Душа мая ад гэтай весткі плача.

Чырвонаармеец

Ты не шумі, а пакруці мазгамі:
Куды нас павядуць без камісара.

Дамейка

Куды? На смерць.

Алёшка

Ой, бацюхны мае!
Што-ж нам рабіць?

Чырвонаармеец

Да камандзіра трэба.
А як мяркуеш ты, Нічыпар Мелех?

Мелех

Я думаю, што трэба запытаць
У Бэсмана. Ён — свойскі чалавек.

Алёшка

Пайшлі да Бэсмана!

Дамейка

А вось ён сам.

Уваходзіць Бэсман, Бегунок і Мікола.

Бэсман

Чаго вы так хвалюецеся тут?

Мелех

Скажы нам, камандзір, ды толькі праўду:
Орджанікідзе трапіў у палон?

Бэсман

Дакладна не скажу, а чуткі ёсць.

Мелех

Калі ты хлусіш нам — вялікі грэх
Бярэш ты на сваю душу, таварыш.

Бэсман

Мне шкода вас, і лепей грэх узяць,
Як мёртвымі ляжаць у чыстым полі
І гніць. А нам, байцы, надзвычай цяжка:
Я сам хадзіў два дні таму ў разведку —
Паны нас абкружылі з трох бакоў,
У тыле з бандай ходзіць Семянюк,
Азорыч, камісар, кудысьці ўцёк,
І нам, відаць, пагібель тут усім.

Алёшка

Сябры, што-ж гэта робіцца? Сябры!..

Уваходзіць камбрыг Баяновіч.

Баяновіч

Чаго сабраліся, што тут за крык?

Мелех

Сам ведаеш.

Алёшка

Палякі абкружылі.

Баяновіч

Які падлец вам гэта мог сказаць?

Бэсман

Я гаварыў.

Баяновіч

Хто? Бэсман?

Бэсман

Так.
Даволі нам у хованкі гуляць:
Нас прадалі, камбрыг, Азорыч збег...

Галасы

Падлюгі! Сволачы!

Алёшка

Дамоў, хлапцы!

Баяновіч

Таварышы, без панікі, цішэй!
Калі Азорыч нават недзе збег,
То нам яшчэ нішто не пагражае,
А сілы нашыя растуць штодзень.
Вось партызаны к нам ідуць на помач...

Мелех

А колькі іх?

Баяновіч

Ды чалавек пяцьсот.

Алёшка

Ды хто-ж гэта крычыць: ратуйся?
Ах, баязліўцы!

Бэсман

Марныя надзеі!
Азорыч выдаў партызан палякам.

Баяновіч

Ты што? Ты бунтаваць людзей надумаў?

Бэсман

Я не бунтую іх, а я ратую:
Азорыч выдаў партызан палякам,
Пра гэта мне казалі іх-жа людзі.

Баяновіч

Якія? Хто?

Бэсман

Паказваючы на Сёмку Бегунка.

Вось гэты чалавек.
Ну, гавары, таварыш, што ты бачыў?

Баяновіч

Ды ён, напэўна, сам з панамі спеўся.

Сёмка

Што-ж, была навука,
Сеў у панскія сані без друка,
Мяне і адчасалі бізунамі.
Але цяпер я, людзі, не хлушу.

Мелех

Дык гэта праўда, што Азорыч выдаў?

Сёмка

Ён ратаваў мястэчка і людзей.

Бэсман

Няпраўду я сказаў? Скажу вам болей:
Орджанікідзе трапіў у палон
Таксама праз Азорыча.

Баяновіч

Што? Што?
Орджанікідзе трапіў у палон?
Арыштаваць яго, ён — правакатар!

Мелех

Мы не дазволім, камандзір.

Баяновіч

І вы?
І вы за правакатара, байцы?!

Мелех

Мы за Серго і самі за сябе.
І я задарам галавы сваёй
Нікому не аддам.

Баяновіч

Пусці, я сам...
Я сам яго застрэлю.

Бэсман

На, страляй!

Дамейка

Страляй у нас усіх.

Алёшка

На, бі ў мяне.

Сёмка

Глядзі, і ён, як п'ян, дык капітан,
А як праспіцца — курыцы баіцца.

Бэсман

Ну, што-ж ты не страляеш, камандзір?
Страляй у правакатараў, страляй!
А сам ты хто? Ты многа ваяваў?
Ты быў пад кулямі? Цябе палякі секлі?
Ты паглядзі на зраненыя грудзі
І на мае зрубцованыя плечы.
Я імі бараніў народную свабоду.
А вы яе прадалі розным гадам,
Прадалі рэволюцыю... Эх вы!
Хто ёсць сумленны тут — за мной!
Я пакажу вам здраднікаў. У штабе
Сядзіць Азорычава дзеўка ў нас.
Яна прыйшла шпіёнкаю сюды.

Галасы

Арыштаваць яе! Судзіць! Расстрэліць!

Дамейка

За мной, у штаб!

Баяновіч

Таварышы,
Сыны, адданыя свайму народу,
На абарону штаба і парадку!

Чырвонаармейцы

Не пусцім! Толькі цераз нашы трупы
Вы ступіце сваёй нагой у штаб.

Галасы

Цішэй! Цішэй! Яна ідзе! Ідзе!

Бэсман

Цяпер, Дамейка, дзейнічай адзін.
А вы таксама больш рашуча, Стрыж.

Знікае ў натоўп. Уваходзіць Тацяна Марыч і Адась Валошын.

Алёшка

А, вось яна! Ану, красуня, пагаворым.

Галасы

Чаго там гаварыць! Прыкладам бі!

Валошын

Прэч адыйдзі!

Баяновіч

Дазвольце-ж ёй сказаць.

Тацяна

Сябры, што вам патрэбна ад мяне?

Мелех

Ты дай адказ, чаго сюды прыйшла —
Шпіёніць? Прадаваць палякам нас?

Тацяна

Што вы гаворыце? Сябры мае!..
Таварышы! Ні перад кім: ні перад вамі,
Ні перад змучаным маім народам,
Ні перад гэтаю скрываўленай зямлёй —
Не вінавата я.

Алёшка

Ты брэшаш, брэшаш!

Тацяна

Дазвольце-ж мне сказаць.

Галасы

Даволі! Годзе!

Валошын

Таварышы, дазвольце слова мне.
Падумайце, прачуйце вашым сэрцам,
Што робіце, куды вы ідзяце?
Краіне пагражае небяспека,
Зняволены і змучаны народ
Апошнія свае напружыў сілы
І, як адзін, паўстаў ад краю ў край
Супроць адвечных ворагаў сваіх.
А вы што робіце? Куды вы ідзяце?
Забыўшыся на свой пачэсны абавязак
І ашуканыя варожымі людзьмі,
Вы ідзяце супроць свайго народу,
Вы здрадзілі сваім братам па класу,
Вы здрадзілі самім сабе...

Мелех

Чакай!
А хіба самі мы супроць змагання?
Мы не супроць, а мы супроць шпіёнкі.

Баяновіч

Калі яна сапраўды вінавата,
Давайце разбірацца і судзіць.

Дамейка

Няма калі судзіць і доўга радзіць,
І наш прысуд даўно вядомы: смерць!

Тацяна

За што-ж мне паміраць? Што я сумленна
Служыла нашай справе?

Мікола

А палякам ты не служыла? Не?

Тацяна

Што бачу я?
Дык вось адкуль усё!

Алёшка

Чаго-ж маўчыш?!

Тацяна

Таварышы, ён вораг сам, ён сам...

Мікола

Вы бачыце, сябры, якая хітрасць?!
Яна ўсіх нас у ворагі залічыць.

Мелех

Ты, грамадзянка, нас не ашукаеш,
Калі жадаеш — праўду гавары.

Тацяна

Клянуся вам, ён вораг ваш і мой.
Я бачыла яго у польскім штабе.

Дамейка

Чаго-ж ты там была, у польскім штабе?

Алёшка

Ага, папалася сама, уліпла!

Да натоўпу з Настаю падыходзіць Макарэнка; ён звяртаецца да Бэсмана.

Макарэнка

Што сталася, таварыш камандзір?

Бэсман

Вярнуліся? Орджанікідзе тут?

Праціскаецца да Стрыжа і Дамейкі

Мелех

Ну, адкажы: чаго-ж ты там была?

Тацяна

Мяне арыштавалі там, і я
З Азорычам на допыце была.

Дамейка

А як-жа ты сюды папала?

Тацяна

Мяне адбілі ў лесе партызаны.

Мікола

Цябе адну?

Тацяна

Адну.

Мікола

А дзе-ж Азорыч?

Алёшка

Ага, заблыталася!

Галасы

Хлусіць! Хлусіць!

Баяновіч

А што калі яна гаворыць праўду?
Вы знаеце, хто гэты чалавек?

Бэсман

Праціснуўшыся да Дамейкі.

Не дайце ім апомніцца, хутчэй,
Орджанікідзе тут.

Дамейка

І ты за іх?
Таварышы, і камандзір за іх,
Які-ж тут можа быць праўдзівы суд!

Баяновіч

Я патрабую даць дзяўчыне слова.

Галасы

Няхай гаворыць! Дайце гаварыць!

Тацяна

Калі вы мне не верыце, дык мне
Няма аб чым вам гаварыць.
Ну што-ж, забіце, я памру спакойна.
Але клянуся вам жыццём і смерцю —
Ён правакатар, панскі паслугач!

Бэсман

Дурніца, сілаю бяры, хутчэй!

Дамейка

Даволі слухаць нудныя размовы.
На ворагаў, за мной, за мной, байцы!

Баяновіч

Я не дазволю вам камандаваць байцамі!

Дамейка

Бярыце сілаю!

Алёшка

Прыкладам бі!
Пусці!

Валошын

Не лезь, а то застрэлю!

Алёшка

Эх!

Адпіхае Валошына і прабіраецца, узняўшы прыклад, да Тацяны, яму заступае дарогу Наста.

Наста

Не дам! Забі мяне... Нашто мне жыць?
Мне цяпер — адзінокай —
Не патрэбна жыццё:
Да магілы глыбокай

Я ўжо страціла ўсё.
Майго любага сына
Адабрала вайна,
І надзеяй адзінай
Засталася яна.
Мае цёмныя ночы,
Мае цяжкія дні
Над нядоляй сірочай
Я гарэла ў агні.
І вось гэта дзяўчына,
Што сіроткай расла,
Замяніла мне сына
І мне шчасце дала.
Я, чакаючы смерці,
Перад вамі стаю,
Дык успомніце-ж сэрцам
Кожны маці сваю.

Усе стаяць маўкліва.

І ты-ж напэўна маеш недзе маці.

Алёшка

Вядома, ёсць... Ды я не вінават:
Мне, брат старэнькая, такі загад.

Дамейка

Ну, што-ж ты курчышся? Спужаўся слёз?

Алёшка

Ды як-жа тут? Старая кажа праўду,
Хай разбярэцца суд у гэтай справе.

Дамейка

Ваякі вы! Раскіслі, быццам бабы.
Пусці!

Выхапіў рэвальвер; паміж ім і Тацянай становіцца Орджанікідзе.

Серго

Чакай!

Галасы

Серго? Орджанікідзе?

Серго

Раззброіць малайца!

Дамейка

Не падыходзь!

Серго

Узяць! Збаяліся? Давай сюды!

Сілаю раззбройвае Дамейку.

Дамейка

За што-ж, за што-ж вы крыўдзіце, сябры?

Байцы выводзяць Дамейку.

Сёмка

Відаць, што пан прахвост,
Калі ўшчаміўся хвост.

Серго

Чаму няма каманды смірна? Я —
Член Рэвваенсовета арміі.
Падаць каманду!

Баяновіч

Смірна! Полк, раўнень..

Серго

Адставіць! Дзе там вам раўненне!
Што за кірмаш? Хто завадатай?

Баяновіч

Бэсман,
Начальнік коннае разведкі.

Серго

Бэсман,
Наперад марш!

Усе аглядаюцца, Бэсмана няма.

Галасы

Няма! Уцёк! Уцёк!

Серго

Ён ведае аб нашым наступленні?

Баяновіч

Напэўна, ведае.

Серго

Вароны вы!
Пасланць за ім людзей і затрымаць.

Баяновіч бярэ байцоў і выходзіць.

Ну, раскажыце мне, што тут за гвалт?
Я слухаў і вушам сваім не верыў,
Каб вы маглі такое гаварыць.
Збаяліся паноў?

Мелех

Не баязліўцы мы.

Серго

Я ведаю, чырвоныя байцы
Не папытаюць, колькі там паноў,
А папытаюць, дзе яны стаяць.
Дык хто-ж паверыў ім прахвостам, а?

Галасы

Алёшка Семізвон! Нічыпар Мелех!

Серго

Алёшка Семізвон, Нічыпар Мелех,
Наперад марш!

Алёшка

Таварыш камісар,
Здаецца, я быў самы тут спакойны.

Серго

Ну, раскажы сябрам, Нічыпар Мелех,
Куды ты іх павёў, супроць каго.

Мелех

Я слухаю. Даруй мне, камісар.
Але нам сказана, што ты ў палоне.
Што мы абкружаны, Азорыч збег,
Павёў на партызан палякаў, і нам...
Тужліва стала, камісар, і крыўдна.

Серго

І ты паверыў ім?

Мелех

Пяць год вайна,
І мы стаміліся.

Макарэнка

А мы?
Мы — сіраты, малыя дзеці?
Калі былі вы на вайне,
Мы йшлі з парога да парога,
Жабруючы па гэтым свеце.
І нашы грудзі рэзаў вецер,
І скрозь па стоптаных дарогах,
За панскім плугам на раллі,
Лятункі нашы адцвілі,
Як вішні адцвітаюць без пары...
Хіба-ж мы не стаміліся, стары?
Эх, баязліўцы вы!

Мелех

Ты малады,
Ты гора гэтулькі не бачыў.

Алёшка

І невялікі твой ваяцкі стаж.

Серго

Стаж у яго маленькі, гэта праўда,
Таму што маці позна нарадзіла,
Але затое справы не благія.
Не вам і дакараць.

Мелех

Даруйце нам.

Серго

Вось бачыш, як у вас. А помніш, Мелех,
Ты гаварыў, што людзі ўсе — звяры.
А хіба вы звяры? Вы — проста дзеці,
Мне хочацца вас гладзіць па галовах,
А я... я вымушаны вас караць.
Аддайце зараз-жа свае вінтоўкі.
Вы зганьбілі высокае імя байцоў
Вялікай пролетарскай арміі.
Ну, што-ж вы стаіце маўкліва, Мелех?

Мелех

Што-ж сказаць на твае дакоры?
Калі праўда — цярпі і маўчы,
Хоць нялёгка нам, гэты сорам
І пакуты свае несучы.
Ліхаманкай гарацЬ нашы твары,
Калі ты нам у вочы глядзіш.
Лепш вядзі нас, злачынных, таварыш,
У агонь, у магілу, пад крыж,
Хоць куды. Абы змыць гэты сорам
Ці загінуць у бойцы не ў час,
Каб ні людзі, ні сонца, ні зоры
Не глядзелі з дакорам на нас.

Серго

Не вас, а Бэсмана павесці-б трэба
Пад гэты крыж. А нам, таварышы,
Патрэбна пільным быць, патрэбна верыць
У нашы сілы. Хіба можа нас
Хто-небудзь разграміць? Ніколі, не!
Нішто, нішто не зможа нашай сілы,
Таму што не парушыць нашай дружбы.

Мелех

Даруй ты мне за ўсе мае грахі.
І ты, таварышка, таксама мне даруй.
Аблыталі мяне ліхія людзі,
І я вялікі грэх мог на душу узяць.
Даруйце мне.

Алёшка

І мне таксама
Гарачы вельмі я і храбры лішне.

Сёмка

Справы няважныя, калі ногі адважныя,
Лепш нага кульгавая, а галоўка бравая.

Мелех

Таварыш камісар, дык як-жа будзе?

Серго

А будзе, брат Нічыпар Мелех, так:
Змый сорам свой адвагаю і славай,
Магчымасці для гэтага табе дадзім.
Сягоння мы павінны наступаць.
Сягоння мы павінны ўзяць Барысаў.
Абрабаваны, змучаны народ
Чакае вызвалення з панскіх крат.
Сыны народа, мужныя байцы,
Не пашкадуем нашага жыцця,
Пакрыем славай баявыя сцягі
І прынясем на іх свайму народу
Свабоду, сонца, шчасце і жыццё.
Кляніцеся, што будзеце змагацца дружна,
Што будзеце любіць сваіх братоў,
Усіх працоўных, бедных і гаротных.

Галасы

Клянемся!

Серго

Ведайце, што нас
Не пераможа ў дружбе аніхто,
І на шляху вялікім гэтым — нас
Чакае слава, шчасце, перамога.

Галасы

Клянемся, ведаем, што нас
Не пераможа ў дружбе аніхто.

Серго

Паходную! Наперад, запявалы!

Байцы строяцца, грыміць песня.

Песня

Над Бярозай-ракой, над далінаю,
Заігралі гарністы паход:
— Узнімайся, сям'я сакалiная,
Уставай на змаганне, народ!
І сышліся пад зоркай чырвонаю
Ад заводаў, палёў малайцы.
Пояць коней вадою сцюдзёнаю
Ля крыніц удалыя байцы.
Сэрца кожнага думкай запалена
Баявы ажыццёвіць загад.
І па слову любімага Сталіна
За атрадам спяшае атрад.
І па волі вялікага Леніна
Дружна рушаць атрады на бой,
Каб жыццё і квяціста і зелена
Зацвіло над Бярозай-ракой.

Суровым маршам ідуць калоны. Песня паволі аддаляецца і...

## МАЛЮНАК ДЗЕВЯТЫ

...Песня набліжаецца ізноў і грыміць з большай сілай. У пажоўклым панскім парку пад Барысавам ападаюць лісты. Спакойна коціцца шырокая рака Бяроза. З палацаў бягуць устрывожаныя жаўнеры і спешна акопваюцца ў парку. Песня чырвонаармейцаў пераходзіць у магутны баявы вокліч. На ганак выбягае палкоўнік Дамброўскі.

Дамброўскі

Сержант!

Сержант

Я слухаю.

Дамброўскі

Гатовы коні?

Сержант

Гатовы, пан палкоўнік.

Д а м б р о ў с к і

Падавай!

Сержант паспешна выбягае.

Д а м б р о ў с к і

Якая нечаканасць! Матка боска,
Малю цябе, ратуй маю душу.

З чамаданамі выходзіць Свідэрскі.

Д а м б р о ў с к і

А вы куды?

С в і д э р с к і

Туды-ж, куды і вы.

Д а м б р о ў с к і

Ды я нікуды, што вы, пан Свідэрскі!

С в і д э р с к і

Нашто нам прытварацца, пан Дамброўскі?

Д а м б р о ў с к і

Але-ж я вас хацеў, пан капітан,
Пакінуць тут начальнікам над войскам.

С в і д э р с к і

Я-ж не ваяка, пан палкоўнік, так?
Я толькі, кажуць, першы між гуляк,
І лепш начальнікам застацца вам.

Д а м б р о ў с к і

Ды што вы, божа барані! А зрэшты
Тут можа справіцца адзін сержант.

С в і д э р с к і

Я думаю таксама, пан палкоўнік.
Сержант!

Уваходзіць сержант.

Сержант

Я слухаю.

Свідэрскі

Гатовы коні?

Сержант

Гатовы, пан Свідэрскі.

Свідэрскі

Падавай!

Убягаюць Ксаверы і Мікола Стрыж.

Мікола

О, пан палкоўнік! Пан Свідэрскі!

Ксаверы

Божа!
Што-ж гэта робіцца?

Мікола

Скажыце нам,
Вы абарсніце мястэчка наша?

Свідэрскі

Сказаць не можам, тайна, пане Стрыж.

Ксаверы

Ну, значыць, ясна: трэба уцякаць.
Мікола, марш! Няма чаго тут быць.

Мікола і Ксаверы знікаюць.

Свідэрскі

Вы бачыце, як лёгка і адразу-ж
Яны адзін другога зразумелі.
А мы стаім ды трацім час. Пайшлі!

Убягае ўзбуджаны Казімер Бэсман.

Бэсман

Спыніцеся! Што робіце, панове?!

Дамброўскі

Эвакуіруемся, пан паручнік.

Бэсман

Якая ганьба, пан палкоўнік, жах!
З такімі сіламі, з такою зброяй
Спужаліся трохсот большэвікоў!

Дамброўскі

Усё-ж адно Барысаў наш не будзе.

Бэсман

Вы глупства кажаце, палкоўнік, глупства!
Я ведаю, што сіл у іх няшмат,
І сілы кінуты на гэты фланг,
А пад Кальварыяй на ўсім участку
Не больш двухсот-трохсот якіх байцоў.
Я прапаную вам наступны план:
Сабраць каля кальварыі ўсе сілы,
Зрабіць прарыў і рушыць у абход,
Каб правы іхні фланг замкнуць кальцом
Тады не толькі войска і абозы,
А й сам Орджанікідзе будзе ў нас.

Дамброўскі

А хто-ж адважыцца на гэтым флангу
Стаяць супроць такой шалёнай сілы.

Бэсман

Абараняцца тут я буду сам,
А ваша справа там зрабіць прарыў.

Дамброўскі

Ну што-ж, пан капітан, пайшлі?

Свідэрскі

Пайшлі,
Я думаю, там будзе спакайней.

Дамброўскі і Свідэрскі выходзяць.

Бэсман

Жаўнеры! Час настаў адказны.
Усе паляжам нашымі касцьмі
І адстаім свой гонар і айчызну.

Жаўнеры

Папробуй адстаяць! Ох, націскаюць, чэрві!
Глядзі, паўзуць! Абкружаць зараз. Слухай,
Давай, брат, уцякаць. Давай!

Бэсман

Жаўнеры!
Ні з месца! Стойце! О, пракляты зброд!

**Бяжыць,** адстрэльваючыся, за жаўнерамі. У парку паказваюцца чырвонаармейцы. Сярод іх: Макарэнка, Алёшка Семізвон, Нічыпар Мелех, Кузьмін.

Макарэнка

Наперад, хлопчыкі, наперад!

Алёшка

Глянь,
Ды гэта-ж Бэсман!

Мелех

Дзе? Чакай-жа, сволач!
Чакай-жа, я з табою разлічуся. *(Страляе.)*
Прамазаў, чорт!

Алёшка

Давай узяць жыўцом!

**Бягуць** услед за Бэсманам. З'яўляюцца Орджанікідзе, Баяновіч і Тацяна.

Баяновіч

Дзевяты полк, таварыш камісар,
Прайшоў на лінію Прудзішчы — Стахаў.
Сялітрынкі заняты шостай ротай.
Далейшы рух часцей на левым флангу
Пакуль прыпынены...

Серго

З якіх прычын?

Баяновіч

Не маем сувязі з другой брыгадай
І з ротамі, якія наступаюць
З усходу на Кальварыю.

Серго

І што-ж?

Баяновіч

І рухацца наперад небяспечна:
Калі Кальварыі не возьмуць нашы —
Мы трапім у мяшок.

Серго

Дык трэба ўзяць.

Баяновіч

Кальварыю абараняе часць
Палкоўніка Дамброўскага, адна
З найбольш трывалых і старых часцей.

Серго

Калісці ў час вайны з Напалеонам
Мы не палкоўніка, а генерала
Дамброўскага на гэтым месцы білі.

Баяновіч

Народ галодны, змучан пераходам,
І вытрымаць такія тэмпы руху —
Байцам надзвычай цяжка.

Серго

Ваша праўда,
Але галоўнае цяпер для нас —
Не даць панам апомніцца ані,
Таму што толькі нечаканы націск
І вырашае нашу перамогу.
Пасля, калі ім Бэсман данясе,
Што сілы нашы меншыя за іх,
Нам будзе вытрымаць яшчэ цяжэй.
Аддайце зараз-жа часцям загад
Рашуча наступаць уздоўж ракі
І горад абхапіць кальцом.

Баяновіч

Тады
Я папрашу на помач батальён.

Серго

А што калі палякі зразумеюць,
Што сілы нашы кінуты на фланг
І рушаць на Кальварыю, на ўсход.

Баяновіч

Не здагадаюцца.

Серго

Дык Бэсман скажа.

Баяновіч

Праз лінію акопаў ён не пройдзе:
Усім часцям аддадзены загад
За фронт не прапускаць ані душы.

Серго

Нам трэба быць гатовымі на ўсё
І берагчы рэзервы да канца.
Ідзіце, я не дам пакуль ні роты.
Выкарыстоўвайце лясістасць месц,

Трымайце сувязь, дзейнічайце дружна
І аб усім даносьце неадкладна.
Мой штаб змяшчацца будзе тут у доме.

Баяновіч

Я слухаю. *(Выходзіць.)*

Серго

Тацяна Марыч!

Тацяна

Я.

Серго

Вось тут размесціце і лазарэт.

Тацяна

Я зараз-жа, таварыш камісар.

Ідзе ў пакой. Серго глядзіць у бінокль.

Серго

Што там каля Кальварыі такое?
Чаму няма дагэтуль данясення?
Калі туды паспеў прабрацца Бэсман,
Ён можа нам нашкодзіць вельмі шмат.

Уваходзяць з клункамі і з гаршкамі Наста, Алена, Марыся, Тэкля і Зяма.

Алена

Дзень добры вам.

Серго

Дзень добры, жаначкі.
Вы што?

Алена

Абед, таварыш камісар.

Серго

Каму?

Тэкля

Ды вам-жа.

Серго

Мне?

Наста

Не толькі вам,
А і салдатам вашым.

Серго

Гэта добра,
Яны-такі галодныя, як след.
Ну што-ж, сябры, нясіце... пятай роце.

Тэкля

А там з гармат страляць па нас не будуць?

Алена

Снарады стануць траціць на цябе.
Пакалышы яго тут, Зяма, трошкі.

*Здымае з плячэй калыску з дзіцем.*

Зяма

Не баўцеся-ж, я чалавек заняты.

Серго

Хлапец, дзяўчына?

Алена

Хлопчык.

Серго

О, герой!

Тэкля

А каб-жа глянулі вы на майго...

Наста

Ну, досыць траціць час, хадзем, кабеты.

Тацяна і жанчыны выходзяць.

Серго

Якой цудоўнай дабраты народ!
Калі палюбіць ён каго душой,
Аддасць яму і кроў сваю і сэрца.

Ідзе ў штаб. Кузьмін пад вінтоўкай вядзе Ксаверыя і Міколу Стрыжа.

Кузьмін

Сюды, сюды, у штаб, каманда. Стой!
Начальнік ёсць?

Зяма

Галоўны самы ёсць.

Кузьмін

Серго? Яго, брат, нельга турбаваць
Такой драбніцай.

Серго *(праз акно)*.

Гэта ты, Кузьмін?

Кузьмін

Я сам, таварыш камісар.

Серго

Ну, што?

Кузьмін

Ды вось злавілі нейкіх падазроных,
Хацелі да паноў. Куды іх дзець?

Орджанікідзе выходзіць на ганак.

Серго

Вы хто такія?

Зяма

Нашыя, Стрыжы.

Серго

Стрыжы? Дык з Бэсманам муцілі вы?
Дзе Бэсман сам?

Мікола

Ён адступіў з палком.

Серго

Ён, значыць, там ужо?

Мікола

Напэўна, там.

Кузьмін

Эх, чорт, няхай-бы лепш папаўся ён!

Серго

Вядзіце здайце іх канвойнай роце.

Ксаверы

Начальнік дарагі, за што-ж ты нас?
Не вінаваты мы, вось крыж святы!

Кузьмін

Пайшлі, пайшлі! *(Выводзіць Стрыжоў.)*

Серго

Выходзіць, — Бэсман там.
Чаму-ж яны паспешна адступаюць?
Ах, вось у чым, напэўна, іхні план:
Тут Бэсман дэманструе абарону,
А націску галоўнага чакаць
Патрэбна на Кальварыю. Ды не,
Не ўдасца вам! Тацяна Марыч!

Знайдзі Валошына і перадай:
Падрыхтаваць атрад да наступлення.

Тацяна

Ёсць, перадам, таварыш камісар!
*Орджанікідзе шпарка ідзе ў штаб.*

Зяма

Эх, і гарачая-ж работа ў іх,
А я сяджу ды калышу дзяцей.
*З пазіцыі варочаюцца жанчыны.*

Тэкля

Як глянула я на яго, аж страх:
Рука вісіць, як нежывая, кроў...

Наста

Ты, можа, трохі памаўчала-б, Тэкля.

Тэкля

Калі я маю людзям што сказаць,
Дык я павінна выказаць усё...
Іначай разапрэ мяне, як бочку.

Алена

Ад пустаты не разапрэ ніколі,
А ў галаве ў цябе-ж ніводнай думкі.

Тэкля

Калі-ж мне думаць, родная мая.
Тут кожную хвіліну навіна.

Тацяна

Што там такое?

Наста

Ранены.

Тацяна

Алена,
Мне трэба на хвіліну адлучыцца.
Вы перавязку зробіце?

Алена

Зраблю.

Тацяна

Дык я пайшла. *(Выходзіць.)*

Наста

Не трэба памагчы?

Алена

Ды не.

Наста

Дык мы дагледзім пойдзем хворых.

Наста і Тэкля выходзяць.

Алена

Не плакаў?

Зяма

Не.

Алена

Ты пасядзіш яшчэ?

Зяма

Абрыдала.

Алена

Я скора забяру.

Алёша гядзе раненага Мелеха.

Алёшка

Нічога, не гаруй, Нічыпар.

Мелех

Крыўдна!..

Алёшка

Я прывяду табе яго жыўцом.
Сабакам назавеш, калі схлушу.

Алена

Давайце, чалавек, перавяжу.

Алёшка

Ну, папраўляйся, мне, браток, пара.
А Бэсмана табе я прывяду
Жывога, а ці мёртвага. *(Выходзіць.)*

Зяма

Баліць?

Нічыпар

Баліць, сынок.

*(Пачынае плакаць дзіця.)*

Зяма

Не дасць пагаварыць.

Алена

Пакалышы, пазабаўляй яшчэ хвілінку.

Зяма

Хлапец, а плача, як дзяўчына, спі.

*Калыша. Уваходзіць Серго Орджанікідзе.*

Серго

І галасок у сына, як у маткі!
Нічыпар Мелех? Ранены?

Мелех

Рука...

Серго

А дзе і як цябе пачаставалі?

Мелех

Каля Бугроў.

Серго

Нічога не чуваць.
Давай пазабаўляю хіба я.
На цацку, на! Не хоча нават слухаць.
Ідзі, Алена, суцяшай сама,
А я перавяжу. А то яшчэ
Пабачыць Баяновіч — засмяе:
За няньку, скажа, раіў быць дарослым,
А сам не ўціхамірыць малыша.

Перавязвае Мелеху руку.

Серго

Дык як і дзе табе ўдружылі?

Мелех

Бэсман.
Заўважылі яго мы тут у парку.
Я выстраліў адразу і прамазаў.
Тады мы рынулі за ім услед.
Я ўжо амаль схапіў яго за карак,
І вось рука павісла нежывой.

Серго

Дармо, паправішся, Нічыпар Мелех.
А я хачу табе сказаць, што дома
Сям'я твая зямлю ўжо атрымала.
Сягоння мне прыслалі тэлеграму.

Мелех

Не варты я, таварыш камісар.

Серго

Сваю віну ты змыў сваёй крывёй.

Мелех

Я дзякую табе.

Серго

За што?

Мелех

За ласку;
Ты маладзейшы за мяне, а ты,
Як бацька, сэрца абагрэў маё.
Мне любы стаў і свет, і дом, і сын.

Серго

А сын вялікі?

Мелех

Восьмы год пайшоў.

Серго

А як мяркуеш, кім твой будзе сын?

Мелех

Мне хочацца, каб быў ён мараходам,
Аб'ездзіў свет увесь, людзей пабачыў,
Краіны розныя, якіх я сам
Не меў шчаслівай долі паглядзець.
А горача любіў я Волгу нашу.
Магутная рака! Плыве спакойна,
Як думы тыя ў маладыя леты,
Ці лёгкі сон.

Серго

А на Каўказе ў нас,
Там рэкі бурныя. Грымяць і выюць,
Укрытыя пушыстай белай пенай,

Аж рэха скрозь ідзе... А горы, горы!
Вяршыняй дастаюць да самых зор.
Цудоўны край! Як скончыцца вайна,
Давай са мной паедзем на Каўказ.
Ты паглядзі, якая там краса!

Паказвае фатаграфічны здымак.

Мелех

А гэта твой партрэт?

Серго

Падобны? Не?

Мелех

Калі ты крыўды на мяне не маеш,
То падаруй на памяць гэту картку.

Серго

Упадабалася? Ну што-ж, вазьмі.

Мелех

Не ведаю, чым я табе аддзячу.
Калі-б не правай не было, а левай —
З адной рукой пайшоў-бы за табой.
А так — даруй: усё, што мог, зраблю.

Серго

Папраўшся, таварыш, не тужы.

Уваходзіць Тацяна Марыч.

Тацяна

Таварыш камісар, Адась Валошын
З атрадам зараз будзе тут.

Серго

Цудоўна!
Бывай, мой дарагі, здароў. Алена,

Ты правядзі яго ў палату.

Орджанікідзе і Гацяна ідуць у штаб.

Алена

Пойдзем.

Мелех

Я маю справу тут адну. Ідзі,
Я сам прыду. *(Алена выходзіць.)*
Сынок, пісаць умееш?

Зяма

Умею.

Мелех

Напішы дамоў мне ліст.

Зяма

А што вам напісаць?

Мелех

Пішы вось так:
Дзень добры, дарагі мой сын і жонка.
Я жыў і рад цяпер свайму жыццю.
Хоць і паранена мая рука,
Але я змыў з душы крывёю ганьбу.
А вывеў цёмнага мяне на шлях
Адзін вялікай праўды чалавек.
Завуць яго Серго Орджанікідзе.
Я шмат пражыў і гора зведаў шмат,
А век ніхто мне не зрабіў дабра.
І стала мне на свеце гэтак горка,
Ажно ад крыўды сэрца галасіла.
А ён узяў маю душу, напоўніў сілай
І асвяціў жыццё маё, як зорка,
І даў маю мне долю... Напісаў?

Зяма *(піша)*.

І асвяціў жыццё маё, як сонца...

Мелех

Я гаварыў: як зорка.

Зяма

Сонца-ж лепей:
І асвяціў жыццё маё, як сонца.

Мелех

І праўда, лепш. Пішы, сынок, далей.
Я пасылаю вам яго партрэт,
Вы закажыце ў Ключнікава рамку
І памясціце гэту картку на сцяне,
А багародзіцу адсуньце трохі.

Зяма *(піша)*.

А багародзіцу зусім здыміце...

Мелех

Ну, гэтага, сынок, ты не пішы.
Няхай вісіць.

Зяма

Дык я ўжо напісаў.

Мелех

А выкрасліць як-небудзь нельга там?

Зяма

Ліст папсуем.

Мелех

Ну што-ж, хай будзе так,
Як і напісана. Пішы далей.
Глядзіце на яго пад час уцехі,
Пытайце рады ў цяжкія хвіліны,
Любіце, як і ён, усіх людзей

І ненавідзьце тых, каго і ён.
А будзе мне не суджана вярнуцца,
Дык помніце, што ён вас не пакіне.
Усім перадаю вам свой паклон,
Бывайце жывы і здаровы. Ваш
Нічыпар Мелех. Напісаў? Усё.

За сцэнай чуваць голас Валошына.

Валошын

Раз, два! Раз, два! Атрад, на месцы стой!
Пакуль што вольна, можна разыйсціся.

Уваходзяць Валошын, Карабан, Шчырэц, Штэйнар, Бегунок і інш партызаны.

Валошын

Дзе камісар?

Мелех

У штабе. Пойдзем, сынку.

Сімха

Ты што, знайшоў сабе другога бацьку?

Зяма

Ой, тата! Мілы!

Сімха

Сыне мой!

Мелех

Ваш сын?
Цудоўны хлопчык! Дзесьці і ў мяне
Таксама ёсць такі.

Сімха

Ты тут адзін?

Зяма

Ды не, Тацяна, цётка Наста, Тэкля...

Шчырэц

Глядзіце, і мая царыца тут!

З пакояў выходзяць Тацяна Марыч, Наста Алена з дзіцем і Тэкля.

Карабан

І не адна: з наследнікам прастола.

Алена

Вось я вас пасмяюся, манархісты!

Шчырэц

Не забывайся, я не партызан,
А рэгулярнай арміі баец.

Сёмка

А заўтра можа быць і генералам.

Сімха

Цішэй, ідзе Серго Орджанікідзе.

На ганак выходзіць Орджанікідзе.

Валошын

Каманда, смірна!

Серго

Вольна, вольна, хлопцы.

Убягае ўсхвалёваны Макарэнка.

Макарэнка

Гаворыць не пераводзячы духу.

Таварыш камісар, дазвольце, часць
З поўночы наша заняла баі...

Серго

Што, што? Не разумею.

Макарэнка

Не магу.

Серго

А ты, друг, не спяшай, ты спакайней.

Макарэнка

Дазвольце далажыць, што наша часць
З паўночы заняла раён заводаў,
Баі ідуць на вуліцах прадмесця.

Серго

Барысаў? Макарэнка! Друг ты мой!
Абдымемся. Вітаю. Малайцы!
Спяшай хутчэй назад і перадай:
Замацавацца на занятых пунктах,
Біць групу кальварыйскіх войск у тыл.
Цяпер напэўна супрацiўнік рушыць
Удары на Кальварыю. Спяшай!
Мы зараз прыдзем вам на дапамогу.

Макарэнка

Ёсць, перадам, таварыш камісар!

*Макарэнка шпарка выбягае.*

Серго

Таварышы! Віншую з перамогай.
Барысаў з поўначы ужо заняты.
Задача наша — дружнаю атакай
Заняць Кальварыю.

Кузьмін

Гэй, прапусціце!

*Кузьмін і Алёшка вядуць Бэсмана.*

Алёшка

Таварыш камісар, злавілі гада!

Серго

Якога?

Кузьмін

Бэсмана.

Серго

А дзе вы ўзялі?

Алёшка

Ён вывеў часць і рушыў у атаку...

Кузьмін

Мы сцерпелі, ударылі па іх...

Алёшка

І ўехалі, у іх-жа на плячах,
У прыгарад...

Кузьмін

І бег-жа ён ад нас!

Алёшка

Ды я за ім сачыў і не адстаў.
Ну што, стрымаў я слова, Мелех, а?

Мелех

Стрымаў, Алёшка, дзякую табе.

Серго

Такі злавілі вас, Казімер Бэсман!

Тацяна

Не Бэсман ён зусім, ён — Завішынскі.
І ён Азорыча прадаў, падлец!

Наста

Дык вось які яго згубіў паганец!

Серго

Чакай, старэнькая. Народны суд —
Ён будзе і тваім судом за сына,
І цяжкай кары пану не мінуць

Бэсман

Вы запазніліся мяне караць:
Я ўсё сваё зрабіў.

Серго

Карысць малая:
Наш батальён ужо заняў прадмесце,
І горад будзе цераз ноч у нас.

Бэсман

Заўчасна гутарыць аб перамозе.
Вы не падумалі, што вашы планы
Я ведаю таксама, і на фланг
Вы кінулі ўсе часці. А на флангу
Мы толькі дэманструем наступленне,
Галоўныя сабраўшы нашы сілы
Каля Кальварыі. Адным ударам
Змятуць яны з усіх пазіцый вашых

*У кірунку Кальварыі грыміць кананада.*

Вы чуеце?

*Убягае Баяновіч*

Баяновіч

Таварыш камісар,
На Кальварыйскім пункце супраціўнік
Два батальёны вывеў свежых сіл
І перайшоў ізноў у наступленне.

Бэсман

І гэтай сілы вам не затрымаць,
Рэзерваў свежых больш у вас няма.
Барысаў будзе наш, іду ў заклад.

Серго

Прайграў, паручнік.

Бэсман

Выйграў, камісар.

Серго

Адась Валошын, вывесці атрад
І рушыць на Кальварыю ў атаку.

Валошын

Ёсць вывесці атрад!

Бэсман

Які атрад?..

Серго

Пакуль вы думалі аб нашых планах,
Дык мы стварылі цэлы батальён.
І ты прайграў, паручнік, і Барысаў
І галаву сваю прайграў. Забраць!

Канвойныя выводзяць Бэсмана.

Серго

Таварышы, вы разумееце цяпер,
Якая наша трудная задача?
Нам выпала на долю разграміць
Апошняе гняздо белапалякаў.
Я спадзяюся, новыя байцы
Вялікай арміі пролетарыята,
Што вы не пашкадуеце жыцця
І здзейсніце пачэсны абавязак.

Галасы

Не пашкадуем! Выпаўнім! Клянемся!

Серго

Пастроіцца!

Валошын

Атрад, увага! Стройся!

Серго

А ты куды?

Сёмка

Ды з вамі, ваяваць.

Серго

Вось так? Раздзеты? Босы? Не, не пойдзеш!

Сёмка

Таварыш камісар, а дзе-ж мне дзецца?

Серго

Ідзі дамоў.

Сёмка

Ды я не маю дому,
Мне трэба дом яшчэ заваяваць.

Серго

Цяпер не лета, холадна, дажджы,
І ты без шыняля не пойдзеш, друг.

Сёмка

Мужчыны, як-жа я адзін, без вас?

Штэйнар

Дазволь яму, таварыш камісар.

Валошын

Ён цэлы дзень вучыўся, як страляць.

Серго

Ну што-ж, хай застаецца тут пры штабе.

Сёмка

Ды не магу адзін я заставацца.

Серго

Што-ж мне рабіць з табой? Бяры, на мой!

Здымае з плячэй свой шынель.

Сёмка

Ды што вы? Не, таварыш камісар,
Такой пашаны я не заслужыў.

Серго

Бяры!

Сёмка

А як-жа вы?

Серго

Я маю бурку,
А ты нічога, друг.

Сёмка

От чалавек!
Шчаслівы той, хто нарадзіў цябе.

Серго

Будзь ласкава, падай, Алена, бурку.

Бярэ на рукі Аленіна дзіця.

Дзіця я патрымаю. Вось, сябры,
Сын будучай шчаслівае краіны,
За лёс якой мы праліваем кроў.
Расці, малы. Праз дваццаць нейкіх год
Заместа нас ты станеш сам
На абарону роднае краіны.

Не беднай і пакутнай, як цяпер,
А радаснай, багатай і шчаслівай.
На, беражы яго для тых вялікіх дзён.

Бурка замінае Алене ўзяць дзіця.

Наста

Вы дайце мне. *(Бярэ дзіця.)*

Серго

Гадуй яго, старая,
Як гадавала ты свайго. А мы —
За будучыню гэтага дзіцяці,
За радасці бацькоў, за іх спакой
І за цябе, радзіма — наша маці,
Смялей, таварышы, смялей у бой!

Накідае на плечы бурку і вядзе атрад у бой за вызваленне.

1939 г.

## ЗМЕСТ


*Стар.*

Пятро Глебка—прадмова М. Клімковіча . . . 5
Ад аўтара . . . . . . . . . . . . 42

1925—1930 гг.

Жаданне . . . . . . . . . . . . . 45
Песня жняі . . . . . . . . . . . . —
*** Нашто гадаць і марыць аб далёкім . 46
Як раней . . . . . . . . . . . . —
Вясна (Ты вясна маладая красуня) . . . 47
Клён завяў . . . . . . . . . . . . —
Гнуцца вербы . . . . . . . . . . . 48
Зацвілі зарніцы . . . . . . . . . . —
М. Багдановічу . . . . . . . . . . 49
Нашто захавала . . . . . . . . . . 50
І зоры, і месяц . . . . . . . . . . —
Вітанне . . . . . . . . . . . . . 51
Дзеўчыне з Заходняй Беларусі . . . . . —
Заклік да вясны . . . . . . . . . 53
Чырвонай Арміі парад . . . . . . . 54
Слова перамогі . . . . . . . . . 55
Рытмы . . . . . . . . . . . . . 56
Матчыны казкі . . . . . . . . . . 58
У дарогу . . . . . . . . . . . . 67
Хада падзей . . . . . . . . . . . 76
Трывожны сігнал . . . . . . . . . 87
З паэмы „Арлянка“ . . . . . . . . 101
З паэмы „Арка над акіянам“ . . . . 107

1931—1935 гг.

Урачыстасць . . . . . . . . . . . 119
Чатыры вятры . . . . . . . . . . 120
Мой шлях . . . . . . . . . . . . 123
Пра сваё жыццё . . . . . . . . . 124

*Стар.*


Дужасць . . . . . . . . . . . . . . 125
Наша пастанова . . . . . . . . . . . 126
Пачатак вясны . . . . . . . . . . . . 127
Перамога (У нас было шмат для гаворкі прычын) . . . . . . . . . . . 130
Скажы мнё, краіна . . . . . . . . . 132
Экзотыка . . . . . . . . . . . . . 133
Дзеўчына савецкае краіны . . . . . . 135
Вернасць . . . . . . . . . . . . . . 136
Адзіная айчына . . . . . . . . . . . 138
„Звязда“ . . . . . . . . . . . . . . 139
Умоўны знак . . . . . . . . . . . . —
Вясёлыя песні . . . . . . . . . . . 141
Нашай славы зара . . . . . . . . . 143
Песня . . . . . . . . . . . . . . . 144
Ад шчырага сэрца . . . . . . . . . . 146
На моры . . . . . . . . . . . . . . 148
Песні прыгону . . . . . . . . . . . 149
Аб песнях і героях (з паэмы „Карменсіта“) 153
Ноч у вайсковых лагерах . . . . . . . 157
Апошняя стрэча . . . . . . . . . . 165
Кара . . . . . . . . . . . . . . . . 170
Пра вясну і рэвалюцыю . . . . . . . 175
Эма . . . . . . . . . . . . . . . . 181


### 1936—1940 гг.


На пачатку лета . . . . . . . . . . 197
Летні дзень . . . . . . . . . . . . 198
Калыханка . . . . . . . . . . . . . 199
На варце . . . . . . . . . . . . . 200
Дазорны . . . . . . . . . . . . . 202
Песні аб граніцы . . . . . . . . . . 204
На прадвесні . . . . . . . . . . . . 206
Провады . . . . . . . . . . . . . . 207
Палёт . . . . . . . . . . . . . . . 209
Пілотам . . . . . . . . . . . . . . 210
Прысяга (У бярозавых прысадах) . . . . 211
Прызнанне . . . . . . . . . . . . . 213
Радасць . . . . . . . . . . . . . . 214
Ліст брату . . . . . . . . . . . . . 215
Снежаньскі вечар . . . . . . . . . . 220
Песня пра наркома . . . . . . . . . 221
Песня славы . . . . . . . . . . . . 222

*Стар.*


Помнік . . . . . . . . . . . . . . 224
Вялікі сын народа . . . . . . . . . . 225
Зімовы малюнак . . . . . . . . . . 227
Прывітанне . . . . . . . . . . . . 228
Нашы дні . . . . . . . . . . . . . 229
Песня фізкультурнікаў . . . . . . . . 230
Родным братам . . . . . . . . . . . 231
Мой дэпутат . . . . . . . . . . . . 232
Навагодні тост . . . . . . . . . . . 233
Памяці Серго Орджанікідзе . . . . . . 235
На нівах калгасных . . . . . . . . . 236
Хмаркі . . . . . . . . . . . . . . 237
Наш лес . . . . . . . . . . . . . 238
На рэчцы . . . . . . . . . . . . . 239
Плыты . . . . . . . . . . . . . . 240
Рыбак . . . . . . . . . . . . . . 241
Грыбы . . . . . . . . . . . . . . 242
Ягады . . . . . . . . . . . . . . 244
Канец лета . . . . . . . . . . . . 245
Дні сучаснасці . . . . . . . . . . . 246
Прысяга (Асенняй раніцою) . . . . . 247

**1941—1945 гг.**

Благаславенне . . . . . . . . . . . 253
Дзень вайны . . . . . . . . . . . . 254
Мужайся . . . . . . . . . . . . . 255
Галасы дарог . . . . . . . . . . . 256
Мы вернемся . . . . . . . . . . . . 257
Упартасць . . . . . . . . . . . . . 258
Песня партызан . . . . . . . . . . 259
Калгасны вартаўнік . . . . . . . . . —
Жніво . . . . . . . . . . . . . . 261
Героі . . . . . . . . . . . . . . 262
Да моладзі . . . . . . . . . . . . 263
Правадыр . . . . . . . . . . . . . 264
Зямля . . . . . . . . . . . . . . 266
Хмара . . . . . . . . . . . . . . —
Слова прысягі . . . . . . . . . . . 268
Гораду на Дзвіне . . . . . . . . . . —
Не спіце . . . . . . . . . . . . . 270
Вінтоўка . . . . . . . . . . . . . 271
Першамайскі салют . . . . . . . . . 272

*Стар.*

Аб чым спяваюць салаўі . . . . . . . 273
Пасылка . . . . . . . . . . . . , 274
Вячэрнія думы . , . . . . . . . . . 275
Партызаны . . . . . . . . . , . . 276
Пасланец . . . . . . . . . . . . 280
Райком . . . . . . . . . . . . . 282
Родны хлеб . . . , . . . . . . . . 283
Дзяўчыне з Клімавіч . . . . . . . . 284
Наказ . . . . . . . . . . . . . . 285
Гай . . . . . . . . . . . . . . 286
Беларусі . . . . . . . . . . . . 287
Роздум пад новы год . . . . . . . . 288
Смерць салдата . , . . . . . . . . . 289
Аповесць пра каня . . . . . . . . 290
Верш пра медаль . . . . . . . . . 293
Пісьмо з няволі . . . . . . . . . 294
Пра кнігі . . . . . . . . . . . . 295
Сны хлапчука . . . . . . . . . . —
Жывое слова . . . . . . . . . . . 296
Наша слава . . . . . . . . . . . 297
Чырвонай Арміі . . . . . . . . . 298
Вясна (Чулі добрыя навіны) . . . . . 299
Вызваленаму Мінску , . . . . . . . . 300
Перамога (Бой адгрымеў) . . . . . . 301
Зварот . . , . . . . . . . . . . . 302
Новы дом . , . . . . . . . . . . . 304
Пад небам бацькаўшчыны . . . . . . —

**Сцяг перамогі**

У тыя дні . . . . . . . . . . . . 309
Мужнасць . . . . . . . . . . . . 336

**Над Бярозай-ракой**

Акт першы . . . . . . . . . . . . 354
Акт другі . . . . . . . . . . . . 404
Акт трэці . . . . . . . , . . . . 453
Акт чацверты . . . . . . . . . . . 481

КНІГІ ПЯТРА ГЛЕБКІ

Шыпшына. Лірыка (Зборнік вершаў). Мінск, 1927, 77 стр., тыр. 2.000 экз., ц. 50 к.

Урачыстыя дні (вершы). 1930, 61 стар., тыр. 2.000 экз., ц. 75 к.

Арка над акіянам (паэма). Мінск, 1932, 111 стар., тыр. 3.000 экз., ц. 1 р. 25 к.

Арлянка (паэма). Мінск, 1932, 120 стар., тыр. 2.500 экз., ц. 2 р. 70 к., перапл.30 к.

Хада падзей (паэма). Мінск, 1932, 129 стар., тыр. 2.000 экз., ц. 2 р. 40 к.

Ураджай (нарысы). Мінск, 1933, 108 стар., тыр. 5.000 экз., ц. 70 к.

Чатыры вятры (вершы). Мінск, 1935, 207 стар., тыр. 4.000 экз., ц. 6 р. 25 к., перапл. 75 к.

Мужнасць (выбраныя вершы). Мінск, 1938, 141 стар., тыр. 6.000 экз., ц. 5 р. 50 к.

Рэдактар *М. Н. Клімковіч*
Тэхрэдактар *Я. Карпіновіч*
Карэктар *Ф. Зарубанава*

АТ 02801. Падпісана да друку 26/VI 47 г. Тыраж 8000 экз.
Папера 60×84/16. Вуч.-аўт. арк. 22. Друк. арк. 33½. Заказ № 263.

Мінск, Друкарня імя Сталіна, Пушкіна, 55.

8000 экз.
Заказ № 267

1964 г.

1964 г.

Цана 10 руб.
Пераплёт 50 кап.

B000000002728788

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ
Петро Глебка
ПОД НЕБОМ РОДИНЫ
Избранные произведения
Государственное Издательство БССР
Минск 1947